# ВЯЛІКІ БЕЛАРУС
# ЛЕЎ САПЕГА



# ВЯЛІКІ БЕЛАРУС
# ЛЕЎ САПЕГА

*Зборнік*

Мінск
ХАРВЕСТ

УДК 94(474/476)"15/16"(092)
ББК 63.3(4Лит)4-8
В99

*Друкуецца па выданню:*
*«Вялікі беларус Леў Сапега», Рыга,*
*Інстытут беларускай гісторыі і культуры, 2012.*

В99 **Вялікі** беларус Леў Сапега : Зборнік артыкулаў. / Укладальнік А. Тарас. — Мінск : Харвест, 2017. — 256 с. : мал.

ISBN 978-985-18-4116-1

Леў Іванавіч Сапега (1557—1633) — выдатны дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага. У розныя гады ён займаў пасады пісара вялікага, падканцлера, канцлера, гетмана вялікага, віленскага ваяводы. У сваёй палітыцы Л. Сапега заўсёды адстойваў суверэнітэт ВКЛ у складзе федэратыўнай Рэчы Паспалітай, змагаўся супраць пашырэння польскага ўплыву на нашых землях. Пад яго кіраўніцтвам быў створаны Трэці Статут ВКЛ (1588 г.) — галоўны закон дзяржавы, па якому нашыя продкі жылі 250 гадоў запар!

У зборніку сабраныя чатыры працы. Яны даюць добрае ўяўленне аб жыццёвым шляху Л. Сапегі, яго дзяржаўнай дзейнасці, грамадзка-палітычных і філазоўскіх поглядах.

**УДК 94(474/476)"15/16"(092)**
**ББК 63.3(4Лит)4-8**

**ISBN 978-985-18-4116-1**
© Вокладка. Харвест, 2017

АНАТОЛЬ ТАРАС

# ЛЕЎ САПЕГА

Леў Сапега — выдатны дзяржаўны і вайсковы дзеяч старажытнай Беларусі — Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага (скарочана — ВКЛ). Займаў пасады пісара літоўскага, падканцлера, доўгі час — канцлера, потым віленскага ваяводы і гетмана вялікага. Адзін з найбольш буйных дзяржаўных дзеячаў ВКЛ і Рэчы Паспалітай свайго часу.

## ПАХОДЖАННЕ. ЮНАЦТВА

Леў Сапега нарадзіўся 4 красавіка 1557 г. у Астроўне Віцебскага павета. Належыў да чарэйскай (больш дакладна — чарэйска-ружанскай) лініі старажытнага шляхецкага роду Сапегаў гербу «Ліс», які паходзіў з полацкіх баяраў. Быў старэйшым сынам Івана Сапегі (памёр у 1580 г.), старасты Драгіцкага і падстаросты Аршанскага, і князёўны Багданы Друцкай-Саколінскай-Канаплі (Канаплянкі), якая памерла каля 1584 г.

Дзед Льва, Іван Багданавіч Сапега (памёр у 1516 г.) быў ваяводам Віцебскім, потым — Падляскім. Такім чынам, Леў паходзіў з магнацкай сям'і, якая мела ўплывовыя сваяцкія сувязі і валодала багатымі маёнткамі.

Бацька аддаў хлопчыка на вучобу і выхаванне на двор віленскага ваяводы і канцлера вялікага Мікалая Радзівіла Чорнага. Леў вучыўся разам з яго трыма малодшымі сынамі. У 1570 г. ён разам з гэтымі трыма сынамі М. Радзівіла выехаў на вучобу ў Нямеччыну, у Лейпцыгскі універсітэт. У Нямеччыне з-за ўплываў Рэфармацыі ён змяніў праваслаўнае веравызнанне на пратэстанцкае — перайшоў у кальвінізм.

У 1573 г. 16-гадовы Леў вярнуўся на радзіму. Ён ужо добра ведаў права, нямецкую, польскую і лацінскую мовы. Неўзабаве па пратэкцыі Радзівілаў кароль Рэчы Паспалітай Стэфан Баторый прыняў Льва да свайго двара.



*Стэфан Баторый (1533—1586)*

У 1579 г. Сапега на чале гусарскай харугвы ўдзельнічаў у вызваленні Полацка ад войск Івана IV Жахлівага. За выдатную службу кароль С. Баторый залічыў яго ў свае асабістыя дваране (прыдворныя). 30 студзеня 1580 г. ён прызначыў Л. Сапегу на пасаду свайго сакратара. Разам з каралём у 1580—1581 гг. Леў прымаў удзел у паходах на Вялікія Лукі і Пскоў. Зноў ён узначальваў гусарскую харугву.

## НА ДЗЯРЖАЎНАЙ СЛУЖБЕ

У 1581 г. Сапега атрымаў ад караля пасаду пісара ВКЛ. З гэтага моманту ён увайшоў у склад сціслага кола кіраўнікоў дзяржавы.

Разам з канцлерам Астафіем Валовічам і падканцлерам Крыштофам Мікалаем Радзівілам Л. Сапега прымаў удзел у стварэнні вышэйшага апеляцыйнага суда ў дзяржаве — Галоўнага трыбунала Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Такім чынам завяршылася судовая рэформа ў дзяржаве, цяпер судовая сістэма набыла такі ж характер, як і ў Каралеўстве Польскім — з выбарнымі (а не прызначанымі) суддзямі з шляхецкага саслоўя.

У лютым 1584 г. Л. Сапега быў накіраваны ў Маскву як пасол да цара Івана IV — каб вырашыць памежныя пытанні і абмяняць ваеннапалонных. Аднак пасольства было затрымана ў Мажайску, бо ў сакавіку цар Іван памёр. Урэшце Сапегу прыняў новы цар Фёдар Іванавіч. Перамір'е было падпісана, а яшчэ Сапегу ўдалося вызваліць з палону 900 чалавек. За ўдалую місію ён атрымаў ад караля 2 лютага 1585 года пасаду падканцлера ВКЛ, а 20 ліпеня 1586 года — Слонімскае староства ў пажыццёвае валоданне. Пасля гэтага Л. Сапега зрабіў Слонім сваей галоўнай рэзідэнцыяй.

У 1585—86 гг., калі С. Баторый жыў у Гародні, Л. Сапега быў пры двары. Падчас бескаралеўя, пасля смерці С. Баторыя, Л. Сапега быў адным з найбольш актыўных сенатараў ад ВКЛ.

На канвакацыйным сойме ў лютым 1587 г., які выпрацоўваў умовы абрання новага караля і кампетэнцыю каралеўскай улады, Л. Сапега разам з троцкім ваяводам Янам Глябовічам выступіў супраць спробаў польскіх магнатаў падпарадкаваць сабе ВКЛ. У супрацьвагу ён прапанаваў весці з Масквой перамовы аб уніі дзвюх дзяржаў. Для гэтай мэты ён сустрэўся ў сакавіку 1587 г. у Навагрудку з пасольствам ад цара Фёдара Іванавіча і неафіцыйна прапанаваў маскоўскім дыпламатам высунуць кандыдатуру цара Фёдара на трон Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага.

## СТАТУТ 1588 ГОДА

На элекцыйным (выбарчым) сойме 1587 г. Л. Сапега выказаўся за абранне каралём Польскім і вялікім князем Літоўскім цара Фёдара. Але, калі гэтая кандыдатура не атрымала падтрымкі, разам з часткай дэпутатаў ад ВКЛ ён падтрымаў кандыдатуру шведскага каралевіча Жыгімонта Вазы, унука па матчынай лініі караля і вялікага князя Жыгімонта II Старога, аднак пры ўмове, што будзе заключаны мірны дагавор з Масковіяй. Пад уплывам Сапегі ВКЛ асобна ад Польшчы заключыла з Масковіяй перамір'е на 15 гадоў. На жаль, пасля абрання караля гэты дагавор не быў зацверджаны.

Жыгімонт III Ваза быў абраны каралём пасля таго, як войска прыхільнікаў другога кандыдата на трон, аўстрыйскага эрцгерцага Максіміліяна, было разбіта. Аднак магнаты ВКЛ доўгі час, пакуль не скончылася барацьба паміж абодвума кандыдатамі на карону, займалі нейтральную пазіцыю. І толькі ў снежні 1587 г. на з'ездзе сенатараў і дэпутатаў сойму ад ВКЛ ў Бярэсці новаабраны кароль быў прызнаны і вялікім князем літоўскім. Леў Сапега з Янам Глябовічам паехалі ў пачатку студзеня 1588 г. у Кракаў. Жыгімонт Ваза пачуваўся ўсё ж на троне няпэўна. Каб атрымаць падтрымку магнатаў і шляхты ВКл, ён 28 студзеня 1588 г. выдаў прывілей, якім зацвярдзіў Трэці Статут Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.

Статут 1588 года падкрэсліваў самастойнасць гэтай дзяржавы («панства»), як і да Люблінскай уніі 1569 г. А польская шляхта, паводле Статута, прызнавалася «суседзямі», «чужаземцамі» і не мела

права набываць і атрымоўваць у ВКЛ маёнткі і дзяржаўныя пасады. 12-ты артыкул 3-га раздзелу Статуту забараняў надаваць польскай шляхце якія-небудзь дзяржаўныя пасады, надаваць або здаваць у арэнду мясцовасці, гарады, мястэчкі, маёнткі. Ёй забаранялася купляць маёнткі або атрымліваць іх у спадчыну. Толькі ўраджэнцы ВКЛ мелі права займаць і высокія, і малыя дзяржаўныя пасады.

Гэты артыкул не толькі перакрэсліў адпаведны артыкул Люблінскай уніі 1569 года, але замацаваў даўнія нормы забароны набыцця маёнткаў польскай шляхтай, якія яшчэ былі зафіксаваны ў Статутах 1529 і 1566 гадоў. Цяпер польскі шляхціц мог прыехаць у Вялікае Княства, ажаніцца з мясцовай шляхцянкай і, калі толькі яна адна была спадчынніцай маёнтка (а гэта было рэдка, бо маёнтак пераходзіў у спадчыну сынам), толькі ўжо дзеці ад гэтага шлюбу (ураджэнцы Вялікага Княства) мелі правы на маёнтак, а не іх бацька-паляк. Таму на Беларусі наплыву польскай шляхты не было, у адрозненні ад Украіны, якая з 1569 г. уваходзіла непасрэдна ў склад Польшчы. За шляхтай ВКЛ замацоўваліся шматлікія прывілеі. Тым самым Жыгімонту была гарантаваная падтрымка Вялікага Княства.

Леў Сапега заняўся выданнем Статута, які адрэдагаваў, стварыўшы, па сутнасці, новую канцэпцыю незалежнасці нашай старажытнай дзяржавы.

У тым жа 1588 годзе Статут быў выдадзены на дзяржаўнай старабеларускай мове ў Вільні ў друкарні Мамонічаў. Потым, у 1614 і 1619 гг., Статут зноў выдаваўся ў Вільні пад наглядам Сапегі. Статут 1588 г. дзейнічаў на тэрыторыі Беларусі, Жамойці і Правабярэжнай Украіны да 1840 г., пакуль яго не скасаваў цар Мікалай I.

## КАЛЬВІНІСТ, КАТАЛІК, ПРЫХІЛЬНІК УНІІ

У 1586 г. 29-гадовы Л. Сапега перайшоў з кальвінізму ў каталіцтва. Гэта паспрыяла далейшай кар'еры, аднак у рэлігійным пытанні ён звычайна займаў стрыманую пазіцыю.

Пераход Л. Сапегі ў каталіцтва адбыўся дзякуючы дзейнасці ў Вільні езуітаў і асабліва выдатнага прамоўцы і прапаведніка Пятра Скаргі, які быў першым рэктарам Віленскай езуіцкай акадэміі. П. Скарга стварыў у Вільні касцёльнае брацтва Божага Цела, да якога належаў Леў Сапега.

Сапега стаўся багатым фундатарам для Каталіцкага касцёла ў Вялікім Княстве. Ён пабудаваў і забяспечыў 24 касцёлы, у тым ліку



*Вільня. Разам з касцёлам св. Міхаіла знаходзіцца былы палац Льва Сапегі, які ў 1594 годзе быў пераабсталяваны ў жаночы кляштар. Сучасны выгляд*

і ў Оршы, Слоніме, Ружанах, жаночы кляштар у Вільні* (1594 г.), кляштар кармелітаў ў Бялынічах (1623 г.), езуіцкі касцёл і калегію (навучальную ўстанову) у Бярэсці (1623 г.), уніяцкую царкву Святой Тройцы разам з базыліянскім манастыром у Чарэі (1599 г.). Сапега пашырыў фундацыю караля для езуіцкай калегіі ў Оршы (1610 г.). Рабіў фундацыі і для іншых святыняў.

У красавіку 1589 г. кароль надаў яму тытул канцлера вялікага Беларуска-Літоўскай дзяржавы. Такім чынам, Леў Сапега становіцца кіраўнікам знешняй і ўнутранай палітыкі Вялікага княства Літоўскага ў адказны гістарычны перыяд для нашай тагачаснай дзяржавы, падчас ваенных канфліктаў у Прыбалтыцы, на ўсходніх і паўднёвых рубяжах Рэчы Паспалітай. У гэты ж час Леў Сапега набываў новыя маёнткі, сярод іх Лепель (Полацкае ваяводства) і Іказнь (Браслаўскі павет).

Не заўсёды канцлер Леў Сапега знаходзіўся ў сталіцы або на соймах у Польшчы. Так, восень 1589 г. ён правёў у сваім маёнтку у Маладзечне. Звычайна ж ён знаходзіўся ў Вільні і кіраваў дзяржаўнымі справамі, або ездзіў да караля ў Кракаў, які яшчэ быў сталіцай Польшчы.

---

* У жаночы кляштар для 24 насельніц з прыстанку на Зарэччы быў пераабсталяваны палац Льва Сапегі, і ў тым жа 1594 годзе канцлер вылучыў сродкі на будаўніцтва пры кляштары касцёла Св. архангела Міхаіла, дзе і быў пахаваны пасля смерці.

Праўда, праз некалькі гадоў, у 1596 г., кароль Жыгімонт III Ваза перанёс сваю рэзідэнцыю ў Варшаву, і гэты горад з таго часу стаўся сталіцай Польшчы.

У 1591 г. у ВКЛ адбыўся канфлікт паміж пратэстантамі (пераважна кальвіністамі) і дзяржаўнымі ўладамі. Пратэстанты патрабавалі ад уладаў выканання акту Варшаўскай генеральнай шляхецкай канфедэрацыі 1573 г., якая (на правах сойму Рэчы Паспалітай) пацвярджала вольнае выкананне сваёй рэлігійнай дзейнасці вернікамі ўсіх хрысціянскіх канфесій. Канцлер абяцаў пратэстантам бараніць іх правы і вольнасці, якія дагэтуль парушаліся. Дзеля гэтага Л. Сапега сустракаўся з адным з кіраўнікоў пратэстантаў Вялікага Княства Андрэем Валянам. У гэты час Л. Сапега ўвайшоў у канфлікт з каралём і польскімі ўладамі. У 1596 г. Сапега адмовіўся паставіць вялікую дзяржаўную пячатку на акт аб прызначэнні на пасаду віленскага біскупа ўраджэнца Польшчы луцкага біскупа Бернарда Мацяёўскага. А без гэтай пячаткі прызначэнне не было сапраўдным і не мела законнай сілы нават з подпісам караля (вялікага князя).

Сапегу падтрымалі ў гэтым і іншыя вышэйшыя саноўнікі Вялікага княства Літоўскага, бо парушаліся нормы Статута 1588 г. Канфлікт скончыўся толькі ў 1600 годзе, калі на віленскую кафедру быў прызначаны мясцовы ўраджэнец Бенедыкт Война, а не паляк.

У кастрычніку 1596 г. у Бярэсці была заключана царкоўная унія, акт пра арганізацыйнае аб'яднанне каталіцкага касцёлу і праваслаўнай царквы на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Мэтамі уніі былі неабходнасць аб'яднання абедзвюх цэркваў супраць пратэстанцтва, ідэйнае аб'яднанне духавенства і феадалаў Рэчы Паспалітай пры правядзенні ўнутранай і знешняй палітыкі, захаванне рэлігійна-культурнай незалежнасці дзяржавы, процідзеянне імкненню рускага цара захапіць землі Беларусі і Украіны. Леў Сапега падтрымаў ідэю стварэння уніяцкай царквы. Сапега асабіста прысутнічаў на Берасцейскім царкоўным саборы як каралеўскі камісар і выступіў на саборы з палымянай прамовай у абарону царкоўнай уніі.

Л. Сапега займаўся і ўпарадкаваннем дзяржаўных дакументаў. Пры ім спраўна працавала дзяржаўная канцылярыя. Паводле яго загаду з 1594 года пачалося перапісванне кніг Літоўскай метрыкі, дзяржаўнага архіва, што было скончана ў 1607 г. Гэта было зроблена для таго, каб рабіць выпіскі для дзяржаўнай дакументацыі з архіва. Дарэчы, гэтая ініцыятыва Льва Сапегі дапамагла захаваць старажытныя акты XVI і нават XV стагоддзяў.

# СПРАВЫ СЯМЕЙНЫЯ

Леў Сапега, маючы 29 гадоў, 1 верасня 1586 г. ажаніўся з Даротай, дачкой Андрэя Фірлея, кашталяна Любліна. Яна была ўдавой ваяводы Троцкага князя Стэфана Збаражскага, які памёр у 1585 г.. Шлюб з ім яна мела шлюб на працягу менш пяці гадоў і паспела нарадзіць дачку Барбару.

Новаму мужу Дарота Фірлей-Збаражская нарадзіла сына Яна Станіслава (1589—1635), які потым стаўся маршалкам вялікім літоўскім, і яшчэ трох дзяцей, якія памерлі немаўлятамі. Сама Дарота памерла 14 сакавіка 1591 г. Л. Сапега пахаваў жонку ў віленскім касцёле святога Міхаіла.



*Соф'я Радзівіл Слуцкая, у дзявоцтве Алелькавіч (1555—1612)*

Праз 8 гадоў (у 1599 г.), на 43 гаду жыцця, ён ўзяў шлюб з 16-гадовай князёўнай Гальшкай (Лізаветай) Радзівіл (1583—1611), дачкой Крыштофа Мікалая Радзівіла Перуна, ваяводы віленскага і вялікага гетмана літоўскага, галавы кальвіністаў у ВКЛ. Гальшка Радзівіл унесла мужу, як тады называлі, новыя маёнткі.

Ад Гальшкі Радзівіл Л. Сапега меў трох сыноў: пісара ВКЛ Крыштофа Мікалая (1607—1631), падканцлера Льва (1609—1656) і Мікалая, які памёр хлопчыкам, а таксама дачку Ганну (1603—1627), якая стала жонкай Альбрыхта Уладзіслава Радзівіла, кашталяна Троцкага, ардынатара Нясвіжскага. Гэты шлюб меў і палітычныя наступствы. Умацаваліся сувязі Л. Сапегі з апазіцыяй. Цяпер ён часта выступаў у палітычных спрэчках як пасрэднік паміж каралём і пратэстантамі ў Вялікім Княстве.

Як раз у гэты час адбыўся канфлікт паміж дзвюма варагуючымі магнацкімі сем'ямі — Радзівіламі і Хадкевічамі, які на пачатку 1600 г. амаль не прывёў да грамадзянскай вайны. Швагер Л. Сапегі, князь Януш Радзівіл, вёў перамовы з апякунамі слуцкай князёўны Соф'і Алелькавіч (1585—1612) Хадкевічамі аб шлюбе з ёю. Хадкевічы завінаваціліся Радзівілам вялікую суму грошай. За згоду на шлюб Януша Радзівіла з уладальніцай былога Слуцкага

княства апякун князёўны Геранім Хадкевіч атрымаў бы 360 тысяч злотых і 500 валок (больш за 10 тысяч гектараў) зямлі, а яго доўг скасоўваўся.



*Януш Радзівіл (1579—1620)*

Аднак з-за спрэчак паміж Хадкевічамі і Радзівіламі, якія захапілі ў Хадкевічаў мястэчка Копысь з маёнткам, вясной 1600 г. Хадкевічы і Радзівілы сабралі па некалькі тысяч жаўнераў. У гэтым канфлікце Л. Сапега стаяў на баку швагра, якому Геранім Хадкевіч не хацеў аддаць нявесту.

Урэшце Радзівілы выслалі Сапегу як парламенцёра да Хадкевічаў. Л. Сапега ўгаварыў цесця дамовіцца з праціўнікамі. У справу ўмяшаліся кароль і сенатары. Урэшце 15-гадовую праваслаўную князёўну Соф'ю, выдалі за кальвініста Януша Радзівіла, але яна засталася праваслаўнай. Хадкевічы атрымалі 360.080 злотых (гэта былі вялізарныя грошы) і 500 валок зямлі, а іх доўг быў скасаваны. Жыгімонт II Ваза выказаў удзячнасць Сапегу за поспех міратворчай місіі.

## МАСКОЎСКІЯ СПРАВЫ

Пасля смерці ў 1598 годзе цара Фёдара Іванавіча Л. Сапега спрабаваў выставіць кандыдатуру Жыгімонта III на маскоўскі трон, але хутка на трон узышоў баярын Барыс Гадуноў. Тады Сапега прапанаваў праект жаніцьбы караля Жыгімонта з царэўнай Ксеніяй Барысаўнай. Канчатковая мэта гэтага праекту прадугледжвала дзяржаўную унію Рэчы Паспалітай з Масквой. І гэты праект не здзейсніўся.

Сойм 1600 г. прызначыў Л. Сапегу кіраўніком вялікага пасольства ў Маскву. У канцы верасня 1600 г. Сапега выехаў з Оршы ў Маскву на чале пасольства, якое налічвала з аховай і слугамі каля тысячы чалавек. Перамовы ў Маскве вяліся доўга і цяжка. У сакавіку 1601 г. была дасягнута дамова аб працягу перамір'я паміж Маскоўскім царствам і Рэччу Паспалітай на 20 гадоў, пачынаючы

з 15 жніўня 1602 г., аднак план дзяржаўнай уніі не ўдаўся. Сапега разлічваў у гэтым пытанні на падтрымку маскоўскіх баяраў, але цар Барыс Гадуноў якраз разграміў баярскую апазіцыю на чале з баярамі Раманавымі.

Пасля вяртання з Масквы Л. Сапега забяспечваў ваенныя дзеянні Рэчы Паспалітай у Інфлянтах, дзе ішла вайна са Швецыяй. Праз сваю канцылярыю Л. Сапега пры кожнай магчымасці выступаў супраць праходу польскага войска праз тэрыторыю Жамойці і Беларусі на поўнач, у Інфлянты, бо па дарозе і ў час пастою гэтае войска рабавала насельніцтва. Сапега абвінавачваў у гэтым польскіх дарадцаў караля, якія, на яго думку, намагаліся такім чынам аслабіць Вялікае Княства. На перадсоймавым з'ездзе дэпутатаў ад Літоўскай дзяржавы ў студзені 1603 г. у Слоніме ён патрабаваў ад польскага боку хутчэйшага вываду свайго войска з земляў ВКЛ.

Л. Сапега выступаў супраць падтрымкі Ілжэдзмітрыя I (расійскі гісторык Сяргей Салаўёў памыляўся, калі пісаў, што менавіта Сапега і падрыхтаваў яго на ролю царэвіча Дзмітрыя). На сойме 1605 г. Л. Сапега асудзіў падтрымку паходу Ілжэдзмітрыя I на Маскву, бо лічыў, што лепш заключыць дзяржаўную унію з Маскоўскім царствам. Прымаючы пасольства ад Барыса Гадунова, Сапега заявіў, што кароль не адказвае за паход самазванца і што Рэч Паспалітая захоўвае перамір'е.

## РОКАШ 1606—1607 гг.

У 1606—07 гг. Л. Сапега вымушаны быў удзельнічаць у сур'ёзным канфлікце магнацка-шляхецкіх груповак Рэчы Паспалітай.

Супраць абсалютысцкіх планаў караля Жыгімонта III Вазы выступіла групоўка на чале з кракаўскім ваяводам Мікалаем Зебжыдоўскім. У ВКЛ яго падтрымаў папулярны сярод шляхты князь Януш Радзівіл, швагер Л. Сапегі. У выступленні на сойме 1606 г. Сапега абвінаваціў апазіцыю ў зрыве папярэдняга сойма 1605 г., што стварыла пагрозу Рэчы Паспалітай (не была прынята пастанова аб падатках на войска), бо новы шведскі кароль Карл IX Ваза пачаў наступ у Інфлянтах, а з поўдня на Украіну напалі крымскія татары. Л. Сапега патрабаваў прыняць пастановы аб падатках і падрыхтавацца да абароны краю. У сваёй прамове ён таксама бараніў уніяцкую царкву ад нападак на яе як праваслаўных, гэтак і пратэстантаў.

У 1606 г. Л. Сапега ўдзельнічаў у нарадах сенатараў ВКЛ у Вільні і Навагрудку і асудзіў рокаш М. Зебжыдоўскага супраць караля. На сойме ў красавіку 1607 г. ён прапанаваў заключыць пагадненне з ракашанамі і сустракаўся з Янушам Радзівілам, які быў маршалкам удзельнікаў рокашу. У бітве супраць ракашан пад Гузавам Л. Сапега не ўдзельнічаў. А пасля гэтай бітвы, якую ракашане прайгралі, ён разам з віленскім ваяводам Мікалаем Крыштофам Радзівілам Сіроткам намагаўся памірыць Януша Радзівіла з каралём.

Л. Сапега звяртаў вялікую ўвагу на падзеі ў Маскоўскай дзяржаве, асабліва пасля забойства ў траўні 1606 г. у Маскве Ілжэдзмітрыя I. У 1607 г. ён прыйшоў да высновы, што вайны з Масквой не пазбегнуць. У жніўні 1607 г. з яго згоды стрыечны брат Ян Пётр Сапега паступіў на службу да Ілжэдзмітрыя II. І вось на сойме 1609 г. Л. Сапега сапраўды выступіў за тое, каб пачаць вайну з Масковіяй, бо «ніколі Рэч Паспалітая лепшай аказіі для пашырэння граніц не мела». Ён нагадаў тэрытарыяльныя страты, якія пацярпела ВКЛ ад Масквы ў папярэдні перыяд.

Разам з каралём Жыгімонтам Л. Сапега ў верасні 1609 г. адправіўся на вайну пад Смаленск. Ён узначаліў полк, які выставіў за свой кошт: 550 коннікаў (гусараў, казакоў і пяцігорцаў), 200 пехацінцаў. Сапега са сваім палкам першы падышоў да смаленскіх муроў 29 верасня 1609 г. Пачалася паўтарагадовая аблога Смаленска. Убачыўшы гэта, Сапега зноў вярнуўся да думкі аб неабходнасці мірных перамоў з Масквой. Ён лічыў, што партнёраў для гэтых перагавораў трэба шукаць у тушынскім лагеры Ілжэдзмітрыя II і адначасова сярод баяраў цара Васіля Шуйскага.

У пачатку 1610 г. Л. Сапега ўдзельнічаў у перамовах з пасольствам баярына Міхаіла Салтыкова, якое прыехала з Тушына. 14 лютага 1610 г. гэтае пасольства падпісала дагавор з каралём, што яго старэйшы сын Уладзіслаў Зыгмунтавіч, як яго па беларускаму узору называлі ў Польшчы, будзе рускім царом, які гарантуе прывілеі баяраў і дваранаў.

Ад гэтага моманту Л. Сапега, знаходзячыся ў лагеры пад Смаленскам, адначасова ўзначальваў не толькі дзяржаўную канцылярыю ВКЛ, але і маскоўскую канцылярыю караля Жыгімонта III, адкуль зыходзілі граматы на маёнткі расійскім баярам і дваранам і іншая дзяржаўная дакументацыя (кароль дзейнічаў ад імя свайго сына, запрошанага баярскім пасольствам на маскоўскі трон).

Пасля перамогі 4 ліпеня 1610 г. войска гетмана Станіслава Жулкеўскага, якое складалася з польскіх і беларускіх коннікаў і украі-

нскіх казакоў (6525 чалавек) над 35-тысячнай арміяй князя Дзмітрыя Шуйскага (брата цара) над Клушынам кая Гжацка, Жулкеўскі пайшоў наМаскву. Калі там даведаліся аб паразе, цар Васіль Шуйскі быў скінуты з трона і створаны баярскі ўрад (так званая «сямібаяршчына»).

Гэты ўрад падпісаў у жніўні 1610 г. дагавор з С. Жулкеўскім аб перадачы маскоўскага трона 15-гадоваму каралевічу Уладзіславу, які быў афіцыйна абвешчаны царом Масковіі. Яму цалавалі крыж і далі грамату жыхары Масквы і іншых гарадоў. У Маскву быў запрошана польска-беларускі гарнізон. С. Жулкеўскі адправіў да караля пад Смаленск вялікае баярскае пасольства — прасіць адпусціць сына ў Маскву, панаваць. У пасольства гетман уключыў усіх магчымых прэтэндэнтаў на царскі трон. Перамовы з імі вёў Л. Сапега. У той жа час ён пераконваў Жыгімонта III хутчэй адпусціць Уладзіслава ў Маскву. У гэтым ён бачыў здзяйсненне свайго даўняга плана аб дзяржаўнай уніі Варшавы, Вільні і Масквы.



*Ян Караль Хадкевіч (1560—1621)*

Па загаду караля ўмовы дагавору з маскоўскімі прадстаўнікамі былі перагледжаны, аднак маскоўскія паслы на ўступкі не ішлі і адмовіліся пераканаць ваяводу М. Шэіна, які абараняў Смаленск, капітуляваць. Тады, зноў-такі па загаду караля, 12 сакавіка 1611 г. Л. Сапега абвясціў маскоўскім паслам, што яны арыштаваныя, іх адсылаюць у Польшчу да канца вайны.

Пасля ўзяцця Смаленска каралеўскімі войскамі ў чэрвені 1611 г. Л. Сапега разам з каралём Жыгімонтам вярнуўся ў Вільню і пачаў рыхтаваць скліканне сойма. На павятовых сойміках, на якіх выбіралі паслоў на сойм, і на перадсоймавым з'ездзе дэпутатаў ад ВКЛ ў Слоніме (верасень 1611 г.) ён прапанаваў далучыць да Рэчы Паспалітай занятыя польскімі і літоўскімі войскамі тэрыторыі Смаленшчыны (вярнуўшы, такім чыгам у склад ВКЛ), і Севершчыну, якую прапанаваў далучыць да ўкраінскіх зямель Польшчы. З такой жа прапановай ён выступіў і на сойме. Пры гэтым ён настойваў на

далучэнні Смаленскай зямлі да ВКЛ і, згодна са Статутатам ВКЛ, пратэставаў супраць надання маёнткаў там польскай шляхце.

У канцы 1611 г. Л. Сапега ў Варшаве ўдзельнічаў у перамовах з маскоўскім пасольствам князя Юрыя Трубяцкога і баярына Міхаіла Марозава, якія прыехалі з просьбай маскоўскага ўрада хутчэй адпусціць цара Уладзіслава Сігізмундавіча ў Маскву. Сапега быў супраць таго, каб адпусціць юнака на царства ў няпэўнай сітуацыі ў Маскву, і кароль пагадзіўся з гэтым. Аднак восенню 1612 г. Сапега ўдзельнічаў у новым паходзе на Маскву, адначасова з гетманам Янам Каралем Хадкевічам і разам з каралём і каралевічам Уладзіславам, якога цяпер ужо хацелі пасадзіць на маскоўскі трон. Але час быў страчаны. Войскі апалчэння, якім камандаваў князь Дзмітрый Пажарскі, не дапусцілі невялікае войска Хадкевіча да Крамля, дзе засеў польска-беларускі гарнізон, і пасля баёў у самім горадзе Хадкевіч вымушаны быў адступіць. Мара Сапегі не здейснілася.



*Альбрыхт Станіслаў Радзівіл (1593—1656)*

У наступныя гады Л. Сапега цалкам узначаліў усходні кірунак палітыкі Рэчы Паспалітай, дбаючы перш за ўсё пра інтарэсы ВКЛ. На сойме 1616 году ён выступаў з прапановай аб падрыхтоўцы новай вайсковай экспедыцыі на Маскву і абяцаў шляхце надзяліць яе далучаныя падчас вайны землямі на Усходзе. Дзеля гэтага ў красавіку 1617 года на канвакацыйным з’ездзе прадстаўнікоў шляхты ВКЛ Сапега разам з іншымі сенатарамі пераканаў шляхецкіх дэпутатаў ухваліць новыя падаткі на два гады. Матывамі неабходнасці новай вайсковай экспедыцыі былі ўзвядзенне на царскі трон (дзе малады цар Міхаіл Раманаў яшчэ не замацаваўся) каралевіча Уладзіслава і замацаванне Смаленскага ваяводства.

Урэшце ў ліпені 1617 г. каралевіч рушыў у паход. Шлях войска на чале з гетманам Я.К. Хадкевічам праходзіў праз Беларусь. Л. Сапега наладзіў прыём каралевічу ў сваіх рэзідэнцыях у Ружанах і Слоніме. Канцлер выставіў са сваіх уладанняў у войска Уладзіслава Вазы дзве роты: гусарскую (200 коннікаў) і пяхотную (100 чала-

век). Л. Сапега суправаджаў каралевіча. Былі заняты Дарагабуж і Вязьма.

Аднак войска было невялікім, а справа з грошамі была вельмі кепскай. Частка галодных жаўнераў пакінулі войска. Каб узмацніць войска Уладзіслава і Хадкевіча, Сапега вярнуўся ў Вільню і сабраў грошы для войска. Адначасова ён дамовіўся з казацкім гетманам Пятром Канашэвічам-Сагайдачным аб паходзе ўкраінскіх казакоў на Маскву. Сойм 1618 г. грошай на працяг кампаніі не даў і выказаўся за перамовы з Масквой. Сапега вымушаны быў з гэтым пагадзіцца. Аднак выслаў на дапамогу Уладзіславу вайсковыя падмацаванні, у тым ліку эскадроны беларускіх татараў.

У кастрычніку 1618 г. каралевіч Уладзіслаў, гетманы вялікі літоўскі Ян Караль Хадкевіч і ўкраінскі гетман Пётр Сагайдачны падышлі да Масквы. Каралевіч знаходзіўся ў сяле Тушына, Сагайдачны з казакамі — каля Данскога манастыра. Аднак штурм Масквы вынікаў не даў, не былі ўзяты таксама Мажайск і Троіцка-Сергіеў манастыр. У гэты час Л. Сапега вярнуўся да каралевіча пад Маскву.

Вычарпаныя баявыя рэсурсы і значныя страты ў людзях прымусілі абодва бакі пайсці на перамовы. У гэтых перамовах Сапега быў адным з чатырох паслоў. У выніку перагавораў 11 снежня 1618 г. паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай было заключана ў сяле Дэуліна перамір'е на 14 з паловай гадоў. ВКЛ афіцыйна вярнула сябе Смаленскае ваяводства, за выключэннем Вязьмы, а Польшча атрымала Ноўгарад-Северскія і Чарнігаўскія землі з адпаведнымі гарадамі. Каралевіч Уладзіслаў захаваў тытул «цара маскоўскага», але на троне застаўся Міхаіл Раманаў. Пытанне аб канчатковым міры было адкладзена.

* * *

У 1621 г. канцлер Сапега займаўся размяркавнням паспалітага рушэння ВКЛ. Ён накіраваў розныя харугвы на вайну супраць Турцыі ў Малдавію, супраць шведаў у Інфлянты, на Смаленшчыну і ўсходні бераг Дняпра — на выпадак абароны ад магчымага нашэсця маскоўскіх войскаў.

Потым Сапега знаходзіўся ў Варшаве і займаўся справай адпору шведам у Інфлянтах. Шведскія войскі захапілі Рыгу і Мітаву (Елгаву), сталіцу Курляндскага герцагства, васала Рэчы Паспалітай.

На пачатку 1623 г. Л. Сапега ўдзельнічаў у Варшаве ў працы сойма Рэчы Паспалітай. 6 лютага 1623 г. ён атрымаў ад Жыгімонта Вазы прызначэнне на самую ганаровую ваяводскую пасаду ў ВКЛ —

ваяводы Віленскага і адначасова адмовіўся ад пасады канцлера вялікага на карысць падканцлера Альбрыхта Станіслава Радзівіла. Адмовіўся Л. Сапега і ад пасады старосты Берасцейскага.

## ВІЦЕБСКІ БУНТ (1623 г.)

У гэты ж час яму прыйшлося займацца і спрэчкамі паміж іерархіяй уніяцкай царквы і праваслаўнымі вернікамі. На Украіне ўжо ў 1620 годзе была ўзноўлена праваслаўная іерархія на чале з мітрапалітам (адначасова з існаваннем уніяцкай царквы і каталіцкага касцёлу). Аднак Украіна была ў складзе Польскага каралеўства, там дзейнічалі польскія законы. У ВКЛ заканадаўства было сваё.

У гэтым рэлігійным канфлікце Л. Сапега выступаў на баку уніятаў. Аднак ён намагаўся неяк улагодзіць канфлікт. Калі ўвосень 1618 г. уніяцкім архіепіскапам Полацкім стаўся Іасафат Кунцэвіч, у новага архіепіскапа пачаўся канфлікт з праваслаўнымі магілёўскімі мяшчанамі, якія яму не падпарадкаваліся. 22 сакавіка 1619 г. кароль сваім дакрэтам патрабаваў пакарання смерцю бунтаўшчыкоў-магілёўцаў. Аднак Сапега, дзяржаўца Магілёўскай эканоміі, пакараў магілёўцаў буйным грашовым штрафам і загадаў гарадскім уладам перадаць цэрквы пад юрысдыкцыю І. Кунцэвіча.

У лютым 1621 г. Л. Сапега як канцлер адмовіўся прыкласці пячатку да універсала Жыгімонта Вазы, якім той забараняў полацкаму магістрату дапусціць у горад праваслаўнага полацкага архіепіскапа Мялеція Сматрыцкага. Такім чынам, універсал караля не меў законнай сілы. 12 сакавіка 1622 г. Л. Сапега накіраваў ліст да І. Кунцэвіча, у якім абвінаваціў уніяцкага архіепіскапа ў рэпрэсіўных дзеяннях супраць праваслаўных і папярэдзіў яго аб трагічных наступствах такой палітыкі.

На сойме 1623 г. Л. Сапега быў уключаны ў склад соймавай камісіі, што павінна была мірыць абодва бакі (уніятаў і праваслаўных) шляхам узаемных уступак. Але 12 лістапада 1623 г. віцебскія праваслаўныя мяшчане жорстка забілі Кунцэвіча. Пасля гэтага Л. Сапега атрымаў асобыя паўнамоцтвы ад Жыгімонта III на правядзенне судовага працэсу ў Віцебску.

Узначальваемая Л. Сапегам судовая камісія ўсебакова разгледзіла справу аб забойстве архіепіскапа і 22 студзеня 1624 г. прыгаварыла 19 мяшчан да смяротнага пакарання. Яшчэ 78 мяшчанам, якія ўцяклі ў Масковію, прыгавор быў вынесены завочна. Камісія

усталявала, што бунт узначальваў праваслаўны поп Сцяпан Пасьера, а грошы на падрыхтоўку бунту дала Віленскае праваслаўнаен брацтвап. У Віцебска было адабрана магдэбургскае права, ўсе вялікакняжацкія і каралеўскія прывілеі. Была разбурана гарадская ратуша. Зправаслаўных цэркваў знялі званы.

## НА ВАЙНЕ СА ШВЕЦЫЯЙ (1625 Г.)

25 ліпеня 1625 г. кароль Жыгімонт III прызначыў Л. Сапегу гетманам вялікім літоўскім. Галоўнакамандуючаму было ўжо 68 гадоў. Жыгімонт быў настроены варожа да гетмана польнага Крыштофа Радзівіла, швагра Л. Сапегі, і таму аддаў вялікую булаву Сапегу, пакінуўшы К. Радзівіла з малой булавой.

Кароль таксама разлічваў на здольнасць Сапегі забяспечыць фінансамі войска, без чаго працягваць вайну са Швецыяй было немагчыма. Польны гетман пакрыўдзіўся і на караля і на Л. Сапегу. Барацьба паміж дзвюма групоўкамі магнатаў у Вялікім Княстве абвастрылася.



*Аляксандр Гасеўскі (1575—1639)*

На тэатр ваенных дзеянняў стары гетман не паехаў. Знаходзячыся ў сваім маёнтку Талачыне і выязджаючы ў Магілёў, ён фарміраваў ваенныя атрады. А камандавац войскам у Інфлянтах замест яго быў прызначаны Смаленскі ваявода Аляксандр Гасеўскі.

Толькі ў верасні 1625 г. Сапега выехаў на фронт на Заходнюю Дзвіну. Дывізія Л. Сапегі дзейнічала асобна ад дывізіі польнага гетмана Крыштофа Радзівіла, і толькі ў лістападзе 1625 г. абодва гетманы сустрэліся і прынялі агульны план ваенных дзеянняў.

Пакінуўшы ў войску свайго сына Яна Станіслава, літоўскага маршалка вялікага, Л. Сапега ад'ехаў на сойм у Варшаву. Хутка пасля яго ад'езду, 17 студзеня 1626 г., малады шведскі кароль Густаў II Адольф нанёс сур'ёзнае паражэнне войску Яна Станіслава Сапегі. Войскам ў Інфлянтах камандаваў Аляксандр Гасеўскі. Ён таксама цярпеў паражэнні ад шведаў.

На пачатку 1627 г. Л. Сапега прапанаваў сенатарам, не звяртаючы ўвагі на намеры караля, пачаць перамовы са шведамі. У выніку дэлегацыя на перамовах у студзені 1627 г. падпісала 5-месячнае перамір'е і шведы вярнулі занятыя імі Біржы.

Улетку 1627 г. 70-гадовы гетман вырушыў на вайну. Але на фронце гетман быў нядоўга і зноў выехаў у Варшаву на чарговы сойм. На сойме депутаты моцна яго крытыкавалі і за ход ваенных дзеянняў, і за грашовыя выдаткі. Дэпутаты ад Польшчы папікалі, што ён плаціць літоўскім жаўнерам больш грошай, чым польскім жаўнерам, што ваявалі супраць шведаў у Прусіі. Сапега зноў выязджаў у Інфлянты, шведы міжтым занялі Прусію.




*Леў Сапега.*
*Невядомы мастак. 1632 г.*

Аднак ішлі ўжо мірныя перамовы. Урэшце 26 верасня 1629 г. у горадзе Альтмарк (Стары Тарг) быў падпісаны дагавор аб перамір'і, паводле якога ўсе гарады, акрамя Караляўца (Кёнігсберга), Гданьска (Данцыга) і Пуцка, і ўсе Інфлянты на поўнач ад Заходняй Дзвіны перайшлі да Швецыі. Працяглую вайну (яна ішла, з перапынкамі, з 1601 году!) Рэч Паспалітая прайграла ў шчэнт!

30 красавіка 1632 г., пасля 45 гадоў панавання, памёр кароль і вялікі князь Жыгімонт III Ваза. Наступіла міжкаралеўе. Л. Сапега адразу паехаў з Бярэсця о Варшаву. На нарадзе сенатараў яму было даручана забяспечыць усходнія межы ВКЛ, узмацніўшы гарнізоны замкаў на маскоўскім рубяжы. У летнія месяцы 1632 г. гэтым і займаўся Сапега.

Потым ён зноў вярнуўся ў Варшаву на канвакацыйны сойм. На наступным, элекцыйным (выбарчым), сойме ў жніўні 1632 г. Л. Сапега падтрымаў кандыдатуру Уладзіслава, старэйшага сына Жыгімонта III Вазы. У лісталадзе 1632 г. Уладзіслаў быў абраны каралём Рэчы Паспалітай і, аўтамытычна, каралем польскім і вялікім князем літоўскім.

Але яшчэ перад выбарамі караля, у верасні 1632 году, маскоўскі цар Міхаіл Раманаў і яго бацька патрыярх Філарэт накіравалі пад Смаленск 40-тысячнае войска, каб захапіць горад і ўсё Смален-



*Езуіцкі калегіум у Оршы (рэканструкцыя). Заснаваны па фундацыі караля Рэчы Паспалітай Жыгімонта III Вазы, які разам з канцлерам Л. Сапегам і ксяндзом Лаўрэнціем у 1609 г. распрацаваў план яго стварэння*

скае ваяводства. У гэты час Л. Сапега фарміраваў новыя роты і накіроўваў іх не толькі ў войска, але і ў свае маёнткі на ўсходзе Беларусі, каб захаваць іх ад нападаў маскоўцаў. У першай палове 1633 г. Л. Сапега быў у Вільні і нават вітаў караля Уладзіслава IV, які ехаў на фронт пад Смаленск.

Памёр Леў Сапега 7 ліпеня 1633 г. у Вільні, ва ўзросце 76 гадоў. З пункту гледжання таго часу ён быў вельмі стары чалавек! Яго пахавалі ў віленскім касцёле святога Міхаіла Архангела побач з жонкамі.

* * *

У гісторыю Беларусі Леў Сапега ўвайшоў як выдатны дзяржаўны дзеяч, які адстойваў суверэнітэт Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага як законадаўца, дыпламат і палкаводзец.



*Унікальны партрэт Льва Сапегі з Нясвіжскага замка.*
*Знік перад Другой сусветнай вайной*

МІКАЛАЙ ШКЯЛЁНАК

# ВЯЛІКІ КАНЦЛЕР ЛЕЎ САПЕГА

*По тэксту брашуры*
*«У трохсотныя ўгодкі сьмерці Вялікага Канцлера Льва Сапегі»,*
*Вільня, 1933, с. 3—30.*

У 1933 годзе мінае трыста гадоў ад дня сьмерці Вялікага Канцлера Літоўскага Льва Сапегі, згуляўшага ў гісторыі беларускага народу і культуры гэткую вялікую і дадатную ролю, што пара яго справядліва завецаа «залатой».

Аб Сапезе захавалася да нашых дзён многа аўтэнтычных дакумэнтаў, на падставе каторых асабістасьць яго можна зусім выразна схарактэрызаваць, дэфінітыўна азначыць яго нацыянальнасць і культурную прыналежнасьць.

Між іншым, у гэтым артыкуле аўтар карыстаўся ў вялікай меры пісьмамі Льва Сапегі да віленскага ваяводы Крыштофа Радзівілла*. Пісьма гэтыя, выдадзеныя ў VIII томе збору «Scriptores rerum polonicarum», маюць вялікую вагу дзеля пазнаньня асабістасьці Сапегі і прадстаўляюць гістарычны матэрыял першараднае вагі, бо, як слушна сказаў прадмоўца да ўспомненага збору, пісьмы вялікіх людзей эпохі Сапегі мелі шмат вялікшае значэньне, чым звычайная карэспандэнцыя. Пісьмы Сапегі, атрымліваныя Крыштофам Радзівіллам, датаго-ж ставаліся ведамымі і шырэйшаму агулу шляхты пры радзівіллаўскім двары, комэнтаваліся, выклікалі дыскусію і ў выніку крысталізавалі публічную думку.

А зьмест пісем Сапегі асабліва цікаўны і вельмі добра характэрызуе Вялікага Канцлера як абаронцу правоў Вялікага Князьства і панаваўшае ў ім беларускае культуры. Апрача таго, пісьмы гэтыя падаюць запраўдныя матывы паступаньня Сапегі ў розных

* Крыштаф Радзівілл «Пярун» (1547—1603) — падчашы ВКЛ у 1569—79, кашталян трокскі і адначасова падканцлер ВКЛ у 1579—84, ваявода віленскі ў 1584—89, вялікі гетман ВКЛ у 1589—1603 гг. — *Рэд.*

важных справах. Гэтыя ўкрытыя матывы маюць далёка большае значэньне, чым штучна прыдумываныя пры афіцыяльных выступленьнях.

Леў Сапега жыў у эпоху, каторая ў гісторыі Беларусі можа быць названа эпохай рэфармацыі і познага гуманізму. Аднак, ня гледзячы на вялікі ўздым культурнага жыцьця, эпоха Сапегі мела ўжо ўсе зачаткі палітычнага і культурнага заняпаду. Асабліва вялікай заслугай Сапегі зьяўляецца іменна тое, што ён адзін ясна бачыў гэтыя прычыны заняпаду, перасьцерагаў перад імі сваё грамадзянства і, як мог, стараўся іх паралізаваць.

Каб адзначыць 300-лецьце сьмерці Льва Сапегі і даць запраўдны абраз гэтае нязвычайнае адзінкі, пяройдземо да агляду жыцьця і працы Вялікага Канцлера.

* * *

Сапегі — вельмі стары беларускі род, які быў у далёкай кроўнай сувязі з Гедымінавічамі і згуляў даволі важную ролю ў гісторыі беларускіх зямель ужо да XV стагодзьдзя. Паводле дакумэнтаў Мэтрыкі Вялікага Княства Літоўскага, калыскай роду Сапегаў была Смаленшчына. Продкі Сапегі былі праваслаўнае веры, аб чым сьведчаць іх імёны: Семенъ, Іванъ (Івашка), Богданъ, Глебъ і другія. Род Сапегаў быў, аднак, бедны, і Леў першы залажыў асновы яго пазьнейшае вялікасьці і магутнасьці.

Бацькамі Льва былі: Іван Іванавіч Сапега, стараста дарагічынскі і ваявода падляскі (памёр у 1580 г.) і княгіня Багдася Друцкая-Сакалінская (памёрла у 1584 г.). Радзіўся Леў Сапега ў 1557 годзе ў двары Астраўку і меў двух братоў: Грыгора, падкаморага аршанскага (памёр у 1600 г.), і Андрэя, які быў перш аршанскім старастам, пасьля віцебскім кашталянам і мсьціслаўскім ваяводам (памёр у 1611 г.). Акром братоў меў тры сястры.

Ідучы за тагачасным звычаем, бацькі аддалі свайго сына яшчэ колькігадовым хлапчуком на нясьвежскі двор вялікага магната Мікалая Радзівілла Чорнага, славутага апякуна беларускіх кальвіністаў. Тутака, у атмасфэры рэлігійных навінак, малады Леў хутка пакінуў старую рэлігію сваіх продкаў і прыняў кальвінства. Толеранцыя, якая панавала на нясьвежскім двары і ў якой гадаваўся Сапега, заклала ў яго душу глыбокія асновы рэлігійнае вольнасьці і не дала яму стацца, як гэта часта тады здаралася, фанатыкам свае веры.

Князю Мікалаю Радзівіллу Чорнаму Сапега спадабаўся адразу сваімі здольнасьцямі, спрытам і глыбокай любоўю да свайго

краю. Пазнаўшы маладога хлапца з найлепшага боку, Мікалай Радзівілл паслаў яго яшчэ 13-гадовым хлапцом на слаўны ў той час унівэрсытэт у Лейпцыгу*. Тамака Леў, разам з сынамі Радзівілла, пільна студыяваў юрыдычныя навукі, клясыкаў і філёзофію, пазнаваў нямецкае жыцьцё і адначасна паглыбляў сваю веду аб уласнай бацькаўшчыне. Знаёмства з рэлігійнымі адносінамі на Захадзе яшчэ больш узмоцніла ў ім рэлігійную цярпімасьць.

Па сканчэньні навукі ў Лейпцыгу Сапега быў добра падгатаваным палітыкам, дыпламатам і выказваў шырокую і ўсебаковую эдукаванасьць. Вярнуўшыся з Нямеччыны, ён задзівіў Сьцяпана Батуру, перад якім бараніў справу свайго бацькі, дасканалай знаёмасьцю лацінскае мовы і — не бяз рады сваіх апякуноў Радзівіллаў — астаўся пры двары, каб сьцерагчы інтарэсы Вялікага Княства. У 1580 годзе, на 23 годзе жыцьця, Сапега абняў урад сэкрэтара Вялікага Княства**.

Нялёгка прыходзілася маладому Льву на новым становішчы і ў новым асяродзьдзі. З аднаго боку ня было для яго тайніцай, што польскія ўплывы штораз глыбей уразаліся ў жыцьцё беларускіх магнатаў і шляхты, а з другога — ён адразу спасьцярог, што Карона ўсялякімі спосабамі імкнулася да пэўнае гэгемоніі над Вялікім Княствам Літоўскім, пагражаючы зьнішчэньнем навет тых правоў, каторыя мела Княства пасля вуніі 1569 г. Кіруючыся любоўю да ўласнае айчыны — з аднаго боку, а з другога — разумеючы магутнасьць радзівіллаўскага дому і бачучы ў ім адзіную рэальную сілу, на якой мог бы апірацца ў барацьбе за інтарэсы Княства, Сапега адразу ўявіў тую вялікую небясьпеку для яго айчыны, якая б паўстала ў прыпадку цеснага паразуменьня Радзівіллаў з каралём, і таму — з вялікім спрытам — ня толькі выкарыстоўваў і паглыбляў спрэчкі і непаразуменьні між імі, але стараўся няраз сам іх тварыць.

Праз увесь час пабыту пры двары Сьцяфана Баторыя і Жыгімонта III Сапега падтрымліваў цесную лучнасьць з Радзівілламі, часта да іх прыяжджаў і пісаў шмат лістоў, у якіх скардзіўся на

---

* Аўтар памыляецца. Льву споўнілася 13 гадоў у 1570 г., а Мікалай Радзівілл «Чорны» памёр на 5 гадоў раней — у 1565 г. Верагодна, у Лейпцыг яго паслаў нехта з нашчадкаў «Чорнага», хутчэй за ўсё, старэйшы сын — Мікалай «Сіротка» (1549—1616). Там Леў у 1570—73 гг. навучаўся разам з малодшымі сынамі «Чорнага» — Альбрэхтам (1558—1592) і Юрыем (1556—1600). Потым яны ад'ехалі ў Рым, а Леў вярнуўся на радзіму. Кальвінізм Леў прыняў не ў Нясвіжы, а ў Лейпцыгу. — *Рэд.*

** Тутака Шкялёнак таксама памыляецца. Л. Сапега ў 1581 г. заняў пасаду не сэкрэтара, а вялікага пісара ВКЛ і заставаўся на гэтай пасадзе да 1585 г. С. Баторы быў каралём Рэчы Паспалітай у 1576—1586 гг. — *Рэд.*




*Лейпцыг на пачатку XVII стагоддзя*

крыўды, робленыя Вялікаму Князьству, абгаварваў сродкі абароны і парушаў наагул унутраныя справы Князьства.

Вайна, распачатая вялікім князем маскоўскім Іванам IV «Жахлівым» супраць ВКЛ дала магчымасьць Льву Сапезе адзначыцца на ваенным і дыплёматычным полі. Сфармаваўшы на свой кошт гусарскі полк, ён зьвярнуў на сябе ўвагу ў бітвах пры Завалаччы, Вялікіх Луках і аблозе Пскова.

Па сканчэньні вайны Сапега едзе на чале пасольства ў Маскву, куды ў тэй жа ролі езьдзілі раней дзядзькі яго — віцебскі ваявода Мікалай і менскі Андрэй. Сапега не застаў ужо жывым Жахлівага і з яго наступнікам Хведарам Іванавічам падпісаў умову згоды на 10 гадоў, паводле якой Масква атрымала Смаленшчыну, але з'абавязалася вярнуць Полаччыну, Вяліжскую і Інфлянцкую землі. Гэта быў першы дыплёматычны выступ Сапегі і пры гэтым вельмі ўдалы. Папераджаючы бег выпадкаў, трэба зацеміць, што праз 16 гадоў, паіменна ў 1600 г., ужо пры цары Барысе Гадунове, Сапега ізноў езьдзіў з пасольствам у Маскву і падпісаў з ёй умову аб міры на 20 гадоў.

Вярнуўшыся з першага пасольства, Сапега атрымаў урад падканцлера Вялікага Князьства, а ў 1586 г. абшырнае слонімскае староства, як бы нагароду за пакінутыя ў Смаленшчыне маёмасьці яго продкаў. Галоўная пара дзейнасьці яго наагул прыпадае на

часы пасля Люблінскае вуніі 1569 г., каторая на даўжэйшы час устабілізавала адносіны між Вялікім Князьствам Літоўскім і Каронаю. І хоць з праўнага гледзішча становішча абедзьвюх частак супольнае Рэчы Паспалітае было роўнае, аднак, дзякуючы фактычнай перавазе Кароны над Вялікім Князьствам, узьнімалася небясьпека поўнага пераходу кіраўніцтва да Кароны.

Адносіны Сапегі да вуніі былі заўсёды ад'емныя. Ён добра разумеў небясьпеку перавагі Кароны і, прымушаны сілаю факту лічыцца з новым палажэньнем свайго краю, пастанавіў не дапусьціць да гэгемоніі Кароны і гэткім чынам абараніць раўнапраўнае палажэньне Вялікага Князства ў новай дзяржаве.

Аднак, роля Сапегі ня зводзілася толькі да абароны свайго краю ад супрэмацыі Кароны. З пададзеных ніжэй фактаў трэба зрабіць той вывад, што Сапега — ў справах асабліваe вагі для Вялікага Князьства — папросту ігнараваў пастановы вуніі і супольных соймаў, чым выклікаў абурэньне з боку палякоў.

Няпрыхільныя адносіны Сапегі да вуніі ясна бачацца з яго пісем да ваяводы віленскага Крыштофа Радзівілла, як прыкладам з пісьма, пісанага 19 студня 1609 году, дзе Сапега кажа:

> Добра ведама, як нам гэту вялебную вунію датрымоўваюць; з радасьцю зрабілі-б з нас Валынь*. Агулам — дрэнная справа з імі, бо яны ахвотна хацелі-б мець нас сваімі галдаўнікамі, а асабліва тыя, што паходзяць з кузьні гэнага нябошчыка, які зваў нас «gens inimica mihi»**.

Больш ясна выступае барацьба Сапегі з вуніяй у сувязі з працамі над Трэцім Статутам. Адкладаючы агляд сутнасьці гэтае барацьбы да адпаведнага месца, трэба зацеміць, што Сапега, маючы перад сабой дакананы факт вуніі, у сваей дзейнасьці лічыўся з створаным вуніяй станам, каторы меў прыметы стану трывалага.

У 1588 годзе памёр Сьцяфан Баторы. Кожная з дзьвюх узаемна сабе варожых польскіх партыяў: Замойскага і Збароўскіх — імкнулася правесьці на каралеўскі пасад свайго кандыдата. Замойскі пратэгаваў сына швэдзкага караля Яна III і Кацярыны Ягелёнкі — Жыгімонта Вазу; Збароўскія выстаўлялі контр-кандыдатуру брата цэзара Рудольфа II, маладога і амбітнага Максымільяна. Гэтай апошняй кандыдатуры спрыяла Літва і перадусім Радзівіллы.

* Валынь была інкарпаравана да Кароны ў 1569 г. разам з Падоліяй і Падляшшам.

** Маецца на ўвазе Сьцяфан Баторы. Пераклад яго слоў наступны: «племя, непрыемнае мне».

Сапега, паводле некаторых гісторыкаў, трымаўся кандыдатуры Жыгімонта Вазы і сваім уплывам спрычыніўся да выбару апошняга на каралеўскі пасад. Аднак, з гэтым трудна згадзіцца дзеля наступных прычынаў.

Перш за ўсё Сапега ў часе выбару Жыгімонта Вазы яшчэ ня меў вялікшых уплываў і тым больш сярод грамадзянства Вялікага Князьства, каторае трымалася кандыдатуры Максымільяна.

Па другое, калі б і згадзіцца з тым, што Сапега спрычыніўся да выбару Жыгімонта III, дык незразумелымі былі б варожыя адносіны да яго новага гаспадара, якія асабліва востра выступалі ў першыя гады панаваньня Вазы.

Па трэцяе — трудна дапусьціць, каб Сапега, апіраючыся на Радзівіллаў, адважыўся адкрыта выступіць супраць сваіх апякуноў. Хутчэй трэба дапусьціць, што, калі Сапега і не стаяў за кандыдатуру Максымільяна, дык у кожным прыпадку ніякая з дзьвюх кандыдатураў яго асабліва не прыцягала.

У першыя гады свайго панаваньня новы гаспадар паказваў варожыя адносіны да Вялікага Князьства і вялікую непрыязьнь да Сапегі, палажэньне каторага пры двары было вельмі цяжкое. Гэта выразна бачыцца з пісем Сапегі да віленскага ваяводы Крыштофа Радзівілла, у якіх ён скардзіцца, што з яго зрабілі не падканцлера, а «пісарчука», і што кароль раней, чымся даць адказы на яго дэзыдэраты, доўга нараджаўся з палякамі. Гэтак у пісьме з 31-га студзеня 1588 году Сапега піша:

> Вельмі перамогай над Максымільянам узмацніліся паны палякі і асабліва народу літоўскаму зрабіліся гардымі, кажучы: каб гэта навіна прышла перад заканчэньнем нашых справаў літоўскіх, не дазволілі-б нам ані нашых постулятаў, ані супакою, ані паловы Інфлянцкае зямлі. Пан Асецкі, пасол ад войска, іменем гэтмана і ўсіх жаўнераў даказваў, што мы да зямлі Інфлянцкае нічога ня маем, і досыць ушчыпліва народ літоўскі ўспамінаў, чаго мы ня хочучы слухаць, бо нам у спрэчкі з імі аб гэтым удавацца не гадзілася, пайшлі прэч, няхочучы даслухаць гэтага іхняга пасольства. Вакансіі літоўскія ўсе разданы перш, чымся мне аб іх з каралём прышлося гутарыць, ды і радзіцца мяне не хацеў.

А ў пісьме з 17 лютага 1588 г. Сапега піша:

> Кароль казаў, што больш палякам павінен, чымся Літве, бо яму палякі больш жычлівасьці паказалі, як Літва. І ня толькі гэтак кажа,

але і робіць. Ужо там больш палякі ў нас* дастаюць, чымся сама Літва; ліцьвіну зараз адмовяць, а паляку зараз дадуць. Дзеля гэтага азнаймляю Вашай Міласьці, што, як толькі штось адчыніцца ў Літве, дык усё паляком хоча** даваць.

Сапега просіць Радзівілла пісаць аб усіх дэзыдэратах, каб мог:

> [...] апіраючыся на іх, з рэзультатам пратэставаць перад каралём, бо самому цяжка бароцца з Панам і панамі палякамі, каторыя ліслівасьцю сваей Жыгімонту хочуць спадабацца. Апіраюся, як кот на лёдзе, але калі ня буду магчы, хіба што з якойсь пратэстацыяй гэтак сама ад'еду дамоў.

А ў пісьме з 7 чэрвеня 1588 г. Сапега яшчэ выразьней піша аб адносінах да яго асабіста і ўсяго літоўскага народу новага гаспадара. Трэба зацеміць, што пісьмо гэтае было выклікана і двумя іншымі фактамі, маючымі гістарычную цікавасьць. Пайменна, Сапега жалее, што Радзівілл, прыймаючы ўчасьце ў вывязеньні цела Сьцяпана Батуры з Горадні, дзе ён памёр, адвёў жалобны кондукт толькі за мост, тады, калі, паводле Сапегі, трэба было адвесьці да граніцаў Вялікага Княэьства. Апрача гэтага, Сапега апісвае абурэньне караля і асабліва каралевы з тэй прычыны, што Радзівілл затрымаў усе кляйноты Сьцяпана Батуры і ня выдаў іх новаму каралю. Пераходзячы-ж да адносінаў між ім і Жыгімонтам III, піша:

> Ня толькі я, але і ўвесь народ наш ёсьць у вельмі лёгкім паважаньні ў караля; жыву тут толькі дзеля формы; аўдыенцыі ніяк не магу дабіцца і не хачу больш падноскаў абіваць.

У пісьме з 15 ліпня 1588 г. Сапега, адказываючы на пытаньне Радзівілла, што «кароль здаецца ўжо лепш адносіцца да нашага народу», заўважае скептычна, што ён

> гэтага не абсэрваваў, а наадварот з рэспонсу пану Мінскаму відаць, што кароль жалее таго, што калі-колечы зрабіў ліцьвіну. Не хачу быць pro forma пры двары і ўраду свайго наражаць на зьнявагі, бо ўрадуе камора, а ўраднікі ёсьць непатрэбнымі.

Аднак, ня гледзячы на гэтыя труднасьці, Сапега астаўся пры двары. Узаемаадносіны між Жыгімонтам і Сапегаю зьмяніліся крыху на лепшае, калі паўстала небясьпека вайны з туркамі і татарамі.

---

* У Вялікім Княэьстве.
** Жыгімонт III.

Гэтую небясьпеку выклікаў Жыгімонт III сваей вузка дынастычнай палітыкай. Шукаючы прыхільнікаў, Ваза стараецца зьяднаць сабе Сапегу, ведаючы, што апошні здабываў штораз вялікшы аўторытэт у Вялікім Князьстве.

Як бы ў сувязі з гэтым, Жыгімонт даручае Сапезе важныя справы, датычучыя Вялікага Князьства, і перадусім згаджаецца на ягонае кіраўніцтва працамі над Трэцім Статутам. Прыступаючы да спаўненьня гэтага вялікага заданьня, Сапега меў 31 год, аднак, ня гледзячы на гэткі малады век, абавязкі свае споўніў бліскуча, здабыўшы ўдзячнасьць сучасьнікаў, памяць і хвалу ў патомкаў.

## СТАТУТ ВКЛ

Статут 1588 г. вырас паступова. Ужо на Люблінскім Сойме 1569 г. было пастаноўлена стварыць адумысную камісію, каторая б занялася перапрацоўкай статуту 1566 году, зьмяняючы апошні адпаведна да пактаў Люблінскае вуніі і новага палажэньня Вялікага Князьства.

У склад камісіі ўвайшлі гэткія асобы, выбраныя на Люблінскім Сойме. З рады гаспадарскае ўвайшлі: Валерыян, біскуп віленскі, Мэльхіор Шэмет, кашталян Жамойцкі; да іх назначаны быў сэкрэтаром «доктар абайга правоў» Яўгустын Ротундус, віленскі войт. Ад шляхты ў камісію ўвайшлі прадстаўнікі ад кожнага ваяводзтва Вялікага Князьства Літоўскага — па адным: Мікалай Дарагастайскі, князь Лукаш Сьвірскі, Ян Стэцковіч, Бэнэдыкт Юрага, князь Павал Сакалінскі, Ян Скалка Кірдзей Крычэўскі, Сялецкі, МарцінВаладкевіч.

Да гэтых дэпутатаў ад ваяводзтваў былі прыдзелены два земскія пісары: Андрэй Мачковіч — віленскі і Пятро Станіслававіч — ашмянскі. Працы камісіі адбываліся ў Вільні. На ўтрыманьне дэпутатаў быў вызначаны, аж да сканчэньня працы, асобны падатак, які плацілі толькі грамадзяне Вялікага Князьства (акром украінскіх земляў). Склад камісіі ня быў праз увесь час адзін і тойжа, бо некаторыя сябры паміралі, іншыя зьмяняліся.

Паводле соймавае канстытуцыі, направа Статуту павінна была адбывацца такім чынам, каб дэпутаты ня толькі зьмянілі або зусім выкрэсьлілі спрэчныя з пактамі Люблінскае вуніі артыкулы, але самае права цывільнае Вялікага па магчымасьці зблізілі да права Кароны. Апрацаваны гэткім спосабам Статут павінен быў быць,

паводле тэй-жа Люблінскае ўмовы, перагледжаны і зацьверджаны «супольным» польска-літоўскім Соймам.

Працы камісіі пасоўваліся, аднак, вельмі павольна; і толькі тады, як справа гэта была даручана Льву Сапезе, — праз два гады, пайменна ў 1588 г., статут быў гатовы. Леў Сапега вельмі добра справіўся з сваім заданьнем і ня толькі апрацаваў Статут, але і выдаў яго ўласным коштам і пад асабістым даглядам у 1588 г. у Вільні.



*Вялікая пячатка ВКЛ, якая выкарыстоўвалася ў 1635—1648 гг.*

Выдаючы новы статут, Леў Сапега зламаў пастановы Люблінскага Сойму ў двух найгалаўнейшых кірунках: фармальным і матэрыяльным. Фармальнае зламаньне выявілася ў тым, што Статут 1588 г. атрымаў абязываючую сілу не на падставе пастановы «супольнага» Сойму (як вымагала Люблінская вунія), а на падставе пацьвярджэньня яго гаспадарам Жыгімонтам Вазай асабіста, г. зн. парадкам, які абязываў у Вялікім Княстве Літоўскім пры выдаваньні законаў перад Люблінскай вуніяй.

Апрача гэтага прывілей гаспадара, пацьвярджаючы Статут, быў выданы за аднэй пячацьцю Вялікага Княства Літоўскага, за подпісам гаспадара Жыгімонта III і за змацаваньнем падканцлера Льва Сапегі ды пісара Габрыэля Войны. Гэтым спосабам Сапега выэлімінаваў магчымасьць якіх-колечы фармальных пратэнсіяў з боку Кароны да свае працы.

Матэрыяльнае зламаньне пастановаў Люблінскага Сойму выявілася ў тым, што Трэці Статут ня толькі ня зьліў права Вялікага Княства з польскім, як гэтага дамагаліся палякі ў Любліне, але навет захаваў усе тыя артыкулы, якія выклікалі вялікае абурэньне ў каронных шляхты.

Гэткім парадкам пакінены быў артыкул 3 другога разьдзелу Статуту 1566 г. (у Статуце 1588 г. яму адпавядаў артыкул 4 трэцяга разьдзелу), каторы абязываў гаспадара пільнаваць цэласьці граніцаў Вялікага Княства:

> тэж дабра панства таго Вялікага Княства Літоўскага ня уменшым і то, што будзець цераз не́прыяцеляў таго панства аддалена,

разабрана і ку іншаму панству ад таго панства нашага калікольвек упрошана, то ку ўласнасьці таго Вялікага Князьства прывесьці, прыўлашчыці й граніцы направіці абяцуем; а хаця быхмо тэж каму загранічнікам пры граніцах тых, верху менёных, землі, іменьня, сёлы і людзі далі, тагды таковыя маюць з таго служыці Вялікаму Князьству Літоўскаму, а хтобы не хацеў служыці, таковых прывілеяў ня маем мы і патомкі нашыя дзяржаці.

Гэтак сама пакінуты быў бяз зьменаў артыкул аб раздаваньні ўрадаў, маемасьцяў і староставаў чужаземцам, загранічнікам і суседзям Вялікага Князьства; — усё гэта можна было даваць

толькі Літве, Русі, Жмудзі, родзічам старажытным і ўраджэнцам Вялікага Князьства Літоўскага і тых зямель, таму Князьству прыналежачых.

Каліб хто-колечы, акром Літвы, Русі і Жмудзі, і атрымаў за свае заслугі аселасьць праз наданьне, то ён карыстацца мог толькі ўчыніўшы прысягу ў «вернасьці і жычлівасьці» Вялікаму Князьству, выконваючы адносна да яго ўсе абавязкі, аднак у кожным прыпадку на ніякія ўрады «ані прыпушчоны, ані ад гаспадара ўстаноўлены» быць ня мог.

Падобна да Другога, Статут 1588 году засьцерагае ўжываньне беларускае мовы ўва ўсіх земскіх урадах Вялікага Князьства, кажучы:

[...] а пісар земскі маець па руску ўсе лісты, выпісы і позвы пісаці, а не іншым языком і словы.

Агулам трэба сцьвярдзіць, што Статут 1588 г., апрацаваны ў зусім адменных умовах палітычнага жыцьця Вялікага Князьства, дзякуючы Льву Сапезе, аказаўся прасякнуты тым самым духам, як і Другі, сьпісаны перад вуніяй. Тутака заслугуе на ўвагу яшчэ наступны факт, каторы выразна сьведчыць аб нэгатыўных адносінах Льва Сапегі да Люблінскае вуніі. Пры выданьні Статуту 1588 г. трэба было на пачатку зьмясьціць *pacta* Люблінскае вуніі і іншыя пастановы, каторыя тварылі г. зв. права публічнае Вялікага Князьства.

Дзеля таго аднак, што пастановы гэтыя па вуніі, як і сам пакт вуніі, былі недагодныя для Князьства, бо абмяжоўвалі яго правы, як самастойнае дзяржавы, Леў Сапега пастанавіў зусім выкінуць іх із Статуту.

Некаторыя польскія гісторыкі называюць гэты паступак Сапегі «magnackim wybrykiem», што зусім было б слушным, калі б стаяць на пункце гледжаньня інтарэсаў Кароны.

Аднак Сапега гэтымі інтарэсамі не кіраваўся, а, ідучы на барацьбу з вуніяй 1569 г., пільна прыслухоўваўся да голасу тагачаснага беларускага грамадзянства і ў першую чаргу радзіўся з магутным радзівіллаўскім дваром, з каторым стараўся падтрымліваць найлепшыя адносіны.

Маючы гэткую падпору, ён і дэцыдаваўся на гэтакае рашучае ламаньне пастановаў вуніі. Гэта ясна бачыцца з яго пісьма да Крыштофа Радзівілла з 15 ліпня 1588 г., у якім Сапега, між іншымі важнымі пытаньнямі, закранае справу выданьня Статуту, пішучы:

> Статут новы загадаў ужо друкаваць па-руску; хацеў-бы яго выдаць і па-польску, аднак, калі-б прышлося de verbo ad verbum яго перакладаць паводле рускіх словаў і сэнтэнцыяў, — вышла-б вельмі «niegrzecznie», а інакш ня сьмею. Ахвотна пачуў бы рады Вашае Міласьці. Прывілеі гэтак сама ахвотна-б выдаў пры Статуце, аднак дзеля таго, што ня ўсе яны нам на руку — у ад-


Статут великого князтва литовского
Отнаяснейшого г[о]с[по]д[а]ря короля его м[и]л[о]сти
Жикгимонта третего на коронацыи
в Кракове выданы : року
҂а ф пи.
Друковано [illegible],
в друкарни дому Мамоничов.
З ласки и привилья короля его м[и]л[о]сти

*Загалоўны ліст друкаванага беларускага арыгінала Статута ВКЛ 1588 г.*

ных пачатак добры, а сяродак дрэнны, у другіх сяродак добры, а пачатак і канец дрэнныя, — не магу здэцыдавацца, ці падабае выкінуць тое, што шкадлівае, ці не.

Працай над Статутам Сапега выказаў ня толькі вялікую здольнасьць і веданьне права, але і вялікі пісьменьніцкі і красамоўчы талент. Аб апошніх пераконваюць пасьвячэньне Статуту гаспадару Жыгімонту III, зьмешчанае на пачатку статуту, і прамова Сапегі ў Сойме, надрукаваная ў тым-жа Статуце. У абедзьвюх гэтых працах Сапега выказаў шмат гэткіх высокіх думак, якія адпавядалі толькі XVIII і XIX стагодзьдзям.

У пасьвячэньні Статуту гаспадару Сапега на першым месцы засьцерагае, што права ў першую чаргу зьяўляецца патрэбным пануючым асобам, каторыя павінны асабліва яго трымацца, бо ў праціўным выпадку яны зробяцца зьненавіджанымі тыранамі, падобнымі да дзікіх зьвяроў, якія патрапяць здаваляць толькі свае «грубыя зьвярыныя пахаці». На пацьвярджэньне гэтае думкі Сапега кажа, што ўжо

> былі тыя часы, Найясьнейшы і Міласьцівы Гаспадару Каралю, калі ў тым зграмаджэньні а паспалітаваньні людзкім, каторае мы рэчаю паспалітаю называем, не правам якім апісаным або статутам, але толькі сваім зданьнем і ўпадабаньнем уладнасьць сваю гаспадары і каралі таго сьвету над людзьмі расьцягалі, але іж частакроць ад прыстойнае свае павіннасьці адступавалі, а на свой толькі пажытак рэчы нацягаючы, а спольнае дабро ўсіх мала дбалі, адтуль то было ўрасло, што людзі брыдзячыся іх панаваньнем і зьверхнасьцю і не гаспадарамі, але тыранамі оныя называючы, на самым толькі статуце і праве апісаным усё бесьпячэнства і добрае рэчы паспалітае засажалі.

Слушнасьць свае думкі пацьвярджае Сапега цытатамі з твораў старадаўных філёзафаў, а ў першую чаргу Арыстотэля, каторы казаў: «там бэльлюа, а панашаму дзікія зьверы, пануець, дзе чалавек паводле ўпадабаньня свайго уладнасьць расьцягаець; а дзе права або статут гару маець, там сам Бог усім уладаець».

Гэтую жыватворчую сілу мае права дзеля таго, што яно зьяўляецца — паводле думкі другога старадаўнага філёзафа: «оным праўдзівым рассудкам а мудрым чалавечага ўмыслу бачэньнем, каторым Пан Бог натуру чалавечую абдарыў» з тэй мэтаю, каб розум і бачэньне гэтае дапамаглі адрозьніць «пачцівыя рэчы ад непачцівых», першыя насьлядаваць, другіх высьцерагацца.

Гэтыя разважаньні Сапегі паказваюць, што пагляды яго згаджаліся з постулятамі пазьнейшае школы натуральнага права, каторая казала, што існуе права абсалютнае, аб'ектыўнае, справядлівае для ўсіх народаў у-ва ўсе часы іхняга існаваньня; трэба толькі пазнаць гэтае права і знайсьці крытэрыум дзеля адрожненьня праўнага ад бяспраўнага.

Права натуральнае мела быць ідэалам, да якога павінна імкнуцца недасканалае права людзкое, перш за ўсё пазначанае для паўстрыманьня небясьпечнае самаволі паасобных людзкіх адзінак. У гэтым сэньсе права, як пэўныя цуглі, паўстрымліваючыя людзей ад бяспраўных учынкаў, патрэбна ня толькі для пануючага, але і для падданых.

Думку гэту Сапега выражае так:

> Леч, іж ня ўсіх так прыроджаньне справіла, абы больш розуму аніжэлі маетнасьцей сваіх а бэстыяльскіх папудлівасьцей насьледаваці мелі, — тое ўдзіла або муштук на зухвальцы Пан Бог і права яго сьвятое ўлажыла, абы тыя за неучцівыя справы свае слушнае караньне, а цнатлівыя прыстойную заплату аднасілі.

Праўны парадак у дзяржаве ёсьць зарукай і фундамэнтам яе дзяржаўнага ладу, бо, паводле Сапегі, толькі там «панствы і каралеўствы стаяць і ў цэласьці сваей захаваны бываюць, дзе ліхія помсту, а добрыя заплату адносяць». Моцнага права ўласнае дзяржавы і непашаны яго дамагаюцца толькі тыя, для каторых «свая воля міла а розум ім непрыяцелем».

У канцы, Сапега, паклікаючыся на прыклады із старадаўнае гісторыі, праводзіць думку, што навет найгоршае права ёсьць лепшым ад неабмяжованага панаваньня аднае асобы. З гэтага гледзішча Сапега апраўдывае ўзрастаўшае пашырэньне правоў шляхты коштам улады гаспадара.

Другі твор Сапегі — прамова на Сойме з прычыны выданьня Статуту, — хоць і паўтарае часткова думкі, выказаныя ў папярэдняй працы, аднак, з увагі на тое, што тутака Сапега зварачаецца не да гаспадара, а да шляхты, ён зьмяшчае шмат новых паглядаў, больш дакладна характэрызуючых праўную псыхіку Сапегі, яго глыбокую эдукацыю, нязвычайную справядлівасьць і перадусім яго нацыянальны воблік.

Дзеля таго, што прамова гэтая зьяўляецца найпрыгажэйшым прыкладам беларускага красамоўства канца XVI ст., а таксама з увагі на яе будову і зьмест, падаем яе поўнасьцю.

2 Зак. 2403

Абачывалі то ўсіх вякоў людзі мудрыя, што ў каждай рэчыпаспалітай чалавеку пачціваму нічога ня маець быці дарожшага над вольнасьць, а няволяй так ся маець гыдзіці, што ня толькі скарбамі, але і сьмерцю яе ад сябе адганяці павінен. А пра гэта людзі пачцівыя ня толькі маетнасьці, але і горлаў сваіх проціў кождаму непрыяцелю выносіці не жалуюць, абы пад іх акрутнае панаваньне ня прыходзілі, а з вольнасьці сваей будучы злуплены, водлуг волі і мысьлі іх, яко нявольнікі, ня мусілі жыці.

Але ўжо мала-б і на тым было, каб чалавек, з няволі ад пастароннага непрыяцеля быў волен, а дамовага непрыяцеля над сабою цярпеці мусіў-бы.

Тагды тот мунштук або ўдзіла на пагамаваньне каждага зухвальца ёсьць вынайдзена, абы ся, баючы права, ад каждага гвалту і збытку пагамаваў, а над слабшым і худшым ня паствіўся і ўціскаці яго ня мог. Бо для таго правы пастаўлены, абы можнаму і патужнаму ня ўсё было вольна чыніці, а як паведзіў Цыцэро, іж естэсьмо нявольнікамі праў для таго, абы вольнасьці ўжываці маглі.

А есьлі чалавеку пачціваму нічога нет мільшага над тое, калі ў айчыне сваей бясьпечна мешкаючы, не баіцца, абы яго хто на добрай славе змазаці, або на целе і на здароўі яго абразіці, або на ўласнай маетнасьці яго укрыўдзіці мог, тагды то нічому іншаму, адно праву, прычытаці маець, за каторым ад каждага ў пакою сядзіць і жаднага ўсільства абэлжаньня і ўкрыўджаньня на сабе не паносіць. Бо той цэль і скутак усіх праў ёсьць і маець быць на сьвеце, абы кажды *добрую славу сваю, здароўе і маемасьць* у цэласьці меў і на тым жаднага ўшчэрбку не цярпеў.

*І то ёсьць наша вольнасьць*, каторай мы межы іншымі народы хрысьціянскімі хвалімся, *што пана, іж-бы водле волі сваей*, а не водле праў нашых панаваў, *над сабой ня маем* і як славы учцівае, так жывата і маетнасьці вольна ўжываем. Бо хто-бы колечы з тых трох рэчаў у чым нас укрыўдзіці і водле ўпадабаньня свайго, а ня водле праў нашых, над намі паствіцца меў, тот бы ўжо ня панам нашым, але сказіцелем праў і вольнасьцяў нашых быў, а мы бы нявольнікамі яго быці мусілі.

І слушна за праўду маем, за што Пану Богу дзякаваці, што пад панаваньнем каралёў іх міласьцяў і вялікіх князёў паноў нашых, тую ўладу і вольнасьць у руках сваіх маем, а правы самі сабе творачы, яко найбольш можам вольнасьці сваей ва ўсім пасьцерагаем; бо ня толькі сусед а спольны наш абываталь у айчыне, але і сам га-

спадар, пан наш жаднае зьверхнасьці над намі зажываці ня можаць, адно толькі, сколькі яму права дапушчаець.

Пра то маючы таковый скарб у руках нашых, каторый жаднаю сумаю праплачаны быці ня можаць, прыстоіць каждаму пачціваму чалавеку, абы а нём ведаў, а будучы добра ведамый, як сам сябе і папудлівасьці свае гамаваў і водле права пісанага справаваўся і нікога ня крыўдзіў, так, есьлі бы ад каго быў укрыўджаны, абы ведаў, дзе абароны і лякарства ў крыўдзе сваей іскаці маець.

Бо яко адзін сэнатар рымскі другога штрафаваў, што права айчыны свае ня ўмеў, так кажды абываталь годны ёсьць наганеньня, каторый вольнасьцю хваліцца і праў сваіх умеці і разумеці ня хочаць, каторым правам усю вольнасьць сваю абвараванай маець. *А есьлі катораму і народу ўстыд праў сваіх ня ўмеці, пагатовя нам, каторыя ня обчым якім языком, але сваім уласным правы сьпісаныя маем і каждага часу чаго нам патрэба ку адпору ўсякае крыўды ведаці можам.*



Артыкулы 1 і 2
Статута ВКЛ 1588 года

А іж тая труднасьць ня мала заважыла, што ня кажды статут мог меці для труднага і доўгага перапісываньня, — тады і ў тым тэй патрэбе каждага абываталя фальгуючы і пажытку рэчы паспалітае служачы, важыўся гэтую працу на сябе падняці, а кошту і накладу свайго не жалуючы, у друк падаў і дарогу мацнейшую і снаднейшую каждаму ку ведамасьці права паказаў. А гды то ўжо ў руках сваіх кажды, калі захочаць, мець можаць, прашу: *рачце-ж ваша міласьць* тую працу ад мяне ўдзячна прыняці, а маючы вольнасьці свае правам добра

абвараваньня, *таго пасьцерагаці*, абы вы да судоў і трыбуналаў ня толькі людзей добрых а тых праў нашых добра умеетных абіралі, але баячыхся Пана Бога і цнатлівых, каторыя бы не для пажытку свайго ані ку шкодзе бліжняга, для лакомства свайго і для падаркаў, права выкручалі, але простым трыбам ідучы, сьвятой праўды і справядлівасьці пасьцерагалі, а тую вольнасьць, каторай цешымся, уцэласьці нам захавалі.

Як бачым, за найвялікшае дабро грамадзян дзяржавы Сапега ўважае вольнасьць. Бараніць адпаведна свае вольнасьці грамадзяне патрапяць толькі тады, калі сярод іх будзе пашырана веданьне права і адсюль сьвядомасьць правоў і абавязкаў. А калі якому-колечы народу — кажа Сапега — сорамна ня ведаць уласнага права, дык пагатовя ганебнай ёсьць рэччу ня ведаць свайго права грамадзянам Вялікага Князьства, каторыя маюць права пісанае ня ў чужой мове, а ў сваей уласнай.



*Палац Галоўнага Трыбунала ВКЛ у Ніжнім замке. Вільня. 1835 г.*

Апошнія словы Сапегі маюць для сучаснага дасьледчыка беларускае культуры і гісторыі нязвычайную вартасьць дзеля выяўленьня характару культуры Вялікага Князьства Літоўскага з гледзішча нацыянальнай яе прыналежнасьці, — тым болей, што словы гэтыя сказаны былі вуснамі найвялікшага прадстаўніка гэтае культуры.

Як ведама, г. зв. «руская» мова Літоўскіх Статутаў ёсьць мовай беларускай, Літоўскія Статуты былі пісаны па-беларуску. Гэткім парадкам Сапега лічыў *уласнай мовай* — і пры гэтым ня толькі сваей, але і ўсяго грамадзянства Вялікага Князьства, — мову Трэцяга Статуту, значыць — *беларускую.* А калі ўзяць пад увагу, што аб нацыянальнай прыналежнасьці гэтак высака культурнае адзінкі, як Сапега, перадусім дэцыдавала і дэцыдуе тая мова, каторую ён сьведама, з пашанаю і любоўю называў уласнаю і правоў каторае гэтак старэнна бараніў, — дык трэба прыйсьці да вываду, што *Сапега,* паводле цяперашняе тэрмінолёгіі, *залічаў сябе сам да беларускае нацыянальнасьці.*

З другога боку ведама, што Сапега — за прыкладам сваіх сучасьнікаў — называў сябе «ліцьвіном», а народ свой, які гутарыў мовай беларускай, «літоўскім». Дык з гэтага сам сабой выплывае лёгічна бясспрэчны вывад, што назовы «ліцьвін», «літоўскі» былі нічым іншым, як *гістарычнымі* назовамі беларускага народу.

Упарадкаваньнем пісанага права і выданьнем Статуту Сапега здабыў для сябе шчырую ўдзячнасьць сучасьнікаў, каторыя не шкадавалі яму заслужоных пахвалаў, а тагачасныя пісьменьнікі называлі яго «айцом айчызны» і літоўскім Салёнам. У 1589 г. Сапега заняў найвышэйшае ў сваей дзяржаве становішча канцлера, якое перад ім займаў Крыштоф Радзівілл.

Абгаварваючы справу ўпарадкаваньня Сапегаю пісаных законаў Вялікага Князьства, трэба ўспомніць яшчэ адзін факт, які меў месца перад выданьнем Статуту і знаходзіўся ў цеснай сувязі з арганізацыяй судоў у Вялікім Князьстве. Гэтым фактам было ўтварэньне Літоўскага Трыбуналу*, які паўстаў у 1581 годзе (на 11 гадоў пазьней, чым у Кароне), дзякуючы ў вялікай меры стараньням Льва Сапегі, каторы хацеў бачыць судоўніцтва Вялікага Князьства незалежным ад Кароны.

Трыбунал быў найвышэйшай апэляцыйнай інстанцыяй у справах цывільных і складаўся з дэпутатаў сьвецкіх, выбіраных праз соймікі, і духоўных, высыланых капітуламі (выключна дзеля справаў касьцельных). Сябры Трыбуналу выбіралі маршалка, які кіраваў працамі Трыбуналу. Трыбунал меў свае кнігі, у якія сьпярша земскі пісар таго павету, дзе адбывалася сэсія, а пасьле асобны трыбунальскі пісар упісваў усе акты ў мове беларускай («рускай»).

Пачаткова Трыбунальскія Суды адбываліся ў чатырох местах: Вільні, Троках, Наваградку і Менску. Пазьней — ад 1588 году, за

* Для земляў этнаграфічна ўкраінскіх быў устаноўлены асобны Трыбунал у Луцку.

згодаю ўсіх станаў Вялікага Князьства, сэсіі Трыбуналу адбываліся толькі ў двух местах: Вільні (куды перайшлі справы, разгляданыя раней у Троках), і Менску або Наваградку (па чарзе). На сэсіі ў Вільні разглядаліся справы наступных ваяводзтваў: Віленскага, Троцкага, Полацкага і зямлі Жамойцкае. На разгляд справаў кожнага ваяводзтва прызначаліся тры тыдні, і толькі справы Полацкага ваяводзтва разглядаліся ў працягу двух тыдняў.

У Менску або Наваградку трыбунальская сэсія пачыналася цераз 22 тыдні пасьле Вялікадня, прычым справы кожнага ваяводзтва (менскага і наваградзкага) разглядаліся ў працягу трох тыдняў.

Характэрна, што Літоўскі Трыбунал быў устаноўлены толькі для земляў этнаграфічнае Беларусі, бо зямля Жамойцкая (этнаграфічная Літва) мела свой асобны трыбунал у Росенях, аднак з яго не карысталася і ў 1588 годзе дабравольна паддала свае справы Літоўскаму Трыбуналу. Гэткім парадкам зьнік асобны Трыбунал для Жамойцкае зямлі, каторая ад 1588 году пасылала сваіх трох дэпутатаў у Трыбунал Літоўскі. У сувязі з паўстаньнем Літоўскага Трыбуналу, Сапега ў 1616 годзе выдаў працу «А спосабе абароны трыбунальскіх правоў».

## САПЕГА І РЭЛІГІЙНАЯ ВУНІЯ

Выданьне Трэцяга Статуту і ўвядзеньне Трыбуналу былі першымі вялікімі крокамі Сапегі ў галіне ўпарадкаваньня ўнутраных адносінаў Вялікага Князьства. Наступнай галінаю ўнутранага жыцьця Вялікага Князьства, у каторай выявілася ня менш кіпучая дзейнасьць Сапегі, была справа ўпарадкаваньня хаосу рэлігійных адносінаў, які паўстаў на Беларусі з хвілінаю ўвядзеньня царкоўнае вуніі 1595 году.

Нажаль, у гэтай галіне інгерэнцыя Сапегі ня мела вялікшых рэзультатаў, бо было шмат іншых дзейнікаў, параліжаваўшых шляхотныя імкненьні Сапегі. У дадатку Вялікі Канцлер зрабіў сам тут памылку, дапамагаючы вуніі ў часе яе тварэньня, хоць кіраваўся самымі шляхотнымі, як з пункту гледжаньня агульна-людзкага, так і інтарэсаў беларускага народу, думкамі. Памылку гэту Сапега пазьней сам зразумеў, вельмі яе жалеў, аднак паправіць яе, ня гледзячы на сваё жаданьне, ня мог. Усё-ж справа ўдзелу Сапегі ў рэлігійным жыцьці Вялікага Князьства мае для беларускае гісторыі вялізарнае значэньне, бо яна выясьняе ролю магутнае пастаці Сапегі ў ратаваньні сваей айчыны ад тае агоніі, у якой яна апыну-

лася ў выніку бязупынна трываўшае рэлігійнае вайны між дзьвюма часткаміаднаго і таго-ж народу.

Гэтая роля Сапегі ўвідочніцца лепш на агульным фоне тагачасных рэлігійных адносінаў у Эўропе і Вялікім Князьстве Літоўскім, дзеля чаго і трэба ўдзяліць крыху месца дзеля намаляваньня гэтага фону.

Што рэлігійная проблема ня толькі ў сярэднявеччы, але і ў новыя вякі адыгрывала вялікую ролю ў жыцьці народаў Эўропы, а ў тым ліку і беларускага народу, — факт знаны. Аднак, калі ў сярэднявеччы рэлігія займала дамінуючае палажэньне ў параўнаньні з дзяржаўнымі інтарэсамі паасобных краін і народаў, дык у новыя вякі скончылася служэньне паасобных нацыяў інтарэсам рэлігіі, і амаль ува ўсей Эўропе пачалося імкненьне да падпарадкаваньня рэлігіі інтарэсам народным або дзяржаўным. Пачаліся запраўдныя войны з унівэрсальным каталіцкім касьцёлам, ведзеныя ў імя пагарджаных дагэтуль нацыянальных ідэалаў.

Аднак, гэтыя войны не аслаблялі значэньня рэлігіі, як магутнага дзейніка духовае культуры. Дык зусім натуральна, што ў новыя вякі — эпоху крысталізацыі паасобных нацыянальнасьцяў у сяньняшнім разуменьні гэтага слова, нацыянальнасьцяў, каторыя стаўлялі сабе азначаныя мэты і да зьдзейсьненьня іх імкнуліся перадусім, — у палітычных павадыроў гэтых нацыянальнасьцяў выяўляецца імкненьне да выкарыстаньня рэлігіі дзеля нацыянальнага ўсьведамленьня і аб'яднаньня народаў.

Амаль у кожнай дзяржаве, збудаванай на прынцыпе нацыянальнае адзінасьці, пачаліся спробы *нацыяналізаваньня* касьцёлу. Часамі ролю нацыянальнага касьцёлу адыгрывала новае веравызнаньне; часамі — тое-ж рымскае каталіцтва, нягледзячы на свой унівэрсалізм.

Апошняе мела месца, да прыкладу, у Польшчы. Даволі сягнуць да гісторыі Польшчы і прыпомніць сабе тое значэньне ў аформленьні нацыянальнага ўсьведамленьня польскага народу, якое згуляла рымскае каталіцтва, стаўшыся, пасьле барацьбы з рэфармацыяй, запраўднай польскай нацыянальнай рэлігіяй. Хопіць спыніцца над жыцьцём і дзейнасьцю выдатнага польскага ксяндза-патрыёты Пятра Скаргі, каб зразумець, як гэты прадстаўнік польскага нацыянальнага касьцёлу цесна лучыў пытаньні нацыянальныя з інтарэсамі рэлігіі. Лучэньне гэтае ішло так далека, што — паводле Скаргі — у межах даўнае Рэчыпаспалітае кожны паляк павінен быў быць каталіком і — наадварот. І хоць Скарга не абараніў Поль-

шчы ад пазьнейшых разьдзелаў, аднак ягоны ўплыў на выпрацоўку польскага нацыянальнага сьветапагляду быў колёсальны.

А вядома, што рымска-каталіцкі касьцёл у Польшчы, як касьцёл нацыянальны, меў многа другіх прадстаўнікоў, каторыя, падобна Скарзе, хоць з меншым красамоўствам і слабейшай аргумэнтацыяй, будзілі ў польскім народзе пачуцьцё ўласнае годнасьці, патрыятызму, але побач з гэтым і рэлігійны фанатызм дый нетолеранцыю да інакш веруючых. Калі-ж яшчэ ўзяць пад увагу глыбокую рэлігійнасьць польскага народу, дык ясным станецца значэньне, якое мела выкарыстаньне ўплываў рымска-каталіцкае веры ў кірунку паглыбленьня польскіх нацыянальных ідэалаў.

Умовы рэлігійнага жыцьця на Беларусі склаліся зусім інакш, чымся ў другіх народаў Эўропы, патрапіўшых стварыць свае нацыянальныя касьцёлы. На Беларусі адразу выступілі адна проці аднае дзьве магутныя рэлігійныя сілы — усходняя праваслаўная царква і заходні рымска-каталіцкі касьцёл. Найменшае іскры было даволі, каб паміж імі пачалося змаганьне не на жыцьцё, а на сьмерць.

Аднак, палітычныя абставіны на Беларусі зложыліся гэтак, што гэнае іскры ня было аж да 1595 году. Да гэтага часу рэлігійнае жыцьцё беларускага народу аформілася перадусім у рэлігійнай толеранцыі, самай шырокай і шляхотнай, якая калі-колечы была ведама цывілізаваным народам.

Прыпомнім сабе, што ў тыя часы, калі на Захадзе адбываліся бартламееўскія ночы і рэлігійныя войны, калі Пётр Скарга шырыў у суседняй краіне глыбокую нетолеранцыю і ненавісьць да інакш веруючых, на Беларусі шляхта і перадусім магнаты, бяз розьніцы рэлігійных пераканаsuccessfully, уласным коштам будавалі сьвятыні *розных вераў* і, уміраючы, адказывалі на іх карысьць маемасьці.

Багаты каталік будаваў і абдорываў ня толькі касьцёлы, але і цэрквы, праваслаўны — ня толькі цэрквы, але і касьцёлы. Аб гэтым сьведчаць захаваныя ў множстве да сяньняшняга дня тэстамэнты з тых часоў. У духу гэтакай рэлігійнай толеранцыі ўзгадаваліся найвыдатнейшыя прадстаўнікі беларускага народу, у іх ліку — і Леў Сапега. І толькі гэтай атмасфэрай рэлігійнае цярпімасьці можна вытлумачыць тую нязвычайную ў разгляданую эпоху, ня маючую сабе роўнай, шляхотнасьць пагляда ў на рэлігійныя проблемы Льва Сапегі.

Як убачым ніжэй, думкі, выказаныя Львом Сапегай у рэлігійных пытаньнях, знайшлі сваё аформленьне і здабылі права на існаваньне пасьле нязьлічоных людзкіх ахвяраў толькі ў XIX ст.

Аднак, трэба сцьвярдзіць, што рэлігійная толеранцыя на Беларусі, побач з узгадаваньнем шляхотнасьці паглядаў у рэлігійных пытаньнях, мела і свой ад'емны бок: яна выклікала хаос у рэлігійных адносінах. Кожная рэлігійная навінка мела тутака права на жыцьцё. Прыхільнікі кожнае рэлігіі закладалі ўласныя друкарні, выдавалі ня толькі неабходныя багаслоўскія кнігі, але і палемічныя творы.

Гэтакае зьявішча спрычынілася паволі да выялавеньня беларускай дзяржаўнай думкі, бо скіравала яе на шлях абстракцыйна-тэорэтычных разважаньняў аб лепшасьці догматаў паасобных рэлігіяў, а аддаляла ад найбольш істотных інтарэсаў беларускага народу. Ня было мовы аб тым, каб якая-колечы з існаваўшых на Беларусі рэлігіяў, а перадусім праваслаўе або каталіцтва, сталася запраўднай нацыянальнай царквой так, як гэта было на Захадзе і ў Польшчы, бо ніводная з іх не пачувалася да абавязку прыняць на сябе адказнасьць за ўзгадаваньне народу ў нацыянальным духу.



*У 1596 г. Леў Сапега заснаваў у Ружанах драўляную святыню ў гонар Святой Тройцы. У 1615—1617 гг. касцёл перабудаваны ў камяні. Сучасны выгляд*

Пры гэткіх умовах рэлігійнага жыцьця, панаваўшых на Захадзе і на Беларусі, абаснаванымі былі імкненьні да стварэньня нацыянальнага беларускага касьцёлу. І вось найвыдатнейшыя прадстаўнікі народу шукалі спосабаў стварэньня гэткага касьцёлу, маючы не ўвазе

ягоны магутны ўплыў на нацыянальнае ўсьведамленьне народу. Мікалай Радзівілл Чорны, пашыраючы рэфармацыю ў Вялікім Князьстве, рабіў гэта з тэй мэтай, каб зрабіць кальвінізм нацыянальнай рэлігіяй і адгарадзіцца гэткім чынам і ад каталіцкае Польшчы, і ад праваслаўнае Масквы.

Спробы яго, аднак, скончыліся няўдала, бо ён, прымушаны сілай абставінаў апірацца ў сваёй дзейнасьці на рэфарматараў-палякоў, спрычыніўся толькі да палёнізацыі беларускіх земляў: польскія рэфарматары, друкуючы сваю рэлігійную літэратуру, рабілі гэта ў польскай мове.

Гэтакай-жа спробай заснаваньня нацыянальнага касьцёлу на Беларусі была і рэлігійная вунія 1595 г. у вачох Льва Сапегі і іншых беларускіх мужоў, якія ёй дапамагалі. Нейкая агульная сынтэза існаваўшых на Беларусі рымска-каталіцкае і праваслаўнае веры, а ў далейшым — заходняе і ўсходняе культуры, была неабходнай дзеля таго, каб ня даць перамогі аднэй з іх і гэтым самым недапусьціць да ўтраты Беларусяй сваей нацыянальнасьці на карысьць Масквы ці Польшчы. Дзеля гэтага ідэя вуніі знайшла спогад у Льва Сапегі, які, нядаўна зьмяніўшы кальвінства на каталіцтва, аказаў ёй на Берасьцейскім сынодзе 1595 г. сваё падтрыманьне.

Аднак, адзначаючыся можа лішне вялікім рэлігійным індыфэрэнтызмам, а хутчэй — будучы перадусім глыбокім толерантам, недапушчаўшым навет думкі аб перасьледаваньні аднае рэлігіі другой, Леў Сапега не ўсьведамляў сабе тых сродкаў, якімі вунія будзе пашырацца сярод народу, і тых сумных вынікаў, да якіх яна ў рэзультаце давяла. Гэта ясна бачыцца з яго пісьма да полацкага арцыбіскупа Язафата Кунцэвіча з 22.III.1622 г. (тэкст яго падамо ніжэй), у якім Сапега, выказаўшы сваё ўжо нэгатыўнае адношаньне да вуніі, хоць і не выракаючыся факту дапамаганьня ёй, сцьвярджае з горыччу, што ён ніколі ня думаў, «каб вунія пашыралася гэткімі гвалтоўнымі і згубнымі для народу спосабамі».

Гэтая глыбокая горыч Льва Сапегі для нас тым больш зразумелая, што, як ужо сказана, пачаткова угледаўся ён на вунію, як на беларускі нацыянальны касьцёл, ускладаў на яе вялікія надзеі і аказаў ёй сваю дапамогу, кіруючыся ў гэтым не абстракцыйнымі рэлігійнымі мэтамі, не карысьцю рымска-каталіцкага касьцёлу, як кароль Жыгімонт і езуіты, а тым больш не інтарэсамі Польшчы, як Пётр Скарга, польскія езуіты і наагул палякі, дапамагаўшыя вуніі, — а выключна толькі любоўю да ўласнага народу і краю, пазбаўленага такое важнае ўласнае крыніцы духовае культуры,

якой была нацыянальная рэлігія з гледзішча яе ўплываў на будову нацыянальнага сьветапагляду.

Рэлігійная вунія 1595 г. не апраўдала ускладаных на яе Львом Сапегай надзеяў, бо, з аднаго боку, зьнішчыўшы рэлігійную талеранцыю, якая панавала на Беларусі, вунія ня сталася беларускім нацыянальным касьцёлам, а з другога — вунія, дзякуючы ўзьнятай ёй унутранай рэлігійнай вайне ў лоне беларускага народу, давяла яго да такога духовага заняпаду, што ён пачаў выбірацца з гэтага заняпаду — і то напоўсьвядома — толькі ў пачатках XIX стагодзьдзя.

З трох найвыдатнейшых дзеячоў вуніі* мы спынімся над мэтадамі і дзейнасьцю Язафата Кунцэвіча, бо між ім і Львом Сапегай паўстала колізія і змаганьне.

Язафат Кунцэвіч выступае на арэну рэлігійнага змаганьня за вунію ўжо ў 1600 г., калі, толькі-што высьвячаны на ксяндза, ён бліснуў сваімі казаньнямі, прыдбаўшымі яму імя «душахвата» ў праваслаўных. Вядучы нязвычайна суровае жыцьцё, спрыяўшае разьвіцьцю рэлігійнага фанатызму, Кунцэвіч ужо ў гэтым часе адзначаўся сваей нетолеранцыяй у адносінах да праваслаўных. І калі навет у 1614 г. ён заняў становішча архімандрыты манастыра сьв. Тройцы ў Вільні, дык, хаця адміністрацыя манастыра, яшчэ беднага, але меўшага ўжо шмат манахаў, адбірала ў яго шмат часу і чыніла нямала клопатаў, Кунцэвіч ні на хвіліну ня спыняецца ў зьдзейсьняньні свае галоўнае мэты — наварачаваньня праваслаўных на вунію ў Вільні і па-за Вільняй, часта з небясьпекаю для ўласнага жыцьця.

Дзякуючы бязупыннай працы Кунцэвіча над пашырэньнем вуніі, хутка пачалі выяўляцца плады яе. Ваявода полацкі князь Міхал Друцкі-Сакалінскі і ваявода наваградзкі Тодар Скумін-Тышкевіч пакідаюць праваслаўе і пераходзяць на вунію. Яшчэ раней, дзякуючы Кунцэвічу, навярнуліся да вуніі Мялешкі і Трызны.

Характэрна, што Тышкевіч — яшчэ за Рагозы — быў, пад уплывам князя Канстантына Астрожскага, праціўнікам вуніі і казаў: «як жа я маю вучыцца цэрамоніяў лацінскіх, калі па лаціне ня ўмею?» Здабыцьцё шляхты для вуніі фактычна азначала і здабыцьцё сялянства, каторае рэдка мела ўласнае перакананьне і пераважна ішло за панамі.

* Апрача Кунцэвіча вялікія заслугі для справы вуніі палажылі: Іпаці Пацэй, даўшы ёй праўныя асновы, і Вэльямін Рутскі, стварыўшы ўнутраную арганізацыю новага касьцёлу.

З надыходам 1617 г. амаль уся Вільня была вуніяцкай. Такжа і на правінцыі было нямала асяродкаў яе. У гэтым жа часе Кунцэвіч быў назначаны коад'ютарам арцыбіскупа полацкага з правам наступства.



*Касьцёл Адшуканьня Сьв. Крыжа і кляштар бэрнардынаў у Гародні на малюнку Н. Орды. Фундатар касьцёла — Леў Сапега*

Насяленьне Беларусі прыняло даволі спакойна вестку аб номінацыі Кунцэвіча. Ня было тутака яшчэ ані агітатараў, ані брацтваў (за выняткам Магілёва) — галоўных вогнішчаў бунту супраць вуніі. Насяленьне Полаччыны яшчэ ня было вуніяцкім, аднак спраціву вуніі спачатку не рабіла і даволі пакорна прыняло Кунцэвіча, а навет прыгатовіла яму ўрачыстае спатканьне ў самым Полацку, галоўнай — побач з Віцебскам і Мсьціслаўлем — сядзібе арцыбіскупаў. У гэтым прыняцьці ня толькі люднасьць вясковая і мяшчане, а навет шляхта брала ўчасьце. Перад брамай места быў збудаваны алтар, пры якім Кунцэвіч адправіў малітвы і потым з урачыстай працэсіяй скіраваўся ў старадаўную полацкую катэдру сьв. Зофіі, каб там прыняць абяцаньне паслухмянасьці ад прысутнага пры інтронізацыі духавенства.

Аднак гэты трыумфальны ўезд Кунцэвіча ў Полацак не адбыўся бяз пэўных дыссонансаў*, каторыя былі першай перасьцярогай для новага ўладыкі перад яго пазьнейшымі гвалтамі і нетолеранцыяй — з боку люднасьці, агулам добра яго прыняўшае.

У хуткім часе новы арцыбіскуп распачаў аб'езд сваей дыэцэзіі. Навет у вялікшых местах не спатыкаўся з апорам. Даволі спакойна прыняў яго також Віцебск, хоць Кунцэвіч адразу адчуў, што ў гэтым месьце няма прыязных да вуніі. Толькі Магілёў, у каторым было праваслаўнае брацтва, аказаў зацяты апор новаму арцыбіскупу.

Духавенства і мяшчане ўзьнялі бунт, як толькі Кунцэвіч пад'ехаў да муроў места, і выступілі супраць яго, як непрыяцеля. Брамы места былі зачынены перад новым уладыкай, а люднасьць, азброіўшыся, сабралася на баштах і ў акопах.

Кунцэвіч адступіў, але аб буньце данёс Жыгімонту III, які даручыў справу дасьледаваньня і пакараньня вінаватых Льву Сапезе, ведамаму ўжо ўва ўсім Князьстве сваей справядлівасьцю. Сапега выдаў прысуд сьмерці на правадыроў бунту, але гэты прысуд ніколі ня быў споўнены. Магілёўскія цэрквы аднак былі аддадзены вуніі.

Гэты факт нязвычайна лёгкага здабыцьця дыэцэзіі для вуніі тлумачыцца адно тым хаотычным станам, у якім знаходзілася праваслаўная царква ў Вялікім Князьстве. Гісторыкі рэлігійных адносінаў тае эпохі на Беларусі згодна сцьвярджаюць, што ў разглядаемую эпоху праваслаўная царква была ў стане поўнага ўнутранага заміраньня. Духоўнікі, бяз ніякае эдукацыі, часта няграматныя, ня ведалі навет малітваў. Сярод іх панавала распуста, п'янства, убогасьць матэрыяльная і найдалей сягаючая несубордынацыя. Догматы рэлігіі ня толькі ня былі ведамы шырэйшаму агулу люднасьці, а ў першую чаргу шляхце, але — па залічанымі вынняткамі — і самому духавенству. Зьмест рэлігіі фактычна зводзіўся да выконваньня абрадаў і адмаўляньня малітваў без разуменьня іх сэнсу.

З гэтых прычынаў вунія, хоць догматычна рэлігія адменная, але пакідаўшая абрадавы бок царквы па-стараму, для шырэйшых масаў была фактычна тым-жа праваслаўем. І толькі дзякуючы гэтаму ўнутранаму хаосу вунія нязвычайна шпарка здабывала пра-

* Яшчэ ў часе малітваў перад брамай места адзін палачанін спытаўся ў Кунцэвіча: «Уладыка, ці моцна трымаешся нашае рускае веры?» Іншы ізноў крыкнуў: «Калі прыходзіш да нас з добрым намерам, — вітаемо цябе; калі-ж не, — тады няхайбы ты лепш ніколі не ўваходзіў у Полацак» Гэтыя воклікі паўтарыліся вастрэй, калі ў катэдру сьв. Зофіі разам з Кунцэвічам увайшлі і езуіты.

васлаўныя асяродзьдзі. Але, калі праваслаўныя пачалі спробы арганізацыі царквы, калі ў гэтым кірунку пачалі працаваць штораз больш чысьленыя брацтвы, гуртаваўшыя найбольш дзейныя адзінкі, — толькі тады праваслаўная царква адразу пачула сьмяротную небясьпеку з боку вуніі і распачала рашучае змаганьне.

Гэтакім зваротным годам у жыцьці праваслаўнае царквы быў 1620 год, у якім ерузалімскі патрыярх Тэофан, пазнаёміўшыся па дарозе з Масквы з прычынамі заняпаду праваслаўя ў Вялікім Князьстве Літоўскім, учыніў радыкальныя крокі дзеля яго аздараўленьня.

Перш за ўсё Тэофан устанавіў у кожнай дыэцэзіі супраць вуніяцкага біскупа — праваслаўнага, вызначаючы на гэтыя становішчы найбольш здольныя асобы; другім яго крокам было ўвядзеньне дысцыпліны між духавенствам. Між іншым на арцыбіскупа полацкага ён вызначыў Мялеція Сматрыцкага, мужа вялікіх здольнасьцяў і ня менш вымоўнага за Кунцэвіча. Ад гэтага году праваслаўная царква арганізуецца нанова і распачынае вайну з вуніяй, што выяўляецца перш за ўсё на літэратурным груньце.

Абедзьве рэлігіі ў вялікім ліку выпускаюць адозвы, палемічныя творы і гэтак далей, у якіх узаемна цяжка сябе зьневажаюць і адкрыта падбухторваюць народ да варожых выступленьняў супраць праціўніка.

Дзякуючы гэтай агітацыі, пачалі адпадаць ад вуніі гэтак лёгка здабытыя беларускія месты. Віцебск, Магілёў, Ворша першыя вярнуліся да праваслаўя, а за іх прыкладам адбыліся апостазіі іншых местаў. Навет у Полацку, рэзыдэнцыі Кунцэвіча, быў узбураны настрой.

У часе, калі адбыліся гэтыя першыя страты для вуніі, Кунцэвіч быў на Сойме ў Варшаве. Па атрыманьні вестак аб іх, ён хутка вярнуўся ў Полацак, каб ратаваць палажэньне. Полацак яму ўдалося супакоіць, але затое ў Віцебску падняўся адкрыты бунт. Падбураная агітатарамі Сматрыцкага люднасьць некалькі разоў грамадна зьбіралася перад ратушам і дамагалася адабраньня цэркваў ад вуніятаў і звароту іх праваслаўным. Скончылася тым, што цэрквы былі вернены праваслаўным, а непакорныя духоўнікі-вуніяты былі выгнаны з места. На вестку аб гэтым Кунцэвіч пасьпяшыў у Віцебск, а тымчасам супраць яго паўсталі Магілёў, Ворша і другія месты, а навет у Полацку, скуль ён быў выехаўшы, паўстаў ізноў вялікі фэрмэнт. Суровыя сродкі, тасаваныя Кунцэвічам да непакорных, як замыканьне і апячатваньне цэркваў, забарона прычашчаць і хаваць пакойнікаў і іншыя, не памагалі, а толькі больш узбуралі народ.

Бачучы, як уцякаў грунт з-пад яго ног, Кунцэвіч пастанавіў зьвярнуцца да Жыгімонта III, каб той выдаў унівэрсал да збунтаваных местаў і загадаў-бы ў ім толькі яго, Кунцэвіча, лічыць запраўдным полацкім арцыбіскупам, а Сматрыцкага абвясьціць інтрузам. Жыгімонт III выдаў жаданы унівэрсал. Аднак, навет у Полацку гэтага унівэрсалу не ўдалося прачытаць публічна. Абураная праваслаўная люднасьць грамадой зьбіралася ў часе публікацыі перад ратушам, спыняла чытаньне і варожа крычэла па адрасу вуніі, Кунцэвіча і навет уладаў.

Публічны супакой быў усюды ў небясьпецы. У часе набажэнства здараліся ўзаемныя напады, якія канчаліся звычайна біцьцём царкоўных слуг і разрабленьнем царкоўных скарбаў, як прыкладам у Віцебску, калі там сам Кунцэвіч адпраўляў імшу.

Гэтакі стан рэлігійных адносінаў быў вельмі небясьпечны для Вялікага Княства, бо перадусім выклікаў згубныя ўнутраныя бунты, а па-другое — поўнае зьдзічэньне нацыянальна-дзяржаўнае думкі, кіруючы яе на шляхі бязупыннае і бескарыснае дыскусіі і сварак на рэлігійныя тэмы. У далейшым ён паглыбляў падзел між беларускім народам і пхаў вуніятаў у рукі Польшчы, а праваслаўных — Масквы, скуль кожная частка чакала збаўленьня і дапамогі ў барацьбе.



*Язафат Кунцэвіч (1580—1623). Мастак Антоні Жэрардзі. 1643 г.*

Леў Сапега, як глыбокі патрыёт свае айчыны, ня мог спакойна пазіраць на гэткі ход падзеяў. Ня ўпрыклад іншым, ён адзін стаяў на становішчы адзінства і цэласьці народу бяз розьніцы рэлігійных перакананьняў. Яго інтэрвэнцыя сталася неабходнай, а ў першую чаргу яна выявілася ў тым, што між Сапегай і Кунцэвічам паўстала вострая палеміка. Як высокі ўрадовец, Сапега стараўся поўнасьцю выкарыстаць сваё становішча, каб стрымаць згубную дзеяльнасьць Кунцэвіча.

З свайго боку Кунцэвіч, маючы падтрыманьне Жыгімонта III, езуітаў і ўсяго польскага духавенства ды грамадзянства, выступаў востра проці Сапегі.

З усей перапіскі між імі на гэтым месцы падамо ў скарочаньні знамянітае пісьмо Льва Сапегі да Кунцэвіча з 22 сакавіка 1621 г., якое вельмі добра характэрызуе становішча Сапегі ў рэлігійным пытаньні наагул, а адносна да вуніі асабліва.

Тэкст пісьма гэтакі*.

Нярад удаюся з Вашай Міласьцю ў ліставаньне і спрэчкі; аднак бачучы, як упорна трываеце Вы пры *зданьню* сваім і што ніякія заўвагі ня могуць Вас ад яго адвесьці, мімаволі чуюся прымушаным на беспадстаўнае пісьмо Вашае адказаці. Не пярэчу, што я сам прыкладаў стараньня каля вуніі і пакінуць яе было-б справай неразумнай, аднак ніколі мне ня прыходзіла ў думку, каб Ваша Міласьць уздумала людзей да яе прыводзіць гэткімі гвалтоўнымі спосабамі.



*Мялецій Сматрыцкі (1577—1633), полацкі архіепіскап, беларуска-украінскі пісьменнік і філёлаг*

Вы Вашымі неразважнымі гвалтамі падбурылі і, скажу, прымусілі народ Рускі да апору і зламаньня ўчыненае яго каралеўскай Міласьці прысягі. Трудна Вам пярэчыць гэтаму, бо Вас пераконваюць пададзеныя ад іх найвышэйшым уpраднікам польскім і літоўскім жалабы. Ці-ж Вам няведамы нараканьні неразважнага люду, каторыя даюцца чуць у тым, што яны прагнуць лепш быць у падданстве турэцкім, чымся цярпець гэтакі уціск веры і набажэнства свайго?

Паводле Вашых слоў толькі некаторыя мніхі з эпархіі Барэцкага і Сматрыцкага спраціўляюцца вуніі. Аднак просьба, пададзеная гаспадару і каралю, не паходзе ад некалькіх манахаў, але ад усяго запарожскага войска, якое жадае, каб Барэцкага і Сматрыцкага ў іхніх эпархіях пацьвердзіць, а Вас з іншымі адсунуць. Бяда таму, хто ёсьць лёгкадумным; абставіны гэтыя зусім інакш прадстаўляюцца ў успомненых вышэй жалабах, і неразумна было-б згубным гвалтам ла-

* Пісьмо гэтае было напісана ў беларускай мове. Пасьля было перакладзена на польскую і расейскую мовы. Аўтар пераклаў яго з польскага тэксту, зьмешчанага ў працы Чацкага «O Litewskich i Ruskich prawach», — на беларускую мову, карыстаючыся сучаснай беларускай транскрыпцыяй, але пакідаючы асаблівасьці стылю Сапегі. Ці арыгінал пісьма захаваўся да нашых часоў, гэтага аўтару, нажаль, устанавіць не ўдалося.

мацьгэтак пажаданую згоду, а гэтым самым і належную гаспадару паслухмянасьць. Вы надужыцьцём свае ўлады, кіруючыся хутчэй гультайствам і прыватнай ненавісьцю, чымся любоўю да бліжняга, супраць сьвятой волі і навет забароне Рэчыпаспалітае, былі прычынай і паджогай тых небясьпечных іскраў, каторыя ўсім нам пагражаюць пажарам ці то вельмі згубным, ці то ўсё травячым.

Вы пішаце, што і палітыка мае зьверненую да іх увагу, а я дадам, што ня толькі палітыка, але і ўрад, бо з іхняе паслухмянасьці вялікшыя для краю вынікаюць карысьці, чымся з Вашае вуніі. Дзеля гэтага павінны Вы ўладу сваю і абавязкі духоўніка прытасоўваць да волі гаспадарскае і да намераў ураду, ведаючы, што ўлада Вашая абмежаная і што імкненьні Вашыя, праціўныя супакою і карысьці грамадзянства, справядліва могуць быць уважаны за абражэньне Маестату. Калі-б Вы адважыліся на штось падобнае ў Рыме або ў Вэнэцыі, напэўна-б Вас там навучылі, колькі трэба мець развагі на палажэньне або палітычныя намеры ўраду.

Пішаце аб наварачаваньні на вунію адшчапенцаў і г. д.; запраўды, трэба падумаць аб іх наварачаваньні, дбаючы аб тым, каб была адна аўчарня і адзін пастыр; але ў гэтым трэба пастпаць асьцярожна і разумна, кіруючыся абставінамі часу, асабліва ў нашай айчыне, дзе зусім ня служыць гэная сэнтэнцыя «прымушай іх уваходзіць». Трэба, каб гэтая нашая пільнасыдь і жаданьне агульнага аб'яднаньня апіралася на асновах любові, водле слоў апостала Паўлы. Але бачу, што Вы аддаліліся ад навукі гэтага апостала, і таму нядзіўна, што тыя, каторыя былі пад Вашай уладай, вышлі з належнае Вам паслухмянасьці. Што датычыць небясьпекі, пагражаючай Вашаму жыцьцю, дык можна сказаць: «кажды сам прычынай сваей бяды». Трэба карыстацца з памысных абставінаў, але ня трэба паддавацца неразумнаму захапленьню, асабліва, калі ідзе аб веравызнаньне, бо тады правадыры бываюць выстаўлены на нялічаныя небясьпекі.

«Я абязаны — пішаце — насьлядаваць біскупаў і г. д.» Ёсьць рэччу пахвальнай насьлядаваць сьв. біскупаў, напр. Златавуснага; але насьлядаваць іх трэба такжа ў пабожнасьці, навуцы, цярплівасьці і даваньню добрых прыкладаў. Прачытайце жыцьцяпісы ўсіх пабожных біскупаў, творы Златавуснага, а ня знойдзеце ў іх ані жалабаў, ані пратэстацыяў, працэсаў, спрэчак, позваў на суд аб пераследаваньне, аб скідаваньне з урадаў з асабістых карысьцяў, аб пазбаўленьні жыцьця пабожных духоўных; знойдзеце там толькі тое, што павялічывае славу Божую, асьвету і будову душаў людзкіх і ўласкавеньне Эўдоксіі, гнеўнай на слуг царквы. Вернемся-ж цяпер

да ўчынкаў Вашае Міласьці: у Вас поўныя земскія суды, поўныя магістраты, поўныя трыбуналы, поўныя ратушы, поўныя біскупскія канцэлярыі позваў, працэсаў, пратэстацыяў, чым ня голькі вуніі ўзмоцніць немагчыма, але і апошняя ў грамадзянстве сувязь любові разьбіваецца. «Але, калі — пішаце — неправаверныя на мяне адважна наступаюць, дык я мімаволі прымушаны бараніцца». Запраўды-ж ня гэтак вучыў нас Хрыстос: ён, ведзены на сьмерць, маліўся за сваіх ворагаў, — гэтак і Вашай Міласьці трэба паступаць.

Яшчэ пішаце: «на соймах падносяцца галасы, шкадлівыя ня толькі для вуніі, але і для ўсяго рымскага духавенства». Хто-ж гэтаму вінен? Адна вунія прычынай гэтых усіх няшчасьцяў! Калі гвалціце людзкія сумленьні, калі замыкаеце цэрквы, каб людзі без абедні, без абрадаў хрысьціянскіх, без таенстваў гінулі, як няверныя, калі самавольна надужываеце любові і павагі да гаспадара, дык тады абходзіцеся бяз нас, але калі з прычыны ўціскаў паўстаець у народзе непакой, каторы трэба ўціхамірыць, — тады намі добра дзьверы запхнуць. Таму і праціўная старана думае, што мы з Вамі паразумеліся, каб супольне гвалціць людзкія сумленьні і нарушаць агульны супакой, — чаго ніколі ня было! Сьцеражыце вуніі для сябе і выконвайце спакойна свае абавязкі, не наражаючы нас на агульную ненавісьць, сябе-ж самога на небясьпеку і гэтакі вялікі перад усім народам упадак. «На няпрымаючых вуніі — пішаце — выдаць загад і выгнаць іх з дзяржавы».

Барані Божа! Няхай ня дзеецца ў айчыне нашай гэтакае страшэннае бяспраўе! Даўно ў гэтых гаспадарствах уведзена сьвятая рымска-каталіцкая вера і пакуль ня мела насьлядаўнічкі набажэнства свайго і паслухмянасьці для сьв. Айца, датуль славілася любоўю да супакою і магутнасьцю ўнутры і вонках краю. Цяпер жа, прыняўшы ў *грамадзкасьць* сваю неякую калатлівую і неспакойную таварышку, церпіць з гэтае прычыны на кожным Сойме, на кожным народным сабраньні, на кожным павятовым сойміку шмат якія сваркі і зьнявагі. Здавалася-б, лепш і карысьней для грамадзянства было-б парваць зусім з гэтакай калатлівай таварышкай, бо мы ніколі ў айчыне нашай ня мелі гэтакіх сварак, якія нам прынесла гэтая рознакалёрная вунія. Хрыстос не пячатаваў і не замыкаў цэркваў. «Маюць яны (вуніяты) — кажаце — адпаведных ксяндзоў», дай Божа, каб іх было досыць, але гэтага мала, што Вы самі іх хваліце: уласная хвала заўсёды ёсьць падазронай. Трэба, каб іншаверцы бачылі добрыя ўчынкі іхнія і ішлі за імі па сьцежках іхніх. Аднак, я чуў, якіх Вы

папоў пасьвячаеце, г. зн. такіх, ад каторых царкве больш упадку, чымся збудаваньня здарыцца можа.

Агульна Вам закідаюць, што ў Вас няма адпаведных папоў, а хутчэй поўна сьляпых. Гэтак папы Вашыя цягнуць за сабой народ на згубу. «Аддаваць — пішаце — цэрквы на пасьмешышча і зьдзекі», — але пячатаваць і замыкаць цэрквы і зьдзекавацца над кім-колечы — гэта знача ламаць брацкую аднамыснасьць і ўзаемную згоду. *Па гэтым усім*, няхай мне Ваша Міласьць пакажа, каго Вы прыдбалі, каго зьяднали гэтай сваей строгасьцю, суровасьцю, гэтым пячатаваньнем і замыканьнем цэркваў? І праўды пакажацца, што Вы страцілі навет і тых, каторыя ў Полацку ў Вас былі ў паслухмянасьці; з авечак зрабілі казлоў; сьцягнулі небясьпеку на край, а можа і згубу на ўсіх нас каталікоў. Заместа вясельля прынесла нам Ваша гэтак хвалёная вунія клапоты, несупакойнасьць, нязгоду і так нам зрабілася горкай, што мы прагнулі-б лепш быць без яе, чымся з прычыны яе цярпець непакоі, горыч і дакуку. Вось плады Вашае вуніі. Знамянітай запраўды ёсьць яна прычынай сварак і нязгоднасьці паміж людзьмі і ў краі. Бо калі-б, чаго сьцеражы Божа, айчына наша ўзбурылася (да чаго Вы гэтакую дагодную дарогу сваей суровасьцю паказываеце), ня ведаю, што-б тады з Вашай вуніяй было...

А па гэтым усім гаспадар загадвае цэрквы іхнія распячатаваць і адчыніць, аб чым я Вашай Міласьці пішу. А калі Вы па гэтым маім напамінаньні не адпячатаеце і не адчыніце цэркваў, дык я сам загадаю іх распячатаць і праваслаўным аддаць, каб яны паводле свайго набажэнства ў цэрквах свае абрады маглі-б справаваць. Жыдам і Татарам не забараняецца ў гаспадарствах каралеўскіх мець свае сынагогі і мячыці, а Вы хрысьціянскія пячатаеце цэрквы! З гэтага поваду разыходзіцца ўжо ўсюды пагалоска, што яны прагнуць быць лепш у няверных Туркаў у падданстве, чымся цярпець гэтакі уціск свайго сумленьня.

Што датычыць Палачанаў і іншых супраць Вас бунтаўнікоў, дык гэта магчыма, што яны гэтакімі ёсьць. Але Вы самі іх да бунту падбурылі. Былі яны Вам ува ўсім паслушныя, царкву Вашу не пакідалі, але Вы самі іх ад сябе адкінулі. І дзеля гэтага ня хочам больш, каб Ваша толькі для нас згубная вунія да канца нас зьнішчыла.

Гэта мае аб'ясьненьні, каторыя даю на Вашае пісьмо. Жадаю сабе на прышласьць быць вольным ад спораў з Вамі. Прашу толькі Найвышэйшага аб усялякую для Вас памыснасьць і адначасна аб духа лагоднасьці і любові да бліжняга, застаючыся з паважаньнем

*Леў Сапега.*

З гэтага пісьма выяўляюцца пагляды Сапегі на рэлігійную праблему наагул і вунію 1595 г. у асаблівасьці. Выказаны яны гэтак ясна, што асобных камэнтарыяў не патрабуюць. Трэба толькі сцьвярдзіць, што паглядамі на рэлігійнае пытаньне Сапега апярэдзіў сваю эпоху на соткі гадоў і зьяўляецца прыкладам справядлівасьці і запраўднае толеранцыі. З гэтага гледзішча ён ня мае роўных сабе сярод сучасьнікаў.

Дзеля ілюстрацыі тагачасных паглядаў — і пры гэтым паглядаў найвыдатнейшых людзей — на рэлігійнае пытаньне падамо пісьмо папы Урбана VIII да Жыгімонта III, пісанае з прычыны забойства Кунцэвіча. Пісьмо гэтае, як антытэза паглядам Сапегі, вельмі характэрнае:

> «Устань, устань», — пісаў папа Урбан, — слаўны сваімі перамогамі над туркамі, і з ненавісьцю, якую да цябе жывяць няверныя, вазьміся за аружжа дый, калі збаўленьне людаў гэтага вымагае, нішч агнём і мячом заразу схізмы. Хай сьвятая вунія паднясе галаву.
>
> Чулі мы аб існаваньні схізматыцкіх брацтваў. Хай-жа твая каралеўская павага, каторая павінна быць абаронай веры, зломіць іхнюю апорнасьць. Хвальшывых біскупаў рускіх, каторыя сеюць забурэньні, пакарай сурова паводле заслугаў. Апякуйся вуніяцкімі біскупамі, аблягчы ім доступ да двара і сойму і зраўняй іх з біскупамі лацінскімі.

Успомнім яшчэ, што ў Польшчы, навет пад канец XVIII стагодзьдзя, выдаваліся канстытуцыі, забараняўшыя некаталіком хаваць нябожчыкаў удзень і вязьці іх па галоўных вуліцах.

## СПРАВЫ КАТАЛІЦКІЯ

Але ня толькі справа вуніі і праваслаўнае царквы захапляла ўвагу Сапегі. Цікавіў яго і каталіцкі касьцёл наБеларусі, вызнаўцаў каторага ён хацеў абараніць ад полёнізацыі, якая пашыралася штораз мацней у яго асяродзьдзі. За часоў Сапегі беларуская каталіцкая люднасьць ня была польскай і крэпка трымалася сваей нацыянальнасьці, даючы адпор варожым імкненьням да яе зьнішчэньня. Гэта ясна бачыцца з наступнага факту, у якім Сапега прыймаў значны ўдзел.

У 1590 годзе памёр кракаўскі біскуп. На яго катэдру кароль хацеў назначыць віленскага біскупа кардынала Юрыя Радзівілла. Леў Сапега, даведаўшыся аб гэтым, напісаў да Радзівілла наступны ліст:

Маю ведамасьць, што, па сьмерці Кракаўскага біскупа, вакансію гэту аддаюць Яго Міласьці Кардыналу, біскупу Віленскаму. Я рад служыць Яго Міласьці і ніякай рэчы ня бачу, якой бы паводле думак Кс. Кардынала яму не жадаў.

Але баюся, каб якая з гэтага поваду мутацыя да нас ня ўнеслася і каб не казалі напотым: «а вось літвін быў біскупам кракаўскім, няхай жа будзе цяпер паляк віленскім». Яле каб з гэтага факту ня было ўшчэрбку народу нашаму напотым, дык тады няхай Яго Міласьць катэдры не даходзіць.

Радзівілл згодзіўся прыняць кракаўскую катэдру, але, як і прадбачыў Сапега, кароль зараз-жа вызначыў віленскім біскупам паляка — Мацееўскага. З гэтага поваду канцлер напісаў Крыштофу Радзівіллу ўспомненае вышэй пісьмо наступнага зьместу:

Ані права, ані рацыі нашыя ня могуць вымагчы на каралю, каб зьмяніў свае адносіны на карысьць нашага народу, асабліва каб не вызначаў віленскім біскупам паляка. Я з асобы маёй *даховываю веру Айчыне маей* і ня толькі пячатаваць ня буду таго, што будзе супраць правоў нашых, але і проціставіцца супраць гэтага з вамі разам *буду, каб ня толькі да гэтакіх дыгнітарскіх урадаў, але і да меншых бэнэфіцыяў і навет да дзяржаваў і лясьніцтваў народу нашага ніхто не папераджаў.*

І запраўды Леў Сапега ў дадзеным прыпадку проціставіўся разам з народам і пры гэтым з пазытыўным рэзультатам. Біскупа Мацееўскага, паляка, жыхарства Вільні ня прыняла, дзеля чаго віленская біскупская катэдра засталася неабсаджанай да 1600 году.

Гэта былі найважнейшыя праявы дзейнасьці Сапегі ў галіне ўпарадкаваньня ўнутраных адносінаў у Вялікім Князьстве. З няменшай энэргіяй бараніў Сапега інтарэсаў сваей бацькаўшчыны і вонках, а ў першую чаргу перад Каронаю, якая, асабліва после вуніі 1569 году, імкнулася да гэгемоніі і поўнае інкорпорацыі Вялікага Князьства.

Вышэй было ўспомнена аб нэгатыўным становішчы Сапегі адносна да Люблінскае вуніі. Толькі адна акалічнасьць у вачох Сапегі апраўдавала яе часткова: гэта — неабходнасьць супольнае, у інтарэсах абодвух народаў ляжаўшае, абароны звонку. Гэтую думку Сапега выказаў у лісьце да Крыштофа Радзівілла з 29.1.1590:

Ня мае француская зямля гэтакіх ворагаў каля сябе, як Літва і Польшча; дзеля чаго самі паміж сабой б'юцца і ніхто іх не разводзіць.

Яле нас разьвялі-б хутка: з аднэй стараны турчын, з другой татарын, а з трэцяй масквіцін, а падобна-б і немцы ня спалі.

Гэтак толькі апраўдаваў Сапега вунію 1569 г. Па-за гэтым ідуць ужо тыя асаблівасьці абодвух народаў, каторыя ўсьцяж падкрэсьліваў Сапега і каторыя ўпаважнялі яго казаць: *«Мы і палякі, хоць і брацьця, але зусім адменных звычаяў»**. Абарона гэтых звычаяў у першую чаргу перад Каронай і зьяўляецца вонкавай дзейнасьцю Сапегі. Юрыдычна гэтыя «асаблівыя звычаі» трэба разумець, як тую частку дзяржаўнае самастойнасьці, каторая асталася Вялікаму Князьству пасля вуніі 1569 г. І запраўды Вялікі Канцлер бараніў гэтае самастойнасьці з задзіўляючай энэргіяй і субтэльнасьцю.

Прыкладам можа служыць наступны факт. Льву Сапезе палякі рабілі закіды, што ён забараняе прыймаць недагодныя дзеля яго ўрадаў пратэстацыі. Сапега адказаў, што гэта няпраўда, што пратэстацыі яго ўрадам прыймаюцца, і толькі пратэстацыя шляхціца Гарабурды супраць справаў польскіх, парушаных на Сойме, прынята і ўпісана ня была, што Канцлер апісавае гэтак:

> [...] досыць яму Гарабурдзе пратэставацца ў сваіх справах, а ня супраць усяго Сойму, бо што каму з нас да спраў польскіх, як і мы ня хочам, каб яны аб нашых ведалі.

Запраўды, з пункту гледжаньня дзяржаўных інтарэсаў Вялікага Князьства і правоў беларускага шляхціца прыняцьце гэткае пратэстацыі было немагчымым, бо яна заціраля б існаваўшую юрыдычную розьніцу паміж Вялікім Князьствам і Каронай, нішчыла бы гэныя «асаблівыя звычаі» бацькаўшчыны Сапегі дый была бы крокам да зьліцьця ў адно цэлае дзьвюх палітычна розных частак аднае дзяржавы.

Сапега ўважаў за патрэбнае перадусім бараніць тэрыторыяльную цэласьць Вялікага Князьства, разумеючы гэта ў самым шырокім сэньсе. Леў Сапега пашыраў правы свае бацькаўшчыны на ўсе тыя тэрыторыі, якія калісьці належалі да гістарычнае Літвы.

Па меры адбіраньня беларускіх этнаграфічных тэрыторыяў ад дзяржаў, якія захапілі іх, Леў Сапега дамагаўся бязумоўнага далучэньня іх да Літвы, нэгуючы рашуча ўсе правы да іх Кароны.

---

* Пісьмо да Крыштофа Радзівілла з дн. 5.VI.1588 г. і інш.

Гэтак было з Інфлянцкай зямлёй, якая, дзякуючы хвілёваму па-воджаньню, была адабрана ад швэдаў і адразу інкорпаравана да Рэ-чыпаспалітай Абодвух Народаў. Леў Сапега пісаў па гэтаму поваду Крыштофу Радзівіллу ў лісьце з 12. III. 1585 году:

Выдзерта няпраўна, сілай, невядома як Інфланцкую зямлю на-шаму народу, да якой паляк грошам не прылажыўся праз колькінац-цаць гадоў, і толькі, калі па вялікіх ахвярах нашых прыйшло да кан-ца вайны, тады пан паляк пачаў адбіраць ад нас тыя замкі, што мы за нашы Лукі, Завалачча і іншыя дабылі. А мы *toto nocte laboravimus et nihil cepimus**, аддаўшы на гэта ня толькі ўсе скарбы нашыя, але навет дзеля гэтае зямлі Інфлянцкае, баронячы яе, згубілі нашу зямлю. Палякі-ж ня толькі забралі бясправўна інфлянцкія замкі, але навет і тыя, што народ наш трымаў, як Рыга, Кесь. Гэта страцілі мы дзеля таго, што самі з сабой не прававаліся. Ад шчырага сэрца напісаў гэта.



*Гальшаны. Рэшткі замка.*
*(1-я палова XVII ст.). Сучасны выгляд*

Тое самае было і з землямі, адэбранымі ад Масквы падчас вай-ны 1610—1613 г., як напр. Смаленскай. Сапега 25 сьнежня 1611 г. пісаў да таго-ж Крыштофа Радзівілла:

А паны палякі канстытуцыю напісалі народу нашаму шкадлі-вую і, гэты фундамэнт канстытуцыі залажыўшы, назвалі яго ды-плёмам, прывілей сабе напісалі на Смаленск і на іншыя правінцыі і

---

* ...змагаліся увесь час і нічога не палучылі... (*лац.*)

замкі, што ім дарue кароль усё, што ад Масквы будзе здабыта. Я быў змушаны ўчыніць пратэстацыю супраць гэтае канстытуцыі і супраць гэнага дыплёму, каторую пратэстацыю, хоць у канцэлярыях каронных прыняць не хацелі, а навет палякі забаранілі прыймаць яе гораду, аднак горад прыняў.

А яшчэ раней, адразу па здабыцьці Смаленска, менавіта 30-га чэрвеня 1611 г., з Смаленска Леў Сапега, разгадаўшы імкненьні палякоў далучыць Смаленскую зямлю ўпалове да Кароны, пісаў да Крыштофа Радзівілла, называючы двор «злым торгам», і хацеў навет «асесьці на ральлі, перапрасіць плуг, бо яго ўжо ніхто ня склоніць на дворскую полеўку, якую ён ведае добра».

Тут трэба зацеміць, што Леў Сапега ня толькі бараніў правы свае айчыны да адабраных чужымі дзяржавамі тэрыторыяў, але ўсьцяж дараджываў, як адабраць іх, і ведаючы, што найлепшым спосабам да гэтага ёсьць «жаўнер літоўскі», радзіў у цэлым радзе лістоў да Крыштофа Радзівілла, як напрыклад у лісьце з 13 ліпня 1611 г. у часе вайны за Інфлянты, каб:

> [...] жаўнер наш не аддыхаў, а замачкі ў Інфлянтах займаў і каб перад прыходам кароннага жаўнера займаў іх якнайбольш, бо тады паны палякі ня змогуць нам сказаць, што мы Інфлянты страцілі, калі нямалую іх часьць *ізноў* рэкупэруемо».

А ў адным з папярэдніх лістоў да таго-ж Радзівілла з 22-га сакавіка 1594 г. чытаем:

> Гэтман Каронны зьбірае выбранцаў і мае вока на татараў, каторыя гвалтам хочуць праз Польшчу да Нёмна. Добра-б было, каб і ад нас палякі помач якую мелі, бо трэба-ж братоў ратаваць, тым больш, што і аб нашу ўласную скуру тут ідзе. Бо сьцеражы Бог няшчасьця на іх, ці-ж нам тады ад палякоў не дастанецца! Я калі палякі абойдуцца бяз нашай помачы, тады гэты одыюм узаемнай непрыязьні і ненавісьці, каторы паміж намі а палякамі цяпер кіпіць, яшчэ больш узрасьце і пры нас будзе culpa. Трэба ім памагчы і жаўнерам нашым, а калі-б гэта не магло быць, тады хоць татарамі».

Гэты ліст вельмі характэрны яшчэ і дзеля таго, што ён выразна сцьвярджае стан антаганізмаў, існаваўшы тады між Каронаю і Вялікім Князьствам, а з другога боку ён сьведчыць аб надзвычайнай шляхотнасьці Сапегі, каторы не хацеў, каб яго народ даў повад да паглыбленьня гэтае ненавісьці.



*Гальшаны. Палац Пятра Сапегі. Гіпатэтычная рэканструкцыя*

Аднак ня толькі на дiплёматычным, але i на ваенным полi Сапега бараніў цэласьці Вялікага Князьства. Калі ў 1620-х гадох уварваліся швэды — пад камандай Густава-Адольфа і не без дапамогі Масквы — у межы Вялікага Князьства, Сапега ізноў, нягледзячы на свой 63-гадовы век, станавіцца на абарону краю і адзначаецца ў ваенных дзеяньнях. Пры гэтым ён не ашчаджае сваей фортуны і паносіць вялікія выдаткі на абарону, за што гаспадарства было яму асабліва ўдзячнае.

У гэту цяжкую для Вялікага Князьства пару, калі — апрача вайны — шырылася яшчэ і маравое паветра*, Сапега абняў галоўнае камандаваньне ваеннымі сіламі, як Вялікі Гэтман Літоўскі.

* * *

Пасля вайны Сапега, будучы віленскім ваяводам, спакойна дажываў свой век, працуючы над упарадкаваньнем Мэтрыкі Вялікага Князьства Літоўскага, інакш кажучы — архіву спраў Дзяржаўнае Канцэлярыі Вялікага Князьства Літоўскага, які знаходзіўся пад асабістым даглядам і кіраўніцтвам Вялікага Канцлера Літоўскага. Архіў гэты зьмяшчае арыгінальныя дакумэнты ад XIII стагодзьдзя і копіі дакумэнтаў, выданых з Дзяржаўнае Канцэлярыі, ды мае надзвычайна вялікую цэннасьць дзеля беларускае гісторыі**.

---

* Эпідэмія чумы. — *Рэд.*

** Гэты скарб сяньня раскіданы па ўсей Расеі і Польшчы. Часткі Мэтрыкі знаходзяцца ў Ленінградзе, Маскве, Варшаве (найстарэйшыя акты ад 1386 да 1551 году). Агулам Літоўская Мэтрыка абыймала акты Вялікага Князьства да 1794 году і мела 556 томаў, у якіх у хронолёгічным парадку адзначаны ўсе важнейшыя здарэньні дзяржаўнага жыцьця.

Яшчэ ў 1594 г., у Вільні, канцлер Леў Сапега апрацаваў рэестр дакумэнтаў Літоўскай Мэтрыкі, а пад канец жыцьця ён упарадкаваў гэты архіў, перапісаўшы кнігі нанова.

Акты Мэтрыкі былі пісаны ў беларускай мове, а дзеля таго, што яны абыймаюць стагодзьдзі, можна на аснове іх прасачыць абраз разьвіцьця беларускае мовы.

Незадоўга да сваей сьмерці Сапега атрымаў годнасьць Маршалка Вялікага Князьства і ў гэтай годнасьці, як прадстаўнік дзяржавы, спатыкаў у 1633 годзе новага караля Уладыслава IV. Сапега меў тады 76 гадоў. Праз два тыдні пасьля гэтае сустрэчы ён памер і быў пахаваны ў Вільні ў касьцелі сьв. Міхала, ім жа ўфундаваным. Перад сьмерцяй Сапега багата абдараваў уфундаваныя ім цэрквы і касьцёлы. Пасься яго, аднак, доўга не магло знайсьці супакою. Над



*Гальшанскі замак Сапегаў (рэканструкцыя Сяргея Прышчэпа). Князі Гальшанскія валодалі замкам да 1525 г., а пасьля шлюбу князёўны Алены Гальшанскай з Паўлам Сапегам ён перайшоў ва ўладаньні Сапегаў. Паколькі Сапегі прымалі ўдзел у паўстаньні за адраджэньне Рэчы Паспалітай і Вялікага Князьства Літоўскага 1863 году, расейскі ўрад забраў усю маёмасьць роду ў дзяржаўны фонд, а Гальшаны перадаў расейскаму памешчыку Гарбанёву, які ў 1880 годзе стаў узрываць вежы і гандляваць замкавай цэглай*

ім надругаліся два разы маскоўцы, асабліва ў 1655 годзе, выкідаючы труну на вуліцу.

У асобе Льва Сапегі Вялікае Княэьства страціла апошняга абаронцу сваіх правоў, а беларускі народ — абаронцу свае культуры, мовы і нацыянальнасьці. После сьмерці Сапегі аканчальны заняпад палітычнага і культурнага жыцьця Беларусі зближаўся шыбкімі крокамі, і ўжо ў 1697 г. зьявілася соймавая пастанова, касаваўшая правы беларускае мовы, як мовы ўрадовае, і загадаваўшая земскаму пісару ўсе акты пісаць па польску. Не падлягае сумліву, што факт гэты стаўся бы значна раней, калі б ня было Сапегі.

Дзеяльнасьць Сапегі не ўратавала Вялікага Княэьства і беларускае культуры ад пазьнейшага заняпаду. Тлумачыцца гэта тымі вялікімі супярэчнасьцямі ўнутранага жыцьця Вялікага Княэьства, каторых навет Сапезе, паміма задзіўляючых высілкаў з яго боку, не ўдалося зьнішчыць.

І ўсё-ж такі эпоха Сапегі астанецца назаўсёды ў гісторыі беларускага народу і яго культуры залатой парой, а магутная постаць Вялікага Канцлера будзе ўсьцяж яскравым доказам вялікіх творчых сілаў, укрытых у беларускім народзе. І хаця мінула ўжо 300 гадоў ад дня яго сьмерці, Леў Сапега застанецца назаўсёды для ўдзячных патомкаў узорам мудрага палітыка і дыплёматы ды гарачага патрыёты, прыкладам запраўднае справядлівасьці, несфальшаванае толеранцыі і высокае эдукаванасьці.

## ГАЛОЎНЫЯ КРЫНІЦЫ

Scriptores rerum polonicarum. Tomus VIII: Archivum Domu Radziwiłłów. Krakôw, 1885.

*Ластоўскі В.* Гісторыя Беларускае (Крыўскае) Кнігі. Коўна, 1926.

*T. Czacki.* O Litewskich i Polskich Prawach. Warszawa, 1800—1801.




*Леў Сапега (1557—1633).*
*В. Гондзіус. Сярэдзіна XVII ст.*

ВІТАЎТ ЧАРОПКА

# ЛЕЎ САПЕГА

*Друкуецца па тэксту кнігі В. Чаропка «Уладары Вялікага княства», Мінскк, 2007. С. 329—408*

## НА ПАЧАТКУ ШЛЯХУ

У дзяцінстве ён любіў слухаць аповеды пра жыццё і справы сваіх продкаў. Загараліся вочы захапленнем і гонарам, калі чуў пра славу Сапегаў. А дом Сапегаў на Літве быў зацным:

> Там Бог благославляет, там слава значная, в тым доме зоставанет на веки трвалая[1].

Свой пачатак Сапегі выводзілі ад «роданачальніка князёў літоўскіх» — Віценя. На пахавальным помніку Івана Сапегі радавод дому падаецца так:

> Івану Сымонавічу Сапегу... сыну Сунігайлы Пунігайлавіча Сафіі, троцкага кашталяна, які пры святым хрышчэнні прыняў імя Сымона... унука Пунігайлы Нарымунтавіча, сучасніка Альгерда і таксама кашталяна троцкага, названага па-грэчаску Сафіяй за сваю мудрасць, адкуль выводзяць сваю прозву Сапега ўсе нашчадкі Нарымунтавіча, роднага брата белзскага і падольскага князёў, праўнука Нарымунта Гедымінавіча, пінскага епарха, сына Гедыміна Віценавіча, унука Віценя — роданачальніка князей літоўскіх[2].

У грамаце Жыгімонта Старога знаходзім згадку, што Сапегі былі наступцы «Нарымунта Гедымінавіча, некалі пінскага князя, нашага крэўнага»[3], а ў грамаце Жыгімонта Аўгуста сказана, што род Сапегаў «паводле дакладнага сведчання прывілеяў бацькі і папярэдніка нашага Жыгімонта першага даведаемся, што разам з Рожынскім ёсць з княжат літвінскіх Нарымунтавічаў»[4]. Дык што, Сапегі — нашчадкі Нарымунта? Падобна на праўду, хаця не выключана магчымасць, што і Жыгімонт Стары быў уведзены ў

зман апакрыфічнай генеалогіяй, якую далі яму Сапегі. Выводзілі ж сябе Радзівілы ад яшчэ аднаго князя Нарымунта. Такая ўжо мода існавала тады — падвышаць знатнасць свайго роду і выводзіць яго ад вялікіх мужоў.

Рэальнасць Сунігайлы засведчана яго подпісам пад актам Гарадзельскай уніі. Вядома, што атрымаў ён герб «Ліс», які стаў родавым гербам Сапегаў. Пры хрышчэнні названы быў Сымонам. Але ўзнікае пытанне, калі Сунігайла прыняў каталіцтва, дык чаму ўсе ягоныя нашчадкі праваслаўныя? Можна пагадзіцца, што ўвесь гэты радавод — прамая фікцыя, і прызнаць услед за некаторымі гісторыкамі Сапегаў нашчадкамі смаленкіх баяраў[5]. Прынамсі ў доказ гэтага прыводзяцца звесткі, што Сунігайла не пакінуў дзяцей. А Сапегі, якія разам з многімі родамі карысталіся гербам «Ліс», вывелі сябе ад Сунігайлы. Гэтым і можна растлумачыць тое, што Сапегі не насілі княжацкі тытул.

Сапегі займалі ў дзяржаве высокія пасады. Па сямейнай традыцыі служылі пры двары пісарамі. Падымаліся і да ваяводстваў. Гэтак, Іван Багдановіч* стаў віцебскім ваяводам, а пасля і ваяводам падляшскім. А ягоны сын Іван ажаніўся з княгіняй Багданай з слаўнага роду князёў Друцкіх-Сакалінскіх. У гэтай сям'і і нарадзіўся 2 красавіка 1557 года ў маёнтку Астроўна Віцебскага ваяводства хлопчык, якога хрысцілі па праваслаўнаму абраду і назвалі Леонам.

Нават калі і прыдумалі Сапегі радаслоўную ад Віценя, дык якая тут бяда. Паднялі планку для сябе высока і ніжэй апускацца не дазваляў гонар. Лепшай школы патрыятызму, чым прыклад слаўных продкаў, не прыдумаеш. Юны Лёва ганарыўся іх справамі дзеля Айчыны і не ўяўляў для сябе іншага шляху, як і самому з годнасцю працягваць сямейную традыцыю. Жыццёвым дэвізам для Льва Сапегі стала перакананне:

Не толькі я, але і жыццё маё належыць Айчыне [6].

Гэтак праз сямейную хроніку юны Лёва пазнаваў гісторыю сваёй Радзімы. А пасля навучаўся ў прыватнай школе пры нясвіжскім двары князя Мікалая Чорнага. Аддалі хлочыка ў навуку дзесьці ў сямігадовым узросце. Хаця школа і была пратэстанцкай, але праваслаўных Сапегаў гэта не бянтэжыла. Выкладалі там дасведчаныя настаўнікі. Сама атмасфера нясвіжскага двара, дзе сабраліся светлыя галовы з усёй Еўропы, дзе на філасофскіх і багаслоўскіх

* Дзед Льва Сапегі.

дыспутах пазнавалі ісціну і сэнс быцця, дзе друкаваліся кнігі, насычала ўражлівую душу і цікаўны розум хлопчыка новымі пачуццямі і новымі думкамі.

Можа, гэта і было для Лёвы занадта спакуслівым, бо, пакуль не пасталеў, ён лёгка паддаваўся чужым уплывам, пра што пазней шкадаваў. Але веды ў нясвіжскай школцы атрымаў ён добрыя, вывучаў і мовы, і філасофію, і багаслоўе, і літаратуру. Можна толькі дзівіцца ягоным здольнасцям.

Па заканчэнні ведаў польскую, нямецкую, лацінскую і грэчаскія мовы, а меў ён трынаццаць гадоў. Зайздросны набытак. Толькі Льва гэта не задавальняла, прагнуў пашыраць свае веды. А калі ёсць магчымасць, грэх не выкарыстаць яе.

У сяброўстве з сынамі Чорнага Юрыем і Станіславам ён паехаў у Германію і паступіў у Лейпцыгскі універсітэт. Пачалося студэнцкае жыццё. Досвед вёў Сапегу туды, дзе, здавалася, нараджаецца нешта новае, праўдзівае.



*Багдан Сапега (да 1450 — пасля 1512). Гравюра 1872 года І. Шубелера паводле партрэта XVI ст.*

Лёгка захапіўся ён ідэямі творцаў Рэфармацыі і нават перайшоў у пратэстанты. Так вось малады чалавек спасцігаў святло ісціны. Ужо ў сталым веку ён па-іншаму аднясецца да сваіх духоўных пошукаў.

> Кідаўся я тады на розныя спакусы і быў дурны, як авечка, асабліва калі вучыўся ў нямецкіх ерэтычных школах [7].

А то і зусім прама прызнаецца: «Заблудшым быў»[8]. Але ж ліха без дабра не бывае. І ў тым, што Леў не толькі вывучаў працы Платона і Арыстоцеля, але і сам думаў мудра, была заслуга гэтых «ерэтычных школ».

Пакінулі след у душы Сапегі і вольналюбівыя ідэі, якія прынесла ў Германію Рэфармацыя: вызваленне чалавека ад путаў схаластычнага светапогляду на сябе як на аб'ект нечай чужой волі і ўзвышэнне чалавека да ўсведамлення сваёй ягамосьці і прызнанне за сабой права быць чалавекам.

Пасля вяртання на радзіму Сапегу не знайшлося месца на службе. Па маладосці ён перажываў, як яму здавалася, сваю непатрэбнасць і вось не вытрымаў. У лісце да Крыштофа Радзівіла піша:

> А я, небарака, яшчэ не ведаю, дзе сесці, і ўжо ўдумаў да кляштара ўступіць, бо нікога за мяне няма на свеце. Да гэтага часу не ўмеў падлісліваць, а вучыцца ўжо позна... [9].



*Іван Сапега (1450—1517). Гравюра 1872 года І. Шубелера паводле партрэта XVI ст.*

Хто, як не бацька, дапаможа свайму сыну? Ён і паслаў Льва да Стэфана Баторыя, нібыта бараніць сямейныя інтарэсы па нейкіх дробных маёмасных справах. Малады Сапега ўразіў уладара лацінай, веданнем законаў і разважлівым не па гадах розумам. Такія людзі дзяржаве патрэбныя. А ў людзях Баторый не памыляўся. Будзе з Льва Сапегі вялікі дзяржаўны муж «Iste adolesceusc evadet in magnum virum in Republica» (Гэты юнак стане вялікім дзеячам для Рэспублікі. — *В. Ч.*)[10].

Баторый у 1580 годзе ўзяў Сапегу да сябе пісарам, а праз год ён ужо назначаны літвінскім гаспадарскім пісарам. Не толькі пяром на паперы махаў Леў, але і зброяй валодаў добра. Надышоў час паказаць Льву і сваё вайсковае зухвацтва.

У паходах Стэфана Баторыя Леў Сапега на чале сваёй почты праявіў сябе як мужны віцязь. Кароль пахваліў Сапегу за гераізм у баях пад Псковам.

Але вось навука, якую ён атрымаў у дзяржаўнай канцылярыі, зрабіла з яго палітыка. У майстэрні палітычных спраў Літвы быў Сапега пакуль што падмайстар. А вучыў яго канцлер Княства Астафій Валовіч, які зацята бараніў самастойнасць Літвы. Ён і ягоныя аднадумцы ні на крок не саступалі Кароне правоў і вольнасцей Княства. Тут зброяй не дапаможаш, тут трэба ўмець палітыку рабіць. Відаць, хутка пераняў вучань настрой свайго настаўніка. Прызнаецца Сапега ў лісце да Крыштофа Радзівіла:

Добра вядома, як нам гэтую вялебнуто унію датрымоўваюць: з радасцю зрабілі б з нас Валынь. Агулам — дрэнная справа з імі, бо яны ахвотна хацелі б мецъ нас сваімі галдоўнікамі, асабліва тыя, што паходзяць з кузьні гэтага нябожчыка (Стэфана Баторыя. — *В. Ч.*), які зваў нас «gens inimica mihi» (варожы мне род. — *В. Ч.*) [11].



*Астафій Валовіч (1520—1587). XVII ст.*

Валовіч займеў не толькі шчырага аднадумцу, але і дзейснага і практычнага спраўцу сваёй незалежніцкай палітыкі. І першай сур'ёзнай справай Сапегі разам з Валовічам і падканцлерам Крыштофам Радзівілам стала праца над стварэннем вышэйшага апеляцыйнага суда — Трыбунала Вялікага княства.

## ПАСОЛЬСТВА

Новае выпрабаванне на сталасць чакала Льва Сапегу. Кароль даверыў яму правіць пасольства ў Масковію.

> Хацеў таго кароль, сам паведаў, каб я зірнуў у вочы дэспату і нагадаў яму пераможныя каралеўскія звіцяствы. Былі часы, калі паслы манархаў, стаўшы перад яго абліччам, трупянелі; абавязак мой, павагу да пераможцы абудзіць, можа, тады суцішыцца ягоная дзікасць і жорсткасць», — гэтак успрымаў значэнне сваей місіі Сапега [12].

Невыпадковым быў выбар Баторыя. Сапега вызначаўся ініцыятывай і не баяўся браць на сябе адказнасць у вырашэнні складаных пытанняў. І што важна, Сапега валодаў моцнай воляй.

Паслам у Масковію не пазайздросціш, бо ехалі яны нібыта ў варожы стан, дзе на кожным кроку чакала небяспека. Прамымі пагрозамі ды хітрыкамі маскавіты вымагалі ад іх падатлівасці. «У такую дзяржаву ніхто не захоча ісці ў паслах», — справядліва

лічылі на Літве[13]. Сапраўднае выпрабаванне для 27-гадовага чалавека.

Хаця ў 1582 годзе і быў падпісаны мір паміж Рэччу Паспалітай і Масковіяй, але па-ранейшаму абедзве дзяржавы варожа ставіліся адна да адной. Неабходна было пацвердзіць мірнае пагадненне з Масковіяй. Пасольства адправілася ў Маскву ранняй вясною 1584 года. Сапегу суправаджала 275 чалавек прыслугі і аховы, ды яшчэ да іх далучыліся купцы, якія везлі на 177 вазах тавары. Два гады перад Сапегам па гэтым шляху прабіраўся ў Маскву Антон Пасевін. І вось што ён занатаваў:

> У лесе ледзь можна разлічыць шлях, паколькі ствалы дрэваў настолькі шчыльна паміж сабой перапляліся, што шлях усюды трэба было прабіваць сякерамі, вазы даводзілася цягнуць рукамі або нават пераносіць на плячах, а між тым знясіленым людзям трэба было начаваць на мокрай зямлі [14].

Тыя ж цяжкасці выпалі і пасольству Сапегі. Таксама давялося прабівацца праз лясы. Каля Мажайска пасольства раптам затрымалі. Што такое? Таямнічасць паводзін маскавітаў нараджала розныя здагадкі. Ад Івана Жахлівага можна было чакаць чаго заўгодна. Дарма што мір абяцаў. Некалькі дзён прайшло ў чаканні і няведанні. Палягчэла на сэрцы, калі адзін з маскоўскіх вартаўнікоў прагаварыўся, — памёр цар.

У Маскве ў той час бунтаваў чорны люд. Па начах горад азараўся пажарамі. А баяры аж да крыві грызліся паміж сабой. Канечне, выставіць на вочы літвінам сваю ганьбу і слабасць не хацелася. І толькі калі на царскі пасад узышоў сын памерлага цара Фёдар Іванавіч і трохі супакоіліся хваляванні, пасольства пусцілі далей. У Маскве паслоў заперлі на пасольскім двары, каб і кроку не ступілі. Высокі плот адгарадзіў ад усяго свету:

> Не толькі што чалавека нельга бачыць, і ветру правеяць няма куды [15].

Асоба пасла не выклікала ў гаспадароў пашаны.

> Тут мяне хавалі, як нейкага вязня, нават дзіркі ў плоце пазатыкалі ды вакол двара паставілі варту, якая сачыла за мною ўдзень і ўначы [16].

Доўгі час новы цар не прымаў паслоў. Баяры змагаліся паміж сабой за ўладу, не да перамоваў тут.

Невядомасць і трывожнае чаканне мучылі Сапегу. Азмрочвалі настрой і палонныя суайчыннікі, якіх трымалі пад вартаю каля пасольскага двара. Яны перадалі запіску Сапегу з просьбай аб вызваленні.

Штодня я абліваюся слязамі, калі чую іх енкі, хоць і далека ад іх стаю [17].

Перамовы, надзіва, закончыліся хутка. У нейкай ступені паўплывала заява Льва Сапегі, што пасля смерці Івана IV мірная дамова, заключаная ў 1582 годзе, страціла сваю сілу. Калі ж цар хоча міру, ён павінен прыслаць да караля вялікіх паслоў для падпісання новай мірнай дамовы, але з умовай прызнання за Рэччу Паспалітай правоў на Смаленск і Северскую зямлю. Выклаў Сапега і патрабаванне ўрада Рэчы Паспалітай: вызваліць палонных і выключыць з царскага тытула назву лівонскага ўладара. Цар вызваліў палонных, але ад тытула ўладара лівонскага не адмовіўся. Як абвясцілі баяры Сапегу, гэтую назву цар атрымаў у спадчыну ад бацькі.

Пасольства дасягнула сваей мэты — Масква гатова падтрымліваць мір. Сапега заключыў з царом перамір'е на 10 месяцаў да прыезду вялікіх паслоў. Да поспеху трэба аднесці і вызваленне 900 чалавек палонных, на што мала спадзяваўся і кароль, і сам пасол.

Сустрэча з царом пакінула непрыемнае ўражанне. Фёдар Іванавіч здаўся Сапегу блазнам:

Вялікі князь малы ростам; кажа ён ціха і вельмі павольна; усведамлення ў яго небагата або, як іншыя кажуць і як я сам заўважыў, зусім няма. Калі ён падчас маёй аўдыенцыі сядзеў на пасадзе ва ўсіх сваіх царскіх упрыгожаннях, дык, гледзячы на скіпетр і дзяржаву, усё смяяўся [18].

Слабавольнасцю Фёдара Іванавіча і баярскай нязгодай хацеў скарыстацца Стэфан Баторый, каб развязаць з Масковіяй вайну. Данясенні Сапегі, дарэчы, паслужылі Баторыю ў ягоных планах:

Нянавісць і нязгода пануюць паміж самымі знатнымі асобамі, а гэта сведчыць пра іх заняпад. Самы час скарыць гэтую дзяржаву, і пра гэта тут ужо думаюць і адкрыта кажуць, што ваша каралеўская міласць скарыстае гэты выпадак, і, як я чуў ад тутэйшых баяр, яны ў думках ужо далучаюць да вас абодва княствы, Смаленскае і Северскае, а князь Бельскі нават прадракае (дай Бог, каб апраўдалася), што ваша мосць хутка будзе ў самой Маскве [19].

Лісты Сапегі зачытвалі сенатарам як доказ правільных разлікаў Баторыя на лёгкую перамогу. Аднак планы караля нечакана для яго сустрэлі адпор з боку літвінскай шляхты.

> Ваявацца няма за што, толькі ваявацца каралю дзеля свайго гонару [20].



*Старонка «Статута».*
*Эпіграма Андрэя Рымшы на герб Льва Сапегі. 1588 г.*

Папярэднія войны знясілілі Літву і пакінулі пустой дзяржаўную скарбніцу. Неўраджайнае лета пагражала краю голадам. І новая вайна прынесла б толькі беды. Песімістычна адносіўся да вайны і першы дзяржаўны Муж Літвы Мікалай Радзівіл Сіротка. На сойміку Вялікага княства ў Ваўкавыску Баторыя не падтрымалі. Супраць вайны выступала і польская шляхта. Такая пазіцыя перашкодзіла Баторыю ажыццявіць свае ваяўнічыя задумы. Так што паміж Рэччу Паспалітай і Масковіяй было заключана двухгадовае перамір'е, якое паўтарала Ям-Запольскую дамову. З новай ініцыятывай выступіла рада Вялікага княства — праект польска-

літвінска-маскоўскай уніі, якая з'яднала б гэтыя тры славянскія дзяржавы. Удзельнічаў у распрацоўцы гэтай «вялікай справы» і Леў Сапега, які на той час стаў падканцлерам (22 лютага 1585 года). Сапега і наладзіў пасольства ў Маскву на чале з менскім кашталянам Міхайлам Гарабурдай. Пасол перадаў баярам прапанову паноў рады:

> [...] калі Бог пашле па душу Стэфана караля і нашчадкаў у яго не застанецца, дык Карону Польскую і Вялікае княства Літоўскае злучыць з маскоўскай дзяржавай пад дзяржаўную руку: Кракаў супраць Масквы, а Вільню супраць Ноўгарада. А пашле Бог па душу вялікага цара, дык Маскоўскай дзяржаве быць пад рукою нашага гаспадара, а другога ўладара вам не шукаць.

Баяры не прынялі прапановы:

> Гэта справа да добрай справы не прывядзе [21].

І калі Літва шукала шляхі мірнага вырашэння даўніх спрэчак з Масквой, дык тая па-ранейшаму спадзявалася на сілу:

> Цяпер Масква не старая: трэба ад Масквы ўжо асцерагацца не Полацку, не Лівонскай зямлі, а трэба асцерагацца ад яе Вільні [22].

Вунь куды замахнуліся — усю Літву пад сябе. Пакуль што пагрозы, гэта сёння, а заўтра ўжо — ява.

Падзеі ж прымуць нечаканы для Масквы накірунак, і цяпер ужо маскоўскі бок выступіць з прапановай уніі.

## ТРЭЦЯЕ БЕЗГАСПАДАРСТВА

Кароль польскі і вялікі князь літоўскі Стэфан Баторый памёр 12 снежня 1586 года ў Гародні «в милых палацах своих»[23]. Смерць уладара Рэчы Паспалітай была сапраўднай нечаканасцю. Баторый добра сябе пачуваў і не скардзіўся на здароўе і раптам за нейкі тыдзень згарэў ад невядомай хваробы. Само сабой напрасілася тлумачэнне, што Баторыя атруцілі.

Леў Сапега, які ў гэты час знаходзіўся пры каралі, так апісвае «прычыну» хваробы. 7 снежня а 11 гадзіне ночы Баторый са свечкай у руках адправіўся на кухню і правёў там каля паловы гадзіны. Пакаёвы слуга Іштан, пачуўшы грукат, пабег на кухню і ўбачыў Баторыя каля дзвярэй. Кароль стаяў на адным калені, нахіліўшыся назад, а яго галаву завярнула «накшталт кадука».

І так ён стукнуўся, што пад каленам на правай назе рана горш, чым ад вострай і доўгай шаблі, — шырокая і глыбокая. Жорстка аб лаву пабіў лоб і пад правым вокам, а таксама і нос пабіў сабе. Іштан ледзь прывалок яго да сябе і пытаў, што з ім сталася [24].

Пасля гэтага таямнічага выпадку Баторый ужо не падняўся з ложка. На трэці дзень лекары вынеслі несуцяшальны прысуд: «Кароль не выжыве»[25]. І хаця праўду захоўвалі, але аб смяротнай хваробе ўладара стала вядома прыдворным. Баторый нікога з іх не прымаў, толькі на кароткі час дапускаў да сябе перамышльскага біскупа Войтаха Бараноўскага. А 12 снежня Стэфан Баторый памёр*. Рэч Паспалітая зноў асірацела на свайго гаспадара. Зноў надышоў трывожны і нялёгкі час безгаспадарства.

Смерцю караля адразу скарысталіся Збароўскія, каб расправіцца з усемагутным канцлерам Янам Замойскім і аднавіць сваё былое становішча ў Польшчы. Нянавісць паміж партыяй Збароўскіх і партыяй Замойскага вырвалася на волю. Абодва бакі выстаўлялі сваіх кандыдатаў на пасад Рэчы Паспалітай. Збароўскія хацелі выбраць брата імператара Рудольфа II, эрцгерцага Максіміляна. На імператарскія грошы Збароўскія нанялі цэлае войска ў 10 тысяч чалавек. Не галасамі выбіраць уладара выпадала, а шаблямі.

Замойскі прытрымліваўся Жыгімонта Вазы — «патомка племя крыві Ягелонаў». За любімага пляменніка дбала каралева Ганна. Яна і давала грошы Замойскаму на выбарчую барацьбу. А барацьба разгаралася. На сойміках шляхта хапалася за зброю, каб вырашыць, хто правы. Гэтак жыла Польшча без караля.

У Літвы былі свае праблемы. Урад думаў, як стрымаць Масковію ад вайны, як пазбегнуць звадак у краіне і, галоўнае, як зацвердзіць звод законаў — Статут Вялікага княства. Ужо ў студзені 1587 года на Віленскім сойме літвінскія станы прынялі шэраг пастаноў па ўладкаванні суда, скарба і абароны. На выпадак небяспекі абвяшчалася паспалітае рушэнне.

На канвакацыйным сойме ў лютым таго ж года прадстаўнік Літвы троцкі ваявода Ян Янавіч Глябовіч заявіў, што Княства кіруецца сваімі законамі і не жадае прымаць польскія пастановы. Зноў Літва заяўляла пра сваю самастойнасць ад Польшчы і падкрэслена размаўляла з ёй, як з іншай дзяржавай. Ды яшчэ патрабавала

---

* Прыдворны лекар Сымоніус лічыў, што кароль памёр ад пнеўманіі і сардэчнай недастатковасці.

вяртання забраных ад яе земляў. Літвіны настроіліся выправіць «несправядлівасць» уніі.

> Вы, палякі, выбіраеце сабе двух каралёў, мы выберам трэцяга [26].

Гэтым трэцім жадаў стаць маскоўскі цар Фёдар Іванавіч. Цар адправіў у Вільню сваіх паслоў Ржэўскага і Свізяева. Цяпер ужо Масква прапаноўвала літвінам «злучэнне».

> Самі ведаеце, што палякі з хрысціянамі рознай веры, а вы, паны рада літоўскія і ўся зямля літоўская, з нашаю зямлёю адной веры і аднаго звычая, дык вы пажадалі б сабе нашага ўладара, хрысціянскага ўладара, а калі будзе Літоўская дзяржава злучана з Маскоўскай, дык нашаму ўладару як не ахоўваць Літоўскую зямлю? Калі будуць абодва панствы заадно на ўсіх недругаў, дык Польская зямля міжволі будзе далучана да Маскоўскага і Літоўскага панстваў, а ўладару тое і люба, што Літоўскае Вялікае княства будзе разам з яго панствамі. І як нашаму ўладару за гэта не стаяць? Начальнае панства кіеўскае ад прадзедаў належыць нашаму ўладару, а цяпер яно зняволена, ад літоўскага панства адарвана да Кароны Польскай, і не адным Кіевам польскія людзі завалодалі ў вас, паноў літоўскіх, ды далучылі гвалтам да Польскай зямлі: як нашаму ўладару ўсяго гэтага не адняць у палякаў, і да вас, і да панства Маскоўскага не далучыць? [27].

Так, прапанова прываблівала сваімі шырокімі перспектывамі. Аднак на Літве не прынялі яе. Як тлумачылі самі паслы, літоўскія паны не хацелі губляць сваіх уладанняў у Польшчы, ды, апроч таго, «у Літве памножылася лятцкая вера»[28], што азначала вялікі ўплыў каталіцкага касцёла на рашэнні літвінаў. Такім чынам, на разрыў Люблінскай уніі Літва не пагадзілася (хаця рыхтавалася, скарыстаўшы час безгаспадарства, выправіць яе «несправядлівасць»), а вось кандыдатуру Фёдара Іванавіча на пасад Рэчы Паспалітай падтрымала.

Калі ўлічыць, што разам з Мікалаем Сіроткам, наваградскім ваяводам Фёдарам Скумін-Тышкевічам правіў перамовы і Сапега, дык падканцлер пачаў выконваць адну з галоўных ролей у палітычным жыцці Вялікага княства. І гэта зразумела, бо Сапега фактычна кіраваў канцылярыяй дзяржавы (Валовіч з-за старасці адышоў ад спраў).

Кандыдатура Фёдара Іванавіча задавальняла многіх літвінскіх палітыкаў, а таксама большасць шляхты. Пагаджаўся на цара і Леў

Сапега. Ад імя Мікалая Радзівіла, Льва Сапегі і Фёдара Скуміна віленскі купец Лука Мамоніч перадаў царскім паслам:

> Паны гэтыя дбаюць уладару і кажуць, каб ваш уладар абавязкова адправіў сваіх вялікіх паслоў на элекцыю; да паноў рады і да рыцарства абедзвюх земляў прыслаў бы свае граматы з любоўю і ласкаю [29].

Паны раілі цару паабяцаць заплаціць жаўнерам жалаванне, якое яны не дачакаліся ад караля, ды і вяльможным прысланы памінкі багатыя.

Цар адмовіўся ад уніі з Літвой і вырашыў прыняць удзел у барацьбе за пасад Рэчы Паспалітай. Сваю праграму ён выклаў літвінскім паслам Чэрнікоўскаму і князю Агінскаму — гэта абарона за свой кошт Літвы і Польшчы ад татараў, не ўступацца «ў даходы і прыбыткі каралеўскія», жалаваць землямі паноў і шляхту.

> Калі б панствы вашы з царствам праваслаўнага ўладара нашага злучыліся б, дык усе паганскія ўладары апусцілі б свае рукі; давялося б ім тады ўжо сябе захоўваць, а не хрысціянства няволіць; Малдавія, Валахія, Боснія, Сербія і Угорыя, якія за туркамі, засталіся б Польшчы і Літве, а што бліжэй да нас — Крым, Азоў, Чаркасы і другія орды — дасталіся б Маскве [30].

Такі смелы план цара пужаў. Ваяваць супраць самай моцнай у Еўропе дзяржавы — Турэцкай імперыі — ні палякі, ні літвіны не адважыліся. Пагрозлівым папярэджаннем ім прагучала заява турэцкага пасольства, калі яны выберуць варожага султану кандыдата, дык ён лічыць неабходным парваць з Рэччу Паспалітай. Так што праграма цара не сустрэла шырокай падтрымкі. І ўсё ж той карыстаўся значнай падтрымкай і ў Літве, і ў Польшчы. Перш за ўсё за яго выступалі праваслаўныя, а таксама малазямельная шляхта, якая спадзявалася атрымаць уладанні ў Масковіі. І літвінскія дыгнітарыі па-ранейшаму ставілі на Фёдара Іванавіча. Слабавольны манарх іх задавальняў.

Гэтак, Мікалай Сіротка дзяліўся сваімі меркаваннямі з Крыштофам Радзівілам:

> Праўда, паводле чутак, цар не здольны да кіравання, але з гэтым можна і змірыцца, калі ўдасца вырашыць пытанне, хто будзе апекуном, і літвіны не пасварацца на гэтай глебе з палякамі, якія жадаюць усім запраўляць [31].

Толькі ці згодзіцца цар выканаць патрабаванні? Фёдар Скумін у гутарцы з паслом Ржэўскім раіў паведаміць цару, што ён павінен «тры калоды перакрочыць»: каранавацца ў Кракаве, пісацца ў тытуле перш каралём польскім і вялікім князем літоўскім, перамяніць веру. «Калі мы гэтыя тры калоды, дасць Бог, перавалім, дык будзем з вамі ў вечным злучэнні»[32]. Як высветлілася, аб гэтыя калоды і спатыкнуўся цар. На элекцыйным сойме царскія паслы паведамілі, што

> ўладар застанецца ў праваслаўнай веры, вянчацца на каралеўстве будзе ці ў Маскве, ці ў Смаленску, карона польская будзе пад царскай шапкай Манамаха, тытул будзе: цар і вялікі князь усёй Русі, уладзімірскі і маскоўскі [33].

Маскоўскі ўрад імкнуўся да першынства ў будучай федэрацыі і дамагаўся кіраўніцтва ў яе знешняй палітыцы. Дыгнітарыі добра разумелі, што задумаў цар, — такая унія іх не задавальняла. Аднак сярод шляхты кандыдатура Фёдара Іванавіча карысталася папулярнасцю. Літвіны нават падчас элекцыі 1 жніўня 1587 года пастанавілі

> не жадаць другога караля, апроч маскавіта, пад пагрозай страты маёмасці, гонару і жыцця [34].

Элекцыйны сойм пачаўся 30 чэрвеня 1587 года каля Варшавы. Польскія паны прыехалі, нібыта на вайну, на чале шматлюдных почтаў. Збароўскія, падтрыманыя імператарам і папскім нунцыем Анібалам, нанялі 10 тысяч нямецкіх, французскіх, італьянскіх, чэшскіх жаўнераў і прывялі з сабой гэтае воінства. Замойскі са сваімі прыхільнікамі таксама абапіраўся на ваярства. Так збройяй спадзяваліся яны падтрымаць сваіх кандыдатаў. Абодва сталі асобнымі лагерамі, як два непрыяцельскія войскі. Літвінская дэлегацыя спынілася на супрацьлеглым беразе Віслы каля сяла Каменка. Пра нейкую агульную згоду ніхто і не марыў. І калі для палякаў сойм стаў полем змагання за ўладу, дык літвіны абаранялі сваю дзяржаву.

Як бы ні скламіся падзеі, хто, у рэшце рэшт, ні перамог бы, літвінам важна было, каб новы манарх выканаў іх волю: вяртанне аднятых ад Літвы на Люблінскай уніі зямель, прызнанне за імі Лівоніі і зацверджанне Статута, якім і адмяняліся артыкулы уніі, накіраваныя на скасаванне самастойнасці Літвы.

Палякі, зразумела, не пагадзіліся з літвінамі і прапаноўвалі поўнае злучэнне Кароны і Княства пад агульнымі законамі і трыбу-

налам. Адпор літвінаў, якія папярэдзілі, што яны не прыступяць да каралеўскай элекцыі, пакуль палякі не выправяць усе парушэнні, учыненыя Літве уніяй, прымусіў польскі бок на ўступкі.

Акт ад 4 жніўня 1587 года ад імя польскіх і літвінскіх станаў дэклараваў падзел Лівоніі паміж Літвой і Польшчай. Літвіны на гэта не пагадзіліся і адклалі свае патрабаванні на разгляд каранацыйнага сойма.

Тым не менш да адкрытага разрыву Княства з Каронай, як гэтага палохаліся палякі, справа не дайшла. Леў Сапега непасрэдна ўдзельнічаў у перамовах з польскім бокам. Трэба адзначыць, што падканцлер уплываў на пазіцыю паноў рады. Яшчэ ў 1585 годзе ён прызнаваўся Крыштофу Радзівілу:

> Ад таго часу, як пачалася вайна за Лівонію, палякі і гарэлага шэлега не далі нам у дапамогу... Яны хочуць нас адпіхнуць не толькі ад заваяванага намі цяпер, але і ад таго, што мы трымалі раней [35].

Відавочна сувязь гэтага даўнейшага меркавання Сапегі з цяперашняй праграмай літвінаў.

Элекцыя ператварылася ў аблудлівую гульню — хто каго перахітрыць. Ні адна з партый не сабралася разам для абмеркавання кандыдатур на гаспадарскі пасад.

У лагеры Замойскага выступалі за Жыгімонта Вазу. За галоўны довад прызнавалі магчымасць уключэння ў склад Рэчы Паспалітай Эстоніі. Адзначалася, што саюз з Швецыяй дазволіць стварыць моцны флот на Балтыйскім моры, забяспечыць мір з Турцыяй. Прываблівала заява шведскіх паслоў:

> Кароль Швецыі абяцае, і гэта з Боскай дапамогай, пэўна, так і будзе, калі палякі дапамогуць, дык ён спустошыць і разрабуе маскавіцкія землі [36].

І «абяцанне» знаходзіла шчыры водгук у палякаў:

> Маскавіты ледзь супрацьстаяць моцы гэтых двух народаў паасобку, а калі яны аб'яднаюцца, яны не вытрымаюць [37].

Літвіны, якіх «знясілілі» войны з Масковіяй, выступалі супраць уладара, які прагне вайны. Так што шведа падтрымалі толькі паплечнікі Замойскага. Яшчэ менш шанцаў меў Габсбург. Збароўскія без асаблівага поспеху агітавалі за імператарскі дом. Лагер іх прыхільнікаў не вызначаўся шматлікасцю. Літвіны засталіся вернымі сваёй кандыдатуры — цару Фёдару Іванавічу.

Праўдападобна, што літвінскія, украінскія, мазавецкія палітыкі дамовіліся пра сумесныя дзеі на аднаўленне ў былых межах Вялікага княства. На такі смелы план літвіны маглі адважыцца пры гарантыі уніі Літвы з Масковіяй. Паны рада ўступілі з маскоўскімі пасламі ў сепаратныя перамовы. Іх цікавіла, ці захоча Фёдар Іванавіч стаць вялікім князем літоўскім, ці здолее хутка дапамагчы Літве войскам, грашыма і ці пакрые зямельныя страты літвінаў у Польшчы. Рада адкрыта паведамляла пра сваю задуму:

> Хочам мы, Літва ды Падляшша, ды Мазоўша з Кіевам, і Падолле, і Валынь... ад Польшчы адарвацца і унію з імі, па вашаму дакананню, хочам разарваць [38].

Цар не прадбачыў такога варыянта і таму не даў наказу паслам, што чыніць у гэтым выпадку. Вось і адказалі на літвінскую прапанову маўчаннем. Ну а калі паслы паведамілі: цар адмаўляецца каранавацца ў Кракаве, застанецца ў праваслаўі і не прызнае першынства польска-літвінскага тытула, дык некаторыя з літвінскіх дыгнітарыяў адступіліся ад яго. Нясвіжскія Радзівілы перайшлі ў лагер Габсбургаў, канцлер Астафій Валовіч і жамойцкі староста Ян Кішка схіліліся да Вазы.

Замойскі наўмысна зацягваў выбары, каб шляхта, прыціснутая грашовымі выдаткамі, раз'ехалася з сойма. Чаго ён і дачакаўся.

Аднак сам сябе перахітрыў. Пакідалі сойм і верныя канцлеру шляхціцы. Затое імператарскія грошы ўтрымлівалі партыю Габсбурга. Замойскі ўжо страціў надзею перамагчы, як нечакана да яго перакінуўся ад Збароўскіх прымас Станіслаў Кранкоўскі. Польскі першасвятар ставіў то на цара, то на імператара і ўрэшце расчараваўся ў абодвух кандыдатах. Стары, вопытны інтрыган, які ўдзельнічаў у трэціх каралеўскіх выбарах, прадбачыў правал і Фёдара, і Максіміляна. Своечасова зарыентаваўся і паставіў на Жыгімонта — як-ніяк, а Замойскі валодаў рэальнай уладай на Польшчы.

17 жніўня прымас прылюдна абвясціў, што выбар аўстрыйскай і маскоўскай кандыдатур немагчымы. Кранкоўскі прывёў да Замойскага амаль усіх біскупаў і цэлы натоўп сенатараў. Разгубленаму ад удачы канцлеру прымас заявіў, што няма чаго марудзіць, ён гатовы абвясціць каралём Жыгімонта.

19 жніўня ў лагеры Замойскага выбралі і менавалі каралём польскім і вялікім князем літоўскім Жыгімонта Вазу. Выбар пацвердзіў прымас. Літвіны 21 жніўня апратэставалі незаконную

элекцыю. Астафій Валовіч, Ян Глябовіч і Леў Сапега прывезлі пратэстацыю да Замойскага. Ян Глябовіч ад імя Літвы ўказаў, што выбранне Вазы парушае прывілеі уніі, але літвіны могуць згадзіцца і на гэтага караля, калі ён заключыць вечны мір з Масковіяй і верне Літве аднятыя землі.

> Калі аб крылах нагадаць, якія нам аднялі, дык разумееце, калі не можам здабыць іншых і лепшых, чым жа нас узнагародзіць, чым жа наш жаль вылечыць? Раю шукаць дарогі, якая б Айчыну не запаліла знутры; над якой з аднаго боку турчын, а з другога боку маскавіт з гатовай шабляй стаяць [39].

«Жаль» літвінаў Замойскі не вылечыў. Паабяцай ім вярнуць адабраныя землі, як уся польская шляхта ды панства падняліся б на яго. Ды і на мір з Масковіяй не пагаджаўся, пэўна, спадзяваўся, што перад пагрозай вайны Літва кінецца да ног ягонага стаўленіка Жыгімонта. Літвінскія паслы дэманстратыўна пакінулі лагер Збароўскага. Інакш дзейнічалі прыхільнікі Габсбурга. Яны ўслед за літвінамі не прызналі элекцыі Вазы і выключылі яго з ліку кандыдатаў на пасад Рэчы Паспалітай. Гэта нават паспрыяла Замойскаму ўламаць шведскіх прадстаўнікоў прыняць ягоныя ўмовы.

Шведы, якія баяліся перамогі цара, саступілі патрабаванням перадаць Рэчы Паспалітай Эстонію і дапамагаць у вайне з Масковіяй. Аднак рана канцлер святкаваў перамогу. 22 жніўня ў лагеры Збароўскіх абвясцілі каралём польскім і вялікім князем літоўскім Максіміляна Габсбурга. І гэтую элекцыю літвіны не прызналі. Супраць «гвалту і парушэння правоў і вольнасці» яны выступілі разам са сваімі аднадумцамі з Кароны і 23 жніўня звярнуліся да абедзвюх партый з прапановай адмяніць «намінацыю» абодвух каралёў і ўчыніць новую элекцыю. Калі ж прапанову не прынялі, дык трэці лагер выступіў з пратэстацыяй, у якой вы-



*М. Цюнд, Г. Адэлгаўсер.*
*Каралеўскі палац Стэфана Баторыя.*
*Фрагмент афорта «Выгляд Гародні». 1568 г.*

бары Максіміляна і Жыгімонта абвяшчаліся незаконнымі. Шляхце прапаноўвалася правесці павятовыя соймікі для ўстанаўлення месца і часу паўторнага элекцыйнага сойма.

Ад свайго кандыдата літвіны не адступіліся і паведамілі маскоўскім паслам:

> Замойскі выбраў шведскага каралевіча, ваявода познаньскі Гурка ды Збароўскія выбралі цэсарава брата, а мы ўсе, Літва і палякаў большая палова, жадаем вашага ўладара. Але затрымка толькі за вераю і за прысудам... толькі нам ведаць, як хутка прыедзе ўладар ваш, мы, выбраўшы б яго, у той жа час рушылі б да Кракава і кароны не далі б ні шведу, ні цэсараву брату [40].

Вельмі красамоўнае тлумачэнне сімпатый літвінаў да маскавіта, як прызналіся царскім паслам Крыштоф Радзівіл і Ян Глябовіч:

> У нас вядомая справа, што нямецкі род славянскаму роду ніякага дабра не прынясе: і нам, як немца ўзяць сабе за гаспадара? [41].

Як вынікае, літвіны лічылі сябе славянскім родам.

Задума Літвы выбраць цара і ўчыніць унію з Масковіяй не здзейснілася. Літвінскі ўрад з улікам палітычнага становішча цяпер прытрымліваўся аптымальнага для Літвы плана дзеянняў.

На Віленскім сойме, які пачаўся 2 кастрычніка 1587 года, літвіны прызналі выбранне двух уладароў за парушэнне уніі, што магло прынесці «небезпеченства на панства, так-же на права, свабоды и волности наши»[42]. Сойм папярэдзіў «панов поляков», каб яны «тых номинатов без нас не короновали»[43].

Да самых «номинатов» літвіны выслалі паслоў з просьбай не дазваляць сябе каранаваць без згоды на тое Вялікага княства Літоўскага. Было вырашана склікаць 8 лістапада ў Вільні новы сойм. Калі надышоў указаны тэрмін, стала вядома, што Максімілян і Жыгімонт не адмовіліся ад кароны і ўжо прыбылі ў Польшчу. Абодва прасілі «зезволеня» Вялікага княства на сваё панаванне. Становішча памянялася. Віленскі сойм вырашыў выслаць да абодвух «кандыдатаў» паслоў з даручэннем, «абы их милость именем Великого князьства Литовского з кандыдаты так поступили, яко было з наичстившим и напожитечнейшим Великого князьства Литовского»[44]. Так што выбар літвінаў залежаў ад таго, хто з «кандыдатаў» прыме іх умовы.

Літва патрабавала вяртання ёй Лівоніі, зацвярджэння літвінскага статута і трыбунала. Калі ж Жыгімонт адмовіцца, дык пасольства

пачне перамовы з Максімілянам. Тым часам Літва падыме свае войска на абарону прызнанага ёю кандыдата.

Пасольства складалі віленскі біскуп Юрый Радзівіл, віленскі ваявода Крыштоф Радзівіл, троцкі ваявода Ян Глябовіч, троцкі кашталян Мікалай Крыштоф Радзівіл, наваградскі ваявода Мікалай Радзівіл, полацкі ваявода Крыштоф Монвід Дарагастайскі, смаленскі ваявода Астафій Тышкевіч, а таксама прадстаўнікі шляхты. Значыць, нясвіжскія Радзівілы падначальваліся волі ўрада Літвы і адмовіліся ад падтрымкі Габсбурга. Літва захоўвала аднадушнасць — у гэтым была яе сіла. Аднак знайшліся паны, якія паспяшылі схіліцца перад Жыгімонтам, — гэта жамойцкі староста Ян Кішка, жамойцкі кашталян Мікалай Тальваш, жамойцкі біскуп Мальхер Гедройць. Недарэмна хваляваліся на Віленскім сойме, што жамойты не падтрымаюць літвінаў. І цяпер, як і раней, Жамойція праяўляла свае сепаратныя памкненні і шукала шляхі пазбавіцца ўлады Літвы.

І як нядзіўна, прыхільнікам Жыгімонта стаў Леў Сапега. Яшчэ на элекцыі ён паведаміў партыі Замойскага:

> І нам прыемны каралевіч шведскі; але тое нам жаласна, што без нас яго менавалі, і на яго не гневаемся, толькі на вас [45].

Можна лічыць гэтую заяву дыпламатычным крокам. А можна дапусціць, што Сапега ўжо тады прадугледжваў магчымасць перамогі Жыгімонта. Палітычная прадбачлівасць не падманула падканцлера. Аналіз падзей паказваў, што шанцы шведа найлепшыя. Сапега вырашыў не толькі сам падтрымаць Жыгімонта, але і павесці за сабой паноў рады. У лісце да Мікалая Сіроткі ад 12 верасня 1587 года Сапега так тлумачыць свой выбар:

> Хаця цяпер і з'явілася шмат розных думак, але любому дазваляецца думаць пра мяне, як яму вольна. Я пакажу ўсім у вочы, што на гэты ліст мяне схілілі не падарункі, не абяцанні, якіх, Бог сведка, я не атрымліваў, але перакананне, што шведскі каралевіч нам указаны Богам. Таму я не жадаю нашаму народу, каб ён спачатку супраціўўся Боскай волі, а пасля падначаліўся б ужо каранаванаму польскаму каралю. Гэта была б знявага і ганьба для нашага народа. Таму я жадаў бы, каб вы зрабілі ласку згадзіцца на яго і схілілі літвінскія чыны да таго, каб яны не былі апошнімі і папярэдзілі каранацыю.
>
> Што ж датычыцца маскоўскага князя, дык Бог мне сведка, што я жадаў мець яго за ўладара, хаця ўсведамляў і бачыў шмат перашкод

да ажыццяўлення гэтага, між іншым і ягоныя недахопы, хаця пра гэта я маўчаў і нікому не казаў, ды і цяпер да часу маўчу [46].

Рашуча паўплываць на рашэнне літвінскіх станаў Леў не мог, але прыклад падаў. І ў тым, што Літва ўсё ж прызнала Жыгімонта вялікім князем літоўскім, ёсць заслуга і падканцлера. Прынамсі, падканцлер стрымліваў сваіх паплечнікаў ад паспешлівага жадання прыпыніць перамовы з Жыгімонтам і настойваў давесці іх да паспяховага заканчэння.

Перамовы вялі Ян Глябовіч і Леў Сапега. Выбранае Віленскім соймам пасольства засталося ў Бярэсці чакаць вынікаў барацьбы паміж «каралямі», а да Жыгімонта ў Кракаў выправіўся Ян Глябовіч. Да троцкага ваяводы далучыўся і Леў Сапега. Ехаў ён і як «печатар», каб замацаваць дзяржаўнай пячаткай дакументы, і як галоўны спраўца новага зводу законаў Статута Вялікага княства Літоўскага.



*Жыгімонт I Ваза (1566—1632). Гравюра «Статута». 1588 г.*

## СТАТУТ

Пры заключэнні Люблінскай уніі Літва адстаяла права «папраўы» Статута.

Новы Статут, на думку літвінскага ўрада, павінен выправіць «несправядлівасць», учыненую Літве Люблінскай уніяй, і захоўваць надалей яе дзяржаўнае жыццё. Аднак, паводле Люблінскай дамовы, «папраўа» зацвярджалася агульным манархам са згоды «супольнага» сойма Польшчы і Літвы. Каб Статут атрымаў заканадаўчую сілу, літвіны павінны былі дамагчыся яго пацвярджэння непасрэдна ад уладара. Але як гэта зрабіць? Зразумела, што трэба скарыстацца момантам, калі Польшча трапіць у цяжкае становішча і не здолее перашкодзіць жаданню Літвы.

Зручнага моманту давялося чакаць амаль дваццаць гадоў, і ўвесь гэты час не сціхала праца над складаннем новага зводу законаў. А працавала над Статутам выбраная камісія, у якую ўва-

ходзілі прадстаўнікі літвінскіх станаў, як каталіцкага, гэтак і праваслаўнага, і пратэстанцкага веравызнання. У розныя часы камісію ўзначальвалі канцлеры Мікалай Юр'евіч Радзівіл і Астафій Валовіч. Артыкулы Статута абмяркоўваліся на павятовых сойміках і агульнадзяржаўных з'ездах. Такім чынам, Статут стаў плёнам заканадаўчай думкі «шляхецкага народа» Літвы.

Аднак толькі пасля таго, як за справу ўзяўся Сапега, праца нарэшце завяршылася. Ён зрабіў агульную рэдакцыю Статута, падрыхтаваў да друку. А тое, што справа гэта нялёгкая, можна судзіць паводле прызнання самога Льва ў 1592 годзе, калі адбываўся перагляд кодэкса:

> Паправу Статута неяк робім, шмат перашкод; даволі ўпартых, а то і неразважлівых. Усе аднадушныя ў тым, каб браць за прыклад лепшае. Іншы раз самі не ведаюць, чаго хочуць. Калі пытаю, як хочаш, каб гэта было, дык адказвае: «Сам не ведаю, як перадаць тое, што думаю». Злы дух цябе пабраў бы, калі я абавязаны разумець тваю фантазію, калі ты сам не можаш яе выказаць! Ужо так мне ўсё надакучыла за невялікі час, што сам не ведаю, ці вытрымаю [47].

Можна ўявіць, якія страсці кіпелі, калі Статут складаўся, і як ламаў сабе галаву Сапега, каб даць самае лепшае. І вось як ён вырашыў гэтую задачу. Сапега выступіў прыхільнікам прававога грамадства і дзяржавы. У прадмове да Статута Леў Сапега выказваў і свае разумение значэння права: «А где опять право або статут гору маеть, там сам Бог всим владнеть»[48]. Услед за антычнымі філосафамі Арыстоцелем і Цыцэронам ён паўтарае думку пра тое, што грамадства не ведае прыстойнага жыцця без заканадаўства, якое павінны ўсе паважаць і, канечне, сам манарх, іначай ён стане для сваіх падданых тыранам. Кожны чалавек павінен вызначаць тыя прававыя нормы, якія пачціва ўзвышалі б яго і засцерагалі ад ганебных учынкаў:

> А тая того есть причина, же право ест, яко его другий зацный мудрец выславил, оным правдивым розсудком а мудрым умыслу чоловечого бачеsuccessь, которым пан Бог натуру чоловечую обдарыти рачыл, абы водлуг того пристойного а мудрого баченья жывот чоловечий так справовал, яко бы се за тым, што ест почтывого, завжды удавал, а што непочстивого, абы се того выстергал [49].

А для дзяржавы зарукай росквіту і велічы ёсць прававы лад.

И тот то ест цель и конец всих прав на свете, тым все панства и королевства стоять и в целости своей захованы бывають, где лихие помсту, а добрые заплату относять [50].

Так, Леў Сапега і астатнія сябры статутавай камісіі з’яўляліся прадстаўнікамі інтарэсаў «шляхецкага народа», і перш за ўсё яны абараняலі свае саслоўнае права. Таму Статут замацоўваў прывілеі і вольнасці пануючага класа, замацоўваў прававую няроўнасць, не дапускаў просты люд да кіравання дзяржавай. Іначай у той час і не магло быць.

Аднак Сапега выразна заяўляў, што ўлада павінна падпарадкоўвацца закону, і спасылаўся на Цыцэрона: «Естесмо невольниками прав для того, абысьми вольности уживати могли»[51]. Статут абвяшчаў роўнасць усіх перад законам, усе павінны судзіцца «тым одним правом писаным».

Відавочна, што погляды Сапегі паўплывалі на гуманістычны характар многіх артыкулаў Статута. Для новага літвінскага зводу законаў чалавек, нават простага стану, — гэта «Божье створенье», што вымагае і адпаведнай пашаны да яго. Гэтак, у аснову законаў былі пакладзены хрысціянскія прынцыпы.

У параўнанні з папярэднімі статутамі новы прызнаваў смяротнае пакаранне за забойства чалавека простага стану. Узаконьвалася права на абарону з адвакатам і прызнавалася прэзумпцыя бязвіннасці, паводле якой суддзі абавязаны вызваляць асоб, чыя віна не даказана.

Ад крымінальнай адказнасці вызваляліся таксама няпаўналетнія да 16 гадоў і псіхічна хворыя, а ў некаторых выпадках асобы, якія ўчынілі злачынства «па глупству». Абараняліся правы жанчыны, і ўстанаўлівалася двайное пакаранне за злачынства супраць яе.

Статут абмяжоўваў прыгнёт, забараняў трымаць у няволі свабодных людзей, скасоўваў нават тэрмін «няволя». Пацвярджаўся і прынцып верацярпімасці. Пад дзяржаўную ахову бралася прырода, уводзіўся парадак карыстання зямлёй, лясамі, рэкамі і азёрамі.

А ў палітычных артыкулах Статут абвяшчаў Вялікае княства самастойным панствам са сваёй тэрыторыяй, не падлеглай уладзе іншай дзяржавы. Акты Люблінскай уніі ўвогуле не ўнесены ў Статут. На чале Княства стаіць манарх — вялікі князь літоўскі, які пад прысягай клянецца захоўваць прывілеі і вольнасці дзяржавы, а таксама правіць на падставе законаў. Уладу вялікага кня-

зя падзяляе рада і сойм, якія і кантралююць ягонае ўладаранне. Важнейшыя агульнадзяржаўныя справы, як абвяшчэнне вайны, скліканне паспалітага рушэння, назначэнне падаткаў, заключэнне міру і другія, вырашаюцца на вальным сойме. Тым самым Статут аднаўляў адменены уніяй вальны сойм Княства, праўда, цяпер ён называўся «соймікам, або зъездом головным».

Але важна не назва, а сутнасць. Усе пасады і зямельныя наданні атрымліваюць толькі «родичи» Княства, г.зн. ягоныя грамадзяне. Такім чынам, ставілася заслона для захопу ўлады палякамі. Статут захоўваў і літвінскія грошы і не казаў пра замену іх агульнай з Польшчай манетай. Паводле новага зводу, Княства не абавязана ўдзельнічаць у войнах, якія вядзе Польшча, і можа асобна ад яе весці войны.

Незаконным лічыўся захоп Польшчай літвінскіх земляў. Відавочна, што ўсе гэтыя артыкулы супярэчылі канстытуцыі Люблінскай уніі.

Як бачым, літвінскі ўрад не толькі ўсяляк абараняў сваю дзяржаву ад паглынання яе Польшчай, але ўвесь час шукаў новыя формы палітычнага жыцця. Вельмі дакладна вызначыў гэты працэс гісторык Літвы Іван Лапо:

> Зніштожылі сойм Княства, на яго месцы ствараецца агульналітоўскі з'езд. Стварылі на паперы агульнае для Літвы і Польшчы выбранне каралёў і агульнае пацвярджэнне выбранымі гаспадарамі правоў абедзвюх дзяржаў, а жыццё так лёгка і так проста ўсё гэта разбурыла і стварыла асобнае пацвярджэнне Літвой элекцыі і асобнае пацвярджэнне каралём правоў для Літвы [52].

Асобны трыбунал, асобныя скарб, канцылярыя, пячатка і пасады, манета і вось асобны Статут. І не толькі палітычнымі сродкамі баранілі літвіны сваю незалежнасць, але і культурнымі. Як мерай супраць апалячвання Літвы прызнавалася дзяржаўнай мовай — беларуская. На ёй напісаны і надрукаваны Статут.

Перад Глябовічам і Сапегам паўстала найскладанейшая задача: без згоды Польшчы атрымаць ад будучага ўладара Рэчы Паспалітай санкцыю на зацвярджэнне Статута. Хто мог стаць гэтым уладаром? Жыгімонт або Максімілян? Свой голас Літва збіралася аддаць таму з іх, хто прызнае літвінскія ўмовы і прыме Статут.

Спачатку здавалася, што перавага за Максімілянам. Габсбург на чале 11-тысячнага войска 16 кастрычніка 1587 года падышоў да Кракава, а Жыгімонт знаходзіўся ў Прусіі. Максімілян апярэ-

дзіў свайго супрацоўніка, але апошняга кроку да кароны яму не далі зрабіць. Кракаў абараняли прыхільнікі шведа на чале з Янам Замойскім. Так і не ўвайшоў у горад Максіміліян і не каранаваўся.

Штурм, які правёў эрцгерцаг 23 лістапада, закончыўся паражэннем. Максіміліян адступіў да сілезскай мяжы, але свайго паражэння ён не прызнаў і рыхтаваўся да новых баёў. Становішча спрыяла місіі Глябовіча і Сапегі. Пакуль ні адзін з бакоў не дасягнуў перамогі, у літвінаў надарыўся рэальны шанс дамагчыся свайго.

Вялікі палітычны вопыт, асабістыя сувязі пры польскім двары Яна Глябовіча і палітычная разважлівасць, прадбачлівасць, дасведчанасць у заканадаўстве Льва Сапегі спалучыліся для дасягнення пастаўленай мэты. А тое, што Жыгімонт пачуваў сябе няўпэўнена (нават хацеў вяртацца ў Швецыю) і паслухмяна падпісаў Pacta Conventa аб выкананні перадвыбарчых абяцанняў, надала надзею, што ён саступіць і патрабаванням літвінаў.

9 снежня Жыгімонт уехаў у Кракаў. Ян Замойскі прывітаў яго пышнай прамовай. Каралевіч панура выслухаў красамоўства і слова не вымавіў у адказ. Збянтэжаны Замойскі накінуўся на паслоў: «Што за нямога чорта вы прывезлі нам са Швецыі?»[53]. Але канцлеру было ўсё роўна, якога ён пасадзіць на пасад, толькі б самому ўтрымацца пры ўладзе. Паспешліва Замойскі ўчыніў Жыгімонту каранацыю, і 28 снежня прымас усклаў на галаву шведа карону. Прысутнічалі пры гэтай так званай каранацыі толькі палова каронных сенатараў — частка знаходзілася ў лагеры Максіміляна, другія баяліся ў небяспечны час выбірацца з дому.

Не прыехалі прадстаўнікі Прусіі і Літвы. Так што і каранацыя Жыгімонта, як і выбранне, была незаконнай.

Калі Глябовіч і Сапега прыехалі ў Кракаў, дык убачылі, што са скарбніцы, дзе захоўвалася карона, сарваны і літвінскія пячаткі. Гэтак, не толькі без згоды Літвы, але парушаючы яе правы, палякі каранавалі Жыгімонта. Падобная беззаконнасць апраўдвала і літвінаў, а дзейнічалі яны з разлікам і хітрасцю.

На першай сустрэчы Глябовіч выказаў пратэст Жыгімонту супраць выбрання і каранацыі яго без удзелу Вялікага княства. Аднак літвіны прапаноўвалі ўмовы, прыняўшы якія, Жыгімонт мог стаць вялікім князем. Умовы цяжкія як для Польшчы, так і асабіста для Жыгімонта.

Недаспадобы прыйшоўся Вазе пункт аб прызнанні заключанага Літвой перамір'я, што не ўваходзіла ў планы ягонага бацькі. Шведскі кароль задумаў ваяваць з Масковіяй і прасіў сына, калі ён

будзе ўладаром Рэчы Паспалітай, не звязваць сябе мірнымі дамовамі з маскавітамі. Ды і палякам Жыгімонт абяцаў пераможную вайну з Масковіяй. І вось Літва перакрэслівала планы Вазаў. І кароль, і незаконна скліканы каранацыйны сойм, які складалі толькі ягоныя прыхільнікі, не прымалі літвінскія ўмовы.



Тытульны ліст Статута Вялікага княства Літоўскага. 1588 г.

Але літвіны наўмысна зацягвалі перамовы. Вайна паміж Жыгімонтам і Максімілянам яшчэ не закончылася. Калі б перамог Максіміліян, дык усе дамовы з Жыгімонтам страцілі б сваю сілу. Не трэба было спяшацца. Глябовіч і Сапега пільна сачылі за падзеямі. Літвінскія віжы знаходзіліся ў абодвух варагуючых войсках. Увесь час адтуль паступалі весткі. Набліжалася рашучая бітва. Літвіны зрабілі ўсё магчымае, каб мецъ навіны з поля сечы раней, чым Жыгімонт і ягонае ачаленне. Па дарозе ў Кракаў стаялі змены коней. Свае дзеянні літвіны захоўвалі ў тайне.

Нарэшце 24 студзеня пад мястэчкам Бычына ў Сілезіі адбылася чаканая бітва. Войска Яна Замойскага разграміла войска Максіміляна. Эрцгерцаг трапіў у палон. Літвінскія віжы панеслі гэтую вестку ў Кракаў. Не адпачывалі, мянялі коней — і ў дарогу. На паўтары дні апярэдзілі яны польскіх вестуноў.

Глябовіч і Сапега адзіныя ў Кракаве даведаліся аб перамозе Замойскага. Вось ён — зручны момант для ўдару ў гэтай напружанай і хітрай дыпламатычнай бітве. 27 студзеня літвінскае пасольства заявіла, што калі Жыгімонт і польскі каранацыйны сойм не прымуць умоў Вялікага княства, дык паслы, не прызнаўшы Вазу вялікім князем, пакінуць Кракаў. Ультыматум!

Рашучасць літвінаў напужала Жыгімонта і ягоных паплечнікаў. Не ведаючы пра перамогу Замойскага і палохаючыся пераходу Літвы на бок Максіміляна, каранацыйны сойм саступіў літвінскім патрабаванням і прымусіў прызнаць іх і Жыгімонта. Такім чынам Жыгімонт прызнаваў перамір'е з Масковіяй, абяцаў перадаць палову Лівоніі Літве і без вывучэння і абмеркавання зацвердзіў Статут. Гэта была адна з самых яскравых перамог у гісторыі літвінскай дыпламатыі. За «паражэнне» на Люблінскім сойме ўзялі ў палякаў рэванш — ды яшчэ які!

Статут аднаўляў ва ўсёй паўнаце палітычныя страты Літвы пры уніі. Сваім росчыркам пад прывілеем на прызнанне Статута Жыгімонт узаконіў існаванне Рэчы Паспалітай як федэрацыі дзвюх дзяржаў. Літвінскі погляд на унію перамог. У той жа дзень літвінскае пасольства ад імя Вялікага княства Літоўскага прынесла клятву Жыгімонту Вазе як вялікаму князю літоўскаму. У сваю чаргу і Жыгімонт даў клятву паслам у захоўванні і прымнажэнні правоў, свабод і вольнасцей Княства. А 28 студзеня ён зацвердзіў і Статут:

> Етот статут права Великого князьства Литовского новопоправленый сим прывильем нашим ствержаем и всим станом Великого князьства Литовского ку уживанью на вси потомные часы выдаем [54].

Калі ж палякі вечарам даведаліся аб паражэнні Максіміляна, дык ужо было позна нешта змяніць — справа зроблена, Літва дамаглася свайго. Рад не рад, ды мусіш змірыцца.

Выданне Статута вялікі князь даручыў Льву Сапегу. І той справіўся з гэтым пачэсным даручэннем. Адначасова са складаннем Статута падканцлер рыхтаваў усё патрэбнае для яго друкавання. Гэтым і можна растлумачыць, што ў тым жа 1588 годзе Статут пабачыў свет. Выдалі Статут у віленскай друкарні магілёўскіх шляхціцаў Кузьмы і Лукаша Мамонічаў.

Па жаданні Сапегі быў выраблены арыгінальны курсіўны шрыфт, які нагадваў пісьмо велікакняжацкай канцылярыі. Наво-

шта гэта спатрэбілася падканцлеру? Адказ блізкі да ісціны дае гісторык Юрый Лабынцаў:

> Вельмі істотна і тое, што амаль усё справаводства ў канцылярыі і самі статуты пісаліся старабеларускім скорапісам, у аснове якога ляжыць кірылічнае пісьмо. Гэтая асаблівасць нашых пісьменніцкіх культур заўсёды была перашкодай на шляху іншакультурнай экспансіі [55].

У ліпені станкі ўжо стаялі з набраным шрыфтам. 13 ліпеня Сапега паведамляў Крыштофу Радзівілу:

> Статут новы ўжо загадаў друкаваць па-руску. Хацеў бы яго выдаць і па-польску, аднак калі б давялося яго перакладаць слова ў слова, паводле рускіх словаў і сентэнцыяў, дык атрымаецца не вельмі добра; інакш зрабіць не магу, не прытрымліваццa словаў і сентэнцыяў, а толькі сэнсу. Людзі і так без усякай падставы знаходзяць, у чым мяне дакараць; баяліся, што і гэта камусьці не спадабаецца, асабліва калі сыходзіць ад мяне. Хацеў бы пачуць вашай парады. Я ахвотна выдаў бы пры гэтым Статуце і прывілеі, але не ўсе яны для нас прыдатныя: у адных добры пачатак, а сярэдзіна дрэнная, у другіх сярэдзіна добрая, а пачатак або канец дрэнныя. Не ведаю, ці можна выкінуць тое, што шкадлівае, ці не [56].

Недарэмна так непакоіўся Леў Сапега. Жыгімонт зацвердзіў Статут з умовай, што ён «звязком и списом унии ни в чом противен быти и ничого шкодити и уближати не маеть»[57]. Унесці ў Статут «дрэнныя» прывілеі — значыць прызнаць іх законнасць для Літвы. А гэтымі «дрэннымі» Сапега лічыў прывілеі, выдадзеныя ў 1387 і 1413 гадах, у якіх абвяшчалася аб'яднанне Вялікага княства з Польшчай[58]. А таксама нявыгадныя для Літвы акты Люблінскай уніі.

Невядома, што параіў падканцлеру Крыштоф Радзівіл, але ці з ягонай парады, ці не Сапега ўзяў на сябе смеласць не «псаваць» Статут «дрэннымі» прывілеямі. І ён меў рацыю, бо ні Крэўскую, ні Гарадзельскую уніі літвіны не прызнавалі законнымі, пра што неаднаразова заяўлялі палякам. А «добрыя» і так ляглі ў падмурак правоў і вольнасцей, занатаваных у артыкулах кодэкса.

Замест прывілеяў Сапега змясціў у Статут дзве прадмовы — адну да Жыгімонта, а другую да станаў Княства. У сваім слове падканцлер выклаў прававую канцэпцыю ўнутрыпалітычнага ўладкавання дзяржавы — не толькі самую перадавую на той час,

а нават роднасную рэспубліканскай[59]. Сапега дае сваё бачанне сапраўднага манарха і папярэджвае Жыгімонта, каб паважаў закон і не стаў «тыранам».

> Были тые часы, найяснейшый милостивый господару королю, коли в том згромаженью а посполитованью людском, которое мы Речью Посполитою называем, не правом яким описаным або статутом, але только своим зданъем и уподобанъем владность свою господары и короли того света над людми ростегали. Але иж частокроть от пристойное своее повинности отступовали, а на свой толко пожыток речы натегаючы о сполное доброе всих мало дбали, оттуль то было уросло, же люди, брыдечысе их панованьем и звирхностью и не господармі, але тыранами оные называючы, на самом только статуте и праве описаном все беспеченьство и доброе Речы Посполитое засажали. А про то он, великий и зацный философ греческий, Арыстотелес поведил, же там бельлуа, а по-нашому дикое звера, пануеть, где чоловек водлуг уподобанья своего владность свою ростегаеть. А где опять право або статут гору маеть, там сам Бог всим владнеть [60].

Філасофія палітыкі Сапегі прама супрацьлеглая шаноўнаму на той час Мікіявелі. Калі італьянскі філосаф апраўдвае любыя сродкі для дасягнення і ўтрымання ўлады, калі ідэалам абвяшчаецца беззаконне мацнейшага над падначаленым, дык Сапега лічыць, што і ў палітычным жыцці трэба кіравацца хрысціянскімі запаветамі. Толькі ў гэтым выпадку праўленне манарха прынясе шчасце ягонаму народу. Закон, пабудаваны паводле хрысціянскіх запаветаў, — улада ад Бога.

> А тая того ест причина, же право ест, яко его другий зацный мудрец выславил, оным правдивым розсудком, а мудрым умыслу чоловечого баченьем, которым пан Бог натуру чоловечую обдарыти рачыл, абы водлуг того пристойного а мудрого баченья жывот чоловечий так справовал, яко бы се за тым, што ест почстивого, завжды удавал, а што непочстивого, абы се того выстерегал [61].

Свае думкі Леў Сапега развівае і ў прадмове да станаў Вялікага княства. Ён абгрунтоўвае патрэбнасць для дзяржавы справядлівых законаў, выкананне якіх і дае грамадству магчымасць пачціва і прыстойна жыць, а чалавеку — добрую славу, здароўе і маёмасны здабытак. Закон — гэта ёсць вольнасць.

Обачывали то усих веков люди мудрые, же в кождой Речы Посполитой чоловеку почстивому ничого не маеть быти дорожшого над вольность. А неволею так се маеть гыдити, же не только скарбами, але и смертью ее од себе отганяти есть повинен. ...А прото люди почстивые не только маетности, але и горл своих против кождому неприятелю выносити не жалують, абы под их окрутное опанованье не приходили, а з волности своее будучи злуплени, водлуг воли и мысли их яко невольники не мусели жити. Але вже мало бы на том было, ижбы чоловек з неволи от посторонного неприятеля был волен, гды бы домового неприятеля над собою терпети мусел. Тогды тот монштук або удило на погамованье кождого зуфальцу есть вынайдено, абы се боячы права от кождого гвалту и збытку погамовал, а над слабшим и хдшим не паствилсе и утискати его не мог, бо для того права суть постановлены, абы можному и потужному не все было вольно чынити. Яко Цыцеро поведил, иж естесмо невольниками прав для того, абысьмы вольности уживати могли. А естли ж чоловеку почстивому ничого нет мильшого над тое, гды во отчызне своей безпечне мешкаючы не боитсе, абы его хто на доброй славе его змазати альбо на теле и на здоровью его образити альбо теж на власной местности его укрывдити мог. Тогды то ничому иншому, одно праву причитати маеть, за которым од кождого в покою седить, а жадного усилства, обельженья и укривженья на собе не поносить, бо тот цель и скуток усих прав ест и маеть быти на свете, абы кождый добрую славу свою, здоровъе и маетность в целости мел, а на том всем жадного ущирбку не терпел [62].

А для Вялікага княства першынство права, якому падначальваецца і сам гаспадар, — гэта «скарб в руках наших, который жадною сумою преплачон быти не можеть». Каб чалавек права пісанага справаваўся, ён павінен ведаць законы.

Так если бы од кого был укривжон, абы ведал, где обороны и лекарства в кривде своей искати маеть, бо яко один сенатор рымский другого штрофовал, же права отчизны своее не умел, так кождый обыватель годен ест наганенья, который вольностью се фалить и прав своих умети и розумети не хочеть, которым правом усю вольность свою обварованную маеть. А если которому народу встыд прав своих не умети, поготовлю нам, которые не обчым яким языком, але своим власным права списаные маем и кождого часу, чого нам потреба ку отпору всякое кривды, ведати можам [63].

Статут быў кнігай Сапегі як аднаго з ягоных аўтараў, як рэдактара, як фундатара выдання. Сам Леў вобразна вызначыў сваю працу над Статутам гэтак: «...дорогу лацнейшую и снаднейшую кождому ку ведомости права показал»[64].

Калі ж казаць мовай фактаў, дык перш-наперш адзначым, што Статут на працягу 200 гадоў лічыўся самым дасканалым зводам законаў у Еўропе і адным з самых дэмакратычных. Па сутнасці гэта канстытуцыя арыстакратычнай рэспублікі. Значны ўплыў зрабіў Статут і на прававую думку Еўропы. Гэтак, ён паслужыў узорам пры стварэнні ў 1648 годзе расійскага зводу законаў Саборнага ўкладання. Цэлыя раздзелы гэтага кодэкса былі проста ўзяты з літвінскага Статута. Карысталіся ім і ў Польшчы як крыніцай права ў заканадаўстве.

Паводле Статута, у XVII стагоддзі працавалі суды ў Латвіі, Эстоніі і на Украіне. Статут пераклалі на нямецкую, украінскую, расійскую, польскую, лацінскую і французскую мовы. Ну, а Літва жыла паводле ягоных законаў амаль да сярэдзіны XIX стагоддзя. Такі вось плён працы ўсіх тых, хто прыняў чыннасць у стварэнні гэтай вялікай кнігі літвінаў.

## СПАКОЙ АЙЧЫНЫ

З новым каралём польскім і вялікім князем літоўскім Льву Сапегу давялося пазнаёміцца так блізка, што ён і сам не радаваўся гэтаму. Падканцлер жыў пры каралеўскім двары ў Кракаве для вырашэння літвінскіх спраў. У лістах Льва Сапегі адчуваецца непрыязь да ўладара. Ні дзяржаўнага мыслення, ні дзейнасці, ні таленту палітыка не праяўляў белабрысы юнак са Швецыі. Чым і вызначаўся, дык насупленасцю і маўклівасцю. Ні да складу, ні да ладу. Так сабе — чалавек пры чужым розуме. З самага дзяцінства сына пратэстанцкага караля Швецыі выхоўвалі езуіты.

Кароль спрабаваў супраціўляцца, ды жонка Кацярына Ягайлаўна настаяла, каб Жыгімонт рос у каталіцкай веры. Маці марыла бачыць яго польскім каралём, вось і навучыла польскай мове і веры. А гэтага, на жаль, мала, каб стаць сапраўдным уладаром. Звычаяў і нораваў Польшчы, а тым больш Літвы, ён не ведаў. Вясёлым і запальчывым палякам і літвінам не падабалася, што іх гаспадар замест ловаў, рыцарскіх турніраў, баляванняў то найграе на клавікордзе, то цешыцца мелодыямі прыдворнага аркестра, то вышывае золатам, а то, як алхімік, бавіць час у хімічных практы-

каваннях. На дзяржаўныя справы неяк і часу не даставала, усё на заутра адкладваў — палякі і празвалі яго Даўтрка (Dojutrka). Мала быць хімікам, каб правіць вялікія справы.

Літвінаў больш хвалявала не столькі асоба Жыгімонта і ягоны характер, а тое, як ставіцца ён да Літвы. Станіслаў Альбрэхт Радзівіл недарэмна выказваў свае трывогі:

> Ён малады, яму ўсяго 22 гады, ён падобны на чыстую кнігу. Што палякі занясуць у яе, тое і застанецца ў ёй, як у воску. Ад іх, і выключна толькі ад іх, залежыць зрабіць з яго добрага або дрэннага ўладара [65].

Вось і запаўнялі старонкі гісторыі Рэчы Паспалітай «дарадчыкі»-езуіты ды іх спадручнік Андрэй Баболя. Як пісаў сучаснік:

> Баболя так авалодаў каралём, што той нічога не рабіў без яго парады, як і сам Баболя без езуітаў; нават у справах грамадскіх першай была парада Баболі і езуітаў заўжды шкодная Рэчы Паспалітай, таму што яны не вывучалі яе становішча і інтарэсаў. Езуіты разбіраліся ў справах школьных і свайго ордэна, Баболя жыў аднымі інтрыгамі, але яны раілі аб справах польскіх, маскоўскіх і шведскіх, і асуджэнне іх думкі лічылася святатацтвам [66].

Чаго здзіўляцца, што старонкі панавання «караля езуітаў» — гэта гісторыя войнаў, авантур, веранянавісці і заняпаду дзяржавы.

Сапега адразу спазнаў на сабе характар Жыгімонта. Так ужо здарылася, што злосць, якая душыла палякаў на літвінаў з-за Статута, яны выплеснулі на падканцлера. Як у непрыяцельскім стане апынуўся ён — вакол варожасць. Настрою палякаў паддаўся і Жыгімонт, і ён злаваў на Літву. Аб атмасферы кракаўскага двара Сапега паведамляў Крыштофу Радзівілу. Гэтак, у лісце ад 31 студзеня 1588 года ён піша:

> Вельмі ўзмацніліся паны палякі перамогай над Максімілянам і зрабілі асабліва пагардлівымі да народа літоўскага, кажучы: каб гэтая навіна прыйшла перад заканчэннем нашых спраў літоўскіх і прысягай каралеўскай, не дазволілі б нам ані тых пастулатаў нашых, ані супакою, ані паловы Лівонскай зямлі. Пан Асецкі, пасол ад войска, іменем гетмана і ўсіх жаўнераў даказваў, што мы да зямлі Лівонскай нічога не маем, і досыць ушчыпліва народ літоўскі ўспамінаў, чаго мы, не жадаючы слухаць, бо нам спрачацца з імі не гадзілася, пайшлі прэч, не хочучы даслухаць гэтага іхняга пасоль-

ства. Вакансіі літоўскія ўсе разданы перш, чымся мне аб іх прыйшлося гутарыць, ды і парадзіцца са мной не хацеў [67].

У другім лісце ад 17 лютага Сапега піша пра непрыязь Жыгімонта да Літвы.

Кароль казаў мне, што болей палякам павінны, чымся Літве, бо яму палякі паказалі больш зычлівасці, чым Літва. І ён не толькі кажа гэтак, але і робіць. Ужо там больш палякі ў нас дастаюць, чым сама Літва. Літвіну адмовяць, а паляку ў той час дадуць. Таму і паведамляю Вашае Міласці, што як толькі штосьці адчыніцца на Літве, дык усё палякам імгнення аддадуць [68].

І да спраў Княства Жыгімонт не хацеў і падступацца. Такое важнае пытанне, як пацвярджэнне літвіна-маскоўскага перамір'я, вялікі князь зацягнуў на месяцы. Сапега напісаў грамату, пераклаў яе на польскую мову, каб Жыгімонт азнаёміўся, а той за колькі тыдняў нават у рукі яе не ўзяў. Штодня падканцлер нагадваў пра грамату і чуў адзін і той адказ: «Яшчэ не чытаў»[69]. І не пра мір думаў уладар, а пра вайну. Гневаўся на Маскву і жадаў яе біць. Як і чым тут даць рады? «Ужо не ведаю, што далей чыніць», — прызнаваўся Сапега[70].

Цяжка аднаму быць супраць гаспадара і польскіх паноў, якім за вялікі гонар — пахлёбствам падабацца пану. Апіраюся, як кот на лёдзе, але калі не буду магчы, хіба што з якойсь пратэстацыяй ад'еду дадому [71].

Каб падканцлер не назаляў, Жыгімонт не прымаў яго. Палову года Сапега не атрымліваў аўдыенцыі з вялікім князем. Гэта ўжо занадта! Відавочная знявага не толькі асабістага гонару, але і Літвы, якую прадстаўляў пры двары падканцлер.

Не толькі я, але і ўвесь наш народ зняважаны каралём. Жыву тут дзеля формы, ад двара гоняць прэч, таму і не жадаю далей падноскаў абіваць», — пісаў Сапега Крыштофу Радзівілу [72].

Мінуў час, а становішча не змянілася. Па-ранейшаму Жыгімонт не падпускаў да сябе літвінскага падканцлера. Па-ранейшаму тая ж варожасць да Літвы. І дарэмна супакойваў Крыштоф Радзівіл Сапегу, што «кароль, здаецца, ужо лепш адносіцца да нашага народа». Льву гэтак не здавалася:

Кароль жалее таго, што калі-колечы зрабіў літвіну. Не хачу быць pro forma пры двары і слухаць знявагі нашага ўрада, бо ўладарыць камора, а ўраднікі непатрэбныя [73].

Сапега расчараваўся ў новым вялікім князі. Ад роспачы ратавала праца над рэдакцыяй Статута. Кракаў ён усё ж не пакінуў — застаўся на варце інтарэсаў Літвы.

Мушу яшчэ не толькі са шкодай, але з жалем сваім трываць тут да часу, пакуль чалавечае цярпенне дапусціць [74].

Але і цярпення ўжо не было. Восенню Сапега вярнуўся ў Вільню. У друкарні Мамонічаў чакалі яго падрыхтаваныя да працы станкі. А напрыканцы года Леў трымаў у руках надрукаваны Статут.

Новыя перспектывы адкрыліся для Сапегі пасля прызначэння яго ў 1584 годзе на пасаду канцлера Вялікага княства. Цяпер ён стаў галоўным ахоўнікам правоў і вольнасцей панства. Спатрэбіўся Сапега і Жыгімонту.

На Варшаўскім сойме Сапегу выбралі каралеўскім камісарам для суцяшэння бунту рыжанаў. Як вядома, Рыга ўпарта адстойвала свае правы вольнага горада. У 1581 годзе Стэфан Баторый зацвердзіў іх. Адным з прывілеяў была дэкларацыя свабоды пратэстанцкай веры. Аднак адразу пасля падпісання прывілея кароль пад ціскам езуітаў патрабаваў ад гарадскога магістрата перадачы католікам дзвюх пратэстанцкіх цэркваў. Магістрат упарціўся. Угневаны кароль ветліва прыгразіў: «Я сёння не магу нічога есці, пакуль не памалюся ў царкве»[75].

Пагроза падзейнічала, і католікі атрымалі цэрквы. Затое пратэстанты засталіся незадаволенымі. Іскаркі мяцяжу ўспыхнулі ў іх душах. А ветрам, які раздзьмуў пажар, стаў новы каляндар. У 1582 годзе Стэфан Баторый загадаў увесці ў Рэчы Паспалітай каляндар, выпраўлены папам Рыгорам XIII. Гэты каляндар, празваны грыгарыянскім, адмяняў часалік старога — юліянскага і на два тыдні апярэджваў яго. Але традыцыі не касуюцца каралеўскімі ўказамі. Паўсюль раздаваліся нараканні. Парушаўся прызвычаны лад жыцця. Перамяшаліся дні святаў. Як адзначыў летапісец:

Праве было начало пристья антихристова у таком великом замешанью [76].

Хваляваліся і ў Рызе. Папская выдумка пераблытала святы. У новым календары рыжане ўбачылі яшчэ адзін замах на пратэ-

станцкую веру. Калі ж езуіты правілі ўрачыстую службу на Раство Хрыстова, паводле грыгарыянскага злічэння, раззлаваны натоўп раптам уварваўся ў касцёл — закідаў святароў камянямі, пабіў шыбы, пашкодзіў усё ўбранне. З'явіліся і правадыры, гарадскія саноўнікі Брынкен і Марцін Гізе. Нацкаваныя імі рыжане захапілі магістрат. Гізе заклікаў распраўіцца з тымі сябрамі магістрата, з-за якіх горад страціў свае вольнасці, правы і цэрквы. Улады спрабавалі мірна супакоіць гнеў рыжан. Аднак адміністратара Лівоніі віленскага біскупа Юрыя Радзівіла не пусцілі ў горад.

Не прынялі рыжане і загад Баторыя прынесці скаргу на магістрат на яго каралеўскае імя. Пзе і Брынкен правілі натоўпам і з'яўляліся гаспадарамі становішча. Яны знайшлі двух віноўнікаў і прымусілі магістрат даць дазвол казніць іх. Так пралілася кроў.

У Баторыя скончылася цярпенне, і ён загадаў сілай суняць бунт. Да Рыгі падышлі каралеўскія жаўнеры. Гізе адразу ўцёк у Швецыю. А ў часы безгаспадарства пра Рыгу забылі. Ды і рыжане астылі. Але вось вярнуўся ў горад Гізе — ізноў успыхнулі хваляванні. На загад магістрата звязеніць Гізе другі правадыр бунту Брынкен напаіў гурт сваіх прыхільнікаў і напусціў іх на магістрат. Рыга апынулася ў руках Гізе і Брынкена. Яны наладзілі сувязі з Максіміліянам. Настроеныя супраць Жыгімонта рыжане адмаўляліся яму прысягаць.

Становішча ў Рызе амбяркоўвалася на Варшаўскім сойме ў 1589 годзе. Сойм зліквідаваў аўтаномію Лівоніі, падзяліў яе на ваяводствы і староствы. Ліцвіны і палякі атрымалі правы займаць пасады і набываць землі ў Лівоніі. Такім было вырашэнне спрэчкі



*Аўтограф Льва Сапегі*

з-за гэтага краю паміж Літвой і Польшчай. Замест падзелу паміж сабой пагадзіліся на супольнае валоданне.

Для ўціхамірвання Рыгі сойм паслаў у горад Льва Сапегу і кракаўскага кашталяна Севярына Бонара. Як толькі пра гэта даведаліся рыжане, дык пастанавілі не пускаць каралеўскіх камісараў у горад. Ледзь не пралілася кроў. Гізе і Брынкен вывелі на вуліцы ўзброеных гараджан. І каб не заступніцтва гарнізона палкоўніка Фарэнсбаха, мяцежнікі разагналі б магістрат. Сапега ведаў, якую сустрэчу рыхтуюць камісарам правадыры мяцяжу. Дзейнічаць сілай тут не выпадала. Але сілу павінны бачыць і паважаць яе.

5 ліпеня камісары пад гарматныя стрэлы ўрачыста ўехалі ў Рыгу. Следам увайшоў у горад вайсковы аддзел у 150 чалавек. Гізе і Брынкен са сваімі хаўруснікамі прыціхлі.

Камісары абвясцілі магістрату каралеўскую міласць на захаванне гарадскіх прывілеяў і патрабавалі прынясення прысягі. А завадатараў мяцяжу загадалі звязеніць і ўчыніць над імі суд. Не паспелі арыштаваных Гізе і Брынкена прывесці пад варту ў ратушу, як каля яе пачалі збірацца людзі. Купец Гергард Фрызе заклікаў натоўп да бою. Ужо раздаваліся ваяўнічыя крыкі. Сапега не хаваўся за спіны жаўнераў, разам з двума сябрамі магістрата ён выйшаў да народу. Мужнасць канцлера нібыта абяззброіла натоўп. Ніхто не асмеліўся падняць руку на яго. Людзі паддаліся ўгаворам не праліваць крыві. Для захавання супакою магістрат наступным днём арыштаваў Фрызе.

27 ліпеня рыжане прысягнулі камісарам на вернасць Рэчы Паспалітай. Але пакой у горадзе не наступіў. Падчас суда Гізе і Брынкен праз акно пачалі крычаць і маліць аб дапамозе. Натоўп паддаўся мальбам падсудных. Зноў на шляху раз'ятраных людзей паўстаў канцлер: «Рыжане, памятайце, што вы прысягалі, інакш вы рызыкуеце жыццём!» — усклікнуў Сапега[77]. Ваяўнічасць згасла перад мужнасцю.

Суд вынес Гізе і Брынкену смяротны прысуд. Паводле просьбы сваякоў асуджаных, Сапега дазволіў пахаваць іх целы ў царкве. Змягчыў ён і пакаранне — замест чвартавання назначыў казнь мячом. І злодзей для канцлера «Божье створенье».

Пакаранне адбылося 2 жніўня. З самай раніцы жаўнеры занялі рынак і з запаленымі факеламі стаялі ў баявым шыхце. Але рыжане не думалі пра мяцеж і збегліся на рынак пагладзець на казнь. Перад смерцю Брынкен раскаяўся і заклікаў народ падначаліцца ўладам.

Калі кат сцяў яму галаву, Гізе папрасіў у канцлера дазволу праспяваць рэлігійны гімн. Сапега адказаў, што спяваць ужо позна. Тады Гізе паслухмяна апусціўся на калені перад плахай і вымавіў: «З глыбінь духу звяртаюся да цябе, Бог»[78]. Кат адсек яму галаву. Над астатнімі зачыншчыкамі мяцяжу суд злітаваўся і пакараў іх зняволеннем і грашовымі штрафамі.

Камісары аднавілі ўладу магістрата і прымірылі яго з гараджанамі. «Такім чынам, дарагі мір зноў запанаваў у Рызе», — адзначыў задаволены рыжскі летапісец[79].

Гэтак, часам «дарагі мір» даводзілася захоўваць суровымі мерамі. І Сапега, абараняючы супакой дзяржавы, не даваў літасці ліхадзеям і мяцежнікам. Кожны атрымліваў па заслугах. Добра разумеў канцлер небяспеку ўнутраных звадак і боек:

> Я не жадаю нашай айчыне таго, што адбываецца ў Францыі. Няма ў Францыі такіх ворагаў, якія каля Польшчы з Літвою, а таму яны б'юцца паміж сабой і няма каму іх разняць. Нас разнялі б хутка, з аднаго боку турчын, з другога — татарын, а з трэцяга — маскавіт, ды і немцы не спалі б, але дасць Бог, што ў нас не дойдзе да гэтага [80].

«Спакой Айчыны да скону дзён буду сцерагчы», — вось мэта Сапегі[81]. Калі ж у канцлера не даставала ўлады сцерагчы спакой, ён выкарыстоўваў і слова. Пераканаўчымі довадамі ён стрымліваў ахвотнікаў сеяць буру. Сапега выказваў погляды, сугучныя лепшым думкам мысліцеляў-гуманістаў. Паказальная ў гэтых адносінах палеміка Льва Сапегі з уніяцкім архіепіскапам Язафатам Кунцэвічам. Сам Сапега прыхільна ставіўся да царкоўнай уніі паміж каталіцкім касцёлам і праваслаўнай царквой Літвы і Украіны. Выступаў з прамовай пры яе заключэнні ў 1596 годзе ў Бярэсці. Як палітык ён звязваў з уніяй перш за ўсё палітычныя выгады для Княства — гэта замірэнне рэлігійных звадак і выхад з-пад уплыву самахоць заснаванага маскавіцкага патрыяршаства. Але перш за ўсё літвінскія вярхі (свецкія і духоўныя) разглядалі унію як важны крок да стварэння нацыянальнай царквы літвінаў[82].

Асаблівую руплівасць праяўляў полацкі і магілёўскі архіепіскап Язафат Кунцэвіч, які сваімі палымянымі словамі павярнуў да уніі нямала народу. Але калі Кунцэвіч пазачыняў праваслаўныя цэрквы епархіі, дык вернікі выступілі на абарону сваёй веры. Сапега прадбачыў наспяванне выбуху — рэлігіёзнай вайны.

Не мог не трывожыць канцлера і той факт, што запарожскія казакі абвясцілі сябе абаронцамі праваслаўя. А гэта сіла, з якой

трэба было лічыцца. Канцлер хацеў папярэдзіць крывавыя падзеі. У лісце да Кунцэвіча ад 12 сакавіка 1621 года Сапега раіць архіепіскапу адмовіцца ад насілля і выказвае ідэі талерантнасці і гуманізму. Гэта быў голас розуму і чалавекалюбства ў тым раз'юшаным вэрхале ўзаемных абвінавачванняў, знявагі, спрэчак, якімі асыпалі адзін аднаго уніяцкія і праваслаўныя святары. Вось гэты ліст з некаторымі скарачэннямі:

Не пярэчу, што я сам прыкладаў старання каля уніі і пакінуць яе было б справай неразумнай, аднак ніколі мне не прыходзіла ў думку, каб Ваша Міласць людзей да яе прыводзіць гэткімі гвалтоўнымі спосабамі. Вы Вашымі неразважнымі гвалтамі падбурылі і, скажу, прымусілі народ рускі да адпору і зламання ўчыненае яго каралеўскай міласці прысягі.

Пішаце аб наварачаванні на унію адшчапенцаў і г.д.; сапраўды, трэба падумаць аб іх наварачаванні, дбаючы аб тым, каб была адна аўчарня і адзін пастыр. Але ў гэтым трэба паступаць асцярожна і разумна, кіруючыся абставінамі часу, асабліва ў нашай айчыне, дзе зусім не служыць гэная сэнтэнцыя «прымушай іх уваходзіць». Трэба, каб гэтая наша пільнасць і жаданне агульнага аб'яднання абапіраліся на асновах любові, паводле слоў апостала Паўлы. Але бачу, што Вы аддаліліся ад навукі гэтага апостала, і таму нядзіўна, што тыя, каторыя былі пад Вашай уладай, выйшлі з належнае Вам паслухмянасці. Што датычыць небяспекі, пагражаючай Вашаму жыццю, дык можна сказаць: «...кожды сам прычынай сваёй бяды». Трэба карыстацца з памысных абставінаў, але не трэба паддавацца неразумнаму захапленню, асабліва калі ідзе аб веравызнанні, бо тады правадыры бываюць выстаўлены на нялічаныя небяспекі. «Я абязаны, — пішаце, — наследаваць біскупаў і г.д.». Ёсць рэччу пахвальнай наследаваць св. біскупаў, напр. Златавуснага; але наследаваць іх трэба такжа ў пабожнасці, навуцы, цярплівасці і даванню добрых прыкладаў. Прачытайце жыццяпісы ўсіх пабожных біскупаў, творы Златавуснага, а не знойдзеце ў іх ані жалабаў, ані пратэстацыяў, працэсаў, спрэчак, позваў на суд аб праследаванні, аб скідаванні з урадаў з асабістых карысцяў, аб пазбаўленні жыцця пабожных духоўных; знойдзеце там толькі тое, што павялічвае славу Боскую, асвету і будову душаў людзкіх і ўласкавенне Эўдоксіі, гнеўнай на слуг царквы.

«Але калі, — пішаце, — няправаверныя на мяне адважна наступаюць, дык я мімаволі прымушаны бараніцца». Запраўды ж не

гэтак вучыў нас Хрыстос: ён, ведзены на смерць, маліўся за сваіх ворагаў, — гэтак і Вашай Міласці трэба паступаць. Яшчэ пішаце: «...на соймах падносяцца галасы, шкадлівыя не толькі для уніі, але і для ўсяго рымскага духавенства». Хто ж гэтаму вінен? Адна унія прычынай гэтых усіх няшчасцяў! Калі гвалціце людзкія сумленні, калі замыкаеце цэрквы, каб людзі без абедні, без абрадаў хрысціянскіх, без таенстваў гінулі, як няверныя, калі самавольна надужываеце любові і павагі да гаспадара, дык тады абыходзіцеся без нас, але калі з прычыны ўціскаў паўстаець у народзе непакой, каторы трэба ўціхамірыць, — тады намі добра дзверы запхнуць. Таму і працiўная старана думае, што мы з Вамі паразумеліся, каб супольне гвалціць людзкія сумленні і нарушаць агульны супакой, — чаго ніколі не было. Сцеражыце уніі для сябе і выконвайце спакойна свае абавязкі, не наражаючы нас на агульную нянавісць, сябе ж самога на небяспеку і гэтакі вялікі перад усім народам упадак. «На непрымаючых уніі,— пішаце,— выдаць загад і выгнаць іх з дзяржавы». Барані Божа! Няхай не дзеецца ў Айчыне нашай гэтакае страшэннае беспраўе!

А па гэтым усім гаспадар загадвае цэрквы іхнія распячатаваць і адчыніць, аб чым я Вашай Міласці пішу. А калі Вы па гэтым маім напамінанні не адпячатаеце і не адчыніце цэркваў, дык я сам загадаю іх распячатаць і праваслаўным аддаць, каб яны паводле свайго набажэнства ў цэрквах свае абрады маглі б справаваць. Жыдам і татарам не забараняецца ў гаспадарствах каралеўскіх мець свае сінагогі і мячэці, а Вы хрысьціянскія пячатаеце цэрквы! З гэтага поваду разыходзіцца ўжо ўсюды пагалоска, што яны прагнуць быць лепш у няверных туркаў у падданстве, чымся цярпець гэтакі ўціск свайго сумлення.

Гэта мае аб'ясненні, каторыя даю на Вашае пісьмо. Жадаю сабе на Прышласць быць вольным ад спораў з Вамі. Прашу толькі Найвышэйшага аб усялякую для Вас памыснасць і адначасна аб духа лагоднасці і любові да бліжняга, застаючыся з паважаннем Леў Сапега [83].

Шкада, што не паслухаў архіепіскап мудрых парад канцлера. Па-ранейшаму сілай усталяваў ён унію. І наклікаў бяду на сваю галаву. Супраць святара ў 1623 годзе паўсталі жыхары Віцебска. Кунцэвіч і некалькі чалавек з ягонага атачэння загінулі ад рук раззлаваных віцьбічаў. Бяда бяду вядзе. Як і папярэджваў Сапега, што кожны сам прычына сваёй бяды, так і здарылася.

Жыццё часта наносіла жорсткія ўдары па ідэалах Сапегі, нібыта выпрабоўвала іх на трываласць. І не без душэўнай скрухі даводзілася яму прызнаваць перавагу явы. Гэтак, як канцлер ён узначаліў камісію па вышуку забойства Кунцэвіча. Угневаны папа Урбан III патрабаваў ад Жыгімонта III знішчыць «агнём і мячом заразу схізмы». Закон павінен выконваць і ён, і закон патрабаваў суровай кары забойцам. 20 чалавек былі пакараны смерцю.

Несуадносіны паміж ідэаламі і жыццём прыгняталі канцлера. Можна прымірыцца з суровай рэальнасцю — гэта таксама выхад. Сапега не мірыцца. Не, ён не бярэ на сябе місію ашчаслівіць чалавецтва і не паўстае супраць тагачаснага становішча грамадства, але па магчымасці змякчае жорсткасць рэалій жыцця.

Можа быць, для многіх сучаснікаў некаторыя ўчынкі канцлера ўспрымаліся як дзівацтва багатага пана. «У вас хлоп хлопам, а ў мяне вяльможны, ясна вяльможны; бо калі я хлопа мець не буду, пэўна, яснавяльможным не буду», — любіў канцлер вось гэтымі словамі падкрэсліць свае адносіны да простага мужыка[84]. Сапега не драў па сем скур са сваіх падданых, але ж і не пратэставаў супраць таго, што яны сваёй працай забяспечваюць яго яснавяльможнасць. У часы, калі з хлопам размаўлялі бізуном, Сапега, які ўдзячна прызнаваў халопскі мазоль і пот, выглядаў, прынамсі, дзіваком.

На сваім прыкладзе Сапега паказваў ідэал, як ён гэта разумеў, паміж канфесійных дачыненняў. Так, ён мяняў веру — з праваслаўя перайшоў у пратэстанты, а пасля хрысціўся ў каталіцтва, але ніколі не чарніў іншую канфесію, не абвяшчаў, што вера, у якой ён знаходзіцца, ёсць адзіная і правільная. Як актуальна гучыць і ў наш час роздум Сапегі аб хрысціянскай лучнасці:

> Не без прычыны святы Павел да слоў — вера ёсць Боскі дар — не прыпісаў «каталіцкая», бо ніхто не ведае, ці варты ён любові або нянавісці. Святое пісьмо кажа: шмат закліканых, але мала выбраных. Не без прычыны і тое, што пан не адвяргаў схізматыкаў, бо Дух Божы, які ёсць дар Бога, дыхае, дзе пажадае. Аб тым, што супраць Боскай волі прымушаць да веры якое-небудзь грамадства, сведчаць наступныя словы: пабудую сваю сталіцу на поўначы і буду падобны найвышэйшаму. Яшчэ і таму вера называецца Боскім дарам, што да яе ніхто сам не далучаецца, як Хрыстос казаў: ніхто не можа прыйсці да мяне, калі мой Бацька не пакліча да гэтага. Такі шлях веры, бо справа далучаных да Бога — верыць [85].

У той час, калі мацнела ў Рэчы Паспалітай веранянавісць, калі праваслаўны Канстанцін Астрожскі абзываў папу антыхрыстам і пагражаў католікам і уніятам вайной, калі католік Юрый Радзівіл паліў Святое Пісьмо, надрукаванае ягоным бацькам-пратэстантам, калі уніят Кунцэвіч зачыняў праваслаўныя цэрквы, Сапега фундуе і каталіцкія, і уніяцкія, і праваслаўныя храмы, засноўвае пры іх школкі, выдае праваслаўную літаратуру. Толькі касцёлаў ён пабудаваў на свае сродкі 24, сярод іх — св. Міхайлы і бернардзінцаў у Вільні, езуіцкі ў Бярэсце, кармелітаў у Бялынічах, бернардзінцаў у Гародні, езуіцкі калегіум у Оршы, св. Францыска ў Бялынічах, Міхалаве, Вільні, Бярэсце, картэзіянцаў у Бярозе, св. Тройцы і апосталаў Пятра і Паўла ў Ружанах, а таксама шэраг праваслаўных і уніяцкіх храмаў. Пагрозліва гучыць папярэджанне Сапегі тым, хто сеяў нязгоду паміж хрысціянамі:

> Каждого таковаго я зараз позываю перед суд Божый страшный, и с ним о то на страшном суде Христовом судитися хочу, где ему то нехай не будет отпущено [86].

І калі ў Вялікім княстве захоўваўся рэлігійны мір, дык таму, што на варце яго стаяў канцлер Леў Сапега. То ён заступаецца за уніяцкага мітрапаліта Іпата Пацея перад праваслаўнымі, то стрымлівае ваяўнічых казакоў ад выступу супраць уніятаў, то ў прыватнай перапісцы раіць князю Канстанціну Астрожскаму адмовіцца ад думкі пачаць вайну з католікамі і уніятамі. І Сапегу слухаюцца, ягоныя парады прымаюць. «Великий Леоне» — пачціва называюць суайчыннікі Сапегу[87]. Нават Жыгімонт Ваза, які непрыхільна ставіўся да літвінскага канцлера, у цяжкія для сябе моманты шукае яго падтрымкі.



*Кніжны знак Льва Сапегі. У коле лацінскі надпіс: Frustra vivit avi nemini prodest — Марна жыве той, хто нікому не дапамагае. Каля 1600 г.*

Вось і ў 1590 годзе, калі польскія саноўнікі не прымалі жадання манарха ажаніцца на Ганне Габсбургскай, ён просіць у Сапегі садзейнічання і з ягонай дапамогай дамагаецца свайго. Аднак варта

Жыгімонту нешта задумаць на шкоду Вялікаму княству, як на яго шляху паўстае Сапега. І канцлер прымушаў венцаноснага ўладара паважаць закон. Як не нагадаць гісторыю з намінацыяй Віленскага біскупства. Праверка сілы Статута Княства.

Справа пачалася ў 1591 годзе, калі месца кракаўскага біскупа заняў Юрый Радзівіл, які дагэтуль з'яўляўся віленскім. Гэтае назначэнне насцярожыла Сапегу: прадбачыў спробу каронных дыгнітарыяў правесці на Віленскае біскупства паляка. Так яно і здарылася.

Палякі, спасылаючыся на тое, што Кракаўскае біскупства дасталася літвіну, прапаноўвалі наўзамен аддаць Віленскае паляку Бернарду Мацяеўскаму. Канцлер добра разумеў далёкія намеры польскіх палітыкаў. Важна стварыць прэцэдэнт. Парушыць артыкулы Статута і назначыць на пасаду ў Княстве «чужаземца». Цяжка зрабіць пачатак, а тады...

> А тады, — на думку Сапегі, — паддайцеся ва ўсім палякам, адмоўцеся ад сваёй пячаткі, ласкі і булавы, і няхай будуць польскія: пячатка, булава і ласка, ды і агульная скарбніца.

А таму, каб гэтага не адбылося, Сапега рашуча выпрашыў: «Або загінуць, або дамагчыся таго, каб літвін быў віленскім біскупам»[88]. І дамогся. На ўсе просьбы, мольбы і пагрозы Жыгімонта прыкласці пячатку Княства да намінацыі Мацяеўскага Сапега адказаў адмовай. Ён заяўляў:

> Я з асобы маёй даховываю веру Айчыне маёй і не толькі пячатаваць не буду таго, што будзе супраць правоў іншых, але процістаўіцца супраць гэтага [89].

Некалькі гадоў доўжылася гэтае супрацьстаянне. Жыгімонт і ягоныя польскія дарадчыкі ўсяляк спрабавалі зламаць волю Сапегі. Дзейнічалі і праз папу, і праз папскага легата. Прыбягалі да падману і ашуканства.

Гэтак, у 1595 годзе Жыгімонт чарговы раз патрабаваў ад канцлера паставіць пячатку, маўляў, і віленскі ваявода Крыштоф Радзівіл згодны на гэта. Сапега не паддаўся на каралеўскі ціск, а напісаў ваяводзе.

Сапраўды, Радзівіл гатовы пайсці на кампраміс, каб на далейшы час забараніць соймавай пастановай назначэнне палякаў на пасады Вялікага княства, а літвінам пад пагрозай пакарання прымаць назначэнне на польскія пасады. Праект ваяводы падабаўся Сапегу,

але ён настойваў на згодзе станаў Вялікага княства. А вось станы на павятовых сойміках аднадушна пратэставалі супраць намаганняў Жыгімонта ўчыніць «зменшенья и затертья права, волности и свобод Великого князства Литовского»[90].

Сапега адчуваў за сабой падтрымку ўсёй дзяржавы і заставаўся непахісным. Нарэшце ў 1597 годзе Жыгімонт абвясціў Мацяеўскага віленскім біскупам, а для пацвярджэння намінацыі папам рымскім вырашыў паставіць на прывілеі польскую пячатку, спадзеючыся, што ў Рыме прызнаюць яе за літвінскую. Сапега заявіў каралю пратэст і даў зразумець яму, што Літва не пагадзіцца з такой «намінацыяй».

Цяпер Мацяеўскі стаяў яшчэ далей ад віленскай катэдры, чым раней. Хітрыкі Жыгімонта з пячаткай не ўдаліся. Папскія прадстаўнікі ўважліва сачылі за супрацьстаяннем караля і канцлера. Інтарэсы каталіцкага касцёла для папы былі вышэйшымі за інтарэсы польскага ўраду. Бок Літвы прыняў папскі нунцый, які забараніў імем папы Мацяеўскаму ехаць у Вільню. Толькі смерць Юрыя Радзівіла ў студзені 1600 года дала Жыгімонту магчымасць з гонарам адступіць — месца кракаўскага біскупа дасталася Мацяеўскаму, а віленскім біскупам стаў літвін Бенедыкт Война. Літвінскі статут перамог, і манарх вымушаны падначаліцца закону.



*Вільня. Былы палац Льва Сапегі, перабсталяваны ў жаночы кляштар. Сучасны выгляд*

Ён атрымаў шмат, ён і аддаваў шмат. Лёс выбраў яго, ён выбраў гэты лёс. Чалавек, які «павінен дбаць пра грамадскае дабро і пра справы дзяржаўныя»[91]. Лёс даў яму ўладу, улада даверыла яму лёс Айчыны — святы дар і давер. Дар свой ахвяраваў ён народу — Айчына стала яго лёсам.

Ён ішоў наперадзе свайго часу і хацеў весці за сабой грамадства. А грамадства азіралася назад у прызвычаны і знаёмы ўчарашні дзень. Грамадства не разумела яго, яно шукала пажытак у сённяшнім дні. Задаволеным малым было дастаткова, каб не шукаць вялікага. І дзень змяняўся днём і прыносіў усё той малы пажытак. Але жыў ён марай пра вялікае.

## МАРНАЯ НАДЗЕЯ

А марыў Леў Сапега пра саюз славянскіх народаў. Як ніхто іншы, канцлер разумеў неабходнасць гэтага аб'яднання. У свеце складваліся моцныя кааліцыі. Каталіцкая ліга, на чале якой стаялі папа рымскі і Габсбургі. Пратэстанцкія краіны ладзілі свой пратэстанцкі саюз. Турэцкія султаны аб'ядноўвалі мусульманскі свет. Пад прыкрыццём рэлігійных ідэй гэтыя саюзы перш за ўсё клапаціліся пра пашырэнне сваіх межаў — заваёвы новых земляў.

Леў Сапега хацеў стварыць славянскі саюз Польшчы, Літвы і Масковіі, што дазволіла б нарэшце ўсталяваць паміж імі доўгачаканы мір і абараніцца агульнымі сіламі ад паступу мусульманскай Порты і заваёўніцкіх захадаў Швецыі. Вялікая ідэя, вартая таго, каб прысвяціць сябе яе ажыццяўленню.

Калі літвіны выступалі за мір з Масковіяй, дык палякі, наадварот, намагаліся сарваць яго. А ў гэты час узбройваўся для паходу на Лівонію шведскі ўладар Карл Судэрманскі. Сапега, знаходзячыся восенню 1599 года ў Рызе, атрымліваў з Швецыі трывожныя весткі.

> Паведамляюць, што герцаг Карл ужо ўступіў у лігу з дацкім каралём. Калі яму яшчэ ўдасца з-за нашага нядбальства злучыцца і з Масковіяй (такую магчымасць таксама трэба ўлічваць), дык што будзем рабіць мы, якія лічым усё малаважным і ўсё зневажаем? [92].

Наракаў Сапега і на легкадумнасць Жыгімонта, які з-за сваёй пыхі сарваў перамовы з маскоўскімі пасламі. Непакоілася і літвінская шляхта і прасіла паноў раду разгледзець адносіны з

Масковіяй на бліжэйшых сойміках. Ведалі, што першы ўдар у вайне са Швецыяй або Масковіяй прыме на сябе Літва. А палякі адсядзяцца дома за спінамі літвінаў. І толькі тады, калі Карл завалодаў Фінляндыяй і шведскае войска з'явілася ў Эстоніі, валашскі гаспадар Міхай захапіў Семіградзе і сталі вядомымі ягоныя зносіны з царом, Жыгімонт спахапіўся. Ён папрасіў Сапегу падрыхтаваць праект граматы ў Маскву.

Аднак на Варшаўскім сойме польскі бок лічыў, што становішча Рэчы Паспалітай не такое і цяжкое, каб прасіць міру ў Масковіі. Што гэта — самаўпэўненасць ці звычайная праява польскай палітыкі падстаўляць пад удар Літву, каб без праблем забраць яе? Так ці інакш, а расплачвацца павінны літвіны, і яны патрабавалі ад Жыгімонта назначыць пасольства дзеля станаўлення вечнага спакою. А каб вялікі князь быў згаворлівым, абяцалі даць яму грошы для вайны за шведскую карону.

І Жыгімонт не адмовіў. Для значнасці місіі вырашылі адправіць «вялікае пасольства». На чале яго ўсе жадалі паставіць Льва Сапегу. «Аднаго цябе бачым, каму можна даручыць пасольства ў Маскву»[93]. Сапега з удзячнасцю прыняў гэты давер. І не з пустымі прамовамі і не спрачацца ехаў канцлер. Ен склаў праект лігі славянскіх дзяржаў:

1. Абодвум уладарам быць паміж сабой «в любви и в згодзе и статечной вечной приязни», паны рада і баяры думныя, усе свецкія і духоўныя станы «в згодзе и в вечной нероздзельной милосци Братерской били яко людзи одное Вери Хрэсцьянское, одного езыка и народу словеньского»*.
2. Агульнымі будуць непрыяцелі і ворагі абедзвюх дзяржаў.
3. Ніякіх дамоваў, шкодных адзін аднаму, уладары не заключаць, узгадняецца знешняя палітыка.
4. Падчас небяспекі аднаму другі «ширже и жичливе верне без хитросци ратовать маець».
5. Землі, здабытыя агульнымі сіламі, пераходзяць да той дзяржавы, якая мае на іх права.
6. Землямі, якія не належалі раней ні аднаму з панстваў, валодаць разам або падзяліць іх.
7. Дазваляецца вольна паступаць на службу любому з двух уладароў.
8. Дазваляецца літвінам і палякам вольна «женитися, кревнитися» з маскавітамі.

* Зноў пераканаўчае сведчанне, што літвіны адносілі сябе да «народу словеньского».

9. Можна выслужыць землі і вотчыны ў абодвух панствах.
10. Абмен паміж двума панствамі вучнямі.
11. Свабода веравызнання «повольно Веры свое уживати».
12. Дазвол будаваць у Масковіі каталіцкія касцёлы, а ў Літве і Польшчы праваслаўныя цэрквы.
13. Купцы «вольно и безпечно» гандлююць у абодвух панствах.
14. Выдаваць з абодвух бакоў зладзееў і «вшэляких шкодников».
15. Разам стаяць супраць татараў.
16. Абодва гаспадарствы маюць «супольни флот на мору Литовском и на мору Великом».
17. Манета аднолькавая «одное цэны, одное ваги».
18. Павінны быць зроблены дзве кароны: адна кладзецца на галаву караля і вялікага князя пры каранацыі маскоўскім паслом, другая такім чынам кладзецца цару паслом ад Рэчы Паспалітай.
19. Уладар Рэчы Паспалітай выбіраецца паводле рады з маскоўскім уладаром.
20. Калі Жыгімонт не пакіне сына, дык Польшча і Літва могуць выбраць сабе цара.
21. Пасля смерці маскоўскага ўладара ягоны сын пры вянчанні на пасад пацвярджае прысягай гэты саюз.
22. Калі ж у цара не застанецца сына, дык маскоўскім уладаром становіцца Жыгімонт[94].

Выпакутаваная ідэя славянскага адзінства ўвасобілася вось у гэтым праекце саюзу трох славянскіх народаў: літвінаў, палякаў і маскавітаў. Канцлер улічыў няўдачы папярэдніх праектаў і прапаноўваў рэальныя ўмовы аб'яднання. Захоўваючы сваю самастойнасць, абедзве дзяржавы цесна збліжаліся на палітычнай, культурнай і эканамічнай глебе і праводзілі супольную знешнюю палітыку.

Гэты саюз адхіліў бы даўнія прычыны да войнаў паміж Масковіяй і Літвой з-за спрэчных земляў і з'явіўся б гарантам «вечнага пакою». Ясна, што ад гэтага саюза выйгралі б усе славяне, бо ў перспектыве паўставала задача вызвалення славянскіх народаў з-пад турэцкага ярма.

Пасламі разам з канцлерам ехалі варшаўскі кашталян Станіслаў Варшавецкі ды сакратар Княства Ільля Пелегрымоўскі, які апісаў гэтае пасольства ў сваім дыярыушы, а пасля нават і ў паэме. У па-

сольства ўваходзілі — князь Яраслаў Друцкі-Сакалінскі, усвяцкі староста Андрэй Варапай, віцебскі ваявода Іван Сапега, Іван Пасак, Пётр Дунін і другія. Адной аховы і прыслугі было за тысячу чалавек. Каля двухсот вазоў везлі пажыткі і харч. Сапраўды, «вялікае пасольства».

27 верасня 1600 года пасольства выправілася з Оршы ў нялёгкае падарожжа. Сустракалі паслоў урачыста. Цар разгневаўся на смаленскага ваяводу з-за таго, што не даў паслам добрага пастоя і напужаныя ваяводы згіналіся перад Сапегам, каб задаволіць яго.

Дапытлівага канцлера цікавіла ўсё, што ўпадабала яго вока. Заходзіў у праваслаўныя цэрквы і слухаў там службы.

16 кастрычніка пасольства дабралася да Масквы. Як звычайна паслоў засадзілі за высокі плот і прыставілі варту. Мінаў дзень за днём, а цар Барыс Гадуноў так і не назначаў прыёму, хаця адразу пацікавіўся спісам падарункаў. Царскія прыставы тлумачылі затрымку тым, што ў цара разбалеўся на назе палец.

А цар цягнуў час — чакаў вынікаў вайны ў Лівоніі і Малдавіі. Замест таго каб сур'ёзна абмеркаваць праект, прапанаваны літвінскім канцлерам, ён настроіў сябе на гандаль: хто больш заплаціць за царскую прыязнасць. А паслы, як вязні, сядзелі. Невядомасць прыгнятала больш за чаканне.

Аднойчы паблізу пасольскага двара ўспыхнуў пажар. Агонь ахапіў некалькі будынкаў і пагражаў перакінуцца на пасольскі двор. Сапега скардзіўся прыставам, што паслоў трымаюць у цесначе, а вакол дома паклалі столькі саломы, нібыта дзеля таго, каб спаліць яго.

> Ухавай, Божа, ад гэтай прыгоды, не толькі ратаваць рэчы, але і самім цяжка выбегчы жывымі. Калі нас яшчэ будуць трымаць у такой цеснаце, дык мы вымушаны самі падумаць пра сябе [95].

Прыставы пакрыўдзіліся і адказалі, што гэта слова высокае і невартае добрай справы. Сваркі не сціхалі. Сапега патрабаваў прыстойных умоў для пасольства. Чатыры дні ён не прымаў прыставаў, пакуль паслам не далі прасторныя дамы. Зразумела, што ўся гэтая валтузня з жытлом чынілася маскавітамі з мэтай паўплываць на волю паслоў. Такая дробная тыранія дзейнічала на слабавольных людзей. Але Сапегу не запугаеш.

І вось нарэшце 26 лістапада Барыс Гадуноў прыняў пасольства. Раніцай пасля малебна паслы адправіліся ў крэмль. Ехалі праз жывы калідор стральцоў. Каля царскага палаца паслы злезлі

з коней, і прыставы павялі іх да прыёмнай палаты. Разадзетыя і ўпрыгожаныя карункамі і золатам баяры і баярскія дзеці запаланілі ўсе пераходы, адзёжкамі і бляскам каштоўнасцей паказвалі славу і моц свайго ўладара.

І натоўп прыдворных, і важныя баяры старажытных і слаўных родаў, і агромністая палата, і залатыя клейноты — усё павінна прымусіць адчуць сваю нікчэмнасць перад веліччу ўладара Трэцяга Рыму. Ён сядзеў на пасадзе ў залатым вянцу і трымаўу руках скіпетр і дзяржаву — жывое ўвасабленне сваіх прэтэнзій на веліч і моц. На правы бок сядзеў ягоны сын. А ўздоўж сценаў расселіся думныя баяры. Перад вялікім князем стаялі чатыры воіны ў белых гарнастаевых апанчах з сякерамі, якія паклалі на плечы.

Дзяк Васіль Шчалкалаў мовіў Гадунову, што пасылы караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта прыйшлі пацалаваць яго руку. Слова ў адказ мовіў Леў Сапега — звычайны пры такіх прыёмах зварот; маўляў, Жыгімонт прыслаў іх пакланіцца вялікаму князю ўсея Русі Барысу Фёдаравічу і справіцца пра яго здароўе. Пасля чаго Сапега перадаў дзяку ліст Жыгімонта. Дзяк прачытаў ліст вялікаму князю. У сваю чаргу і Гадуноў папытаў, ці здаровы кароль Жыгімонт. Сапега адказаў, што ён караля пакінуў у добрым здароўі. У сваёй прамове пасол паведаміў пра мэту пасольства.

> Ведаючы, што сам усемагутны Бог выбірае ўладароў і князей і каго хоча ставіць на панства, а таму і табе Барысу Фёдаравічу даў сесці на вялікім пасадзе маскоўскім толькі паводле сваёй святой волі, і, бачучы твой добры намер і добрае жаданне, якое ты выказаў перад намі праз свайго пасла, віншуем цябе з узыходжаннем на гэты пасад і жадаем табе пражыць шмат гадоў у міласці Боскай і добрым саюзе з намі. Бачучы, як важна і як карысна для нашых Гаспадарстваў узаемная зычлівасць і згода, мы з радасцю прымаем такую вестку і з радасцю жадаем быць з табой, Вялікім уладаром і Вялікім князем Барысам Фёдаравічам, у міры, згодзе, зычлівасці і любові [96].

Прыём завяршыўся паднясеннем Гадунову і ягонаму сыну падарункаў. Ад сябе Сапега падараваў Гадунову залаты ланцуг, упрыгожаны жэмчугам і карункамі, чатыры срэбныя кубкі, каня з чэпраком, усыпаным жэмчугам і карункамі, два срэбных кубкі і добрага каня. Патраціўся канцлер на падарункі, але і гонар яснавяльможны, і гонар Айчыны не дазваляў яму прыехаць да цара з пустымі рукамі.

«Мне дужа не падабаецца, што мы адкрываем перад чужаземцамі нагату і вялікі недастатак нашай Айчыны, нашы продкі сцерагліся, каб вораг, асабліва блізкі, ведаў пра нашу беднасць», — лічыў канцлер [97].

Багатыя падарункі паднеслі і другія сябры пасольства. Цар падабрэў і пачаставаў паслоў абедам. Дзве гадзіны літвінскія паслы і маскоўскія баяры па-сяброўску дзялілі хлеб і соль, ды яшчэ смачныя стравы і напоі. Цар таксама падтрымліваў свой гонар.

Пасля прыёму пасольству далі яшчэ два двары — можна было вальней размясціцца. Але на просьбы пачаць перамовы приставы адказвалі — то цар прыхварэў, то святочны дзень, то цар заняты, то яшчэ якая бяда — так і месяц мінуў.

«Не ведаю, што далей з намі пачнуць рабіць і як нас доўга будуць трымаць у гэтым вязенні», — хваляваўся Сапега [98].

Нарэшце 3 снежня приступілі да перамоваў. Калі паслы прыехалі ў царскі палац, дык замест цара ўбачылі яго сына Фёдара. Ён і абвясціў, што бацька загадаў баярам пачаць перамовы.

«Мы гэтаму абрадаваны. Мы дзеля гэтага і прыехалі, а не дзеля таго, каб ляжаць і нічога не рабіць», — адказаў Сапега [99].

Не лёс славянства, а ўмацаванне сваёй дынастыі на пасадзе — вось клопат Гадунова. І прызнанне тытула пасламі стала б яго важнай перамогай. Баяры распавялі показку пра тое, што яшчэ Уладзіміра Манамаха прызналі царом царградскія імператары і на Успенскім Саборы таго каранавалі чатыры патрыярхі. Царскі тытул нашчадкаў дому Манамаха прызналі не толькі хрысціянскія ўладары, але і магаметанскія. А калі Жыгімонт не прыме гэты тытул, дык і цар не прызнае яго каралём польскім і вялікім князем літоўскім, а таму і не трэба спадзявацца на мір і згоду паміж Масковіяй і Рэччу Паспалітай. Сапега паказаў баярам ранейшыя граматы маскоўскіх уладароў, дзе яны не пісаліся царамі. Дык пра што гаворка? Не, баяры цвёрдалоба патрабавалі царскага тытула для Барыса Гадунова. Пагражалі і вайной, як галоўным довадам у гэтай спрэчцы. Сапега спакойна выслухаў пагрозы і мудра заўважыў:

Вайну пачаць можаце, але канец вайны ў руках Боскіх [100].

Наступным днём Сапега ў прысутнасці Фёдара прачытаў праект саюза. А ў сваёй прамове да баяр канцлер заклікаў іх садзейнічаць заключэнню гэтага саюза.

Мы з вамі славяне, адзіны народ. Бога з вамі хвалім адзінага і адну чэсць, хвалу яму аддаем. Хіба гэта мала, каб не паразумецца? Слушна тады было б наперад сваіх манархаў звесці ў вечную прыязнь, ды прывесці да таго іх панства. Каб паміж сабой міласць і згоду вечную ўзялі і супраць усіх паганых братэрства мелі. Шчырым сэрцам зычу, каб у вашых і нашых сэрцах праўдзіва прыняць гэты саюз [101].

Адказ паслы атрымалі праз тры дні. Баяры адмаўляліся ад саюзу і не згаджаліся, каб палякі і літвіны жаніліся ў іх краі, набывалі маёнткі і будавалі каталіцкія касцёлы, але не забаранялі ім прыязджаць і жыць. Адхілілі баяры і артыкул пра каранацыю, маўляў, каранують уладароў духоўныя асобы. Аднак, каб узяць мір, трэба вырашыць прыналежнасць Лівоніі. Баяры заяўлялі, што Лівонская зямля — спрадвечная вотчына рускіх уладароў.

Чаго баяўся Сапега, тое і адбылося.

Нічога грунтоўнага з намі станавіць не хацелі, толькі дамагаліся князю свайму царскага тытула і вяртання сабе зямлі Інфляцкай [102].

Перамовы перайшлі ў пустыя спрэчкі, каму належыць Лівонія. Сапега адказаў, што ў яго няма паўнамоцтваў вырашаць гэтае пытание. Гэта ніколькі не бянтэжыла баяраў, і яны насядалі на яго. Заўсёды стрыманы канцлер на гэты раз ускіпеў. Абодва бакі забыліся аб прыстойнасці. Думны дваранін Таціщчаў без усялякіх акалічнасцяў заявіў: «Ты, Леў, малады, ты кажаш няпраўду». Адказ Сапегі быў яшчэ больш рэзкім. «Сам ты маніш, халоп глупы, я прызвычаіўся мовіць праўду. Не ўмею так, як ты, круціць фартэлямі. Не са знамянітымі пасламі табе размаўляць, а з хлопамі на стайне, ды і тыя размаўляюць больш прыстойна за цябе». — «Чаго крычыш! Я дакажу, што ты кажаш няпраўду». — «Нецнатлівы пёс, вялікую крыўду мне чыніш, вініш мяне ў падмане, каб не шанаваў свайго караля і князя вашага, баяр значных і сябе самаго, здолеў бы цябе, смярдзюка, на гэтым плацы правучыць. Але на волю старэйшага тое аддаю. Я тут болей быць не хачу»[103].

Такая вось дыпламатыя — хто каго перакрычыць. Добрых вынікаў яна не прынесла. Калі перамовы зайшлі ў тупік, дык баяры зноў пагражалі вайной. Вось як апісвае дыялог Міхайлы Салтыкова і Льва Сапегі ў вершаваным варыянце свайго дыярыуша Гальяш Пелегрымоўскі:

*Пане Леў, не навіна нам ужо бываць у Літве*
*І рабіць тое, што належыць мужам у бітве.*
*Не навіна мне з шабляй быць у тваім маёнтку,*
*І хутка мне там пабачыш са шматлікімі гасцямі!**

Адказвае Сапега баярыну з філасоўскай мудрасцю чалавека, які разумее пераменлівасць чалавечага лесу:

*Хвалько не нахваліцца, будзько не набудзецца,*
*Славы вам ад гэтага ніколі не прыбавіцца.*
*Быць можа, будзеш госцем, калі цябе туды прывядуць*
*І з тваімі таварышамі ў кайданах адвядуць.*

І не залішнім лічыць канцлер нагадаць баярам пра адказнасць перад Богам за свае ўчынкі:

> Хто шукае праліцця чужой крыві, над тым Боская помста, Не ў галкі гуляць, не смех гэта, не з саду ружа [104].

Зразумеўшы, што наскокам Сапегу не зломіш, маскавіты вярнуліся да сваёй ранейшай тактыкі псіхалагічнага ўціску. Перамовы спыніліся, а паслоў трымалі пад вартай. Пачалося супрацьстаянне волі — хто не вытрымае і саступіць. Паслы звярталіся да царэвіча, каб цар іх адпусціў дадому. Прашэння не прынялі. «І да таго нас прывялі, што мы прасілі сабе смерці: ні справы не робяць, ні адпускаюць», — прызнаваўся пазней Сапега. Маскавіты не спыніліся і перад прамымі пагрозамі. Папярэджвалі паслоў, што цар разашле іх па гарадах і засадзіць у вязенне — ужо і двары для гэтага падрыхтавалі. Ды Сапега і ягоныя паплечнікі не спужаліся.

> «Калі гаспадар ваш не загадае нас адпусціць, дык мы сядзем на коней і самі паедзем, а хто нас стане біць, і мы пачнем біць, таму што дайшло нам не да гаспадарскай чэсці, нам сваё жыццё за ўсё даражэй, бо не прызвычаіліся жыць у няволі», — адказаў прыставам Сапега [105].

А ў Маскву нарэшце прыбылі шведскія паслы, іх наўмысна правезлі перад дваром літвінскага пасольства. Паказалі літвінам, што цар можа заключыць мір са шведамі, таму згаджайцеся з нашымі ўмовамі. Зноў пужалі Сапегу, што Карл Судэрманскі саступае цару Эстонію.

---

* Пераклад Сяргея Кавалёва.

Сапега не верыў у падобныя заявы, бо ведаў прагны апетыт Карла да Лівоніі. Не дзеля таго ён распачаў вайну з Рэччу Паспалітай, каб дзяліцца завяяваным з Масковіяй.

Канцлер не памыляўся. Маскавіты пужалі і шведскіх паслоў, маўляў, Жыгімонт саступае цару палову Лівоніі, калі той стане ваяваць з Карлам. Ды толькі і шведы не паддаваліся на хітрыкі. Барыс Гадуноў перахітрыў сам сябе — перамовы з пасольствамі праваліліся. Ён заставаўся са сваім кукішам у кішэні і царскім тытулам у марах. І ўжо не пра выгоды трэба думаць, а як захаваць мір. Дайшла да цара і вестка пра перамогу войска Рэчы Паспалітай у вайне з валашскім гаспадаром Міхаем. Гэта афіцыйна пацвердзіў на прыёме і Леў Сапега. Цяпер Рэч Паспалітая магла кінуць сваё войска і на шведаў. Трэба было выбіраць. Цар і баяры выбралі мацнейшага. Без спрэчак і патрабаванняў 1 сакавіка 1601 года прыгаварылі перамір'е паміж Масковіяй і Рэччу Паспалітай аж да 1622 года.

У той жа дзень цар цалаваў крыж пад перамірнымі граматамі. Паводле звычая, паслы павесілі свае пячаткі пад граматай Жыгімонта, якая заставалася ў Маскве, а баяры павесілі царскую пячатку на грамаце Гадунова — яна перадавалася каралю. Каралеўскае і царскае слова ўрачыста прачыталі цару і баярам. Пасля чаго цар загадаў пакласці граматы на срэбную талерку (сваё слова на верх, а каралеўскае слова пад ніз), а на граматы пакласці крыж. Гадуноў падняўся з царскага пасада і прамовіў клятву:

> Леў, Станіслаў, Гальяш! Цалую крыж на гэтай перамірнай грамаце, што нам, вялікаму гаспадару, трымаць у тыя перамірныя гады ўсё так, як у гэтай нашай перамірнай грамаце пісана. А як будуць у Жыгімонта караля нашы паслы, і Жыгімонт кароль перад нашымі пасламі таксама нам крыж цалаваў на граматах і правіў бы ўсё так, як у гэтай нашай грамаце пісана [106].

Цар пацалаваў крыж. Са свайго боку Сапега, Пелегрымоўскі і Варшавецкі таксама цалавалі крыж на тое, што Жыгімонт дасць клятву трымаць заключанае пагадненне. Цар пажалаваў паслоў і дапусціў іх да сваёй рукі. Ды яшчэ запрасіў да стала.

Абед даваў царэвіч у Гранатавітай палаце. Сабраліся і баяры думныя, і баяры простыя, і дваране вялікія, і дваране думныя, і дзякі, і розныя слугі, і князі служылыя. Кожнаму ўказалі яго месца. Толькі два слаўных князі Фёдар Мсціслаўскі і Фёдар Трубяцкой — Гедымінавічы селі побач з царэвічам: адзін праваруч, а другі леваруч.




*Бярозаўскі кляштар картэзіянцаў. Гравюра невядомага мастака. Заснаваны ў 1618 годзе князем Львом Сапегай*

Сапегу далі месца пасля баяр вялікіх, Станіславу Варшавецкаму пасля акольнічых, а Пелегрымоўскаму — пасля вялікіх дваран. Чынна і сур'ёзна выконвалі баяры і дваране свае дзяржаўныя абавязкі за царскім сталом.

Гэта не вясёлыя і шумлівыя баляванні за каралеўскім сталом, дзе пілі з рук караля за сваё здароўе, дзе спрачаліся і весяліліся, плакалі ад замілавання, дзе вяльможы «ганебна п'яныя і барздо вясёлыя» выкідвалі такія фартэлі, што і сорам нагадваць. Там любілі жыццё. Тут любілі цара. Там любілі Айчыну. Тут любілі дзяржаву. Там былі спраўцы дзяржаўныя. Тут — халопы гасударавы.

Пачаставаўшы царскімі стравамі, Фёдар Барысавіч пажалаваў паслоў падарункамі. Сапега атрымаў залаты карэц з лазаравым яхантам, шоўкавую пярсідскую тканіну з золатам на саблях, жамчужныя і залатыя ланцужкі ды сорак сабалёў.

Царскія падарункі не радавалі Льва Сапегу. Так і не збылася мара. Праект славянскага саюзу не ажыццявіўся.

# АБВІНАВАЧВАННЕ

З лёгкай здагадкі расійскага гісторыка Сяргея Салаўёва Леў Сапега стаў ці не хросным бацькам Ілжэдзмітрыя, чалавекам, які вынасіў злахітры план смутнага часу. Вось якія довады прывёў Салаўёў. Маўляў, Сапега два разы наведаў Маскву, а значыць, добра ведаў тамашнія справы і таямніцы. Апошні раз ён пакінуў Маскву раззлаваны на цара Барыса. Першы, хто прызнаў у самазванцы царэвіча Дзмітрыя, быў слуга Сапегі — маскоўскі ўцякач Пятроўскі. Сапега выступаў як заўзяты спадручнік Жыгімонта супраць Масквы. Ён выхоўваў пры сваім двары новых самазванцаў. Спасылаецца гісторык на указанне маскоўскага летапісца, які наіўна тлумачыць з'яўленне Лжэдзмітрыя злосцю Льва Сапегі на шматлікае войска, якое бачыў ён падчас пасольства. Нарэшце, паводле некаторых звестак, Лжэдзмітрый прызнаўся ў тым, што ездзіў у Маскву пры пасольстве Сапегі.

> «Што б там ні было, калі западозрыць кагосьці з польскіх вяльмож у прадстаўленні самазванца, дык, канешне, падазрэнне перш за ўсё павінна ўпасці на Льва Сапегу», — гэткая выснова Сяргея Салаўёва[107].

Прамых доказаў «віны» канцлера ў справе Лжэдзмітрыя пакуль гісторыкі не знайшлі і не прывялі іх на суд гісторыі. Таму паспрабуем апраўдаць Льва Сапегу ад «абвінавачвання». Не будзем прымаць за довады веданне канцлерам становішча ў Масковіі — не адзін ён ведаў, што там робіцца. А злосць Сапегі на Барыса яшчэ не падстава для распальвання вайны. Тое, што першым прызнаў самазванца за царэвіча слуга Сапегі, таксама не можа сведчыць, што той выконваў волю свайго гаспадара. Пятроўскі ведаў Дзмітрыя па жыцці ў Вуглічы. Калі самазванец абвясціў сябе царэвічам, Сапега паслаў Пятроўскага пераканацца ў ягонай сапраўднасці. Бачыць за гэтым інтрыгу можа толькі той, хто хоча яе бачыць.

І самыя паводзіны Пятроўскага пры апазнанні царэвіча зусім не паказваюць на ягоную змову з канцлерам. Убачыўшы «царэвіча», Пятроўскі разгубіўся і не ведаў, што і мовіць. Становішча выправіў сам «царэвіч», які пазнаў свайго «былога слугу». Пасля чаго і Пятроўскі прызнаў «Дзмітрыя». Не станем спрачацца і з летапісцам — ніякіх доказаў на дачыненне Сапегі да «ўваскрашэння» Дзмітрыя ён не прыводзіць. А маніфест, у якім нібыта Лжэдзмітрый паведамляў пра паездку ў Маскву пры пасольстве Сапегі, не захаваўся або зусім

не існаваў. Затое ў дайшоўшым да нас маніфесце Ілжэдзмітрый нават не намякае на ўдзел у пасольстве.

Што ж датычыцца «школы самазванцаў», якую трымаў Сапега, дык наўрад ці яе закончыў першы Лжэдзмітрый, а другія вучні — гэта іншая гісторыя. Словам — усе довады віламі пісаны па вадзе. Праўда, цень падазрэння ўсё ж падае на Льва Сапегу. Гэтак, Руслан Скрынікаў сцвярджае наступнае:

Канцлер галосна заявіў, што «Дзмітрый» вельмі падобны на нябожчыка цара Фёдара, а паабяцаў паставіць і прысланы на дапамогу «царэвічу» дзве тысячы вершнікаў [108].

На жаль, гісторык не называе крыніцы, адкуль ён узяў падобны факт. Хаця ёсць ускосныя ўзгадкі на тое, што Сапега прызнаў самазванца за царэвіча. Гэтак, вармійскі біскуп Тыліцкі між іншым заўважыў канцлеру наконт Ілжэдзмітрыя: «Бачу, што вы лічыце яго сапраўдным»[109].

Прысутнічаў Леў Сапега і на абручэнні Лжэдзмітрыя з Марынай і выступіў там з прамовай, нагадаўшы «царэвічу» пра Боскую місію ўлады. Нават калі Сапега і прызнаў самазванца, то не значыць, што ён «прадставіў» яго. А падтрымаць «царэвіча» Сапегу прасіў нунцый Клаўдзій Рантоні. Хай сам Леў Сапега пазбавіць сябе ад абвінавачванняў. З ягонага ліста Крыштофу Радзівілу ад 31 кастрычніка 1604 года даведаемся, што канцлер асуджаў гэтую авантуру.

Ох! Пасварыць нас сандамірскі ваявода з Масквою. Знойдзе ён шчасце або не, усё роўна зробіць горш Айчыне і нам [110].

Раіў канцлер Мнішаку адмовіцца ад паходу і вярнуцца назад*. Ясна выказаў Сапега свае адносіны да Лжэдзмітрыя і ўвогуле да падзей «смутнага часу» ў соймавай прамове. Канцлер падрабязна спыняецца на гісторыі з'яўлення самазванца, называючы яго беглым манашкам Грышкам Атрэп'евым. Цяжка западозрыць хітрасць у гнеўным закліку Сапегі правесці вышук, якім чынам нарадзілася авантура з самазванцамі, за чыёй рады і хто прычына войнаў з Масквой:

Няхай апраўдаюцца і дадуць адказ тыя, хто спраўляў ў гэтым і хацеў, нібыта гонару пану, а прывёў яго да такой крыўды, сраматы і ганьбы, што горш і быць не можа. О, якое зласлівае разліванне

* Мабыць, з гэтай прамовай Сапега выступіў на Варшаўскім сойме ў 1611 годзе.

крыві, забойства нявінных людзей з абодвух бакоў! Смела можна мовіць: цякуць рэкі крыві і людскіх слёзаў. Хто таму прычына і повад, павінен даць адказ Пану Богу* [111].

Канцлер рашуча адмяжоўваўся ад спраўцаў крывавых авантур і гнеўна асуджаў іх.

І зразумела, што не звярнуліся б да Сапегі князі Шуйскія і Галіцыны з прапановай скінуць Ілжэдзмітрыя з царскага пасада, каб канцлер быў яго апекуном. Праз пасла Івана Безабразава яны паведамілі Сапегу, што кароль «даў ім нізкага і легкадумнага чалавека», і жадалі ўзвесці на пасад каралевіча Уладзіслава[112]. Аднак ні Сапега, ні кароль не падтрымалі гэтую авантуру. Можа, і дарэмна, бо царскі вянец захапіў Васіль Шуйскі, што нарадзіла другога самазванца, які, падобна першаму, выдаваў сябе за Дзмітрыя.

Грамадзянская вайна ў Масковіі запалыхала яшчэ з большай сілай. І каб патушыць полымя, Васіль Шуйскі прыбег па дапамогу да Карла Судэрманскага. Не з добрай ласкі згаджаўся шведскі ўладар дапамагаць цару. Яшчэ раней Карл прапаноўваў Васілю разам ваяваць супраць Рэчы Паспалітай, пакуль цар не заваюе ўсю Літву, а ён — Лівонію. Масковіі і самой патрэбна была Лівонія, таму цар не згаджаўся на такі падзел.

Цяпер выбіраць не даводзілася. Карл абяцаў не толькі даць цару войска, не толькі вынішчыць агнём і мячом усіх яго непрыяцеляў, нават не злітавацца над немаўлямі, але заваяваць для Масковіі Літву. Да пары, да часу збіраўся Карл трымаць саюз з царом, пакуль не разаб'е Рэч Паспалітую, пасля нанесці ўдар і па Масковіі.

У патаемных наказах сваім генералам Карл загадваў захапіць Ноўгарад, Пскоў і другія гарады. Аднак Жыгімонт вырашыў нанесці ўдар першым.

## ПАД СЦЕНАМІ СМАЛЕНСКА

Здавалася, караля чакала лёгкая перамога. Васіль Шуйскі думаў, як утрымацца на пасадзе. Добрая палова дзяржавы служыла «тушынскаму вору» Лжэдзмітрыю II.

Наўрад ці Шуйскі здолее даць належны адпор каралеўскаму войску. Паслы, якія вярталіся з Масквы, упэўнівалі караля ў прыязні да яго баяр. І як толькі ён заявіцца з войскам у краіну, дык яны скінуць

* Па дарозе ў Маскву Юрый Мнішак і яго дачка Марына 23 сакавіка гасцілі ў Сапегі ў Ружанах, з 24 і па 26 сакавіка ён прымаў іх у Слоніме. Як адзначала ў сваім дзённіку Марына Мнішак, яны «забяспечваліся ўсялякімі прыпасамі ад пана канцлера літоўскага».

Васіля Шуйскага, а царом абвясцяць каралевіча Уладзіслава. Летам 1609 года ваяводы некаторых заходніх гарадоў вялі перамовы аб узвядзенні на царскі пасад Уладзіслава. Значыць, ідэя ўжо не лётала ў паветры, а пачала авалодваць розумам маскавітаў. Перамога сама прыйшла ў рукі. І нельга было ўпусціць яе.

Кароль пачаў рыхтавацца да вайны. І адразу яго напаткала няўдача. Давялося лічыцца з прыхільнікамі міру. Палохаючыся правалу сваіх планаў, кароль не паставіў пытання аб вайне на абмеркаванне пасольскай палаты. Падтрымкай шляхты Жыгімонт не заручыўся. Таму абапіраўся ён на сілу тых магнатаў, якія падтрымалі яго. Яны за свой кошт і сабралі войска. Не такое і вялікае яно было — трохі больш за 11 тысяч. Сам Жыгімонт выставіў 400 вершнікаў і 1800 пешцаў (з іх 800 чалавек угорскай пяхоты). Выставілі харугвы гетман Станіслаў Жулкеўскі, брацлаўскі ваявода Ян Патоцкі, варшаўскі кашталян Станіслаў Варшавецкі. Атрад нямецкіх пешцаў у 1260 чалавек узначаліў староста пуцкі Людвіг Вэйгер. Пайшлі на вайну і некаторыя літвінскія паны, якія выставілі 1220 вершнікаў і 600 пешцаў. Палову складалі людзі Льва Сапегі — 920 чалавек (300 гусараў, 200 казакоў, 100 пяцігорцаў, 120 валанцёраў і 200 пяхоты)*[113].

Можна падумаць, што Сапега прагнуў лаўраў палкаводца. Аднак, пэўна, тлумачэнне іншае. Свой погляд на вайну з Масковіяй канцлер выказаў у складзеным у ягонай канцылярыі універсале да жыхароў Смаленска. Паход тлумачыўся жаданнем Жыгімонта выратаваць няшчасны край ад бедаў. А беды ўчыняліся ад таго, што царскі пасад сталі займаць людзі, якія «не па сваёй меры на царскую высату і царскі пасад спакусіліся»[114]. Вось таму Жыгімонт як блізкі сваяк былой царскай фаміліі па праву сваяцтва пашкадаваў гінучае панства і гатовы захаваць народ пры ўсіх «старажытных звычаях». Гэты універсал быў не проста ідэалагічным апраўданнем вайны, а ясна ўказваў на яе мэты. Жыгімонт прад'яўляў свае правы на маскавіцкі пасад**.

Такім чынам, акцыя Жыгімонта з'яўлялася ўзброенай спробай аб'яднання Рэчы Паспалітай і Масковіі — даўняй мары Сапегі. А другой задачай паходу было вяртанне Літве Смаленскай зямлі. Як дзяржаўны дзеяч і патрыёт Літвы Сапега шчыра падтрымаў

* Паводле звестак маскоўскіх віжоў, войска караля складалі 1400 нямецкіх пешцаў, а «литовских людей 6000». (Акты исторические. Т. 2. С. 314.)

** Жыгімонт абгрунтоўваў свае правы тым, што ягоны продак Ягайла быў сынам рускай княжны. Нагадаем, што сваяцтвам з літвінскімі ўладарамі абгрунтоўваў свае правы на літвінскі пасад Іван Жахлівы.

намер Жыгімонта, і першы выказаўся на сойме за вайну. Аднак калі сойм не адобрыў намеры караля, то і Сапега змяніў сваё меркаванне. Кароль спытаў яго, «чаму ён не радзіць ісці на вайну». Убачыўшы вялікае жаданне караля ваяваць, канцлер прасіў яго параіцца з сенатарамі і без іх згоды нічога не пачынаць. Кароль самаўпэўнена адказаў, што ў нікога не будзе слухаць рады. Тым не менш Сапега быў «давераным амаль усіх тайнаў яго сэрца»[115], паводле прызнання самога канцлера.

І калі гетманы з шабляй у руках здабывалі сабе славу, Сапега вызначыў шлях палітыкі караля і вялікага князя.

Пры сустрэчы ў верасні 1609 года ў Оршы канцлер пераконваў уладара не марудзіць, а спяшацца на Смаленск. Нецярпенне Сапегі выклікалі данясенні віжаў: смаленскі гарнізон малалікі, і горад можна лёгка ўзяць. Кожны страчаны дзень даваў маскавітам магчымасць лепш падрыхтавацца да абароны. Кароль спяшаўся, нідзе не адпачываў больш за дзве ночы. Каб і ў Оршы ўладар не заседжваўся, Сапега павёў свой полк на Смаленск. Слаў лісты да гетмана Станіслава Жулкеўскага — паспяшацца з войскам. 19 ве-




*Г. Келер. Аблога Смаленска. 1610 г.*

расня канцлер падышоў да горада. Першыя дні вайны выклікалі ў душы Сапегі скруху. У лісце да жонкі «наймілейшай Гальшусенкі» Радзівіл ёй шчыра прызнаецца:

> Спадзяюся на вашы малітвы, бо тут плачу, слёз за войскам рэкі цякуць, а следам і кроў нявінных убогіх падданых разліваецца, сякуць, мардуюць, хоць забівай, ніякага паслушэнства не маеш [116].

Спачатку ён жыў у манастыры св. Спаса, але, даведаўшыся пра гэта, маскавіты пачалі абстрэльваць яго. Сапега перабраўся ў пабудаваны дом.

Значэнне Смаленска як фарпоста Масковіі добра разумелі пры царскім двары. Напужаныя паходамі Стэфана Баторыя, маскавіты ў 1586 годзе пачалі ўзводзіць тут моцную каменную крэпасць. Шэсць гадоў больш за 15 тысяч чалавек працавалі на яе будаўніцтве. Уся краіна рабіла цвержу, аб якую разбіўся б наступ Літвы. Агульная працягласць смаленскіх муроў даходзіла да шасці з паловай кіламетраў. Толькі сцены Царграда пераўзыходзілі іх па працягласці. Вышыня муроў дасягала ад 13 да 19 метраў, а шырыня — 5—6 метраў. Каб абараніць цвержу ад падкопаў, фундамент муроў заглыбілі на 3—4 метры ў зямлю. Аб такія сцены ядры адскоквалі як гарох. Гарматы былі бяссільнымі перад імі. Яшчэ больш уражвалі непрыступнасцю вежы, якія падымаліся на вышыню за 20 метраў. А Фралоўская брама — аж на 33 метры. Трох'ярусная сістэма бою дазваляла весці агонь з ніжніх, сярэдніх амбразур і верхніх галерэяў. Усе подступы абстрэльваліся. Узяць цвержу штурмам было амаль немагчыма. Нават і невялікі гарнізон лёгка мог вытрымаць доўгую аблогу.

Аднак смаленскі ваявода Міхайла Шэін спадзяваўся не толькі на моцныя і высокія муры, паклапаціўся ён пра воінства, харчовыя і вайсковыя запасы. Яшчэ ў пачатку года віжы даносілі з Літвы, што кароль збіраецца ў паход на Смаленск або на Маскву. Так што часу падрыхтавацца да абароны ў ваяводы хапала. І ён не згубіў яго дарэмна. Паводле яго загаду, са Смаленскай зямлі павінны даць па 6 чалавек з сахі* з пішчалямі і сякерамі. Сяляне не пайшлі ў аблогу і не далі ваяводзе людзей.

На абарону горада Шэін выставіў 5400 ратнікаў ды 170 гармат[117]. Апроч таго, усе жыхары Смаленска павінны былі абараняць горад — а гэта каля 70 тысяч чалавек. Багата назапасіў ваявода харчоў і зброі, асабліва пораху і ядраў. Усе пасады вакол

* Саха — зямельная мера, роўная 1200 дзесяцінам ралля.

горада Шэін загадаў спаліць, каб расстрэльваць непрыяцеля на голым месцы. У агні згарэлі і цэрквы. Раззлаваны народ ледзь не пабіў ваяводу за самаўпраўства. Паведамленні віжоў, што горад абараняе купка баяр і стральцоў, як высветлілася, не адпавядалі сапраўднасці. Смаленск мог пастаяць за сябе. Сапега паспрабаваў угаварыць смалян здацца. Пасланы канцлерам Багдан Велічанінаў паведаміў ім:

> Верце добраму намеру караля, які хоча вас пажалаваць, у пакоі будзе захоўваць вашых жонак і дзетак, вашу веру і абрады яе, звычаі і права будзе захоўваць.

Сапега шчыра верыў у разважлівасць смалян.

> Дай ім Пан Бог Духа Святога, каб без разлівання крыві захацелі старыцы [118].

Смаляне баяліся помсты літвінаў:

> Хвалім гаспадара караля вашага, што жадае адносіцца да нас пахрысціянску, але баімся Літвы; бо не верым, хаця кароль і пацалуе нам крыж, Літва не стрымае прысягі, як і тыя з Літвы, якія жывуць пад Масквой, якія і бароняць нашых, але бяруць жонак, дзяцей, дочак нашых баяр і рушаць нашы воласці [119].

Смаленск асудзіў сябе на доўгую і цяжкую аблогу. Амаль два гады каралеўскае войска стаяла каля горада і боем, падкопамі, хітрасцю, угаворамі, морам вымушала яго да здачы. Ужо першы штурм 4 кастрычніка 1609 года паказаў усю безнадзейнасць лёгкай перамогі. Працяглы абстрэл з гармат, які павёў літвінскі маршалак Крыштоф Дарагастайскі, не прычыніў ніякай шкоды цвержы і не напалохаў сэрцы яе абаронцаў. У цемры перад світанкам на штурм кінулася нямецкая пяхота Людвіга Вэйгера. Барталамею Навадворскаму ўдалося прабрацца пад агнём да брамы і паставіць дзве петарды. Ад выбуху брама адчынілася. Некалькі дзесяткаў немцаў на чале з Навадворскім уварваліся ў горад. Абаронцы выбілі іх з цвержы.

Шэін адразу ж пасля штурму загадаў заваліць усе брамы камянямі і зямлёй. А пасля яшчэ пабудаваў палісады і прыставіў да іх варту. Замураваў брамы так, што ні чужыя не ўвойдуць, ні свае выйдуць.

Заставалася паліць па цвержы з гармат. Гарматы не вытрымлівалі, давалі расколіны, а сцены стаялі непахісна. Не прыносілі

ўдачы і падкопы. Маскавіты праз патаемныя падземныя хады лавілі кожны гук і ўзрывалі падкоп. А то ўцягвалі ў падзямелле гармату і расстрэльвалі каралеўскіх сапёраў ядрамі, нашпігованымі серай, смалой, порахам, нават гарэлкай. Час ішоў, а Смаленск так і не скарыўся. З кожным днём большала смута. І часта ў лістах канцлер паўтараў адно і тое: «Пан Бог ведае, што далей будзе». Лічыў, што такім парадкам і за тры гады не ўзяць Смаленск. Хвалявала яго і тое, што вайна перш за ўсё зруйнуе Літву, маўляў, яна ідзе на нашу пагібель. Свавольства жаўнераў пагражала сапраўднай бядой. Вось выйдзе халоп з валом араць, а жаўнер з плугу вала возьме. Выедзе халоп сеяць авёс, жыта або ячмень, а жаўнер з возу зерне бярэ. Усё гэта бачыў канцлер і сумна рабіў выснову, што ўсю Літву ў пустыню ператварылі.

Становішча Смаленска значна пагоршылася. Перабежчыкі распавядалі, што за суткі ў горадзе памірае ад голаду і хвароб каля 50 чалавек. Просты люд штодня патрабуе ад ваяводы здачы горада, а той суцяшае народ казкамі аб царскай дапамозе. А баярына, які выказаўся за здачу, Шэін закатаваў. Смаленскія ратнікі не прымалі міласэрнасці караля — не жадалі загубіць сваіх душ.

Прыйшоў час, і сам Шэін не вытрымаў. Разам з жыхарамі ён хадзіў да смаленскага архіепіскапа Сергія, каб угаварыць таго здаць Смаленск і выратаваць горад ад смерці. Ні горада, ні людзей святар не пашкадаваў. Праваслаўе вышэй за міласэрнасць. Сергій зняў з сябе шаты і заявіў, што прыме пакуту, але царкву сваю не выдасць. Расчуленыя смаляне пакляліся абараняцца да апошняга. За рэлігійны фанатызм плацілі жыццём людзей. Да сярэдзіны мая 1610 года ў Смаленску памерла 14 тысяч чалавек.

І тым не менш горад трымаўся. Між тым адзін за другім палі суседнія гарады. У красавіку Аляксандр Гансеўскі аблогай вымусіў адчыніць браму Бельск. Пасля каралеўскія ваяры ўзялі Ноўгарад-Северскі. Запарожскія казакі захапілі Старадуб, Чарнігаў і Пачэп. Амаль уся Смаленская і Северская землі перайшлі да Рэчы Паспалітай, і насельніцтва прынесла каралю прысягу. Але таму патрэбны быў Смаленск — адступленне азначала паражэнне. А калі ўлічыць шматлікую апазіцыю і неўстойлівае асабістае становішча, дык бясслаўнае вяртанне з войскам магло каштаваць Жыгімонту кароны.

Аблога працягвалася. Але частку войска на чале з Станіславам Жулкеўскім давялося накіраваць супраць царскай раці Дзмітрыя

Шуйскага*. Жулкеўскі каля Клушына 24 чэрвеня збіў са свайго шляху ворага і рушыў да Масквы. Паволі перавага ў вайне хілілася на карысць Рэчы Паспалітай.

Напрыканцы мая прыбылі з Рыгі і абложныя гарматы — дзве буйныя «Баба» і «Базілішак» і шэсць меншага калібру. Палову месяца ставілі батарэю для бою, і вось 18 ліпеня яна загаварыла. Велізарныя ядры прабілі ў Гранатавай вежы адтуліну. Наступным днём з самага ранку нямецкая пяхота ўварвалася ў горад. З усходняга боку на прыступ рынуліся казакі. Абаронцы адагналі іх агнём гармат і пішчаляў.

Сапега сур'ёзна апасаўся, што замест славы давядзецца вяртацца дадому з няславай. У лісце да яго віленскі біскуп пераконваў, што вялікая справа вялікаму часу і вялікіх цяжкасцей вынесці патрабуюць.

На перамовах з Львом Сапегам ваявода Шэін не згаджаўся аддзяліцца ад «галавы» — сталіцы Масквы. Смаленск не здаваўся і тады, калі баяры скінулі цара Васіля Шуйскага і выбралі ўладаром каралевіча Уладзіслава. Голад і хваробы забіралі штодня сотні людзей. Воля смалян была зломлена, і яны асуджана прымалі свой трагічны і гераічны лёс.

Смаленск паў 13 чэрвеня 1611 года. Каралеўскае войска начным штурмам узяло горад. Ратуючыся ад раз'юшаных ваяроў, смаляне заперліся ў праваслаўным саборы.

Але і святасць храма не спыніла пераможцаў. Яны ўварваліся ў сабор і пачалі забіваць і хапаць у палон людзей. Архіепіскап Сергій з крыжом у руках хацеў спыніць кровапраліцце. Не пашкадавалі і яго. Секанулі шабляй па галаве. Тады смалянін Андрэй Беляніцын запаліў пад лёхам дзежкі з порахам. Выбух разваліў храм, і пад яго абломкамі ляглі сотні людзей. Трыумф перамогі Жыгімонта стаў трагедыяй Смаленска**.

## СТРАСЦІ ПА ШАПЦЫ МАНАМАХА

Увесь час аблогі літвінскі канцлер знаходзіўся пры войску. Баявымі подзвігамі ён не адзначаўся перад гісторыяй. Не вёў воінаў у бой і не рызыкаваў сам. Перабраўся падалей ад небяспечнага агню

---

* Сілы Жулкеўскага складалі 2000 вершнікаў і 1000 пешцаў. Ішла з гетманам і харугва сына Сапегі, Яна.

** Міхайла Шэін трапіў у палон. Пазней Леў Сапега выпрасіў у караля свабоду для ваяводы і пасяліў яго разам з сям'ёй у сваім доме ў Ружанах. Тут Шэін пражыў да 1619 года, пакуль не вярнуўся на радзіму.

смаленскіх гармат. Толькі двойчы ў дзённіку аблогі нагадваецца імя Льва Сапегі ў сувязі з вайсковымі падзеямі. Першы — калі на чале свайго аддзеда ў ноч на 3 кастрычніка 1609 года ён напаў на лагер ваяводы Скопіна-Шуйскага.

Маскавіты з дапамогай немцаў адбілі атаку літвінаў. Але непераможны Скопін пасля гэтага бою павярнуў назад. Другі — 31 кастрычніка, калі абаронцы горада зрабілі вылазку і напалі на варту канцлера і, сустрэўшы адпор, адступілі.

Як самы ўплывовы вяльможа пры каралеўскім двары падчас гэтага паходу, Леў Сапега вызначаў стратэгію вайны — яе мэты і сродкі дасягнення. Вёў складаную дыпламатычную палітыку за ажыццяўленне сваёй мары — уніі Рэчы Паспалітай і Масковіі. Шлях да гэтага ён бачыў праз выбранне на царскі пасад каралевіча Уладзіслава. Аднак як гэта здзейсніць? Цяжкасцей хапала. Надзею надавала жаданне часткі баяр падтры маць Уладзіслава. Падзеі складваліся так, што спрыялі задуме канцлера.

Саюзнікаў Сапега знайшоў у лагеры Лжэдзмітрыя II — там сабраліся баяры і дваране, незадаволеныя ўрадам цара Васіля Шуйскага. Найбольш дальнавідныя з баяр, якія прысталі да самазванца, пачалі думаць пра замену Лжэдзмітрыя. Выбар быў адзін — каралевіч Уладзіслаў. Групоўку ўзначаліў мітрапаліт растоўскі і яраслаўскі Філарэт Раманаў, які пры самазванцы хадзіў за патрыярха. Быў там і вядомы ў Масковіі палітык баярын Міхайла Салтыкоў — той, што пагражаў Сапегу на перамовах вайной. Ён і ўзначаліў пасольства тушынскіх баяр да Жыгімонта напрыканцы студзеня 1610 года. Прыехалі з Салтыковым ягоны сын Іван, князі Васіль Масальскі, Юрый Хварасцінін, баяры Леў Пляшчэеў, Нікіта Вельямінаў, а таксама дзякі і дваране.

31 студзеня пасольства прыняў Жыгімонт. Тушынцы выступілі ад імя ўсяго маскавіцкага народа, чым паказалі каралю, што яны адзіныя маюць права прэтэндаваць на ўладу ў дзяржаве. Канешне, пасадзіўшы на царства свайго ўладара, яны не толькі вярнулі б страчанае, але яшчэ больш узвысіліся. Намаганні апраўдвалі сябе. Дзяк Іван Грамацін абвясціў, што ў маскоўскім панстве ўсе людзі жадаюць мець за цара каралевіча Уладзіслава, калі ён захавае грэчаскую веру, старыя правы і звычаі, калі яшчэ прыбавіць новыя правы і звычаі, якіх раней не было ў Маскоўскім гаспадарстве.

Вынікам перамоваў пасольства з раднымі панамі (а перамовы вёў Леў Сапега) стала заключэнне 4 лютага пагаднення аб умовах выбрання Уладзіслава царом. У аснову быў пакладзены ранейшы

праект Льва Сапегі: паміж Маскоўскім гаспадарствам, Польскай Каронай і Вялікім княствам Літоўскім устанаўліваецца вайскова-палітычны саюз; дзеля абароны ад татарскіх набегаў межы панстваў ахоўваюць агульнымі сіламі; Маскоўскае гаспадарства захоўвае свой палітычны лад, палякі і літвіны не дапускаюцца да дзяржаўных пасадаў, захоўваецца праваслаўная вера; паміж абодвума панствамі існуе вольны гандаль, але мыта на межах браць па-старыне; па навуку можна ездзіць з Масковіі ў іншыя хрысціянскія дзяржавы; забараняецца пераход сялян, як у самой Масковіі, так і з яе земляў у Рэч Паспалітую; Уладзіслаў вянчаецца на царства рускім патрыярхам паводле старога звычаю.

Жыгімонт у гэтае пагадненне дадаў некалькі артыкулаў. Гэтак, вянчанне каралевіча павінна адбыцца пасля наступлення ў дзяржаве спакою. Тым самым кароль пакідаў сабе магчымасць прэтэндаваць на царскі вянец. Спасылаючыся на неспакой, ён мог не адпусціць сына на царства і, абапіраючыся на войска сілай, вымусіць маскавітаў абвясціць сябе царом. Дадатковы артыкул пагаднення даваў яму права, калі ён будзе ў Маскве, «уряжаць» панствам разам з патрыярхам, баярамі і ўсёй зямлёй. Згоду на вянчанне Уладзіслава ён лічыў часовай мерай — ідэалагічным прыёмам, «каб не ўпусціць выпадку прывабіць да сябе і маскавітаў, якія трымаюцца Шуйскага, і даць справам нашым выгадны ход»[121].

Вось тут і сутыкнуліся інтарэсы літвінскага канцлера і караля. Сапега павінен быў перашкодзіць інтрыгам Жыгімонта і выратаваць свой праект. Не дапусціць да царскага пасада Жыгімонта і пасадзіць на царства Уладзіслава — вось задача, якая паўстала перад канцлерам. На жаль, дакументы не даюць поўны адказ, як усё адбывалася. Канечне, Сапега дзейнічаў асцярожна, не раскрываў сваіх намераў, каб не пасварыцца з Жыгімонтам. Канцлер стараўся не пакідаць слядоў. А таму дакументы так скупа асвятляюць ролю канцлера ў выбары Уладзіслава.

Аднак сучаснікі ведалі галоўнага зачыншчыка гэтай справы. «Сама Масква вельмі славіць імя вяльможнага пана за тое, што праз яго намаганні каралевіча за ўладара ўзялі», — паведамляў пазней канцлеру Ян Сакалінскі, які пабываў у Маскве[122]. Выканаўцаў сваёй задумы Сапега знайшоў сярод тушынскага пасольства — баярына Міхайлу Салтыкова, князя Васіля Масальскага, дзяка Івана Грамаціна, былога скорніка Фёдара Андропава. З-пад Смаленска канцлер кіруе іх дзеяннямі, дае ім «поўную аб усіх справах навуку»[123]. А яны даюць адказ «міласціваму пану і дабрадзею», як яе

выконваюць. Перш за ўсё трэба было нізлажыць цара Васіля Шуйскага.

Пасля вызвалення ад аблогі Масквы становішча Васіля Шуйскага на нейкі час умацавалася. Але рана ён радаваўся будучай перамозе над «тушынскім ворам» і Жыгімонтам. Пасад пад ім захістаўся. То прыняліся за справу тушынцы. Яны і баяраў агітавалі супраць цара, і люд падбівалі на яго падняцца. Добрага слова пра Шуйскага ў народзе не казалі. Клялі цара і за неспакой, і за праліццё крыві, і за горкае жыццё. На вуліцах Масквы людзі гнеўна ганілі свайго ўладара: «Ён чалавек дурны і нягодны, п'яніца і распуснік» — і адкрыта заяўлялі, што ён не варты царства, бо з-за яго «праліваецца многа крыві»[124].


*В. Гондзіус. Леў Сапега. Сярэдзіна XVII ст.*

Прайшоў час, і народ ад слоў узяўся за справу. 7 сакавіка 1610 года ў Маскве ўспыхнула паўстанне супраць Шуйскага. Натхнялі маскавітаў тушынцы. Цар разагнаў мяцежнікаў, ды толькі непрыемнасці для яго не скончыліся. Праз месяц выкрыл! змову баяр, якія рыхтавалі забойства цара. Раптоўна памёр Скопін-Шуйскі — адзіны ў царскім атачэнні таленавіты военачальнік. Казалі, што цар атруціў пляменніка, западозрыўшы яго ў намеры захапіць царскі вянец.

Войска засталося без галавы. Бяздарны Дзмітрый Шуйскі прывёў маскоўскае воінства да разгрому.

Гетман Станіслаў Жулкеўскі падышоў да Масквы. Стала зразумела, што царстваваць Васілю Шуйскаму засталося лічаныя дні. Нават цуд не дапамог бы яму ўседзець на царстве. Палітычныя групоўкі хацелі прычыніцца да нізлажэння цара, каб мець заслугі ў прэтэнзіях на ўладу. Штуршком для расправы з Васілём Шуйскім паслужыла навіна аб набліжэнні да Масквы войска Лжэдзмітрыя. Становішча вымагала рашучасці.

17 чэрвеня завадатары перавароту князь Васіль Галіцын, які сам марыў стаць царом, а таксама захоплены раней у палон Філарэт Раманаў паднялі народ звесці Шуйскага з царства. Цар не меў ніякіх надзей на выратаванне і пакорліва выракся пасада. Каб Шуйскі не спрабаваў вярнуцца на царства, яго сілком пастрыглі ў манахі. Але каго выбраць цяпер царом? Ні Галіцын, ні тушынскія баяры не валодалі рэальнай уладай у Маскве. На сцэну падзей выйшлі людзі, якія сталі на чале часовага баярскага ўрада, — князь Фёдар Мсціслаўскі ды Іван Куракін, а яны схіляліся да Уладзіслава пры ўмове заключэння з ім новага пагаднення. Шанцы каралевіча былі лепшымі, чым у яго сапернікаў Ілжэдзмітрыя ды Галіцына.

Уладзіславу прысягнулі Ноўгарад, Мажайск, Барысаў, Бароўск, Ржэва. Ён меў сілу — войска Жулкеўскага. На перамовах з пасламі Мсціслаўскага гетман ад імя каралевіча абяцаў, што той будзе царстваваць, як і папярэднія ўладары, захавае цэласнасць і самастойнасць дзяржавы. А калі стала вядома, што Захар Ляпуноў жадае патаемна ўпусціць у Маскву войска самазванца, Мсціслаўскі паклікаў у сталіцу Жулкеўскага. Гетман падышоў да Масквы якраз у той час, калі Лжэдзмітрый вёў бой на яе подступах. Мсціслаўскі прасіў дапамогі, але гетман патрабаваў узамен прызнання Уладзіслава царом. Князь не набраўся рашучасці, завагаўся.

Сумленні прагнаў самазванец новым прыступам на сталіцу. Ледзь адбіла яго раць на чале з сынам Салтыкова Іванам Міхайлавічам. І тады Мсціслаўскі здаўся, прыняў дамову з Жулкеўскім, што да Жыгімонта будзе паслана прасіць на царства Уладзіслава, які павінен прыняць праваслаўе і вянчацца ад маскоўскага патрыярха. А пасля гэтага кароль вывядзе войска з краіны. 27 жніўня Масква прысягнула Уладзіславу. І па гарадах баярскі ўрад разаслаў граматы з загадам прысягаць новаму цару.

Жыгімонт вырашыў, што справа прыняла патрэбны для яго накірунак. Галоўным непрыяцелем Уладзіслава стаў яго бацька. Ён сам прагнуў царства. Браты, Ян і Стэфан Патоцкія, пераконвалі караля ў там, што ён вернецца дадому з бясслаўем, калі не возьме

Маскву і царскі вянец. Насуперак меркаванню другіх сенатараў, і «асабліва Льва Сапегі, канцлера літоўскага, які ўсімі сіламі стараўся і раіў каралю зацвердзіць умовы, заключаныя Жулкеўскім, і ўнесці іх на сойм», Жыгімонт не прызнаваў іх і хацеў сам быць царом[125].

> «Пан Бог дае нам Маскву ў рукі, а гвалтам яе кароль сваім упорам ад сябе адштурхоўвае», — думаў Сапега[126].

У Маскву да гетмана Жулкеўскага прыбыў з лістом ад Жыгімонта Фёдар Андропаў. Гетману загадвалася прымусіць баяр аддаць царскі пасад не Уладзіславу, а Жыгімонту. Не падазраваў кароль, што «даверапы тайнаў яго сэрца» перашкаджае яму завалодаць царскім вянцом. Канцлер вёў сваю палітыку абачліва і хітра, выдаваў сябе за шчырага слугу каралеўскай волі. А між тым рабіў усё насуперак каралю. Услед за Андропавым да гетмана прыехаў ад Жыгімонта Аляксандр Гансеўскі. Нібыта прывёз ён падрабязны наказ Жулкеўскаму, як дзейнічаць на карысць караля.

Але сапраўдную мэту Гансеўскага выкрываюць вынікі яго місіі. Гансеўскі некалі служыў Льву Сапегу і палітычную кар'еру зрабіў пры яго падтрымцы. Не выклікае сумненняў, што гэта быў аддапы паплечнік канцлера, бо невыпадкова маскоўскія баяры лічылі яго «прыяцелем Льва Сапегі». І, мабыць, Сапега параіў каралю менавіта Гансеўскага паслаць у Маскву дапамагаць гетману*.

Жыгімонт не падазраваў інтрыгі. Гэтак Сапега займеў у гетманскім стане свайго чалавека. А ён прызнаў, што немагчыма парушыць дамову і выканаць жаданне караля. Першую атаку Жыгімонта на царскі пасад Сапега адбіў. Гансеўскі нейтралізаваў Жулкеўскага, і той не мог уплываць на працу земскага сабора. Так і не правёў гетман кандыдатуру караля. Сабор, на якім сабраліся патрыярх Гермаген, баяры, дваране, прадстаўнікі гарадоў, прыгаварыў біць чалом Жыгімонту, каб пажалаваў на Маскоўскае гаспадарства свайго сына каралевіча Уладзіслава. Цяпер толькі сілай мог Жыгімонт забраць сабе пасад. Сапега прадбачыў і такі варыянт і загадзя рыхтаваў каралю адпор. Перш за ўсё пастараўся ўбраць з Масквы Жулкеўскага, каб войска ўзначаліў Аляксандр Гансеўскі. Пачаў раіць каралю, што толькі пад началам такога слаўнага гетмана, як Станіслаў Жулкеўскі, можна нарэшце заваяваць Смаленск.

---

* Першапачаткова меркавалася, што сам Леў Сапега заменіць Жулкеўскага ў Маскве.

Кароль паддаўся на гетманаўскія хітрыкі і выклікаў гетмана да сябе. А ў Маскве застаўся Аляксандр Гансеўскі. Бліжэйшымі яго дарадцамі сталі тыя, хто выконваў «навуку» Сапегі: Міхайла Салтыкоў, князь Васіль Масальскі, Іван Грамацін, Фёдар Андропаў — усе стаўленікі Сапегі. У сваіх лістах да канцлера яны б'юць яму чалом, каб жалаваў іх міласцю сваёй. Вось «пячатнік» Іван Грамацін прапаноўвае «міласціваму пану і дабрадзею» сваю службу: «Прашу Вашу міласць, скажы мне вам, Ваша міласць, служыці, а я вельмі рад»[127]. Вось Фёдар Андропаў просіць у Сапегі «поўную аб усіх справах навуку» і жадае ягонай падтрымкі, каб выгнаць з прыказаў «пахлебцаў» Шуйскага. Вось Міхайла Салтыкоў шукае ў канцлера заступы ад непрыяцеляў і дзякуе за тое, што перадаў яму іх «паносы і хлуслівае пісьмо». Нават князь Фёдар Мсціслаўскі, і той шле Сапегу сяброўскі паклон, заслугоўвае яго зычлівасці. Гансеўскі і стаўленікі канцлера верхаводзілі ў баярскай думе.

Сапега выйграў — пазбаўлены каралеўскага ціску земскі сабор абвясціў царом Уладзіслава. Да Жыгімонта 7 кастрычніка прыехала пасольства ад сабора і гарадоў Масковіі*. Пасольства ўзначаліў князь Васіль Галіцын. Ад імя Масковіі паслы прасілі ў Жыгімонта даць каралевіча Уладзіслава на царства:

> І вас молім, і ад гэтага прашэння маліць не перастанем, хай пачуе нас вялікая тваёй дзяржавы высакароднасць, даруе нам цара з вераю прыняць святое хрышчэнне ў імя і Сына, і Святога Духа ў нашу праваслаўную грэчаскую веру. Дзеля любові Боскай змілуйся, вялікі гаспадар, не адвяргай гэтае прашэнне [128].

У каралеўскай радзе пачалі думаць, як быць. Вось тут канцлер і зрабіў ракавую памылку. Ён лічыў, што трэба трымаць дамову Жулкеўскага з Мсціслаўскім, але перш за ўсё трэба авалодаць Смаленскай і Северскай землямі, а пасля ўвесці Уладзіслава ў Маскву. Канцлер усё ж не давяраў прысязе маскавітаў: ці не хочуць яны выйграць час? І калі маскавіты падмануць Уладзіслава, дык будзе страчаны і царскі вянец, і Смаленск. Лепш не выпускаць з рук тое, што ў руках.

Пасля доўгіх спрэчак перамагла думка Льва Сапегі і тых, хто падтрымліваў яго.

---

* Ржэва, Зубцава, Разані, Кастрамы, Яраслаўля, Кашыры, Казельска, Бранска, Болхава, Тарапца, Тулы, Дзмітрава, Белева, Сярпейска, Алексіна, Тарусы, Калугі, Варатынска, Ліхвіна, Смаленска, Медыні, Вярэі, Бежацкага Верха, Галіча, Старыцы, Вязьмы, Дарагабужа, Бежацкай Пяціны, Шэлонскае Пяціны, Карачава, Арла, Мцэнеска, Дзераўскай Пяціны.

Паслам адказалі, што кароль не выведзе з Масквы войска і не адступіць ад Смаленска, бо ён прыйшоў у Маскоўскае гаспадарства ўсталяваць спакой і мір, расправіцца з самазванцам, толькі пасля гэтага ён дасць свайго сына на царства.

Як паказалі далейшыя падзеі, гэтае рашэнне было памылковым. Прысутнасць каралеўскага войска ў сталіцы і аблога Смаленска апраўдвалі непрымірымую пазіцыю ворагаў Уладзіслава, дазвалялі выдаваць сваю барацьбу за святую справу — абарону веры і краіны ад «літоўскіх заваёўнікаў». Вянчанне на царства Уладзіслава прывяло б да прысягі новаму цару ўсю Масковію і пакончыла б з апазіцыйным рухам, які яшчэ не набраў сілы. Аднак Уладзіслаў не прыехаў у Маскву.



*Станіслаў Жулкеўскі (1547 ці 1550—1620). XVII ст.*

Народ хваляваўся. А кароль ніяк не мог узяць Смаленск, каб адправіць сына ў Маскву. На перамовах з маскоўскімі пасламі Смаленск стаў той цвержай, аб якую разбіваліся ўсе добрыя намеры канцлера ўчыніць унію славянскіх дзяржаў. Паслы ўпарта адмаўляліся саступаць гэты горад. Сапега ўжо і не ведаў, як упрасіць іх.

> Шмат раз мы з вамі з'язджаліся, але нічога добрага не зрабілі, мы кажам увесь час, каб вы каралю чэсць зрабілі, загадалі смалянам крыж цалаваць яго міласці і сыну яго каралевічу. Але вы адгаварваецеся не па справе, што без згоды маскоўскіх баяр таго ўчыніць не можаце, тады як вам дадзены паўнамоцтвы казаць і станавіць пра ўсё.

Паслы не здаваліся. Сваёй упартасцю даводзілі канцлера да крыку, і ён у запале пагражаў ім:

> Мы вам у апошні раз кажам пра Смаленск. Калі не зробіце так, каб смаляне цалавалі крыж каралю і каралевічу, дык прысяга з гетмана сышла, і мы Смаленска не станем цярпець; не застанецца камня на камні і будзе з ім тое самае, што было некалі з Іерусалімам.

18 лістапада на сустрэчы з парламентарамі Сапега заявіў, што Шэін спасылаецца з «ворам» і хоча ўпусціць яго ў горад, таму смаляне павінны здацца. І гэты довад не пераканаў паслоў. Тады іх папярэдзілі: «Убачыце, што заўтра будзе над Смаленскам». Ясны намёк на штурм горада. Паслы захісталіся. Цвёрдасць вярнуў ім мітрапаліт Філарэт:

> Нельга ніякімі мерамі ўпусціць каралеўскіх людзей у Смаленск. Калі мы ўпусцім іх хоць трохі, дык ужо Смаленска нам больш не бачыць. Калі так, няхай лепш кароль возьме Смаленск узяццем, па-за дамовы і свайго крыжовага цалавання: на тое Боскі лес, толькі б нам кволасцю сваёю не аддаць Смаленска [129].

Гэтак, зноў з-за Смаленска павінна ліцца кроў. Жыгімонт вырашыў зброяй зламаць супраціўленне паслоў і смалян. І гэты прыступ (21 лістапада) не прынёс перамогі. Праз падкоп удалося ўзарваць адну вежу і разбурыць частку сцяны. Аднак смаляне грудзьмі сталі ў адтуліне. Тройчы адбівалі яны атакі каралеўскага войска.



*Т. Макоўскі. Прадстаўленне Варшаўскаму сойму 1611 г. Васіля Шуйскага. XVII ст.*

А ў Маскве паводле «навукі» Сапегі Міхайла Салтыкоў, Фёдар Андропаў і князь Фёдар Мсціслаўскі ўламвалі патрыярха Гермагена напісаць Філарэту, каб ён і паслы прызналі каралеўскую волю. Патрыярх гневаўся і абяцаў падняць народ, калі Уладзіслаў не прыме веры праваслаўнай, а кароль не выведзе свае войска. Не знайшоўшы словаў, Салтыкоў аблаяў святара і замахнуўся на яго нажом.

І адштурхнуў патрыярха ад Уладзіслава. Наступным днём Гермаген заклікаў на плошчы народ стаяць за праваслаўную веру. Хаця Гансеўскі і арыштаваў Гермагена, але іскра, кінутая ім, разгарэлася. Полымя вайны супраць Уладзіслава распальваў разанскі ваявода Пракоп Ляпуноў. Гэта ён прывёў да прысягі Уладзіславу Разанскую зямлю і ён першы здрадзіў свайму цару. Здрадзіў, бо бачыў падман з боку Жыгімонта. Сына не адпусціў, краіну ваюе. Ляпуноў падтрымаў заклік патрыярха і пасылаў па гарадах граматы, каб усёй зямлёй стаяць за Маскоўскае гаспадарства і біцца насмерць з палякамі і літвінамі. Пачало збірацца апалчэнне ў паход на Маскву. Ніхто, пэўна, не чакаў, але пастаяць за «праваслаўную хрысціянскую веру» заклікалі з-пад Смаленска і паслы. Калі прыйшоў загад баярскай думы падначаліцца каралеўскай волі, здавалася, што нарэшце яны згодзяцца на здачу Смаленска. Леў Сапега з надзеяй адзначаў:

> Бачыце, пра што мы вам казалі, тыя ж словы Дух Святы паслаў усім вашым баярам: яны ж гэтымі словамі вам загадваюць, якімі мы ад вас таго ж патрабавалі; сам Бог адкрыў ім усё гэта, і вы тым больш павінны слухацца волі яго міласці караля [130].

Але пад граматай не стаяла пячатка патрыярха. Паслы адмовіліся выконваць баярскі загад. Замест пакоры падбівалі народ на вайну:

> Не думайце і не спадзявайцеся, каб каралевіч быў гаспадаром у Маскве. Усе людзі ў Польшчы і Літве гэтага ніяк не дапусцяць. У іх у Літве на сойме думалі з усёй зямлёй, і ў іх так пакладзена, каб вывесці добрых людзей і спустошыць усю зямлю і валодаць усёю Маскоўскаю зямлёю. Усім стаць нам за праваслаўную хрысціянскую веру, пакуль яшчэ мы вольныя, а не ў рабстве, і не выведзены ў палон [131].

Паслы не толькі парушылі закон пасольскіх чынасцяў, але і прама хлусілі. Ніякага сойма на Літве не адбылося, дзе нібыта

пастанавілі завалодаць усёю Маскоўскаю зямлёю. Але за «святую справу» можна і схлусіць. Грамату паслоў Пракоп Ляпуноў перапісваў і слаў па гарадах. Масковія падымалася на свайго ўладара, хлусня і здрада ўзначалілі гэты рух.

Гэтак самалюбівымі і недалёкімі людзьмі знічтажалася вялікая мара Льва Сапегі. Адзін за адным выракаліся прысягі Уладзіславу маскоўскія гарады. На Маскву рушыла сабранае Ляпуновым 80-тысячнае апалчэнне, да якога далучыўся паплечнік самазванца Заруцкі. А як высветлілася, Ляпуноў і ягоныя спадручнікі дбалі не пра выратаванне Айчыны, а толькі пра месца пры царскім двары — высокае месца. Учыненая імі дума вырашыла пасадзіць на царства аднаго з сыноў Карла Судэрманскага і саступіць шведам Ладагу і Арэшак. Каб ажыццявіўся гэты праект, Масковію чакала б яшчэ больш крывавая вайна, цяпер на яе палях Швецыя і Рэч Паспалітая біліся б за царскі вянец. Чым закончылася б гэта? Падзеннем Маскоўскага гаспадарства?

Дарэмна Гансеўскі і Салтыкоў увяшчалі патрыярха спыніць апалчэнцаў і не праліваць хрысціянскую кроў. Гермаген палахліва выракаўся. І кроў пралілася. Завадатарамі мяцяжу падазравалі паслоў. 26 сакавіка 1611 года Леў Сапега выклікаў іх да сябе і паведаміў прычыны іх зняволення:

> Мы ведаем вашы аблудлівасць і хітрасць, нявартыя паслоў: парушылі народнае права, пераступілі межы вашых пасольскіх абавязкаў, зняважылі указы баяр маскоўскіх, ад якіх прыехалі; падбівалі патаемна народ да непавінавення і мяцяжу, распальвалі нянавісць да караля і каралевіча Уладзіслава, давалі парады мяцежнікам, адхілілі Шэіна ад здачы Смаленска, абнайдзейваючы яго хуткай дапамогай ад Ляпунова, чакалі, пакуль выспеюць здрада і мяцеж [132].

Так безвынікова закончыліся гэтыя перамовы аб выбранні каралевіча Уладзіслава на Маскоўскае гаспадарства. Спадзяванні Сапегі на саюз Рэчы Паспалітай з Масковіяй не спраўдзіліся. Замест міру і згоды паміж абодвума панствамі зноў запанавала нянавісць і вайна. Канцлер не мірыўся з такім паваротам падзей. Зноў звярнуўся ён да паслоў:

> «Вы нам скажыце, як злу дапамагчы і крыві праліццё суняць». — «Мы самыя не ведаем, што цяпер рабіць, — адказвалі паслы, — нас адправіла ўся зямля, а па-першае — патрыярх. Цяпер

жа патрыярх, наш начальны чалавек — пад вартаю. Маскоўскага гаспадарства баяры і ўсялякія людзі прыйшлі пад Маскву і б'юцца з каралеўскімі людзьмі, за каго сябе прызнаваць, і пра Смаленк не ведаем, што рабіць: як смаляне даведаюцца, што каралеўскія людзі, якіх маскавіты ўпусцілі да сябе, спалілі Маскву, ды спалохаюцца, каб з імі гэтак не зрабілі, калі ўпусцяць да сябе каралеўскіх людзей.

Такім чынам, паслы складвалі з сябе паўнамоцтвы. «Што ўтварылася ў Маскве, пра гэта няма чаго казаць: кажыце, што рабіць наперад?». І вось што адказалі паслы:

Іншага сродку паправіць справу няма, як, каб кароль пацвердзіў нашы стацці аб Смаленску і час свайго адступлення ў Польшчу пазначыў менавіта ў лісце за вашымі сенатарскімі рукамі. А мы аб гэтай каралеўскай міласці дадзім вестку ў Маскву патрыярху, баярам і ўсім людзям Маскоўскага гаспадарства, напішам і тым, якія цяпер прыйшлі пад Маскву, каб яны суняліся і з каралеўскімі людзьмі не біліся і каб з Масквы, як найхутчэй, да нас адпісалі і прыслалі людзей з усіх чыноў [133].

Сапега згадзіўся з прапановай паслоў, але патрабаваў, каб здаўся Смаленск. Паслы слушна заўважылі, што смаляне да згоды з Масквой не паслухаюцца іх. Але ў караля ўжо не выпадала часу чакаць. З Польшчы прыходзілі трывожныя лісты ад паноў. Семіградскі ваявода Габрыэль Баторый, братаніч караля Стэфана і кандыдат на каралеўскую карону ад Жабрыдоўскага і Януша Радзівіла, выгнаў з Малдавіі гаспадара Радула. Паны хваляваліся, каб Баторый не рушыў на Кракаў і пры падтрымцы былых ракашан не сеў на каралеўства. Трэба было спяшацца ў Польшчу, але вярнуцца з бясслаўем кароль не мог.

Ці не каштавала б няўдачная аблога Смаленска кароны? Незадаволеная апазіцыя не прамінула б расправіцца з ім. Кароль не хацеў чакаць доўгіх зносін пасольства з маскоўскімі баярамі. І калі паслы адказалі Сапегу, што будуць чакаць адказу з Масквы, ён ад імя караля вынес ім прысуд — высылка ў Вільню. 13 красавіка пасольства адправілі пад вартай у Літву.

Кароль ужо не нагадваў і пра царскі вянец, узяць бы Смаленск і заявіцца на сойм пераможцам. Не да саюзу з Масковіяй было ўладару. Нарэшце 13 чэрвеня Смаленск паў. Жыгімонт радаваўся выратавальнай для яго перамозе, а яна зрабіла немагчымым саюз Рэчы Паспалітай і Масковіі. Гэта было паражэнне — паражэнне

ўсяго славянства. Пэўна, і сам Леў Сапега яшчэ не разумеў значэння смаленскай трагедыі. На той момант яго непакоілі захады палякаў прысвоіць сабе Смаленск. Пры каралеўскім двары адбываўся «злы торг», як казаў канцлер, вернутымі землямі. Польскія саноўнікі марылі пра Вялікую Польшчу.

> А паны палякі напісалі Канстытуцыю народу нашаму шкадлівую і, гэты фундамент Канстытуцыі залажыўшы, назвалі яго дыпломам, прывілей сабе напісалі на Смаленск і на іншыя правінцыі і замкі, што ім дарує кароль усё, што ад Масквы будзе здабыта. Я быў змушаны пратэставаць супраць гэтае Канстытуцыі і супраць гэтага дыплому, каторую пратэстацыю, хоць у канцылярыях кароных не хацелі прыняць, а палякі нават забаранілі прымаць яе гораду, аднак горад прыняў [134].

Хаця і адстояў канцлер прыналежнасць Смаленска да Вялікага княства, аднак глыбокае расчараванне азмрочыла радасць.

> Як шмат добрага з ласкі сваёй даў нам Пан Бог, каб мы былі ўдзячны за яго ласку і дабрадзейства, ды, ідучы за воляй яго святой, здолелі тое ўтрымаць, што нам у рукі даў [135].

Кожны імкнуўся да сваіх выгод. А вінаваты ён, канцлер. У лістах да жонкі ён скардзіўся на няўдзячнасць да яго караля і яго «каморы».

> Пакарай мяне, пан Бог, што на мяне наракаюць усе, але Бог бачыць, што не даю прычыны.

Але і без прычыны ганілі яго: «Пакуль было кепска, то кажуць, што я радзіў, калі пан Бог даў дабро, то ўжо яны радзілі, а не я». Так, перамогу прыпісвалі сабе каралеўскія падхлебцы, а няўдачы — Льву Сапегу. «Хто ім пільней і зычлівей служыць, тыя ў іх у меншай павазе; ужо ў мяне баліць сэрца ад іх службы», — прызнаваўся Сапега жонцы[136]. Аднак такое не скажаш. Жыгімонт Ваза своеасабліва «аддзячыў» канцлеру — загадаў польскаму войску вяртацца праз слонімскія ўладанні Сапегі. А хто такія свавольныя жаўнеры, ён добра ведаў — не лепш за рабаўнікоў. Горкія думкі авалодвалі канцлерам: «Ужо мне час дома сядзець, а не служыць няўдзячнаму панству», — дзяліўся ён сваімі сумненнямі з самым блізкім чалавекам «наймілейшай Гальшусенкай»[137]. Яна хварэла, а ён з-за служэння «няўдзячнаму панству» не мог адлучыцца з каралеўскага лагера. Так і не ўбачыла яна перад смерцю свайго



*Рэканструяваныя брама і флігелі палацу Сапегаў у Ружанах*

мужа. Вярнуўся з вайны Леў Сапега чалавекам, які страціў сэнс жыцця.

Толькі моцная воля і пачуццё абавязку дапамаглі канцлеру не паддацца адчаю і кволасці. Калі не ён, дык хто? Сапраўды, хто прынясе жаданы мір славянам, хто спыніць гэтыя крывавыя войны паміж імі? І Сапега разумеў, што гэты чалавек — ён, канцлер Вялікага княства Літоўскага. За ім улада, за ім немалое багацце, за ім шчырае жаданне, а значыць, і Бог. Гнеўна асудзіў Сапега тых карысталюбцаў, якія сваімі дзеяннямі сарвалі саюз Рэчы Паспалітай і Масковіі. Не называў іх па імёнах, але ясна было, што гнеўныя пяруны слаў канцлер на галовы тых, хто раіў каралю не выконваць дамову Жулкеўскага. Ды толькі і ён не знайшоў іншага шляху, як сілай вярнуць царскі вянец Уладзіславу і злучыць у саюзе славянскія народы. Цара Міхайлу Раманава Сапега не прызнаваў за законнага ўладара. Заявіў у 1615 годзе маскоўскім паслам Жэлабужскаму і Мацiну, што цара пасадзілі адны данцы — данскія казакі.

> Яшчэ ў вас несапраўдны гаспадар: два ў вас гаспадары: адзін у вас на Маскве, а другі тут, Уладзіслаў каралевіч, яму вы ўсе крыж цалавалі [138].

Паход у 1618 годзе не прынёс жаданага выніку. Маскавіты не адступілі ад цара Міхайлы. А Маскву не ўзялі. Сваю мару Сапега

імкнуўся ажыццявіць на перамовах. Прадстаўляў маскавітаў баярын Фёдар Шарамецеў, які некалі слаў да Сапегі пад Смаленскам лісты ў надзеі выпрасіць у канцлера жалаванне. Тады баярын сябрам зычлівым і паплечнікам сябе выдаваў, а цяпер вось праціўнік.

> Нельга не звярнуць вашу ўвагу, якім праз вашу аблудлівасць пакрыліся мы сорамам перад светам, якія цяжкія кары мсціваe неба гатуе для вас. І паглядзіце, каго адрынулі, уласнага князя, у якім толькі хрысціянства, у якім цячэ кроў цэзараў і каралёў, князя, які сам народжаны ў вольным народзе, навучаны, як шанаваць свабоды, не сцерпіць і ў вас няволі, знішчыць тыя самавольныя указы, праз якія за віну аднаго бацька, маці вінаватыя і адным знакам трацяць жыццё, або ў роспачы і нудзе гінулі на выгнанні. Не, іншыя чакаюць вас справы, іншы ўрад пад панам асвячоным, хотлівым заслугі ўзнагароджваць і ўчынкі паводле праў судзіць. Заслужаных асоб і маёмасці вашай не будзе ў трывозе і няўпэўненасці, смутку трымаць. Не супрацiўляйцеся карысці, што чакае вас ад трывалага міру Рэчы Паспалітай і Масквы. Спрыянне ў гандлі і ўсялякіх абме-



*І. Лаўры. Сойм Рэчы Паспалітай у 1622 г.*
*Літарамі адзначаны: А — Яго каралеўская міласць; В — Архібіскуп Гнезненскі, прымас каралеўскі; С — Архібіскуп; D — Сенатары-біскупы; Е — Сенатары-ваяводы, кашталяны; Р— Вышэйшыя кіруючыя і судовыя дыгнітарыі і сенатары ВКЛ; G — Канцылярыя, сакратарыят ЯКМ; Н — Нобілі каралеўства і ВКЛ*

нах, збаўленне ад цемры, узвышэнне асветы, братэрства, годнасць і салодкія абавязкі саюзу! Якая нарэшце са злучоных сіл выгода, мацнейшыя будзем супраць непрыяцелей хрысціянства татараў і турак. Ах! Як хутка ўсе звадкі, усялякія ўзаемна пабудаваныя сцены разбурым, якое заспакаенне паміж бацькам і сынам. Супраціўнае гэтаму можаце чакаць ад урада Міхайлы. Не выбранец ён баяр і люду, толькі зухвальству збунтаванага казацтва вінен вянцом. І хто ён такі? Дзе яго высакароднасць значыцца? Ці можа сын нейкага манаха не тое што раўняцца з крывёй каралёў, але і з лепшымі дамамі вашых баяраў: Мсціслаўскімі, Шуйскімі, Галіцынымі, Трубяцкімі, Далгарукімі, Куракінымі, Шарамецевымі. Зменшаны гонар гэтых шляхецкіх радоў, бо той, хто нядаўна займаў у вас апошняе месца, цяпер з высокага пасада загадвае ўсімі.

Вярніцеся да правага пана вашага, які вялікадушна прабачыць вас і ў праўленні яго шчасце і славу знойдзеце[139]. Шарамецеў і яго спадручнікі не прымалі ні дакоры, ні довады, так што дарэмна пужаў канцлер баяраў Боскай карай за аблуду да Уладзіслава, дарэмна даводзіў пажытак і выгоду саюзу паміж панствамі. Баяры засталіся пры царскім наказе. «Не запярэчым, што Уладзіслаў за вялікага князя маскоўскага згоднымі галасамі быў ад нас выбраным, прысягалі яму, як Пану, шчыра малітвы ўзносілі да неба за цэласць і здароўе яго: імя яго насілі ўсякія нашы уставы, пячатка, грошы. Сталіцу з княжым жэзлам, карону, дарагія скарбы, аздобы аддалі гетману Жулкеўскаму, аж да прыбыцця манарха. Калі яго нецярплівa, калі яго доўга зачакаліся, не прыбываў у край наш, высланых па яго паслоў супраць правоў народаў звязенілі. Кароль ваш не за сына, за сябе працаваў, адданае Уладзіславу берло хацеў затрымаць для сябе. Можа, вам гэта тайна, але ведайце цяпер, што Жыгімонт праз сваіх пасланцаў стараўся нахіліць нашых баяр, каб не малалетняму, яшчэ недасведчанаму сыну, але яму раду над панствам аддалі [140].

Сапега апраўдваўся ад абвінавачванняў. Ці мог прыехаць Уладзіслаў у Маскву, калі Ляпуноў і Пажарскі паднялі супраць яго бунт і самі прагнулі вянца? Ці можна было адпусціць яго на вашу зычлівасць і вернасць? Маскву спалілі без ведама караля і каралевіча. Але хто прычына? Ляпуноў, які ўварваўся ў горад. А паслы былі завадатары бунту і сваімі падступствамі заслужылі няволю.

Кожны бок прызнаваў толькі сваю праўду. За абвінавачваннямі і дакорамі і прайграў канцлер гэты апошні бой за сваю вялікую

мару. Не пераканаў ён баяр ні ў справядлівасці прэтэнзій Уладзіслава на царскі пасад, ні ў патрэбнасці саюзу. Толькі заключыў перамір'е на 14 гадоў. І тое, пасля таго, як не вытрымаў баярскай упартасці:

> Прысягнём вам, што болей з вамі размаўляць не будзем. Заўтра пашлём на вас людзей, а самі паедзем у Літву на сойм [141].

Папярэджанне падзейнічала, і баяры згадзіліся на перамір'е. Паводле Дэулінскага пагаднення, Вялікаму княству Літоўскаму вярталіся гарады, якія ўваходзілі раней у яго склад: Смаленск, Белы, Дарагабуж, Старадуб, Чарнігаў, Трубчэўск, Сярпейск, Невель, Себеж, Красны, Ноўгарад-Северскі. З палону вызваляліся маскоўскія паслы Васіль Галіцын і мітрапаліт Філарэт.

Канечне, гэта важная дыпламатычная перамога, і кожны дыпламат ганарыўся б ёю. Але не зроблена было галоўнае. Колькі ўжо заключалі і перамір'яў і мірыліся на вечныя часы, а ўсё роўна пераступалі праз крыж і ваявалі. Бо ніхто не быў здольны знішчыць перадумовы да новых канфліктаў.

На сойме каронны падканцлер Андрэй Ліпскі назваў заключанае Сапегам перамір'е ганебным. Падканцлер выслужваўся перад каралём, забыўся, як пісаў Сапегу лісты з просьбай хутчэй закончыць вайну. І вось цяпер вінаваціў яго ў змяншэнні славы і пажытку Рэчы Паспалітай. На ўсе абвінавачванні Сапега проста адказаў:

> Калі грамадзянін пачціва служыць сваёй Айчыне, непарушна веру, што славы сваёй не можа зменшыць, калі б яго нават на хвіліну зласліва хацела скрыўдзіць намова, справядлівая патомнасць апраўдае яго і кожнаму аддасць належную плату [142].

Да канца жыцця не раставаўся Сапега са сваёй марай. Усе шляхі да яе прайшоў, а вось не дайшоў. І вярнуўся на шлях, якім ішоў Ілжэдзмітрый. Цяпер і ён задумаў дасягнуць мэты з дапамогай самазванца. У Берасцейскім праваслаўным манастыры ігумен Афанасій Філіповіч паводле просьбы Сапегі выхоўваў хлопчыка сірату падляшскага шляхціца Яна Фаўсціна Лубу. Яго Леў Сапега выдаваў за сына Лжэдзмітрыя II і Марыны Мнішак — Івана Дзмітрыевіча.

Але, пэўна, Леў не верыў у поспех задуманай авантуры, бо так і не выправіў царэвіча здабываць царства.

## НА СХІЛЕ ЖЫЦЦЯ

Давялося Льву Сапегу і браць зброю ў рукі, каб і на вайсковым полі бараніць Айчыну ад ворага — на гэты раз ад шведаў. Карл Судэрманскі не зміры ўся з паражэннем у Лівоніі, і толькі дацкі кароль Хрысціян IV пераблытаў ягоныя планы. Тры гады доўжылася вайна паміж Даніяй і Швецыяй і закончылася ў 1613 годзе. Швецыя страціла шэраг сваіх земляў, а Данія стала першай дзяржавай на Балтыйскім моры. Неўгамоннага Карла Судэрманскага супакоіла смерць — 30 кастрычніка 1611 года шведскі кароль памёр. Не толькі каралеўскую карону ўзяў у спадчыну ад бацькі семнаццацігадовы Густаў Адольф, але і ягоныя планы заваёвы Лівоніі, а таксама план саюзу пратэстанцкіх краін — Швецыі, Францыі, Англіі і Галандыі супраць Рэчы Паспалітай, Іспаніі і Рыма. Славуты астраном Ціха дэ Брага прадказаў Густаву Адольфу вялікую славу.

І сапраўды, дзейсная натура караля прагла вялікіх спраў. Маладосць не бянтэжыла Густава Адольфа, бо з дзяцінства бацька пасвячаў яго ў таямніцы ўладарання, а малады запал не прызнаваў цяжкасцей. Праявіць сябе самалюбівы юнак марыў у пераможных войнах і зрабіць Швецыю мацнейшай дзяржавай у Паўночнай Еўропе. Перш за ўсё Густаў Адольф паклаў намаганні, каб не выпусціць з рук завяваныя шведамі падчас «смуты» маскоўскія землі, ды яшчэ завалодаць новымі. Шведскі кароль у 1615 годзе на чале войска абклаў Пскоў, але абаронцы адстаялі горад.

У 1617 годзе паміж Швецыяй і Масковіяй быў заключаны мір. Перамогі легка не даваліся. Густаў Адольф задаволіўся і нязначнымі вынікамі: здабыццём некалькіх гарадкоў. Не зважаючы на страту Ноўгарада, кароль расхвальваў сябе перад рыксдагам як пераможцу над маскавітамі. А міру шукаць прымусіла Густава апаска перад Жыгімонтам, які не прызнаваў яго за шведскага караля. Жыгімонт слаў у Швецыю граматы і падымаў супраць Густава Адольфа народ. Пужалі Густава і навіны, што стрыечны брат рыхтуецца да вайны і чакае дапамогі ад іспанскага флоту. Дынастычную барацьбу шведскі кароль выдаў перад рыксдагам як святую вайну за пратэстанцкую веру супраць каталіцызму. Злы чалавек Жыгімонт, якім кіруюць д'ябальскія езуіты, жадае вынішчыць пратэстантаў і падначаліць Швецыю папскаму ярму. Густаў прасіў рыксдаг падтрымаць яго супраць Жыгімонта і папістаў, а народ заклікаў згуртавацца вакол уладара і стаць на абарону Швецыі.

Патрэбныя грошы для вайны Густаў атрымаў і прыняўся рыхтавацца да яе. У Галандыі набываў зброю і порах, у Нямеччыне

набіраў жаўнераў. Увесь пафас абаронцы Швецыі прыкрываў простую мэту — заваяваць Лівонію. І не Жыгімонт, а Густаў пачаў першым вайну. Вясной 1617 года шведскае войска на чале з каралём высадзілася з караблёў каля Віндавы. У Лівоніі знаходзіліся нешматлікія літвінскія аддзелы пад зверхнасцю польнага гетмана літоўскага Крыштофа Радзівіла. Галоўныя сілы Літва трымала супраць Масковіі, а Польшча — супраць Порты.

Крыштоф Радзівіл скардзіўся Сапегу: «Што тут з такой горсткай будзеш рабіць, куды кідацца?» Чым мог дапамагчы Сапега? Прасіў ён у караля грошай на войска і чуў адно і тое: «Пенедзей няма».

Лівонію не выпадала як бараніць. Так што лёгка быць пераможцам, калі ўдарыць у спіну, ды яшчэ і нечакана. Поспеху шведаў спрыяў і пераход на іх бок палкоўніка Фарэнсбаха. Ён здаў шведам 8 жніўня Пернаў. Яшчэ адзін замак узяў Густаў Адольф — Саліс. Пасля чаго прыняўся за аблогу Дынамюндэ, які ахоўваў подступы да Рыгі. Тут яго чакала няўдача. Паход на Рыгу сарваўся. Густаў Адольф вымушаны быў пры пасрэдніцтве дацкага караля Хрысціяна IV заключыць з Жыгімонтам двухгадовае перамір’е.

Жыгімонт не надаў належнай увагі гэтаму выступу стрыечнага брата і спадзяваўся з часам распраўіцца з ім. А пакуль займаўся больш важнымі справамі: выправіў па царскі вянец у Маскву каралевіча Уладзіслава. Так што для Лівоніі не хапала ні войска, ні грошай, ні часу. Затое Густаў Адольф не ставіўся так лёгкадумна да Лівоніі, папаўняў і войска, знаходзіў і грошы, даражыў і часам. Завёў шведскі кароль сяброўства з Галандыяй, выдаючы сябе за абаронцу пратэстантызму. Як і шведаў, так і галандцаў Густаў пужаў намерам каталіцкіх уладароў расправіцца з пратэстантамі. Варта Рэчы Паспалітай перамагчы Швецыю і ўзяць пад кантроль балтыйскі гандаль, як Галандыя пазбавіцца галоўнай крыніцы багацця і падзе перад Іспаніяй.

Такой была дыпламатыя Густава, і яна прыносіла плён. Пратэстанцкія краіны дапамагалі шведскаму каралю. Гэтак, з Галандыі дастаўлялі зброю, порах, караблі, вайсковы рыштунак. Галандыя дала Густаву і вялікую пазыку і абяцала абвясціць Рэчы Паспалітай вайну. Жыгімонт па-ранейшаму недаацэньваў сілу стрыечнага брата і не прызнаваў яго шведскім каралём, а таму не прадоўжыў з ім перамір’е. Недальнабачны, выкліканы самалюбівымі намерамі крок Жыгімонта зноў стаў бядой для Рэчы Паспалітай. Густаў Адольф нанёс удар, калі войска Рэчы Паспалітай стаяла супраць турэцкіх

полчышч. Не паслухаўся і англійскага караля, брандэнбургскага электара і галандскіх саюзнікаў не ганьбіць сваю славу нападам на краіну, якая ў гэты час абараняла Еўропу ад мусульманскага нашэсця. Здрадніцкі ўдар, варты не вялікага палкаводца, а звычайнага злодзея, дарма што карону насіў на галаве.

Летам 1621 года шведскі флот болей за сто караблёў прыстаў да берагоў Лівоніі. Кароль павёў 17-тысячнае войска (3125 конніцы і 14 700 пяхоты) пад Рыгу. 1 жніўня пачалася аблога горада. Рыжане мужна адбілі штурм. Жыгімонт безразважліва адносіўся да просьбаў рыжанаў дапамагчы. Кароль і яго дарадчыкі лічылі Рыгу непрыступнай — вытрымае аблогу. Адна Літва прыйшла на дапамогу рыжанам. Але ў польнага гетмана Крыштофа Радзівіла яўна не хапала войска. Усяго тысяча чалавек. Ён адступіў ад Рыгі.

Палову месяца шведы здабывалі горад. Штодня гарматы абстрэльвалі гарадскія ўмацаванні, выпускалі па тысячы ядраў за дзень. Калі Густаў Адольф прапанаваў рыжанам здацца, дык яны адказалі, што будуць абараняцца да апошняга чалавека. І ўсё ж бамбардзіроўка зрабіла сваю справу, разбурыла частку ўмацаванняў. Цвёрдасць абаронцаў пахіснулася. Чакаць выратавання не было адкуль. 15 верасня гарадскі магістрат здаў горад шведам.

Густаў Адольф пакіну ў Рызе яе ранейшыя вольнасці і прывілеі, але прысвоіў сабе гарадскі замак і мытню, выменні, якія належалі каралям польскім і вялікім князям літоўскім. Забраў і маёмасць езуітаў. Рэч Паспалітая пазбавілася свайго важнейшага порта на Балтыйскім моры. Асабліва адчувальнай была гэта страта для Літвы.

Густаў Адольф спяшаўся на поўніцу выкарыстаць спрыяльны момант. Шведы ўзялі Дынамюндэ, а пасля рушылі ў Курляндыю. Навёў іх сюды брат курляндскага герцага Вільгельм Кетлер — марыў сам уладарыць. Вось і прасіў Густава паспрыяць яму. Без супраціўлення на другі дзень аблогі здалася курляндская сталіца Мітава. Занепакоены Сапега папярэджваў караля: «Усім нам патрэбны мір». Не да вайны было. І думаў ён пра просты народ: «Так вынішчылі ўбогіх людзей, што не толькі пабораў даць не могуць, але самі не маюць што есці, ад голаду мусяць паміраць»[143]. Аднак Жыгімонт не згаджаўся на мір. А вясной 1622 года Радзівіл на чале трохтысячнага літвінскага аддзела вымусіў капітуляваць шведскі гарнізон у Мітаве. Смаленскі ваявода Гансеўскі разбіў шведаў каля Кокенгаўзена.

Занепакоены Густаў летам 1622 года прыбыў у Лівонію і прапанаваў Радзівілу заключыць сепаратную дамову паміж Швецыяй

і Літвой. Гетман адмовіўся ад такой прапановы. Але вось перамір'е ад імя Рэчы Паспалітай заключыў. Чым заслужыў нараканні Жыгімонта, маўляў, учыніў перамір'е без каралеўскіх паўнамоцтваў. Перамовы аб міры закончыліся безвынікова з-за прэтэнзій Жыгімонта на шведскую карону, пагадзіліся на перамір'е. Але трымалася яно нядоўга. Вайна зноў пачалася ў 1625 годзе. Густаў Адольф падзяліў войска на часткі і выправіў іх на Курляндыю, Прусію і Усходнюю Эстонію, а сам рушыў да межаў Літвы. 15 ліпеня пасля гарматнага абстрэлу шведам здаўся Кокенгаўзенскі замак. Перад шведскім войскам скарылася некалькі гарадкоў.

Аддзел сына Сапегі Яна пацярпеў паражэнне. Малады Сапега такірваўся ў бой з ворагам, што напароўся прама на яго. Не паспеў і воінаў расставіць, як шведы ўдарылі. Вершнікі дык выраталіся, а вось пешцы — хто лёг на полі забітым, а хто трапіў у няволю. Сам Ян уцёк. Шведы перайшлі літвінскую мяжу і падступілі да радзівілаўскага замка Біржы. Абаронцы пратрымаліся толькі пяць дзён і 20 жніўня запрасілі літасці. Замак разам з арсеналам у 70 гармат дастаўся пераможцам. Адначасова генерал Понтус Дэлагардзі ўзяў Дэрпт, а следам і Нейгаўз. Паспяхова дзейнічаў генерал Горн, які прымусіў здацца Марыенбург і некалькі другіх замкаў. Уся Лівонія і Курляндыя (шведы адваявалі і Мітаву) апынуліся пад шведам. Толькі Дынабург заставаўся вольным. Горн спрабаваў захапіць і гэтую цвержу, але пры штурме атрымаў раненне і адступіў пабіты.

Як ні падабалася Жыгімонту ўзвышэнне Льва Сапегі, але нічога не заставалася, як назначыць яго вялікім гетманам літоўскім. Да пасады віленскага ваяводы (Сапега атрымаў яе ў 1621 годзе) дадалося і гетманства. Такім чынам, Леў Сапега стаў самым уплывовым і значным дыгнітарыем Вялікага княства. Праўда, яшчэ ў 1623 годзе Сапега добраахвотна склаў з сябе абавязкі канцлера.

Выпадак беспрэцэдэнтны, калі вяльможа пры жыцці адмаўляецца ад такой пасады. Прычынай уходу магло стаць расчараванне палітыкай Жыгімонта. Паддаючыся патрабаванням папы рымскага мячом пакараць віцебскіх паўстанцаў супраць царкоўнай уніі, Жыгімонт, у сваю чаргу, патрабаваў жорсткай расправы і ад Сапегі, які ўзначальваў судовую камісію. Сапега чыніў суд насуперак перакананням.

Людзей каралі за спробу абараніць сваю веру і годнасць. Расправа над паўстанцамі была жорсткай (20 чалавек пакараны смерцю), але сваю нязгоду з Жыгімонтам Сапега выказаў уходам з канцлерскай пасады, каб надалей не станавіцца заложнікам палі-

тычных патрабаванняў вышэйшай улады. Але Жыгімонту зноў спатрэбіўся Леў Сапега. Пасля смерці вялікага гетмана Яна Карла Хадкевіча не было на Літве вопытнага і таленавітага палкаводца. Сапега прасіў Жыгімонта назначыць вялікім гетманам Крыштофа Радзівіла, якому раней дастаў пасаду дворнага маршалка. Але сенатары зрабілі Радзівіла вінаватым у страце Лівоніі. Трэба на кагосьці зваліць віну. Ды і сам польны гетман не вызначыўся перамогамі і вайсковай славай. А Жыгімонт не хацеў давяраць гетманскую булаву кальвіністу.

Не праславіўся подзвігамі на ратным полі і Леў Сапега, але менавіта яму 25 ліпеня 1625 года перадаў вялікі князь уладу над літвінскім войскам. Радзівіл у лістах да Сапегі дакараў яго, маўляў, на зло яму прыняў гетманства. «Не трэба думаць пра мяне, што вам на злосць гэтак учыніў, ніколі і нікому на зло нічога не чыніў», — адказаў Сапега[144]. Відаць, Жыгімонт разлічваў, што паважаны і ўплывовы на Літве дыгнітарый здолее сваім прыкладам павесці за сабой паноў і шляхту.


*Густаў Адольф (1594—1632). А. Ван-Дэйк. XVII ст.*

Сам Сапега новае прызначэнне прыняў як святы абавязак перад Айчынай: «Калі маім слабым сілам даручана пахіленую сцяну падпіраць і неасцярожна ўчыненый пажар гасіць прыходзіцца, дык гадам і здароўю дзеля Айчыны не дам адпачынку»[145]. Так у немаладым веку Сапега ўзначаліў літвінскае войска. Хаця і войска моцнага не было. А сабраць шляхту з-за эпідэміі не выпадала. Тым не менш гетман рабіў усё магчымае, каб спыніць рух шведаў на Літву. Пад Дынабург ён паслаў нанятых за свой кошт сотню пехацінцаў і некалькі соцень казакоў пад началам Аляксандра Гансеўскага. Пасілак падышоў своечасова, і гарнізон адбіў шведскі штурм.

Выступіў у паход і сам гетман. Літвіны адваявалі ад шведаў Люцын, Рэжыцу, Марыёнгаўз і Зелборг. Густаў Адольф адразу прыняў меры, каб спыніць пераможны рух літвінскага войска. Ён тэрмінова загадаў пакінуць сваім аддзелам Курляндыю, каб захаваць іх ад разгрому. Мітава і Боўск зноў сталі вольнымі. Сам Густаў захацеў

пераправіцца цераз Дзвіну і ўдарыць на Літву. Сапега ўгадаў гэты манеўр і падсцярог непрыяцеля каля рэчкі Авіншта ў месцы, дзе яна ўпадае ў Дзвіну. Шведскае войска 9 кастрычніка 1525 года спынілася на процілеглым беразе. Сапега ўгледзеў і караля, які красаваўся на кані перад сваімі ваярамі. Праверыў яго храбрасць. Па гетманскаму загаду гарматчыкі далі залп. І ўдача! Ядро трапіла прама ў каралеўскага каня і забіла жывёлу. Густава выратавалі жалезныя пісталеты і сядло, якія захавалі яго ад раны.

Напужаны кароль адразу ж перасеў на другога каня і на ім панёсся падалей ад смяротнага агню. Шведы падаліся за сваім правадыром. Пасланыя гетманам літвінскія вершнікі на чале з Аляксандрам Гансеўскім пераправіліся цераз рэчку і на плячах шведаў уварваліся ў Даленскі замак. У палон трапіла 200 чалавек.

Паход шведскага войска на Літву праваліўся. Але і Сапега вымушаны быў спыніць паход. За перамогі аддалі жыццё шмат воінаў, шмат было параненых, другія захварэлі. А папаўненне кароль не прыслаў, не даваў і грошай на жалаванне. Войска стамілася, і Сапега вывеў яго з Лівоніі на адпачынак. Як і яго папярэднік Хадкевіч, так і Сапега ўвесь цяжар вайны са Швецыяй нёс на сабе. Кароль і вялікі князь палахліва адседжваўся на сваім пасадзе. Польшча хавалася за спіну Літвы, а літвіны хацелі міру. Ваяры скардзіліся на каралеўскую няўдзячнасць. Дакаралі і гетмана, маўляў, сенатарскім слугам, людзям маладым, незаслужоным каралеўскую ласку ўпросіць, а вось для жаўнераў-небаракаў, якія маёмасць сваю трацяць, праліваюць сваю кроў, выпрасіць не можа. Расплачваўся гетман з войскам сваімі ўласнымі грашыма. Сварыліся паміж сабой і першыя памочнікі Гансеўскі і Ян Станіслаў Сапега. Хацелася бацьку даць магчымасць вызначыцца свайму ўлюбёнцу*. Апекваўся над ім.

Можна зразумець просьбу Сапегі да караля, што ў выпадку, калі ён не дасць новага войска, дык «нязносны цяжар з рук маіх зняць і

---

* У сямейным жыцці Льва Сапегу неаднойчы напаткала бяда. Першая жонка Дарота Фірлiеўна (пашлюбаваўся з ёй у 1586 годзе) памерла пры народзінах сына Андрэя ў 1591 годзе. Сын пражыў чатыры тыдні. У раннім веку памерла і дачка Катаржына, якую хрысціла каралева Ганна. Палову года пражыў і сын Крыштоф, народжаны ў 1588 годзе. І толькі Ян Станіслаў, народжаны ў 1589 годзе, шчасліва дажыў да сталага веку. Другой жонкай Льва Сапегі стала Гальшка Радзівілаўна, з якой ён абвянчаўся ў 1599 годзе. Але і яна рана пакінула Льва, памерла ў 1611 годзе. Ад гэтага шлюбу нарадзілася ў 1603 годзе дачка Ганка, жонка князя Альбрэхта Радзівіла, яна памерла ў 1627 годзе. Сапега не мог нават праводзіць дачку ў апошні шлях, бо ў гэты час выправіўся ў паход супраць шведаў. Сын Мікалай у 1606 годзе памёр пасля нараджэння. У росквіце маладосці памёр і другі сын Крыштоф, народжаны ў Ружанах у 1607 годзе. Трэці сын Казімір Лявон стаў падканцлерам. Сапега мужна пераносіў смерць сваіх дзяцей, змірэнча прымаў лёс: «Бог даў, Бог і забраў; як гэта Пан упадабаў, так і сталася; няхай будзе блаславенна панскае імя» (Kognowiski K. Op. cit. 139).

мяне з яго вызваліць»[146]. Жыгімонт не вызваліў гетмана ад «нязноснага цяжару», баяўся, што з яго уходам разваліцца і абарона Літвы. Сапега зноў на свае сродкі сабраў войска і летам 1626 года адправіў яго на чале з Аляксандрам Гансеўскім на вызваленне Лівоніі. Каля Зелборга літвіны сустрэліся са шведскім аддзелам Дэлагардзі. Для Гансеўскага гэты бой ледзь не стаў апошнім. Куля трапіла яму ў шлем на галаве. Але перамогу Гансеўскі здабыў.

Шведы запрасілі перамір'я. На перамовах Гансеўскі з Дэлагардзі так і не знайшлі пагаднення. Вайсковыя дзеі аднавіліся. Гансеўскі ўзяў некалькі замкаў, а пасля праз лясы і балоты выйшаў да Кесі. Тут яго чакалі шведы. Бой закончыўся паражэннем літвінаў, і яны адступілі ў Боўск. Гансеўскі даносіў гетману пра нялёгкае становішча: шмат страт, людзі стаміліся і патрабуюць жалаванне. «Чым далей, тым больш пан Бог за нашы грахі адымае фартуну», — зрабіў Сапега несуцяшальную выснову[147]. Каб захаваць войска і не дазволіць шведам ісці на Літву, Сапега дазволіў Гансеўскаму заключыць перамір'е. Паводле дамовы з Понтусам Дэлагардзі, шведы вярталі Літве Біржы, а ўзамен атрымлівалі Лаўдан. Як гетман тлумачыў каралю — абмен выгадны яго каралеўскай міласці, бо Лаўдан драўляны двор, які цяжка ўтрымаць, а Біржы — мураваны




*Замак у Біржах*

замак, і каб не гэты абмен, дык і Лаўдан страцілі б і Біржаў не мелі б. Для нядобразычліўцаў гетмана з'явілася падстава абвініць яго ў прычыненай крыўдзе каралю, маўляў, без каралеўскага ведама парушыў артыкул уніі, не браў згоды на пакой у каронных паноў. Хто казаў бы? А тое, што палякі нічым не дапамаглі літвінам супраць шведаў, — гэта ці не парушэнне уніі? Пра гэта ягамосці каронныя маўчалі. Забыліся яны і пра дапамогу літвінаў у войнах з туркамі.

> Калі паганыя наступалі на Карону, мы, маючы на шыі гэтага моцнага непрыяцеля шведа, усё ж шэсць тысяч войска літоўскага супраць паганых выправілі і нават грашыма са скарбу літоўскага войска кароннае ратавалі; і цяпер, калі непрыяцель наступіў на прускую зямлю, за просьбай яго каралеўскай мосці нямала за палову літоўскага войска да Прусіі паслалі.
>
> І перакананы, што і я, і народ наш нічым не выступілі сваім учынкам супраць яго каралеўскай мосці і нічым супраць звязкаў уніі [148].



*Герб «Пагоня».
З канстытуцыі Варшаўскага сойма 1619 г.*

Аднак і палякі не далі адпор ворагу. Некалькі разоў шведы грамілі польскае войска ў Прусіі. Густаў Адольф захапіў Пілаву, Мемель, Елбагу, падступалі шведы да Гданьска. Так што Сапегу давялося слаць на дапамогу палякам літвінскія аддзелы. Што і ўратавала палякаў ад поўнага разгрому. У рэшце рэшт 26 верасня 1629 года ў Альтмарку паміж Рэччу Паспалітай і Швецыяй было заключана перамір'е. Швецыі дасталася ўся Лівонія да ракі Дзвіны, берагавая частка Прусіі з партамі. Прыкрае паражэнне з-за пустога жадання Жыгімонта менавацца каралём шведаў, вандалаў і готаў.

А што Леў Сапега? А ён паказаў нам, як ахвяруюць дзеля Айчыны. Не кожны прынясе сваю маёмасць на яе алтар. На абарону Літвы ад ворага толькі ў апошнюю вайну Сапега ахвяраваў большую частку свайго капітала. За гэтыя грошы гетман і трымаў

войска, якое і спыніла шведаў ад нашэсця на Літву і выратавала палякаў.

**Подзвіг самаахвярнасці — вышэйшы подзвіг. Пакуль у Літвы былі такія людзі — яна стаяла. А пасады і багацце, што яны перад народным прысудам?**

**Гэты прысуд у народа не выпрасіш, не падкупіш яго паказным дабрадзействам, не заслужыш красным словам. Вялікі рахунак гісторыі. Першым і адзіным чалавекам на Літве, якога людзі назвалі «бацькам і збаўцам Айчыны»[149], быў Леў Сапега.**

*P. S. Памёр Леў Сапега 7 ліпеня 1633 года ў Вільні і пахаваны ў пабудаваным ім віленскім касцёле св. Міхайлы. Ён прадчуваў смерць і мудра, па-філасофску сустрэў яе. Падняўся з-за сямейнага стала і прамовіў сыну Казіміру: «Час ужо надыходзіць! Садзіся на месца маё, месца гаспадарскае»[150]. І пайшоў ён у пакой падрыхтаваць душу да сустрэчы з мілым Богам і сваімі продкамі. Жыццё ён пражыў, як і яны, ва ўсякіх для свае Айчыны працах, і атрымаў ад людзей славу бессмяротную.*

# БІБЛІЯГРАФІЯ

1. Мамонич Л. На герб ясневельможного пана, его милости, пана Лео Сапеги // Анталогія беларускай паэзіі. Т. 1. Мн., 1993. С. 57.
2. Памятники русской старины в западных губерниях. Вып. 7. СПб., 1885. С. 249.
3. Kognowicki K. Zywot Lwa Sapiehy. Sanok, 1856. S. 2.
4. Ibid. S. 4.
5. Sapiehowie. T. 1. Petersburg, 1890. S. V; Boniecki A. Op. cit. S. 300.
6. Siarczuvski Obraz panowania krola Zygmunta III. S. 154.
7. Саверчанка І. В. Канцлер Вялікага княства. Мн., 1992. С. 9.
8. Kognowicki K. Op. cit. S. 141.
9. Archiwum domu Sapiehow. T. 1. S. 3.
10. Лаппо И. И. Литовский статут 1588 г. Т. 1.4. 1. Каунас, 1934. С. 459—460.
11. Archiwum domu Sapiehyw. T. 8. Krakow, 1885. S. 246; Шкялёнак М. Леў Сапега // Спадчына. 1991. № 1. С. 61.
12. Kognowicki K. Op. cit. S. 141.
13. Соловьев С. М. Указ. соч. Кн. 4. С. 197.
14. Поссевино А. Указ. соч. С. 192.
15. Соловьев С. М. Указ. соч. Кн. 4. С. 197.
16. Archiwum domu Radziwillow. T. 8. S. 174.
17. Ibid. S. 175—176.
18. Соловьев С. М. Указ. соч. Кн. 4. С. 196—197.
19. Сб. материалов и статей по истории Прибалтийского края. Т. 4. С. 182.
20. Флоря Б. И. Русско-польские отношения и политическое развитие Восточной Европы во второй половине XVI — начале XVII в. М., 1978. С. 138.
21. Соловьев С. М. Указ. соч. Кн. 4. С. 202.
22. Там же. С. 203.
23. Еўлашоўскі Ф. Указ. сач. С. 52.
24. Archiwum domu Radziwillow. T. 8. S. 185.
25. Ibid.
26. Dyjaryusze sejmowe R. 1587. Krakow, 1887. S. 3.
27. Соловьев С. М. Указ. соч. Кн. 4. С. 208.
28. Флоря Б. И. Указ. соч. С. 145.
29. Соловьев С. М. Указ. соч. Кн. 4. С. 209.
30. Там же. С. 210.
31. Archiwum domu Radziwillow. T. 8. S. 32.
32. Соловьев С. М. Указ. соч. Кн. 4. С. 211.
33. Там же. С. 214.

34. Шмурло Е. Ф. Россия и Италия. Вып. 2. Т. 2. СПб., 1913. С. 523.
35. Archiwum domu Radziwillow. T. 8. S. 179.
36. Флоря Б. И. Русско-польские отношения и балтийский вопрос в конце XVI — начале XVII в. М., 1973. С. 25.
37. Dyjaryusze sejmowe R. 1587. S. 102.
38. Флоря Б. И. Русско-польские отношения и политическое развитие Восточной Европы. С. 189.
39. Bielski J. Dalszy ciag kroniki polskiej. Warszawa, 1851. S. 57—58.
40. Соловьев С. М. Указ. соч. Кн. 4. С. 217.
41. Там же. С. 218.
42. Лаппо И. И. Литовский статут 1588. Ч. 2. Т. 1. Каунас, 1936. С. 184.
43. Там же. С. 186.
44. Там же. С. 188.
45. Bielski J. Op. sit. S. 60.
46. Archiwum domu Sapiehow. T. 1. S. 22.
47. Archiwum domu Radziwillow. T. 8. S. 212.
48. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588. Мн., 1989. С. 44.
49. Там жа.
50. Там жа.
51. Там жа. С. 47.
52. Лаппо И. И. Великое княжество Литовское. С. 225.
53. Брянцев П. Указ. соч. С. 397.
54. Статут. С. 43.
55. Лабынцаў Ю. Пачатае Скарынам. Мн., 1990. С. 231.
56. Archiwum domu Radziwillow. T. 8. S. 195.
57. Статут С. 43.
58. Юхо І. Указ. сач. С. 88.
59. Лабынцаў Ю. Указ. сач. С. 236.
60. Статут. С. 44
61. Там жа.
62. Там жа.
63. Там жа. С. 47—48.
64. Там жа. С. 48.
65. Форстен Г. В. Указ. соч. Т. 2. С. 9—10.
66. Кондратович Л. Указ. соч. С. 197.
67. Archiwum domu Radziwillow. T. 8. S. 189.
68. Ibid. S. 190.
69. Ibid. S. 191.
70. Ibid.
71. Ibid. S. 192.
72. Ibid. S. 193.
73. Ibid. S. 198.
74. Ibid. S. 191.
75. Сб. материалов и статей. Т. 4. С. 82.
76. Старажытная беларуская літаратура. С. 200.
77. Сб. материалов и статей. Т. 4. С. 96.

78. Там же. С. 97.
79. Летопись Ниенштеда. С. 77.
80. Archiwum domu Radziwillow. Т. 8. S. 206.
81. Archiwum domu Sapiehow. Т. 1. S. 70.
82. Саверчанка I. В. Указ. сач. С. 43.
83. Шкялёнак М. Указ. сач. С. 73, 75.
84. Kognowicki K. Op. cit. S. 103.
85. Памятники философской мысли Белоруссии XVII — первой половины XVIII в. Мн., 1991. С. 78—79.
86. АЗР. Т. 4. СПб., 1851. С. 191.
87. Мамонич Л. Епикграма // Анталогія беларускай паэзіі. Т. 1. С. 57.
88. Archiwum domu Sapiechow. Т. 1. S. 73.
89. Шкялёнак М. Указ. сач. С. 75.
90. Лаппо И. И. Люблинская уния и третий Литовский статут // ЖМНП. 1917. Ч. LXIX. С. 134.
91. Памятники философской мысли. С. 76.
92. Archiwum domu Sapiehow. Т. 1. S. 225.
93. Kognowicki K. Op. cit. S. 39.
94. Шпилевский П. Посольство Льва Сапеги в Москву в 1600 году // ЖМНП. 1850. Ч. LXVIII. С. 111 — 112; Казберук Ул. Мастацкі дакумент сярэднявечча // Спадчына. 1992. № 2. С. 41 — 45.
95. Trebicki W. Poselstwo Lwa Sapiehy w roku 1600 do Moskwy. Grodno, 1846. S. 12.
96. Шпилевский П. Указ. соч. С. 101— 102.
97. Archiwum domu Sapiehow. Т. 1. S. 84—85.
98. Archiwum domu Radziwillow. Т. 8. S. 228.
99. Соловьев С. М. Указ. соч. Кн. 4. С. 350.
100. Шпилевский П. Указ. соч. С. 111.
101. Tuszkowski K. Poselstwo Lwa Sapiehu w Moskwie 1600 r. Lwow, 1927. S. 54.
102. Archiwum domu Sapiehow. Т. 1. 5. 258.
103. Tuszkowski K. Op. cit. S. 60—61.
104. Кавалёў С. У пошуках вечнага міру // Спадчына. 1992. № 2. С. 33.
105. Соловьев С. М. Указ. соч. Кн. 4. С. 354.
106. Сб. РИО. М., 1912. Т. 137. С 56.
107. Соловьев С. М. Указ. соч. Кн. 4. С. 392.
108. Скрынников Р. Г. Самозванцы в России в начале XVII века. Григорий Отрепьев. Новосибирск, 1990. С. 68.
109. Archiwum domu Sapiehow. Т. 1 5. 406.
110. Archiwum domu Radziwillow. Т. 8. S. 233.
111. Любавский М. Литовский канцлер Лев Сапега о событиях смутного времени. М., 1901. С. 15—16.
112. Записки гетмана Жолкевского о Московской войне. СПб., 1871. С. 10.
113. Wyprawa krola J. m. do Moskwy r. p. 1609. S. 428—431.
114. Niemcewicz J. Dzieje panowania Zygmunta III. T. 2. Warszawa, 1819. S. 583.

115. Записки гетмана Жолкевского (Приложения). С. 107.
116. Prochaska A. Wyprawa па Smolensk. Lwow, 1920. S. 58.
117.Каргалов В. В. Указ. соч. С. 192.
118. Prochaska A. Op. cit. S. 59.
119. Wyprawa krola J. m. do Moskwy r. p. 1609. S. 460—461.
120. Prochaska A. Op. cit. S. 78.
121. Соловьев С. М. Указ. соч. Кн. 4. С. 542.
122. Kognowicki К. Op. cit. S. 51.
123. Акты исторические. (Далее: АИ). Т. 2. СПб., 1841. С. 356.
124. Платонов С. Ф. Очерки по истории смуты в Московском государстве XVI—XVII вв. СПб., 1899. С. 429.
125. Записки гетмана Жолкевского. С. 97.
126. Tuszkowski К. Op. cit. S. 13.
127. АИ. Т. 2. С. 357.
128. Сб. РИО. Т. 142. М., 1913. С. 176.
129. Костомаров Н. Смутное время Московского государства в начале XVII столетия. СПб., 1868.
130. Там же. С. 101.
131. Там же. С. 106—107.
132. Там же. С. 168.
133. Соловьев С. М. Указ. соч. Кн. 4. С. 619.
134. Archiwum domu Radziwillow. T. 8. S. 253.
135. Любавский М. Указ. соч. С. 11.
136. Prochaska A. Op. cit. S. 55, 78, 56.
137. Ibid. S. 56.
138. Ibid.
139. Сб. РИО. Т. 142. С. 570.
140. Niemcewicz J. Op. cit. T. 3. S. 133—134.
141. Соловьев С. М. Указ. соч. Кн. 5. М., 1990. С. 109.
142. Niemcewicz J. Op. cit. T. 3. S. 133—134.
143. Szelagowski A. Walka a Baltuk (1544—1621). Lwow, 1904. S. 331.
144. Ibid.
145. Archiwum domu Radziwillow. T. 8. S. 277.
146. Ibid. S. 275.
147. Kognowicki K. Op. cit. S. 87.
148. Ibid. S. 95.
149. Ibid. S. 97.
150. Ibid. S. 102.



*Леў Сапега — канцлер ВКЛ (1557—1633)*

СТАНІСЛАЎ ЛАЗУТКА

# ЛЕЎ САПЕГА

## Жыццё, дзяржаўная дзейнасць, палітычныя і філасофскія погляды

*Пераклаў з літоўскай мовы Віктар Люкевіч*

*Пад рэдакцыяй Яўгена Іванова*

*Друкуецца па часопісу «Край = Kraj», № 1—2 (13—14) за 2004 год. Старонкі 2—103.*

## АД РЭДАКТАРА

Леў Сапега (1557—1633) — славутая гістарычная асоба. Ён быў грамадзянінам Вялікага княства Літоўскага і яго сапраўдным патрыётам. Не літоўскім, не беларускім, а менавіта Вялікага княства Літоўскага. Леў Сапега належыць агульнай гісторыі Беларусі і Літвы і дарагі для абодвух народаў. Яго доўгае, насычанае падзеямі жыццё, шматбаковая дзяржаўная і палітычная дзейнасць, рэлігійныя і філасофскія погляды, безумоўна, павінны зацікавіць і беларускага чытача.

Льву Сапегу прысвечана некалькі кніг, у тым ліку і беларускіх гісторыкаў. Аднак бачанне гэтай добра вядомай усім асобы сучасным літоўскім гісторыкам, магчыма, дапаможа беларускаму чытачу зірнуць на яе з крыху іншых пазіцый.

Як гаворыцца, кожнае пакаленне і нават кожная школа гісторыкаў маюць свайго Юлія Цэзара...

*Яўген Іваноў, рэдактар часопіса «Край = Kraj»*

## СЛОВА ДА ЧЫТАЧА

Кожны настаўнік гісторыі і нават студэнты-гісторыкі дакладна, не блытаючыся ў храналогіі, маглі б пералічыць вялікіх князёў Літвы, аднак рэдка хто з іх згадаў бы ўсіх канцлераў Літоўскай дзяржавы і віленскіх ваявод ці вялікіх гетманаў, якія пасля ўзыходжання на трон Казіміра Ягайлы сталі сапраўднымі кіраўнікамі ўрада. Менавіта з лета 1440 года, калі вялікім князем Літвы быў абвешчаны зусім маленькі, трынаццацігадовы Казімір Ягелончык, сапраўдная дзяржаўная ўлада перайшла да паноў-рады, якую ўзначальваў віленскі ваявода Ян Гоштаўт. Пазней, да апошняга дзесяцігоддзя XVI стагоддзя, гэтыя дзве дзяржаўныя пасады — дзяржаўнага канцлера і віленскага ваяводы (або разам і вялікага гетмана) — звычайна займала адна асоба. Выключэнні былі рэдкімі.

Пра згаданых гістарычных асоб, славутых дзеячаў Літоўскай дзяржавы, рупліўцаў яе дзяржаўнасці ў літоўскай гістарыяграфіі няма пакуль што значных даследаванняў. Уся гістарычная літаратура (пра некаторых дзяржаўных дзеячоў Літвы ёсць нават асобныя манаграфіі, тамы збораў дакументаў) на польскай мове і, натуральна, польская. Менавіта «польская», бо гісторыі Літвы, літоўскасці там няма месца. Пра тое, што гісторыкі Літвы ў гэтай галіне значна адстаюць ад сваіх польскіх калег, яскрава сведчыць апошняя, прыгожа ілюстраваная, створаная на аснове багатых крыніц праца А. Тламацкага пра род Сапегаў ад яго пачатку да нашых дзён (TŁOMACKI 1996). Яе аўтар амаль не кранае нашу тэму, бо кніга прысвечана гісторыі лініі Сапегаў Кодзенскіх, якую, ў сваю чаргу, не апісваем мы, таму што Леў Сапега з другой лініі Сапегаў — Чарэйскіх. Праца А. Тламацкага — напамінак нам, што гэта праблема чакае даследчыкаў гісторыі Літвы. Як спроба хоць часткова запоўніць названы прабел у літоўскай гістарыяграфіі падрыхтавана да друку праца пра віленскіх ваявод і дзяржаўных канцлераў Вялікага княства Літоўскага (далей — ВКЛ) да канца XVI — пачатку XVII стагоддзяў. Так здарылася, што спачатку быў напісаны фінал гэтай працы — пра аднаго са славутых, калі не самага славутага, кіраўнікоў ураду ВКЛ таго часу — Льва Сапегу. Яе заключная частка і прапаноўваецца паважанаму чытачу.

Зразумела, што наша напалову навуковая, напалову папулярная кніга не прэтэндуе на ўсебаковае асвятленне жыцця і дзейнасці

Льва Сапегі. Гэтая тэма невычарпальная. Пра такую выдатную гістарычную асобу, самага вядомага сярод знакамітых дзеячоў Літоўскай дзяржавы будуць пісаць кнігі і праз пяцьдзесят, і праз сто гадоў.

Добра вядома, калі ў ВКЛ з'явілася пасада ваяводы. Гэта здарылася ў 1413 годзе пасля так званай Гарадзельскай уніі, паводле якой было вырашана падзяліць ВКЛ на ваяводствы па прыкладу Польшчы:

> Item dignitates, sedes et officia, prout in Regno Poloniae institutae sunt, instituentur et locabuntur: in Vilna scilitet palatinus et castellanus Vilnensis, et demum in Trokky et in aliis locis, ubi nobis videbitu expedire, juxta nostrae beneplacitum voluntatis, temporibus perpetuis duraturis (Любавский 1915: 321).

Першымі былі заснаваны ваяводствы Віленскае і Трокскае. Там і з'явіліся першыя ваяводы. Віленскі ваявода з самага пачатку побач з вялікім князем браў чынны ўдзел у кіраванні дзяржавай. Першым віленскім ваяводай быў літоўскі вяльможа Альберт Войцэх Манвід.

Калі ж з'явілася пасада канцлера, высветліць цяжка. Але можна не сумнявацца, што гэта пасада ўзнікла значна раней за ваяводскую, хоць яна, як і канцылярыя вялікага князя, спачатку была даволі сціплай.

Ва ўсёй гістарычнай літаратуры сцвярджаецца, што да часоў Ягайлы і Вітаўта літоўскія вялікія князі, пачынаючы з Міндоўга і канчаючы Альгердам і Кейстутам, усё ўнутранае жыццё дзяржавы ўладкоўвалі праз сваіх намеснікаў і давераных асоб вуснымі ўказамі і толькі ў рэдкіх выпадках вялі перапіску з замежнымі краінамі. З заходнімі — на латыні, а іншы раз і па-нямецку, з Масквой, Вялікім Ноўгарадам і іншымі княствамі былой Кіеўскай Русі — на іх мове. Зразумела, што самой па сабе канцылярыі не існавала, яна толькі пачынала стварацца. Новыя часы, хрышчэнне Літвы, унія з Польшчай вымагалі пашырэння перапіскі. І ва ўнутраным жыцці паступова пераходзілі да пісьмовых актаў. Шпарка распаўсюджваліся не толькі царкоўныя, але і свецкія пісьмовыя дакументы. Дастаткова згадаць, што ўжо ў 1388 годзе Вітаўт, які быў яшчэ толькі ўдзельным князем, атрымаўшы ад Ягайлы права на часовае валоданне асобнымі землямі Русі, сярод іх і Бярэсцем, даў яўрэйскай абшчыне гэтага горада прывілей — вельмі змястоўны і вялікі акт, напісаны на латыні. У літоўскай і беларускай юрыспрудэнцыі гэта першы судзебнік, у якім усталёўваліся не толькі нормы жыцця і

дзейнасці яўрэяў, але і іх узаемаадносіны з хрысціянамі (Лазутка, Гудавичюс 1993). Ён, такім чынам, быў актуальны не толькі для яўрэяў, але і для хрысціян. Таму не выпадкова, што ўжо ў часы Казіміра Ягелончыка гэты прывілей быў перакладзены на старабеларускую мову. Так, у часы Вітаўта замест аднаго-другога выпадковага пісара стала стварацца дзяржаўная канцылярыя. Вось што пра гэта пісаў К. Яблонскі, які вычарпальна даследаваў гэтую праблему:

> У Літве, якая напрыканцы XIV стагоддзя ўвайшла ў асяродак каталіцкіх дзяржаў Заходняй Еўропы, пасля таго, калі яе ўладары засвоілі непазбежныя для тых часоў хрысціянскія нормы жыцця, і ў Літве з'явіліся новыя, у Заходняй Еўропе ўжо даўно ўкаранёныя пісьмовыя акты [...] недастаткова ўжо было задавальняцца асобнымі манахамі або адным-другім чалавекам, здольным пісаць паперы на замежных мовах. Вялікім князям неабходна было мець пры сабе поўны штат канцылярыстаў рознага профілю, здольных весці дакументацыю на шматлікіх мовах таго часу. Вядома, што Вітаўт меў пісараў, якія пісалі на лацінскай, рускай, дзвюх нямецкіх мовах [...] па-арабску і, магчыма, па-чэшску. Такім чынам, толькі што арганізаваная канцылярыя ВКЛ магла весці справы аж на шасці мовах (Jablonskis 1979: 221).

Значыць, канцылярыя з'явілася ў часы Вітаўта. Павінен быў з'явіцца і кіраўнік апарата новаадкрытай дзяржаўнай установы — канцлер. Ці зваўся ён так з самага пачатку, цяжка сказаць, але няма сумнення, што ў кіраванні дзяржавай ён яшчэ не меў той ролі, якую атрымаў напрыканцы XV стагодцзя. Хто былі тыя першыя кіраўнікі канцылярыі вялікага князя Літвы, таксама невядома. Праўда, пра аднаго з іх — Мальдржыка, які напрыканцы праўлення Вітаўта ўжо тытулаваў сябе канцлерам, згадвае І. Лапо (Lappo 1930: 39). Першым, ужо добра вядомым у гісторыі ВКЛ кіраўніком канцылярыі з 1441 года, г.зн. з пачатку княжання Казіміра, быў Судзівой (Судзівай) Валімантавіч, малодшы брат старасты Жамойцкага Кесгайлы, хоць у крыніцах тых часоў тэрмін «канцлер» яшчэ не сустракаецца.

Леў Сапега, якому прысвечана гэтая кніга, быў семнаццатым віленскім ваяводай і дзесятым канцлерам ВКЛ.

*Праф. Станіслаў Лазутка*

## УВОДЗІНЫ

Пра гісторыю жыцця, дзяржаўнай і палітычнай дзейнасці Льва Сапегі, яго генеалогію ёсць досыць багатая гістарыяграфія: лацінская, польская, літоўская, руская, беларуская і нават французская (Misztolt 1724, Kognowicki 1790, Данилович 1841, Siarczynski 1843—1858, Czacki 1844, Jaroszewicz 1844, Turowski 1855, Пташицкий 1893: 195—223, Любавский 1901, Tyszkowski 1922, Ptaszycki 1925, Tyszkowski 1927, Estreicher 1928, Šapoka 1933: 275—284, Шкелёнак 1933, Lappo 1934—1936, Viskanta 1937, Inglot, Labarre De Raillicourt 1970, Саверчанка 1992, Pletkiewicz 1995, Tlomacki 1996). У гэтай гістарычнай літаратуры ў залежнасці ад нацыянальнай арыентацыі аўтара Льва Сапегу называюць то польскім, то рускім, то літоўскім, то беларускім дзеячам. Тэндэнцыя лічыць ВКЛ беларускай дзяржавай і ўсіх дзеячаў яго ўрада беларусамі заўважаецца ў працах асобных сучасных беларускіх даследчыкаў.

Параўны, напрыклад, такія вызначэнні, як «...вядомага беларускага князя — асветніка Мікалая Радзівіла Чорнага...» або «Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае — гэта поліэтнічная сярэднявечная беларуская дзяржава, што існавала ў XIII—XVIII стагоддзях» і да т. п. (Саверчанка 1992: 7). У тыя часы Леў Сапега, як і ўсе дзеячы ўрада ВКЛ, здаецца, не ламаў галавы наконт сваёй нацыянальнасці, а лічыў сябе грамадзянінам Літоўскай дзяржавы, якой аддана служыў, аберагаў яе дзяржаўнасць і тэрытарыяльную цэласнасць.

Лепей за ўсіх пра сваю «нацыянальную» і грамадзянскую прыналежнасць яшчэ да Льва Сапегі выказаўся другі знакаміты дзеяч ВКЛ, палкаводзец украінскага паходжання і праваслаўнага веравызнання князь Канстанцін Астрожскі, які пісаў: «Уцякаю з Маскоўскай няволі на сваю радзіму Літву». Радзімай для іх усіх было ВКЛ, якое яны называлі проста Літвой. На такі «нацыянальны менталітэт» тагачасных дзеячоў ВКЛ не раз звярталі ўвагу гісторыкі, гэта асабліва падкрэсліў адзін з выдатнейшых літоўскіх даследчыкаў акадэмік Ю. Юргініс:

Не толькі рускія магнаты, — пісаў ён, — але і шырокія слаі шляхты цвёрда трымаліся дзяржавы, якую лічылі сваёй. Такім чынам паступова ўтварылася дзяржава, у якой як літовец, так і рускі мог адчуваць сябе сапраўдным сынам агульнай радзімы, агульнай краіны, агульнай «літоўскай Жэчыпаспалітай» (Jurginis 1982: 45).



*Ян Фрэдэрык Сапега (1680—1751), канцлер ВКЛ*

Што тым дзеячам па-сапраўднаму рупіла, дык гэта генеалогія, асабліва лічылася добра, каб яна была княжацкая, а лепей за ўсё — каб пачыналася з Гедымінавічаў. Напрыклад, саноўнікі Радзівілы першы княжацкі тытул атрымалі (вядома, не за дзякуй) ад імператара Германскай імперыі толькі ў 1517 годзе. Сапегі, якія ўзвысіліся напрыканцы XVI стагоддзя і найвялікшай магутнасці дасягнулі ў канцы XVII стагоддзя, зыходную дату сваёй генеалогіі таксама звязвалі толькі з Гедымінавічамі. Адзін з Сапегаў, канцлер ВКЛ (1680—1751) Ян Фрэдэрык, каля 1744 года падрыхтаваў аж два прывілеі (адзін караля Польшчы і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Старога і адзін яго сына Жыгімонта Аўгуста), якіх у сапраўднасці не існавала, але паводле якіх род Сапегаў паходзіў ад сына Гедыміна Нарыманта, г.зн. ад літоўца. Відавочна, што ў той час ужо для цалкам апалячанага Яна Фрэдэрыка Сапегі пытанне нацыянальнасці не было істотным, важнейшым было паходжанне, тым больш такое, якое звязвалася з Гедымінавічамі.

Гэтая памылковая генеалогія першымі гістарыёграфамі Льва Сапегі лічылася сапраўднай. Ксёндз К. Кагнавіцкі ў сваёй працы, выдадзенай у друкарні Віленскага універсітэта, нават надрукаваў згаданыя два прывілеі.

У адным з іх сцвярджаецца:

Публікуем гэтыя акты для жадаючых зараз і ў будучым ведаць, што мы [Жыгімонт Стары. — *С. Л.*] вялікай прыхільнасцю даем нашага родзіча, вяльможнага Нарыманта Гедымінавіча [...] нашчадкам

[выдзелена намі. — *С. Л.*] Яну Кодземскаму, ваяводзе Віцебскаму [...] таксама Багдану Апакаўскаму, акольнічаму Смаленска [...] — Сімановічам Сапегам [...] што калісьці светлай памяці нашага дзядулі і першапраходцы, караля Польшчы і вялікага князя літоўскага Уладзіслава Ягайлы дараваны за вялікія паслугі тых бацьку Сымону Сунігайлавічу, кашталяну трокскаму Пунігайлу Нарымантавічу, празванаму калісьці Сафіяй, таксама дзецям кашталяна старажытны прывілей на права яму і нашчадкам яго карыстацца гербам [...] які называецца Ліс [...] (што) сцвярджаем і зацвярджаем» (Zywoty 1830: 111—115).

Гэты прывілей цалкам передрукаваў і А. Тламацкі (Тłomacki 1996: 261—262).

Гэтую фальшыўку гісторыкі выявілі яшчэ ў мінулым стагоддзі (К. Стадніцкі, І. Вольф, М. К. Любаўскі). Для даследчыкаў нашых дзён генеалогія Льва Сапегі не з'яўляецца аб'ектам дыскусій, яна цалкам устаноўлена, спрачаюцца толькі з-за нацыянальнай прыналежнасці Льва Сапегі. На нашу думку, сучасным гісторыкам не варта дзеля апошняга штучна падзяляць Літоўскую дзяржаву, а тым больш яе дзеячаў, прэпарыруючы гісторыю, трэба даследаваць гістарычную рэчаіснасць такой, якой яна была ў рэальнасці.

А ў сапраўднасці Леў Сапега быў славутым палітычным дзеячам Літоўскай дзяржавы канца XVI — першай трэці XVII стагоддзя, яе грамадзянінам і патрыётам, не літоўскім, не польскім, не беларускім, а менавіта патрыётам ВКЛ. З гэтых пазіцый і трэба разглядаць гісторыю яго жыцця, дзяржаўнай і палітычнай дзейнасці. Так яна і выкладаецца ў нашай кнізе, дзе выкарыстаны як выдадзеныя даўно шматтамовыя ўнікальныя крыніцы (Radziwill 1839, Wolff 1885, ADR 1885, Boniecki 1887, Gorczak 1890, Sapiehowie 1890—1891, Prochaska 1892, Ostrowski 1898, Dworzaczek 1959), так і асобныя архіўныя дакументы, якія захоўваюцца ў Літоўскім дзяржаўным гістарычным архіве (ЛДГА — LVIA), а таксама ў рукапісных фондах бібліятэк Акадэміі навук Літвы і Вільнюскага універсітэта (LVIA Ф.: 1292, LMAB RS F. 139, VUMB RS F. 59. 97).

У асноўным мы карысталіся раней згаданымі унікальнымі шматтамовымі зборамі дакументаў, сабранымі А.Прахаскай і другімі польскімі даследчыкамі ВКЛ у архівах Польшчы і Расіі і выдадзенымі ў канцы XIX стагоддзя.

Трэба адзначыць, што ў тых зборах ёсць усе асноўныя крыніцы, неабходныя для асвятлення асабістага жыцця і шматбаковай

дзейнасці Льва Сапегі, выяўлення арэала яго неабсяжных землеўладанняў. Асабліва важныя для гэтага тэстаменты яго самога і яго жонкі (Sapiehowie 1890: 381—391. Dok. № XXV; 391—398. Dok. № XXVI; 399—408. Dok. № XXVII). У асобных выпадках выкарыстаны дакументы, якія захоўваюцца ў рукапісных фондах LVIA, МА (Акадэміі навук Літвы) і бібліятэкі Вільнюскага універсітэта (LVIA Ф. 1292, LMAB RS F. 139, VUMB RS F. 59, 97). Іх (Сапегаў) фонды і справы ў LVIA апісаў вядомы літоўскі гісторык і архіварыус Д.Буценас (Butenas 1995). Хоць у нашым архіве і ў рукапісных фондах бібліятэк захоўваецца мноства дакументаў, якія ўтрымліваюць звесткі пра род Сапегаў у XV—XVIII стагоддзях, але ў параўнанні з крыніцамі, апублікаванымі ў пералічаных шматтамовых выданнях, яны мала што даюць для асвятлення жыцця і дзейнасці Льва Сапегі. Таму трэба папярэдзіць чытача, што часта мы выкарыстоўваем адну або дзве кнігі дакументаў, у якіх апублікаваны некалькі сотняў актаў, так ці інакш звязаных з нашай тэмай.



*Сунігайла Пунігайла Нарымант († каля 1431)*

У кнізе выкарыстаны і асобныя акты «кнігі» Літоўскай Метрыкі, яшчэ не ўведзеныя ў навуковы ўжытак (РГАДА Ф. 389. Адз. зах. 224, Леонтович 1896, БА 1928, Lietuvos Metrika (1528—1547). 6-oji Teismų bylų knyga, 1995). Усё гэта дазваляе па-новаму ўбачыць самую знакамітую ў гісторыі Літоўскай дзяржавы асобу.

## Глава 1
## КАРАНІ

Сапраўдны радавод Льва Сапегі ў параўнанні з легендарным значна прасцейшы і звычайны для большасці арыстакратычных родаў Літвы, якія ўзняліся ў пачатку XVI ст. У старажытнейшых крыніцах згадваецца продак Сапегаў — Сіман Сапежыч, які паходзіць са Смаленскай зямлі. Феадалы гэтай памежнай зямлі, якія ў XV стагоддзі пастаянна пакутавалі ад бясконцых войнаў

паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай, былі вымушаны выбраць сюзерэна і, вядома, імкнуліся знайсці болей магутнага. Такім быў у той час вялікі князь літоўскі. Сіман Сапежыч, звычайны, а можа нават крыху вышэйшы за звычайнага феадал, адукаваны чалавек свайго часу, выбраў вялікага князя літоўскага.

Ужо ў першыя гады праўлення Казіміра Ягелончыка Сіман Сапежыч згадваецца ў кнігах Літоўскай Метрыкі як пісар уладара. Яго жонка Анастасія верагодней за ўсё паходзіць з сям'і заможнага пана Паўшы з Кіеўскага ваяводства. Апошні разам з Сіманам і сынам Анастасіі Янам судзіліся за двары Варавец, Бернаў і Когатаў, якія былі захоплены князем Палубенскім (Sapiehowie 1890: 1)*.

Мяркуючы па памерах уладанняў Сімана, якія ён меў на Смаленскай зямлі і павялічыў выгаднымі шлюбамі сыноў і дачок, можна меркаваць, што ён быў ужо дастаткова буйным землеўласнікам, і нават княжацкія роды лічылі за гонар парадніцца з гэтым пісарам уладара (Sapiehowie 1890: 5)**.

Так, старэйшы яго сын Багдан, які ажаніўся ў 1475 годзе на князёўне Фядоры, дачцы князя Фёдара Фёдаравіча Друцкага-Сакалінскага-Бабіча-Канаплі, такім чынам ускосна парадніўся з нашчадкамі самога Гедыміна. Бабуля Фядоры Еўдакія была сястрой князя Андрэя Уладзіміравіча Альгердавіча (Sapiehowie 1890: 2). Другі сын Сімана — Ян дзякуючы бацьку шпарка ўздымаўся па службовай лесвіцы. З 1486 года ён — пісар ВКЛ, з 1500 года — дзяржаўца Жэжмарыі і Новага двара, з 1502 да 1509 года — Браслаўскі намеснік, у 1505 годзе — маршалак вялікага князя і канцлер яго жонкі Алены, пазней (1508—1512) — Віцебскі ваявода (Sapiehowie 1890: 14—15)***, а з 1513 года — ваявода Падляшша (Sapiehowie 1890: 14—15)****. Дзве дачкі Сімана і Анастасіі таксама пашлюбаваліся з князямі (Sapiehowie 1890: 24).

Сіман і Анастасія мелі яшчэ двух сыноў, Юрыя і Васіля, менш вядомых у гістарычнай літаратуры.

Менавіта Сіман, які шмат дзесяцігоддзяў кіраваў справамі Літоўскай дзяржавы, быў заснавальнікам славутага роду Сапегаў. У

* А. Тламацкі выказвае версію, што Анастасія магла быць з роду Глінскіх (Тłомаскі 1996: 9)

** Сіман Сапежыч меў на той час даволі значныя землеўладанні: буйныя Апакоўскі і Ельнінскі двары на Смаленскай зямлі.

*** Р. Ясас лічыць, што Віцебскім ваяводай ён быў толькі да 1511 года (Jasas 1971: 330). Гэта паўтарае і А. Тламацкі (Тłомаскі 1996: 12). На нашу думку, аўтары крыніц «Sapiehowie» бліжэй да праўды (Pietkiewicz 1995: 24—25).

**** Р. Ясас памылкова ўказвае другі год — 1514 (Jasas 1971:330). К. Пяткевіч таксама называе 1514 год (Pietkiewicz 1995: 25).

гістарычных крыніцах ёсць звесткі, што напрыканцы свайго жыцця ён нават падарожнічаў у Рым як пасол уладара ВКЛ.

Старэйшыя сыны Сімана — Багдан і Ян далі пачатак адпаведна дзвюм лініям у родзе Сапегаў — Чарэйскай і Кодзенскай. Леў Сапега, канцлер ВКЛ, віленскі ваявода і вялікі гетман, належаў да Чарэйскай лініі (яе чацвёртага калена), якую заснаваў яго прадзед Багдан, сын Сімана і Анастасіі. Багдан, які выгадна ажаніўся на памянёнай князёўне Фядоры, Чарэйскі двор атрымаў ад дзядзькі яе маці з боку бацькі, Смаленскага архіерэя Місаіла. Апроч гэтага, Місаіл перадаў пад яго апеку, а фактычна ва ўласнасць, пабудаваную ім царкву Святой Троіцы і манастыр каля Галаўлёва возера. У дароўным акце Місаіла, напісаным 7 кастрычніка 1475 года, сказана:

> Се азъ владыка Смоленьский Мисайло [...] приказалъ есми и далъ тот храм Божий и манастырь Святые Троицы по своемъ животе въ оборону и въ поданье братанне своей кнегини Марьи и зятю нашому Богдану Сопезе, писару королеву, и жоне его, и детемъ, и наследкомъ ихъ со всими людми и селы своими, и што князи Друцкие Бабичы тому манастырю села въ Рудомле, а князи Лукомские село въ Кореевичахъ и озеро Золотино придали, съ куплями и со всимъ наданьемъ природныхъ и неприродныхъ моихъ, вечно и на веки (АЗР 1848: № 101. 231).

Гэты вельмі інфарматыўны дакумент утрымлівае важныя звесткі пра жыццёвы шлях і пачатак дзейнасці Багдана Сапегі. Па-першае, ажаніўся ён, відаць, не ў 1475 годзе, а некалькімі гадамі раней (Sapiehowie 1890: 2)*, таму што ў дароўным акце, напісаным у тым самым годзе, пра яго дзяцей гаворыцца не як пра будучых, як звычайна было прынята ў такіх выпадках пісаць у актах, а як пра існуючых, што ўжо нарадзіліся. Па-другое, Фядора прынесла яму не толькі багаты пасаг, але і велізарную спадчыну — двор Чарэя з царквой і манастыром. Па-трэцяе, ужо ў гэтым акце ён названы каралеўскім пісарам, гэтую важную пасаду якога ён атрымаў у спадчыну ад свайго бацькі.

І нарэшце, у гістарычнай літаратуры вядуцца спрэчкі наконт назвы гэтай лініі роду Сапегаў — Чарэйская ці Северская (Sapiehowie 1890: 5). У гэтым дакуменце выразна названы двор, назва якога на працягу доўгага часу разам з назвай манастыра з'яўлялася

* У гістарычнай літаратуры сцвярджаецца, што Багдан ажаніўся ў 1475 годзе.

асноўнай — Чарэя. Такім чынам, можна гаварыць толькі пра двор Чарэя і Чарэйскую лінію. З-за гэтага двара пазней не раз судзіліся. У пачатку 1497 года сам Багдан з-за яго судзіўся са сваёй цешчай Марыяй (Леонтович 1896: Вып. 1. 130. № 336), а пазней, у 1541 годзе, яго сын Ян — з сёстрамі і пляменнікам (Sapiehowie 1890: 264—270. № IV).

У актах Літоўскай Метрыкі Багдан Сімaнавіч Сапега як пісар уладара першы раз згадваецца ў 1471 годзе. На думку некаторых аўтараў, пісарам ён прабыў да 1486 года (Jasas 1971: 324), хоць у актах Літоўскай Метрыкі пісары Сапегі, без указания на імя, згадваюцца і ў 1493 годзе, і ў 1494 годзе (Леонтович 1896: Вып. 1. 36. № 83; 57, № 145). Невядома, ці гэта быў сам Багдан, ці яго брат Ян, які таксама пачынаў кар'еру пісарам. 6 красавка 1494 года Багдан Сапега зацвердзіў у новага вялікага князя Аляксандра куплю зямлі яшчэ ў часы Казіміра аж у дванаццаці дваран. Тады ён ужо называўся мцэнскім і любецкім намеснікам (Леонтович 1896: Вып. 1. 41. № 93), а яго пасада пісара не згадвалася. Так сама тытулуецца ён і ў акце ад 15 сакавіка 1496 года (Леонтович 1896: Вып. 1. 95. № 246). У акце ад 6 красавіка 1499 года Багдан Сапега называецца проста панам, без пералічаных тытулаў (Леонтович 1896: Вып. 2. 14. № 457). Але ці значыць гэта, што ён з 1496 года тых тытулаў быў пазбаўлены, не атрымаўшы новых, як сцвярджаецца ў



*Касцёл Святой Ганны ў Кодэні*

навуковай літаратуры, бясспрэчна меркаваць падстаў няма. Верагодней, што на гэтых пасадах Багдан Сапега быў да пачатку XVI стагоддзя, калі ён пачаў тытулавацца ўжо смаленскім акольнічым (Jasas 1971: 324). Менавіта так ён пазначаны ў спісе паслоў, якія пад кіраўніцтвам полацкага ваяводы Станіслава Глябовіча ў 1503 годзе прыбылі ў Маскву (Sapiehowie 1890: 4; Pietkiewicz 1995: 24). У 1506 годзе Багдан Сапега зноў накіраваны ў Маскву разам з Пятром Дарагастайскім. Гэтай пасольскай місіі было даручана паведаміць маскоўскаму вялікаму князю Васілію III пра смерць Аляксандра, дагаварыцца пра абмен ваеннапалоннымі і пра кампенсацыю страт, якія прынесла вайна 1499—1500 гадоў. Апошняе пытанне, відавочна, і выклікала гнеў маскоўскага вялікага князя на паслоў Літвы, таму што ён пасля прыёму фактычна зняволіў Багдана.

З палону ён быў вызвалены толькі ў 1508 годзе, дзякуючы намаганням новага вялікага князя Літвы Жыгімонта Старога. Апошнія звесткі пра Багдана Сапегу ў актах Літоўскай Метрыкі зафіксаваны ў 1512 годзе, калі ён як акольнічы Смаленска паведаміў вялікаму князю пра напад маскалёў на памежныя воласці: Рэчыцу, Любецк і яго ўласную Ельню (Sapiehowie 1890: 5, Pietkiewicz 1995: 24). Верагодней усяго, што ў тым жа самым годзе ён і памёр.

Багдан Сіманавіч Сапега, заснавальнік Чарэйскай лініі, не набыў такіх скарбаў і не дасягнуў такіх высокіх пасад, як яго брат Ян, заснавальнік Кодзенскай лініі, які ў апошнія гады свайго жыцця быў віцебскім і падляшскім ваяводай. Але даволі высокая пасада смаленскага акольнічага, прасторныя землеўладанні і другія скарбы былі салідным падмуркам для далейшага ўзвышэння гэтага праваслаўнага дваранскага роду Літвы. Ужо на самым пачатку сямейнага жыцця Багдана Сапегі яго зямельныя ўладанні (спадчына ад бацькоў, пасаг, атрыманы за жонкай Фядорай, дар смаленскага архіерэя Місаіла) знаходзіліся, прынамсі, у чатырох ваяводствах: Смаленскім, Полацкім, Кіеўскім і Віцебскім. Праўда, за Чарэю — важнейшы сямейны двор — у 1497 годзе прыйшлося судзіцца з цешчай Марыяй і яе сынам князем Фёдарам Сакалінскім, аднак працэс Багдан Сапега выйграў. У тую самую пару вялікі князь падарыў яму яшчэ некалькі зямельных уладанняў у Ельнінскай воласці і Віцебскім павеце. У першыя гады XVI стагоддзя яму было даручана намесніцтва ў Высокім Двары Трокскага павету.

Вярнуўшыся пасля другой місіі ў Маскву, Багдан Сапега атрымаў ад уладара новыя зямельныя ўгоддзі, і за ім былі замацаваны правы на ўладанне землямі ў Ельнінскім павеце (Sapiehowie

1890: 5, Pietkiewicz 1995: 24). Акрамя таго, у адным з актаў Літоўскай Метрыкі адзначана, што Багдан Сапега купіў зямлю ў дваран Гродненскага павета (БА 1928: 82—83. № 116). Такім чынам, Сапегам з Чарэйскай лініі добрую апору для ўзвышэння стварыла ўжо першае пакаленне, і яе паспяхова выкарыстаў адзін з трох сыноў Багдана — Ян, дзед Льва Сапегі. Другія два сыны — Януш і Фёдар — былі пасрэднымі феадаламі і па кар'ернай лесвіцы не ўзняліся вышэй за дваран уладара (Sapiehowie 1890: 34—38). Багдан і Фядора таксама мелі чатырох дачок: Багдану, Ганну, Марыю і Алену (Sapiehowie 1890: 39—47).

Ян Багданавіч Сапега, старэйшы сын Багдана і Фядоры, першы раз у гістарычных крыніцах згадваецца ў 1508 годзе як пісар уладара (Sapiehowie 1890: 25)*. Такім чынам, ён працягнуў традыцыю дзеда, бацькі і дзядзькі Яна. Другім актам засведчана, што Ян Сапега, сын Багдана, распачаў дзяржаўную службу ў часы вялікага князя Аляксандра. У 1511 годзе ён ужо названы трокскім гараднічым (Sapiehowie 1890: 25), а ў снежні 1515 года — пісарам уладара, маршалкам і трокскім гараднічым (Boniecki 1887: 303)**. Гэта ставіць пад сумненне меркаванні асобных даследчыкаў, што быццам бы Ян Багданавіч Сапега быў прызначаны Віцебскім ваяводай у 1514 годзе (Sapiehowie 1890: 25). Такое прызначэнне не магло быць раней другой паловы 1516 года, таму што дзядзька Яна Багданавіча Сапегі Ян Сымонавіч Сапега, Падляшскі ваявода, памёр толькі напрыканцы 1516 года або ў пачатку 1517 года (Jasas 1971: 330, Pietkiewicz 1995: 25). Менавіта яго месца заняў Віцебскі ваявода Януш Станіслававіч Касцевіч, а на вызваленую пасаду апошняга і быў прызначаны Ян Багданавіч Сапега (верагодней за ўсё ў 1517 годзе).

Такая хуткая кар'ера маладога чалавека з роду, якога ў той час не было сярод самых вядомых і ўплывовых, мела сваю прычыну. Гэтай прычынай было паспяховае кіраўніцтва вайсковым атрадам у пераможнай бітве з маскоўскім войскам ля рэк Бабёр і Драва ў 1514 годзе. Дзякуючы выпадку, Ян Багданавіч Сапега ўзвысіўся да пасады ваяводы і разам з тым стаў членам паноў-рады.

Высокая пасада, атрыманая ў маладым узросце, а таксама немалая спадчына і шчодрыя ўзнагароды вялікага князя за службу стварылі для Яна Сапегі цудоўныя магчымасці для выбару нявесты. Гэтыя магчымасці ён дзейсна выкарыстаў, узяўшы шлюб з

---

* Хоць А. Банецкі лічыць, што ўжо ў 1502 годзе ён быў намеснікам у Юрбарку, а ў 1505 годзе — у Бранску.

** Праўда, А. Банецкі пасаду маршалка не прыбаўляе.

Ганнай Сангушкай, бацька якой, Андрэй Аляксандравіч Сангушка, уладзімірскі староста і валынскі маршалак, быў прамым нашчадкам Гедымінавічаў, а маці — князёўна Багдана Адзінцэвіч. Дачка аднаго з самых багатых князёў, Ганна далучыла да ўладанняў мужа, на той час ужо вельмі вялікіх, немалы пасаг (Sapiehowie 1890: 26).

Тым часам Ян Сапега шпарка ўздымаўся па кар'ернай лесвіцы. У 1529 годзе (па смерці ў 1527 годзе Януша Касцевіча) ён заняў пасаду падляшскага ваяводы, якая была на адну ступень вышэйшай за пасаду віцебскага ваяводы (БА 1928: 7. № 1; 2, 6-ojі ТВК. Р. 312, РГАДА. Ф. 389. Адз. зах. 224. Л. 268; 337, Wolff 1885: 42). У лістападзе 1532 года ён стаў і драгічынскім старастам, бо гэтую пасаду звычайна займалі ваяводы Падляшша (Sapiehowie 1890: 27).

Наступныя дванаццаць гадоў Ян Сапега быў сярод важнейшых вяльмож краю. Разам з першымі асобамі дзяржавы (віленскім ваяводай і канцлерам Альбертам Гоштаўтам, трокскім ваяводай і вялікім гетманам Канстанцінам Астрожскім, трокскім кашталянам Юрыем Радзівілам і другімі) ён удзельнічаў у судах уладара (РГАДА 1896: Ф. 389. Адз. зах. 224. Л. 69 об.), на якіх разам з штодзённымі справамі вырашаліся і такія важныя дзяржаўныя праблемы, як, напрыклад, зацвярджэнне выдачы Кіеўскай зямлі прывілея ад 24 кастрычніка 1529 года (РГАДА 1896: Л. 337).

Ян Сапега, падляшскі ваявода, разам з полацкім ваяводай Янам Юравічам Глябовічам і віцебскім ваяводай Мацеем Войцэхавічам Яновічам у 1536 годзе на камісарскім судзе вырашыў справу паміж імі і такімі буйнымі землеўласнікамі, як Ян Лядскі і ўдава Януша Касцевіча Марына (6-ojі ТВК 1995: 152—153). Уладар даручаў Яну Сапегу і важныя дыпламатычныя місіі. У канцы 1532 года ён разам з віцебскім ваяводай Мацеем Войцэхавічам Яновічам і пісарам уладара Паўлам Нарушэвічам быў накіраваны ў Маскву для перамоў з вялікім князем Васіліем III. Дэлегацыі ўдалося дамагчыся працягу мірнай дамовы паміж дзвюма дзяржавамі (Sapiehowie 1890: 27). Поспех гэтай місіі, відаць, вызначыў тое, што Ян Сапега быў уключаны і ў другую пасольскую дэлегацыю, накіраваную ў Маскву ў 1536 годзе. Яе ўзначальваў крэўскі намеснік Нікадым Янавіч Цеханавецкі, а членамі яе, акрамя Яна Сапегі, былі Андрэй Няміра, князь Эльяс Астрожскі і Анікей Гарнастай. Перад дэлегацыяй была пастаўлена мэта — завязаць добрыя адносіны з новым маскоўскім вялікім князем Іванам IV Жахлівым (Sapiehowie 1890: 29).

За сорак без малога гадоў паспяховай службы Ян Сапега, атрымаўшы, як ужо было згадана, немалую спадчыну і пасаг князёўны

Ганны Сангушкі, значна пашырыў свае землеўладанні. У 1541 годзе ён судзіўся са сваімі сёстрамі і пляменнікам за двары Тухачоў і Чарэю (важнейшы радавы маёнтак), і хоць суд не вынес канчатковага прыгавору (Sapiehowie 1890: 264—270. № IV), усё ж такі, як бачна з некаторых больш позніх актаў, гэтыя маёнткі ўрэшце дасталіся яму (Sapiehowie 1890: 251—254. № I.). Асобныя маёнткі раней памёршых братоў таксама перайшлі ва ўласнасць або пад апеку Яна Сапегі.

Акрамя таго, за 40 год многа землеўладанняў было атрымана ад уладара ў якасці дароў, куплена або здабыта іншымі спосабамі. Так, ужо на самым пачатку дзяржаўнай службы, у 1508 годзе, вялікі князь адарыў яго трыма сялянскімі службамі ў Абалецкай валасці Віцебскага ваяводства, надзелам у горадзе Смаленску, а ў Первалкскім павеце — дваром Лейпунінкі (Ляйпоніс?). У 1514 годзе Сапега захапіў землі, падараваныя ўладаром Мацку Кунцэвічу (Sapiehowie 1890: 25)*. Уладар у 1520 годзе адарыў Яна Сапегу немалымі зямельнымі і ляснымі плошчамі ў Меркінскай валасці (Sapiehowie 1890: 26).

Стаўшы віцебскім ваяводай, Ян Сапега атрымліваў велізарныя даходы з карчомных і мясцовых мытных пошлін, прыціскаў гараджан, што бачна з іх скаргаў (РГАДА 1896 Ф. 389. Адз. зах. 224. Л. 268—268 об.). 15 жніўня 1523 года Жыгімонт Стары даў Віцебскаму ваяводзе Яну Сапегу прывілей на карыстанне шасцю пусткамі (кінутымі землямі) у Меркінскай валасці з лесам, які быў пры двары Ляйпоніс (VUMB RS. F. 59—13. L. 1). У 1530 годзе вялікі князь зацвердзіў значныя пакупкі Яна Сапегі зямель і дамоў у Гродне, а таксама 10 азёр у двары ў Славенты і права лавіць рыбу ў рацэ Ноча (Sapiehowie 1890: 27). У 1531—1535 гадах, ужо стаўшы падляшскім ваяводай, Ян Сапега набыў яшчэ некалькі азёр (VUMB RS. F. 59—13. L. 7—7v). У 1532 годзе ён судзіўся з чыноўнікам каралевы Боны Залепугам з-за вялікага двара Луні пры рэчцы Лунь (VUMB RS. F. 59—13. L. I). У 1535 годзе ўладар зацвердзіў яму куплю азёр у двары Войцэха Насілоўскага Перавалкі (VUMB RS. F. 59—13. L. lv).

У той жа час Ян Сапега пастаянна судзіўся за валоданне землямі з князямі Слуцкімі, Масальскімі і другімі сваімі сваякамі (Sapiehowie 1890: 28).

---

* Таксама гл.: Lietuvos Metrika.. Knyga № 8 (1499—1514). Užrašymų knyga 8. 1995: 284: № 370.

Такім чынам, Ян Багданавіч Сапега рознымі шляхамі, не грэбуючы ніякімі сродкамі, і, гаворачы сучаснай мовай, карыстаючыся сваім высокім службовым становішчам, за без малага сорак год не толькі ўзняўся да вышэйшых прыступак дзяржаўнай іерархіі, але і стаў буйнейшым землеўласнікам. На жаль, канец яго жыцця быў трагічным. Па прычынах, не высветленых да гэтага часу, у 1544 годзе Ян Сапега, ваявода падляшскі і староста драгічынскі ды чарэйскі, згубіў усе свае пасады і нават частку землеўладанняў і апынуўся ў астрозе. Гэта яго становішча засведчана ў заступніцкім лісце імператара Фердынанда да Жыгімонта Старога:

> Звярнуўся да нас Лукаш Сапега, падданы Вашай Каралеўскай Вялікасці, што бацька яго Ян Багданавіч Сапега ў ВКЛ з гадоў дзяцінства верна служыў [...] а на працягу 30 гадоў быў дарадчыкам В. К. Вялікасці і ваяводай падляшскім. Аднак жа з-за хлуслівых даносаў сапернікаў сваіх, зусім невінаваты, пазбаўлен *не толькі гонару, тытулаў і маёмасці і даведзены да поўнай беднасці* [выдзелена намі — *С. Л.*], але нават і некалькі месяцаў правёў у астрозе... (Sapiehowie 1890: 30—31).

Гэты заступніцкі ліст, між іншым, сведчыць, якім уплывовым быў Ян Сапега, калі літасці ўладара для яго прасіў і сын Жыгімонта Старога Жыгімонт Аўгуст, і ўся паны-рада. Урэшце ж уладар змяніў свой гнеў на міласць каля 1545 года, аднак пасады ваяводы не вярнуў і, здаецца, аддаў не ўсе землеўладанні (Sapiehowie 1890: 30—31). У 1546 годзе Ян Багданавіч памёр, пакінуўшы ўдаву Ганну, чатырох сыноў — Лукаша, Яна, Мікалая і Паўла — і дачку Сафію (Sapiehowie 1890: 34). Лукаш памёр у той жа год (Sapiehowie 1890: 66). Удава Ганна, перажыўшая мужа на пятнаццаць год, памёрла ў 1561 годзе (Sapiehowie 1890: 33). Тры сыны і дачка, якія засталіся, падзялілі пакінутыя бацькам землеўладанні.

Ян Янавіч Сапега, бацька Льва, старэйшы з трох застаўшыхся сыноў, завалодаў буйнейшай доляй бацькавай спадчыны, хоць і абкарнанай, але яшчэ даволі значнай. Гэта адбылося пасля смерці бацькі і шлюбу Яна, якога ў крыніцах называюць не інакш, як «ваяводзічам падляшскім» (Sapiehowie 1890: 66—73). Гэты шлюб, як і абсалютная большасць шлюбаў тагачасных феадалаў, быў верагодней за ўсё з разлікам. Ян Янавіч Сапега недзе каля 1548 года пабраўся з удавой Пятра Раманавіча Лукомскага Багданай, якая была дачкой Канстанціна Фёдаравіча Каноплі (з галіны князёў Друцкіх-Сакалінскіх) і княгіні Анастасіі Талачынскай. Князі

Талачынскія былі буйнымі землеўласнікамі. Брату маці Багданы Васілю Юравічу Талачынскаму, акрамя Друцкага княства, належаў Талачын з воласцю і шасцю маёнткамі, а таксама два землеўладанні ў Мсціслаўскім павеце.

У будучым родзічы князя Васілія, які быў бяздзетным (Sapiehowie 189: 69), у тым ліку і зяць яго сястры Ян Сапега з жонкай Багданай, маглі спадзявацца на вялікую спадчыну. Час паказаў, што гэты разлік спраўдзіўся.

Прыблізна ў той жа час пачаўся перадзел скарбаў сям'і Сапегаў, які суправаджаўся ўзаемнымі прэтэнзіямі, скаргамі і судовымі працэсамі. Ужо ў 1550 годзе маці Яна Сапегі падала на яго ў суд, патрабуючы, каб ён з атрыманых «рускіх і літоўскіх» землеўладанняў выдзяліў бы частку для сястры Сафіі (Sapiehowie 1890: 67). З гэтай справы бачна, што ў час дзяльбы Яну адышлі ўладанні ў этнаграфічнай Літве, Смаленскіх і Віцебскіх землях.

У 1555 годзе брат Мікалай прад'явіў яму судовы вышук за несправядлівы падзел «літоўскіх» уладанняў бацькі, і Ян, які атрымаў быў болей, чым яму належала, пагадзіўся, каб бацькаўская спадчына была перадзелена для ўсіх братоў па-новаму. Аднак з гэтым не пагадзіўся другі брат Павел, які завалодаў большай часткай бацькавых земляў і, як пазней убачым, дзелячы бацькаву, і асабліва матчыну, спадчыну, паводзіў сябе зусім не па-брацку.

У 1558 годзе ўдава Яна Багданавіча Сапегі Ганна, падляшская ваяводзіна, дажыўшы да глыбокай старасці, адпісала ўсю сваю маёмасць дзецям: Яну дастаўся маёнтак ля Полацка, Сафіі — маёнтак Панямонне, Мікалаю — грашыма 150 коп грошай, а Павел і на гэты раз па нейкіх невядомых прычынах, відавочна, здолеўшы неяк «падлашчыцца» да маці, атрымаў значна болей за другіх — увесь двор Ляйпоніс, матчын пасаг, за які яе нябожчык муж аддаў 1200 злотых.

Вельмі незадаволены матчыным тэстаментам і падзелам яе пасагу, Ян звярнуўся ў суд (VUMD RS. F. 59—13. L. Iv-2). Суд скаргу Яна Сапегі супраць маці і брата не задаволіў. Тады Ян у 1561 годзе сілай захапіў двор Ляйпоніс. Суд уладара, атрымаўшы скаргу Паўла, у той жа час абавязаў Яна Сапегу вярнуць захоплены маёнтак брату. Ян у сваю чаргу запатрабаваў пераглядзець рашэнне суда. Яно было перагледжана і суд прыняў новае рашэнне, якое абавязвала Паўла раздзяліць Ляйпонскі двор на тры часткі — кожнаму брату па частцы (VUMB RS. F. 59—13. L. lv-2). Але і гэты прысуд не быў выкананы. Тады, калі памёрла маці, у дзень яе паха-

вання браты Ян і Мікола сілай захапілі двары, аддадзеныя маткай Паўлу, і з выпадку яе пахавання зноў уварваліся ў вялікі маёнтак Ляйпоніс.

Цікава, што гэтыя грабежніцкія дзеянні каралю Жыгімонту Аўгусту абскардзіў не сам Павел, які, імкнуўшыся завалодаць матчынымі дварамі, дзейнічаў не менш вераломна, а яго цесць Рыгор Аляксандравіч Хадкевіч. Кароль, рэагуючы на гэтую скаргу, паслаў надзвычайнага ўпаўнаважанага князя Андрэя Жылінскага, якому загадаў вярнуць Паўлу ўсе захопленыя братамі двары пад гарантыю ў 1000 коп грошай, а калі яны не паслухаюцца, уздзейнічаць сілай (VUMB RS. F. 59—13. L. 2).

Усё гэта сведчыць, што амаль два дзесяцігоддзі пасля смерці бацькі Ян Сапега пастаянна судзіўся з братамі, сястрой, нават з маці і ў гэтых справах яму часцей, хоць і не заўсёды, шчасціла. Паказальным у гэтым сэнсе з'яўляецца судовы працэс Яна Сапегі супраць яго брата Паўла, зафіксаваны ў справе ад 2 жніўня 1565 года. У ёй Ян абвінавачвае Паўла, што той, выдаючы сястру замуж, не даў ёй пасагу ні граша і што толькі ён, Ян, разам з маці выдзеліў для сястры добрае ўтрыманне; але цяпер, пасля смерці сястры, Павел без усякіх на тое падстаў захапіў Панямонскі замак і іншыя «літоўскія» ўладанні сястры; такім чынам, яму, Яну, з жонкай і дзецьмі не застаецца сродкаў для жыцця, бо яго маёнткі на мяжы з маскоўскай дзяржавай захоплены варожымі вайскамі.

Задавальняючы гэтую скаргу Яна Сапегі, Жыгімонт Аўгуст загадаў Паўлу Сапегу, з 1556 года ваяводзе навагрудскаму, «выдзеліць свайму брату Яну трэць усіх літоўскіх уладанняў, якія засталіся пасля смерці бацькі» і аддаць Панямонскі замак.

Акрамя таго, кароль даў Яну Сапегу прывілей валодаць на Валыні вялікім дваром Палонь з мястэчкам і некалькімі валасцямі (VUMB RS. F. 59—13. L. 2v.; Sapiehowie 1890: 70—71).

Чытач, мала знаёмы з паўсядзённым жыццём феадальнага грамадства таго часу, можа падумаць: «Ну і людзі тыя Сапегі, ну і сямейка, сапраўдныя звяры-драпежнікі — брат брата душыць за мізэрны двор, за капу грошай». Так! Але такія ж самыя зямныя страсці без элементарнай чалавечнасці віравалі ў тыя часы пры раздзеле буйных набыткаў і ў другіх родах, напрыклад, пры раздзеле спадчыны буйнейшага феадала ВКЛ канцлера Мікалая Мікалаевіча Радзівіла Малодшага, памёршага ў 1522 годзе (РГАДА. Ф. 389. Адз. зах. 224. Л. 97—98об.).

Сквапнасць, карыслівасць, бясконцыя судовыя працэсы — гэта штодзённасць тагачаснага грамадства, характэрная не толькі для Літвы, але і для Польшчы, Расіі, Францыі і інш. Розніца толькі ў тым, што жыццё феадалаў ВКЛ яскрава і вельмі падрабязна засведчана ў кнігах Літоўскай Метрыкі. Дзякуючы ім, захаваліся да нашых дзён і сямейныя маёмасныя справы Яна Сапегі, і справы яго судовых спрэчак з далёкімі сваякамі і феадаламі-суседзямі.

Так, у 1550 годзе судовую скаргу на Яна Сапегу падаў адзін з буйнейшых царкоўных землеўласнікаў, віленскі архідыякан Восіп Ясінскі, з прычыны захопу і абрабавання яго двара ля рэчкі Улы ў Віцебскім павеце. У 1554 годзе шляхціч наваградскага ваяводы Яна Гарнастая Сцяпан Шапшынскі скардзіўся на Яна Сапегу за захоп сілай яго маёнтка.

У 1561 годзе Яна Сапегу выклікалі ў суд князі Багдан і Валтазар Лукомскія, абвінавачваючы яго ў налётах на іх двары Чарэя, Радамля і Гарадзец. У той жа самы час Ян Сапега з жонкай Багданай і яе маці распачалі працэс супраць дзяцей Яна Гарнастая, якія незаконна завалодалі вялікай часткай спадчыны згаданага бяздзетнага князя Васіля Талачынскага. Яго ўдава, князёўна Марыя Заслаўская, выйшла другі раз замуж за наваградскага ваяводу Яна Гарнастая і ў якасці пасагу прынесла за сабой усе землеўладанні Васіля Талачынскага, якія мелі вельмі вялікія памеры.

Аднак паводле нормаў Першага Літоўскага Статута тыя ўладанні пасля смерці Марыі павінны былі перайсці да бліжэйшых сваякоў князя Васіля Талачынскага, г.зн. Яну Сапегу і яго жонцы. Так і здарылася. У 1562 годзе рашэннем суда вялікага князя гэтыя двары былі прысуджаны Яну Сапегу і яго жонцы (Sapiehowie 1890: 67—70).

Такім чынам Ян Сапега спакваля прабіраўся ў кола першых саноўнікаў ВКЛ. Праўда, вялікі князь па нейкіх прычынах усё яшчэ не вяртаў яму тых вышэйшых тытулаў, якія меў яго бацька. У актах Ян усё яшчэ ваяводзіч, які не мае свайго тытула. У той жа час яго малодшы брат Мікалай ужо атрымаў спачатку нязначны тытул двараніна ўладара, а пазней — тытул каралеўскага сакратара, а брат Павел — любецкага дзяржаўцы, з 1556 года — наваградскага ваяводы (АЗР 1848: 72. № 18), а з 1566 года — тытул кіеўскага кашталяна (Sapiehowie 1890: 81). Аднак лёс не быў паблажлівым не толькі да службовай кар'еры Яна Сапегі, але і да яго скарбаў. Большасць яго маёнткаў, асабліва з боку жонкі, былі на землях, памежных з Маскоўскай дзяржавай: Смаленскіх, Віцебскіх і Полацкіх.

З прычыны паспяховых дзеянняў рускага войска ў першыя гады Лівонскай вайны* ўсе гэтыя ўладанні былі або заняты праціўнікам, або апустошаны сваім войскам.

Пасля згаданага ўжо рашэння караля ад 2 жніўня 1565 года Яну Сапегу вярнулі некаторыя радавыя двары ў этнаграфічнай Літве, а пасля і далі прывілей на другія ўладанні, у выніку чаго яго маёмаснае становішча ў пачатку 1580-х гадоў, здаецца, зноў пачало паляпшацца. Напрыканцы жыцця, каля сярэдзіны 80-х гадоў XVI стагоддзя, яму былі вернуты Драгічынскае намесніцтва і бацькаў тытул старасты.



*Траецкая царква ў вёсцы Белая царква. Пабудавана у 1599 г. на востраве возера Галаўль Львом Сапегам (цяпер тут паўвостраў, і возера мае назоў Чарэйскае). Фота К. Скарэвіча, пач. ХХ ст.*

Апошняя важная крыніца пра жыццё і маёмаснае становішча Яна Сапегі датавана 1578 годам. Гэта прывілей, дадзены Стэфанам Баторыем, які пацвердзіў правы ўласнасці Яна Сапегі на двор Чарэю з манастыром і царквою (АЗР 1848: 230—234. № 101; Sapiehowie 1890: 71—72). Можна меркаваць, што гэты прывілей, які значна ўмацаваў маёмаснае становішча Яна Сапегі, быў дадзены за актыўную дзейнасць яго сына Льва, які ўжо ў тую пару быў заўважаны не толькі ў акружэнні вялікага князя, але і самім уладаром.

Ян Янавіч Сапега памёр у 1580 годзе, а яго жонка — ў 1584 годзе. Яны пакінулі шасцёра дзяцей: Льва, Грыгаля, Андрэя, Ганну, Марыю-Сафію і Фядору, якія ў 1585 годзе пачалі дзяліць спадчыну бацькі (Sapiehowie 1890: 72).

* Больш падрабязна пра гэта гл.: Сборник 1892; Кобрин 1989.

Такім чынам, радавод Льва Сапегі падмацаваў зыходныя ўмовы для яго дзяржаўнай і палітычнай кар'еры, маёмаснага становішча. Яго карані не былі княжацкімі і тым болей не дасягнулі Гедымінавічаў, як сцвярджала гістарыяграфія XVIII стагоддзя, заблытаная згаданымі фальсіфікацыямі. Аднак паходжанне Сапегаў усё ж не было такім нізкім, як паказвалася ў гістарычнай літаратуры XIX і пачатку XX стагоддзяў. Нават такі сур'ёзны даследчык як І. Лапо аднёс Сапегаў да *«нязначных»* [выдзелена намі. — *С. Л.*] дваранскіх родаў Літоўскай дзяржавы (Lappo 1934: 455). Маючы на ўвазе тое, што было сказана пра радавод Сапегаў, асабліва пра дзеда Льва Яна Багданавіча Сапегу, з 1517 года — віцебскага ваяводу, а з 1529 да 1544 гадоў — падляшскага ваяводу, меркаванне І. Лапо трэба ўдакладніць, аднёсшы Сапегаў да *не самых значных* дваранскіх родаў Літвы. З фармуляра спраў «судовых кніг» Літоўскай Метрыкі бачна, што падляшскі ваявода быў членам паноў-рады, меў месца на другой лаўцы (РГАДА. Ф. 389. Адз. зах. 224, 225). На першай, самай ганаровай, лаўцы сядзелі віленскі і трокскі ваяводы, жамойцкі староста і чатыры епіскапы.

Вядома, Яна Багданавіча Сапегу ні пасадамі, ні паходжаннем, ні багаццем нельга раўняць з Гоштаўтамі, Кесгайламі, Астрожскімі, Радзівіламі, але ўсё ж і ён, падляшскі ваявода, быў даволі значным у дзяржаве феадалам, стварыўшым добры падмурак для ўзвышэння сваіх нашчадкаў. Праўда, як ужо згадвалася, напрыканцы жыцця ў яго былі нейкія дагэтуль яшчэ канчаткова не высветленыя непрыемнасці, але, як сведчыць гісторыя і вопыт нашага часу, у такіх выпадках у другім-трэцім калене звычайна ўсё «рэабілітуецца». Паходжанне, тытулы і набыткі лёгка не знікаюць.

Так здарылася і ў гэтым выпадку. Ужо ў другім і асабліва ў трэцім пакаленні ўсё для роду Сапегаў яшчэ больш паспяхова адрадзілася.

## Глава 2
## ПАЧАТАК ЖЫЦЦЯ

Леў Сапега нарадзіўся 4 красавіка 1557 года. Як ужо вядома, яго бацькі і асабліва дзед Ян Багданавіч Сапега былі заможнымі феадаламі, якія праз жонак парадніліся з княжацкімі сем'ямі. Праўда, калі пачалася Лівонская вайна, у гады дзяцінства Льва, матэрыяльнае становішча яго бацькі значна пагоршылася; грамадскае

становішча таксама было ніякім, бо Драгічынскае намесніцтва і тытул старасты яму былі вернуты толькі ў канцы 80-х гадоў XVI стагоддзя. Памыляюцца гісторыкі, якія сцвярджаюць, што Леў Сапега нарадзіўся ў сям'і драгічынскага старасты (Sapiehowie 1890: 144). У час нараджэння Льва Драгічынскае староства яго бацьку яшчэ не вярнулі.

І ўсё ж паходжанне ў эпоху феадалізма мела вялікую сілу, якую перакрэсліць не маглі ні часовая, ні працяглая няміласць манархаў. Як ужо было згадана, за Яна Багданавіча Сапегу заступаўся сам імператар Фердынанд і ўся паны-рада, у якой у тую пару найвялікшы ўплыў мелі розныя прадстаўнікі роду Радзівілаў. А з Мікалаем Радзівілам Чорным, які з 1551 года быў канцлерам ВКЛ, бацьку Льва Яна Сапегу, паводле меркаванняў некаторых даследчыкаў, звязвалі сяброўскія адносіны (Sapoka 1933: 275).

Мікалай Радзівіл Чорны, адзін з найбольш адукаваных людзей ВКЛ таго часу, кіраўнік Рэфармацыйнага руху, відавочна, меў вялікі ўплыў на бацькоў Льва, якія ў канцы шостага дзесяцігоддзя свайго жыцця з праваслаўя перайшлі ў пратэстантызм. Здаецца, можна меркаваць, што Леў нарадзіўся ўжо ў сям'і рэфарматаў, хоць хрышчоны ён быў яшчэ па праваслаўнаму абраду (Sapiehowie 1890: 148). Таму не здзіўляе, што бацькі, калі яму споўнілася сем гадоў, аддалі яго ў Нясвіжскую школу, якая клопатамі Мікалая Радзівіла Чорнага была пераўтворана ў цэнтр руху радыкальнай Рэфармацыі.

У Нясвіжскі двор Радзівілаў, які належаў яшчэ бацьку Мікалая Чорнага, Яну Мікалаевічу Радзівілу, былі запрошаны вучонейшыя дзеячы Рэфармацыі, якія ў поглядах былі больш радыкальнымі не толькі за Лютэра, але нават і за Кальвіна. На жаль, між імі не было згоды. Мікалай Радзівіл Чорны, таленавіты дзяржаўны дзеяч, разумеў, што рознагалоссе ў Рэфармацыі — той ідэалогіі, абапіраючыся на якую ён меркаваў абнавіць феадальнае грамадства ў ВКЛ, — супярэчыла яго палітычным задумам. Таму ён імкнуўся згуртаваць разнародныя плыні Рэфармацыі вакол самага радыкальнага яе напрамку. А гэта і было, відаць, яго істотнай памылкай.

Феадальны соцыум ВКЛ таго часу мог прыняць самую памяркоўную, лютэранскую Рэфармацыю, аднак і да яе не быў належным чынам гістарычна падрыхтаваны. Хрысціянства ў Літву прыйшло на некалькі стагоддзяў пазней, чым у другія дзяржавы Заходняй Еўропы, таму яго пачатковая форма — каталіцтва — тут далёка яшчэ не было выкарыстана ва ўсіх сваіх духоўных і культурных магчымасцях.

Гэтага не разумелі і не хацелі бачыць нават такія вопытныя палітыкі, як Радзівілы, што самі яшчэ нядаўна, між іншым, былі шчырымі католікамі (асабліва бацька Мікалая Радзівіла Чорнага Ян).

Занадта спакуслівай здавалася секулярызацыя царкоўных скарбаў, хоць і не такіх значных, як у Заходняй Еўропе! Мікалай Радзівіл Чорны з самага пачатку сваёй рэфармацкай дзейнасці быў акружаны такімі радыкальнейшымі рэфарматамі, як яго асабісты лекар Георг Бландрат, а таксама Пётр Ганецый, Лаўрэн Крышкоўскі, Марцін Чаховіч, Сымон Будны і інш. Іх жыццё, погляды і дзейнасць грунтоўна даследаваны (у асноўным польскімі аўтарамі; на літоўскай мове гл. Lukšaite 1980).



*Мікалай Радзівіл Чорны (1515—1565)*

У такім вось інтэлектуальным асяроддзі апынуўся сямігадовы здольны хлапчук Леў Сапега разам з не меней здольнымі дзецьмі Мікалая Радзівіла Чорнага Альбертам Войцэхам, Юрыем і Станіславам. У Нясвіжскай школе ён авалодаў некалькімі важнейшымі для далейшай адукацыі мовамі: лацінскай, старажытнагрэчаскай і нямецкай.

Зразумела, Леў Сапега таксама валодаў і старабеларускай мовай — афіцыйнай мовай ВКЛ, якую пазней называў сваёй роднай, і польскай мовай.

У багатай Нясвіжскай бібліятэцы ён пазнаёміўся з важнейшымі еўрапейскімі літаратурнымі творамі XV і першай паловы XVI стагоддзя. Тут разам з малодшымі сынамі Мікалая Радзівіла Чорнага ён захапіўся ідэямі Рэфармацыі, гуманізма і патрыятызма.

Час на радзіме юнага Льва Сапегі быў неспакойным. Цягнулася доўгая Лівонская вайна, першае дзесяцігоддзе якой для ВКЛ не было паспяховым. Гэтая вайна была адным з тых фактараў, якія прымусілі Літву ў 1569 годзе заключыць з Польшчай зневажальную Люблінскую унію. Яе горача абмяркоўвала ўся грамадскасць тагачаснай Літвы. Незадаволенасць уніяй у Літве моцна і балюча ўразіла і яго (Lappo 1934: 458), гэта не магло не трывожыць розум і пачуцці

падлетка. І, відаць, менавіта ў тыя гады ў Нясвіжы, дванаццаці-трынаццацігадовы Леў Сапега задумаў вялікія пераўтварэнні ВКЛ, якія потым грунтоўна асэнсаваў і ажыццявіў.

Трэба было вучыцца далей. Тут жаданні юнака і яго бацькі цалкам супадалі. У 1570 годзе Леў Сапега разам з дзецьмі Мікалая Радзівіла Чорнага Альбертам Войцэхам, Юрыем і Станіславам адбыў за мяжу працягваць адукацыю. У матрыкулах тых часоў Лейпцыгскага універсітэта згадваецца імя Льва Сапегі (Lappo 1934: 456). Адзін са старэйшых у Германіі, заснаваны ў 1409 годзе Лейпцыгскі універсітэт знаходзіўся ва ўладаннях курфюрста Саксоніі Аўгуста. Шчыры лютэранін Аўгуст патрабаваў, каб усё, што супярэчыла вучэннто Лютэра, было без літасці вынішчана ва універсітэце. З-за гэтага абвастрылася барацьба паміж прыхільнікамі Лютэра, якія пераважалі сярод прафесароў, і кальвіністамі.



*Pacta conventa (дагавор паміж выбраным каралём С. Баторыям і станамі Рэчы Паспалітай). Выява з Нацыянальнай бібліятэкі Варшавы*

Ужо сама Рэфармацыя, вядома, абнавіла універсітэт, а секулярызацыя царквы дала сродкі для значнага ўмацавання яго матэрыяльнай базы. Ідэалагічная барацьба ў віры рэфармацкага руху абуджала думку прафесараў і студэнтаў, садзейнічала філасофскім пошукам. Усё гэта ўздзейнічала на вучобу юнага Льва Сапегі. На думку І. Лапо, асаблівы ўплыў на яго філалагічную і філасофскую адукацыю меў

вядомы ў той час прафесар класічнай філалогіі Іяхім Камерарый (Lappo 1934: 457).

У Лейпцыгу Леў Сапега правучыўся два гады і пасля смерці Жыгімонта Аўгуста, у канцы 1572 або ў пачатку 1573 года, вярнуўся на радзіму. Некалькі гадоў пасля гэтага яго імя не згадваецца нідзе. Невядома, дзе ён жыў і чым займаўся. Відаць, варта пагадзіцца з І. Лапо і адказ на гэтыя пытанні шукаць у наступных словах тэстаменту Льва Сапегі:

> [...] з маладых гадоў выхаваны ў нямецкіх *ерэтычных школах* [выдзелена ў транскрыбіраваным тэксце. — *С. Л.*], збіўся з дарогі, як аблудная авечка [...] (Sapiehowie 1890: 400).

Гэтыя словы сведчаць, што ён вучыўся не толькі ў Лейпцыгскім універсітэце, але і ў некалькіх «ерэтычных» школах Германіі. Менавіта ў гэтых словах змяшчаецца адказ на пытанне, што рабіў Леў Сапега ў перыяд да 1577—1578 гадоў, калі ён дзякуючы пратэкцыі свайго дабрадзея Мікалая Радзівіла Рудога быў прыняты на дзяржаўную службу і атрымаў пасаду двараніна ўладара.

Такім чынам, трынаццацігадовым падлеткам пачаўшы вучобу ў Лейпцыгскім універсітэце, Леў Сапега працягваў яе яшчэ некалькі гадоў, спецыялізуючыся ў галіне філасофіі і юрыспрудэнцыі, у другіх «ерэтычных» універсітэтах Германіі. І зусім магчыма, што ў архівах тых універсітэтаў знаходзяцца яго матрыкулы і чакаюць, калі рука руплівага даследчыка сатрэ з іх пыл часу і запоўніць яшчэ адну старонку гісторыі. Пра тое, што Леў Сапега вучыўся яшчэ ў некалькіх універсітэтах, акрамя згаданых слоў тэстаменту, сведчаць і яго творы, дзе праяўляецца велізарная эрудыцыя, і ўся яго выдатная дзяржаўная і палітычная дзейнасць, пра якую будзе сказана пазней.

Нарэшце грунтоўная адукацыя была атрымана. У нямецкіх універсітэтах Леў Сапега не толькі вывучыў асновы філасофіі і тэорыі права, але сфарміраваўся як паслядоўны прыхільнік Рэфармацыі.

Прыйшла пара юнацкай сталасці. Дваццацігадовы дваранін уладара сваімі здольнасцямі, эрудыцыяй у галіне права, веданнем моў, асабліва лацінскай, адразу ж звярнуў на сябе ўвагу двара караля Польшчы і вялікага князя літоўскага Стэфана Баторыя, таксама добра адукаванага чалавека. Стэфан Баторый, які не ведаў мясцовых моў, са сваімі чыноўнікамі размаўляў на латыні. Адным з іх і быў Леў Сапега, які дасканала валодаў лацінскай мовай, пра што сведчыць яго багатая эпісталярная спадчына (Prochaska 1892).

Паводле аднаго з першых біёграфаў Льва Сапегі А. А. Міштольта, які карыстаўся дастаткова надзейнымі крыніцамі, Стэфан Баторый, бліжэй пазнаёміўшыся з новым сваім прыдворным, аднойчы сказаў: «Iste juvenis adolescens, evadet in magnum virum in Respublica»* (Misztolt 1724: 22). Эрудыцыя, дасціпны розум Льва Сапегі і неўзабаве надарыўшаяся магчымасць праявіць свае ваенныя здольнасці і адданасць радзіме на полі бою гарантавалі яму надзвычай хуткі ўздым па кар'ернай лесвіцы.

У 1579 годзе ўзнавіліся актыўныя, на гэты раз паспяховыя для ВКЛ і Польшчы ваенныя дзеянні супраць маскоўскай дзяржавы. Леў Сапега на свае сродкі сфарміраваў вялікі вайсковы атрад і са сваім радавым сцягам пад кіраўніцтвам Стэфана Баторыя дзёрзка ваяваў пад Псковам і Вялікімі Лукамі (Misztolt 1724: 23). Гэта было належным чынам адзначана — кароль польскі і вялікі князь літоўскі 2 лютага 1580 года прызначыў яго адным са сваіх сакратароў (Lappo 1934: 460).

На той жа час Леў Сапега ўжо ўдзельнічаў у пасяджэннях Сойма. Праз год яму была дадзена яшчэ болей высокая пасада — пісара канцылярыі вялікага князя (Lappo 1934: 460). Гэтыя пасады адкрылі яму доступ да ўсіх дзяржаўных дакументаў і далі магчымасць супрацоўнічаць з членамі паноў-рады. Ужо з першых крокаў дзяржаўнай дзейнасці дваццаціпяцігадовы Леў Сапега дэманструе незвычайныя здольнасці ва ўсіх сферах дзяржаўнага кіравання. Ён адмыслова карыстаецца становішчам прыдворнага караля і вялікага князя. Амаль увесь час знаходзячыся ў Кракаве, ён шчодра забяспечвае вычарпальнай інфармацыяй самых уплывовых членаў паноў-рады.

Асабліва цесныя адносіны, якія пазней перараслі ў сяброўскія і былі замацаваны сваяцтвам, завязаліся з Крыштафам Радзівілам — магутным саноўнікам Літвы, сынам віленскага ваяводы Мікалая Радзівіла Рудога (Prochaska 1892: 3—4). Крыштаф Радзівіл у той час ужо займаў высокія пасады: быў палявым гетманам, трокскім кашталянам, а з 1579 года і падканцлерам ВКЛ. У адным з тагачасных лістоў Леў Сапега, акрамя важных звестак пра напад турак на дзяржаву, падрабязна паведамляе пра здарэнні ў палацы ўладара, напрыклад, на якіх вяселлях быў канцлер Кароны і якія адбыліся бойкі:

Ад пана Камянецкага старасты, з Камянец-Падольска прыбыў пасыльны з лістом, дзе паведамляецца, што туркі ўжо пераправі-

* «Гэты юнак стане вялікім мужам Рэспублікі».

ліся праз Дунай і могуць асесці лагерам каля Каменца... (Prochaska 1892: 3).

І далей:

> Назаўтра, у панядзелак, 5 верасня пан канцлер [Кароны. — *С. Л.*] быў на вяселлі ў пана Длускага, які аддаваў сваю дачку за нашага п. Савіцкага; там было шэсць боек, прычым адна з іх, апошняя, была такая, што не толькі шляхта, але і ўсе паны схапіліся за шпагі і мячы (Prochaska 189:4).

Час вучобы і вычарпальна падрабязныя навіны пра Кракаўскі палац былі належным чынам ацэнены як Крыштафам Радзівілам, так і яго бацькам, які здаўна быў апекуном Льва Сапегі. Таму аўтарытэт маладога Льва сярод вышэйшых колаў паноў-рады ўсё ўзрастаў, а сам ён шпарка ўздымаўся па прыступках кар'ернай лесвіцы. Калі ў 1582 годзе неабходна было накіраваць адну з найболей аўтарытэтных асоб на сумесны Варшаўскі сойм маршалкам Літоўскай палаты паслоў, быў абраны менавіта Леў Сапега, якому толькі што споўнілася дваццаць пяць гадоў. На гэтую важнейшую пасаду сумесным рашэннем караля і паноў-рады прызначаліся самыя ўплывовыя асобы Літоўскай дзяржавы. Таму І. Лапо, каментуючы гэты факт, меў цвёрдую падставу меркаваць, што Леў Сапега ўжо тады заслужыў давер не толькі караля Стэфана Баторыя, але і значны аўтарытэт сярод кіруючых колаў ВКЛ (Lappo 1934: 460).

Напрыканцы 1583 года Рэч Паспалітая апынулася ў надзвычай цяжкім становішчы: у яе паўднёвую вобласць уварваліся войскі турэцкага султана і крымскага хана, а на ўсходзе працягвалася вайна з маскоўскай дзяржавай. У гэтых умовах неабходна было любой цаной спыніць ваенныя дзеянні супраць Масквы, а ў лепшым выпадку — заключыць мірнае пагадненне. З такой мэтай вясной 1584 года ў Маскву паехала вялікая дэлегацыя на чале з дваццацісямігадовым Львом Сапегам. Гэта было першае адказнае дзяржаўнае даручэнне, з якім малады Леў выдатна справіўся.

Хоць перамовы з урадам толькі што ўзыйшоўшага на рускі прастол Фёдара Іванавіча былі цяжкімі і часта заходзілі ў тупік, нарэшце ў канцы 1584 года быў заключаны мір на дзесяць гадоў. Урад Фёдара, дэманструючы мірныя памкненні і добрасуседскія адносіны з Рэспублікай, без якісьціх умоў і выкупаў вызваліў усіх палонных. 28 ліпеня 1584 года дэлегацыя вярнулася ў Вільню (Sapiehowie 1890: 145). Паспяховыя перамовы і заключэнне неаб-

ходнага мірнага пагаднення з Масквой забяспечылі Льву Сапегу славу дыпламата. Яго чакалі каралеўскія міласці і новы, на гэты раз яшчэ большы ўзлёт у кар'еры.

У 1584 годзе памёр вялікі гетман і віленскі ваявода Мікалай Радзівіл Руды. Як у такіх выпадках здаралася, пачаўся рух дзяржаўных асоб па іерархічнай лесвіцы. Вышэйшыя пасады Літоўскай дзяржавы, якія займаў нябожчык, унаследаваў яго старэйшы сын Крыштаф Радзівіл (пазней празваны Перуном), які пакінуў месца падканцлера ВКЛ. Пасля перамоў, якія ішлі амаль тры месяцы, падканцлерам 2 лютага 1585 года быў прызначаны Леў Сапега, які ў той час меў няпоўных дваццаць восем гадоў (Lappo 1934: 461).

Прызначэнне на такую высокую пасаду было перш за ўсё абумоўлена яго здольнасцямі, паходжаннем і набытымі ўжо на той час немалымі скарбамі, пра якія будзе сказана пазней. Акрамя таго, важную ролю мела прыхільнасць караля Стэфана Баторыя і актыўная дапамога новага віленскага ваяводы Крыштафа Радзівіла. З апошнім, як вядома, Леў Сапега сябраваў. Кандыдатуру Льва Сапегі, відаць, падтрымаў і сам канцлер Астафій Валовіч. Пасада падканцлера адчыніла Льву Сапегу дзверы ў кола самых адказных дзяржаўных дзеячаў ВКЛ, ён стаў трымальнікам так званай малой пячаткі дзяржавы.

Добры пачатак быў зроблены, шлях да вышэйшых дзяржаўных пасад, вялікіх спраў, славы і незлічоных скарбаў быў адкрыты.

## Глава 3
## ДЗЕЯЧ ЛІТОЎСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ

Леў Сапега, усклаўшы ў дваццаць восем год на свае маладыя плечы цяжкую ношу спраў велізарнай краіны, пакрочыў звілістым і спакуслівым шляхам дзяржаўнага дзеяча. З той пары пачынаецца яго інтэнсіўнейшая дзяржаўная і палітычная дзейнасць. Акрамя бягучых дзяржаўных спраў, якія Льву Сапегу, як другой асобе ў дзяржаўным апараце, даводзілася вырашаць, ён, адукаваны юрыст і вялікі знаўца права Літвы, актыўна ўдзельнічаў у кадыфікацыі «Трыбунала» і Трэцяга Літоўскага Статута — выдатнага помніка позняга еўрапейскага феадалізму, а таксама шмат увагі ўдзяляў уладкаванню канфесійных канфліктаў. Вядома, што ў шматканфесійным ВКЛ такія канфлікты значна абвастрыліся ў 80-я гады XVI стагоддзя, калі распачалася актыўная контррэфармацыя, і ў Вільні з'явіліся іезуіты.

Сам Леў Сапега, як і большасць дзеячоў Рэфармацыі, у пытаннях веры быў вельмі памяркоўным і да рэлігіі падыходзіў пераважна з рацыянальнага палітычнага погляду. У той час ужо перайшоўшы да каталіцтва, але ў глыбінях душы яшчэ памятаючы пра праваслаўе сваіх продкаў, ён марыў пра магчымасць шляхам уніі праваслаўных і рымскіх католікаў стварыць новую царкву, не залежную ні ад Маскоўскай метраполіі (з 1589 года — патрыярхата), ні ад папскага прастола. І кадыфікуючы Трэці Літоўскі Статут, і прымаючы ўдзел у стварэнні новай уніяцкай царквы, ён перш за ўсё імкнуўся ўмацаваць дзяржаўнасць ВКЛ, яго прававыя і ідэалагічныя асновы, узвысіць яго прэстыж.

У 1586 годзе па смерці Стэфана Баторыя ў Літве і Польшчы наступіла пара міжуладдзя. Для Льва Сапегі, які толькі што стаў падканцлерам, а з 1587 года пасля смерці Астафія Валовіча фактычна выконваў і абавязкі канцлера, пачаліся дні іспытаў на палітычную сталасць. Падзеі 1586—1587 гадоў для маладога дзяржаўнага дзеяча былі вырашальнымі (Šapoka 1933: 280). Цяпер Льву Сапегу дасталася першая роля пры абранні новага агульнага для Польшы і ВКЛ манарха.

На гэта звярнуў увагу І. Лапо:

> Па смерці Астафія Валовіча, — пісаў ён, — пасада канцлера Літоўскай дзяржавы яшчэ не была занятай. Леў Сапега застаўся адзіным «гаспадаром пячаткі», які мог пячаткай ВКЛ зацвердзіць тыя дакументы, што трэба было б падрыхтаваць і апублікаваць, калі ў Літоўскай дзяржаве прызнаюць аднаго з «намінатаў» [г. зн. прэтэндэнтаў. — *С. Л.*] сваім манархам (Lappo 1936: 193).

Напачатку Леў Сапега, які хоць і не быў абраным на сейміках членам дэлегацыі ВКЛ, аднак актыўна ўдзельнічаў у працы элекцыйнага сойма, падтрымаў кандыдатуру маскоўскага цара Фёдара і агітаваў за саюз з Масквой. Ён імкнуўся такім чынам умацаваць нядаўна заключаны з Масквой патрэбны Літве мір, а калі ўзнікнуць спрыяльныя ўмовы для гэтага, магчыма нават і стварыць новую, яшчэ большую дзяржаву ВКЛ, Польшчы і Расіі. Аднак пераканаўшыся ў ненадзейнасці кандыдатуры цара Фёдара, ён хутка змяніў сваю пазіцыю і пачаў падтрымліваць Жыгімонта Вазу, якога падтрымлівала большасць польскіх магнатаў, што знаходзіліся пад уплывам канцлера Кароны Польскай Яна Замойскага. На гэта, відаць, паўплывала адмоўнае ўражанне пра цара Фёдара як асобу падчас першай місіі Льва Сапегі ў Маскве. Матывуючы змену сва-

ёй пазіцыі, у лісце з Варшавы ад 22 верасня 1587 года да Крыштафа Радзівіла Перуна ён пісаў:

> Пан Бог мне сведкай, што жадаў яго [цара Фёдара. — *С. Л.*] мецъ уладаром, хоць ведаў і бачыў многа для гэтага перашкод, а між іх не меншыя — недахопы яго асобы (Prochaska 1892: 22).

Гэтыя асабістыя «недахопы», хваравітасць цара Фёдара Леў Сапега заўважыў яшчэ падчас сваёй місіі 1584 года ў Маскве. У адным з тагачасных лістоў да таго самага Крыштафа Радзівіла ён пісаў, што новы маскоўскі цар «...і свайго розуму мала мае, і цяжкай хваробай часта хварэе...» (ADR 1885: 174). Асоба Фёдара грунтоўна ахарактарызавана сучаснікамі, пераважна іншаземцамі (Czerska 1988: 8—11). Таму Леў Сапега, дасціпны палітык, вельмі хутка зразумеў, што перспектыва абрання цара Фёдара каранаваным уладаром агульнай дзяржавы Літвы і Польшчы мізэрная.

Праўда, напачатку ў Літве далёка не адзін толькі Леў Сапега падтрымліваў кандыдатуру цара Фёдара. Некаторы час за яе былі абедзве першыя асобы дзяржавы: віленскі ваявода Крыштаф Радзівіл Пярун і трокскі ваявода Ян Глябовіч. Аднак нягледзячы на вялікае сяброўства і адданасць Льва Сапегі магутнейшым Радзівілам, хада падзей развяла іх думкі і пазіцыі. Большасць літоўскіх феадалаў, на якіх не ўплывалі Радзівілы, адмовілася ад цара Фёдара, стала арыентавацца на кандыдатуру эрцгерцага Максіміліяна Габсбурга.

Леў Сапега, ацаніўшы рэальнае становішча, у тым самым лісце настойліва схіляў новага віленскага ваяводу Крыштафа Радзівіла змяніць свае пазіцыі. Падзеі заблыталіся так, што большасць польскай шляхты цвёрда падтрымлівала кандыдатуру шведскага кронпрынца Жыгімонта Вазы, паводле маці Ягелончыка. Яго маці Катрына была сястрой Жыгімонта Аўгуста, апошняга Ягелончыка.

Бацькі Жыгімонта Вазы з маленства рыхтавалі яго да польскага трону, нават навучылі польскай мове. Гэтая большасць польскай шляхты на сойме выбрала Жыгімонта Вазу каралём, фактычна без удзелу дэлегацыі Літвы, якую Радзівілы і другія вяльможы адмовіліся паслаць.

Другая апазіцыйная частка польскіх сенатараў, якую ўзначальваў Крыштаф Збароўскі, каралём выбрала Максіміліяна. Апазіцыю бурна падтрымлівалі ўплывовыя літоўскія саноўнікі Юрый Радзівіл, віленскі епіскап і яго старэйшы брат, трокскі кашталян Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка — дзеці Мікалая Радзівіла Чорнага, якія прыватна бралі ўдзел у рабоце элекцыйнага сойма.

Элекцыйны сойм фактычна раскалоўся, стварылася вельмі складанае і небяспечнае становішча, якое Леў Сапега, прымаўшы ўдзел у сойме як падканцлер ВКЛ, імкнуўся як мага змякчыць. Звяртаючыся да Жыгімонта Вазы і членаў сойма палякаў, ён сказаў:

> [...] І нам любы шведскі каралевіч, аднак нам непрыемна ад таго, што яго абвясцілі [каралём — *С. Л.*] без нас, і не гневаемся на яго, а толькі на вас (Bielskl, Sobieszczański 1851: 60; Lappo 1936: 183)*.

Вядома, з'яўляючыся ўсяго толькі добрым падканцлерам, ён не мог вырашыць ход падзей.

Паны-рада і шляхта ВКЛ і пазней, не прызнаючы законнасць выбараў Жыгімонта Вазы, адмовіліся накіраваць сваіх паслоў на яго каранацыю, якая мела адбыцца ў Кракаве 28 снежня 1587 года. Падзеі таго часу і ўсе іх драматычныя наступствы для ВКЛ падрабязна адлюстраваны ў багатай гістарычнай літаратуры (Lappo 1936: 167—205).



*Крыштаф Радзівіл Пярун (1547—1621)*

Леў Сапега адзін з нямногіх прыналежных да кіруючых колаў ВКЛ, цвяроза ацаніўшы становішча, асцярожна, дыпламатычна схіляў паноў-раду адмовіцца ад сваёй пастановы і згадзіцца з каранацыяй Жыгімонта Вазы. У згаданым лісце да фактычнага кіраўніка Літоўскай дзяржавы віленскага ваяводы Крыштафа Радзівіла Перуна ён пісаў:

> Для кожнага бачна, куды тут падзеі схіліліся і як тут тыя, што яго Вялікасць Каралевіча [Жыгімонта Вазу. — *С. Л.*] зневажалі, падтрымліваюць і гарой стаяць за яго, згаварыўшыся канчаткова супраць Максіміліяна [...] што так разумею і бачу, Яго Вялікасць шведскі Каралевіч ад Бога прызначаны гаспадаром нашым і шлях яму высцілаецца да атрымання трона. Таму болей не жадаў бы таго свайму народу, чаму ён па волі Боскай супраціўляўся напа-

* Lappo 1936: 183: «...i nam smaczny jest krolewic Szwedzki, ale to nam żałosna, żeście go bez nas mianowali, y nie gniewamy się nań tylko na was».

чатку, а толькі, каб стаў падданым каранаванага Караля Польскага, інакш, думаю, будзе знявага і ганьба для майго народа. Дзеля таго ж жадаў бы, каб і Ваша княжацкая Вяльможнасць, мой любы пане, свой розум да таго схілілі б — павялі б саслоўі ВКЛ да таго, каб у праявах сваёй волі не былі апошнімі, а нават апярэдзілі бы каранацыю».

Такім чынам, Леў Сапега, які быў толькі падканцлерам ВКЛ і меў усяго трыццаць гадоў, перш за ўсіх і лепш зарыентаваўся ў складанай палітычнай сітуацыі ў дзяржаве і нават асмеліўся настойліва параіць свайму дабрадзею, магутнаму віленскаму ваяводзе Крыштафу Радзівілу, як у такіх умовах трэба дзейнічаць, каб не зрабіць шкоды свайму народу і краіне.

І рэальна кіруючыя колы адкарэктавалі сваю палітыку, якая стала больш гнуткай. 8 лістапада 1587 года ў Вільні быў скліканы дзяржаўны сход ВКЛ (Lappo 1936: 188), на якім былі сфармуляваны ўмовы прызнання прэтэндэнтаў («намінатаў») на трон вялікага князя Літвы і караля Польшчы.

Важнейшымі з іх былі пяць:

> Па-першае, каб прысягнуў [будучы ўладар. — *С. Л.*] за нашы правы на вольнасць, свабоду і прывілеі паводле клятвы каралёў Генрыха і Стэфана, усюды прыбаўляючы, каб было — *et Mag. Due. Lith.* Па-другое, каб мір, дамоўлены з Масквой, трымаўся да пятнаццаці гадоў а *interea* [...] каб з ім [царом Масквы. — *С. Л.*] вечны мір быў устаноўлены. Па-трэцяе, каб рашэнне аб зямлі Інфлянцкай прыняў і спрэчку з палякамі цяпер, да таго сойма па каранацыі, вырашыў. Пачцвёртае, каб нававыпраўлены Статут [Трэці. — *С. Л.*] быў выдадзены і зацверджаны. Па-пятае, зацвердзіць Трыбунал (Lappo 1936: 194).

Ёсць падстава меркаваць, што Леў Сапега актыўна ўдзельнічаў у падрыхтоўцы гэтых патрабаванняў. Давесці іх да прэтэндэнтаў сход даручыў вельмі аўтарытэтнай дэлегацыі, у якую ўвайшлі амаль уся вышэйшая паны-рада (пяць сенатараў, за выключэннем старасты і епіскапа жамойцкіх) і дваццаць два прадстаўнікі шляхты, аднак ад удзелу ў каранацыі Жыгімонта Вазы ўсё ж было вырашана адмовіцца, хоць у гістарычных крыніцах трапляюцца звесткі пра тое, што асобныя вяльможы Літвы ў каранацыі ўдзельнічалі.

Дэлегацыя спынілася ў Бярэсці, а непасрэдна весці перамовы з прэтэндэнтамі ў Кракаў выехалі яе ўпаўнаважаныя, якіх узна-

чальвалі трокскі ваявода Ян Глябовіч і падканцлер Леў Сапега, хоць апошні ў склад дэлегацыі афіцыйна не быў уключаны. У гэтым выпадку, відаць, было ўлічана і тое, што па смерці Астафія Валовіча ў снежні 1587 года Леў Сапега фактычна выконваў абавязкі канцлера. Бясспрэчна ж, прызначэнне ўпаўнаважаным абумовілі і яго погляды, уменне арыентавацца ў складанейшых сітуацыях, талент дыпламата.

Упаўнаважаныя сапраўды цудоўна справіліся са сваёй місіяй. Жыгімонт Ваза прыняў усе пяць згаданых умоў Літоўскай дэлегацыі. 28 студзеня 1588 года ён выдаў прывілей, які зацвердзіў Трэці Літоўскі Статут, завізіраваны подпісамі яго самога і падканцлера Льва Сапегі (Lappo 1936: 205).

Гэта важная заслуга Льва Сапегі была належным чынам адзначана. Ужо 14 лютага 1588 года, яшчэ быўшы падканцлерам, ён змог атрымаць прывілей Жыгімонта Вазы, які даў права выдаць Трэці Літоўскі Статут. І з гэтым заданием ён выдатна справіўся (пра гэта яшчэ будзе сказана падрабязна).

Месца канцлера ВКЛ было свабодным болей года. Пасля доўгіх рад і спрэчак на гэтую вышэйшую дзяржаўную пасаду ў канцы красавіка 1589 года быў прызначаны трыццацідвухгадовы Леў Сапега (Sapiehowie 1890: 150).

Важную ролю ў гэтым адыграла яго цвярозая і прадбачлівая палітыка ў пытаннях каранацыі Жыгімонта Вазы і прызнання ўладара.

Яшчэ большае значэнне мела «змена вех», г. зн. пераход ад кальвінізма да каталіцтва (Sapiehowie 1890: 148). Праўду сказаць, гэты пераход фактычна адбыўся яшчэ за некалькі год — пра гэта сведчыць ліст Льва Сапегі да Крыштафа Радзівіла Перуна ад 24 чэрвеня 1586 года, дзе ён шчыра і горача абараняе Рымскую каталіцкую веру, а свае ранейшыя погляды лічыць памылковымі (Prochaska 1892: 12—13. № 19).

Цяпер Леў Сапега пасля віленскага ваяводы Крыштафа Радзівіла Перуна стаў паводле пасады другой асобай у дзяржаве. Маючы на ўвазе яго эрудыцыю, здольнасці і «своечасовы» пераход да каталіцтва, калі ўладарыў паслядоўны католік Жыгімонт Ваза, няцяжка зразумець, што ўплыў Льва Сапегі на дзяржаўныя справы часта быў вырашальным. Тым больш што Крыштаф Радзівіл Пярун, быў адным з нешматлікіх саноўнікаў ВКЛ, які застаўся прыхільнікам веравызнання свайго славутага бацькі — кальвінізму.

Хоць рэлігійная цярпімасць была характэрнай рысай Літоўскай дзяржавы, але фанатычны католік Жыгімонт Ваза не любіў іншаверцаў. У такіх абставінах Леў Сапега, застаючыся па-сяброўску лаяльным і ўдзячным свайму патрону Крыштафу Радзівілу, у дзяржаўнай і палітычнай дзейнасці карыстаўся і добразычлівасцю ўладара.




*Тытульны ліст Трыбунала Вялікага княства Літоўскага. Вільня, 1586 год*

З 1589 года Леў Сапега стаў кіраўніком паноў-рады, якая фактычна ўладарыла ў вялізнай дзяржаве. Перад урадам ВКЛ у той час паўсталі важнейшыя задачы: захаваць раўнапраўе ВКЛ і Польшчы ў сумеснай дзяржаве, умацаваць прававыя асновы феадальнага грамадства, утрымаць у межах дзяржаўнай дэмакратыі шляхецкія вольнасці, якія часта пагражалі пераўтварыцца ў сапраўдную анархію, упарадкаваць палітычныя ўзаемаадносіны з Масквой і Швецыяй. На вырашэнне гэтых пытанняў новы канцлер і скіраваў усе свае сілы.

Аднак вырашаць іх было ўсё цяжэй. Гэтаму перашкаджалі каралеўскія ўлады і імкненні польскіх магнатаў гаспадарыць у ВКЛ. Усё менш рэзультатыўная дзейнасць сойма паралізоўвала вырашэнне канкрэтных дзяржаўных спраў. Незацугляная шляхецкая дэмакратыя разбурала падмурак самой дзяржавы. Аднак Леў Сапега і ў такіх умовах, па-майстэрску манеўруючы між інтарэсамі розных бакоў, адмысло-

ва бараніў і зберагаў дзяржаўную самастойнасць ВКЛ, мацаваў яго прававыя асновы.

Такім чынам, ужо ў самым пачатку свайго канцлерства Леў Сапега сутыкнуўся з дзвюма першымі праблемамі: зберагчы раўнапраўнае становішча краю ў саюзных узаемаадносінах з Польшчай і ўмацаваць прававыя асновы дзяржаўнасці. 28 чэрвеня 1591 года кароль Жыгімонт Ваза па прапанове вышэйшых польскіх сенатараў, без згоды паноў-рады ВКЛ прызначыў Кракаўскім епіскапам віленскага епіскапа кардынала Юрыя Радзівіла (Lietuvių enciklopedija T. 24: 382—385; Пташицкий 1893: 197). Гэты адзін з магутнейшых саноўнікаў, сын віленскага ваяводы і канцлера, кіраўніка радыкальнай плыні Рэфармацыі ў Літве Мікалая Радзівіла Чорнага, у раннім юнацтве і сам быў кальвіністам, аднак у 1572 годзе перайшоў у каталіцтва і стаў яго самаахвяраддана абараняць ад рэфарматаў. Перабежчыкі ва ўсе часы цаніліся і добра ўзнагароджваліся.

Так здарылася і з Юрыем Радзівілам: у васемнаццаць гадоў ён віленскі пад'епіскап, у дваццаць пяць — віленскі епіскап, а ў дваццаць сем — кардынал. І нарэшце, дажыўшы да трыццаціпяцігадовага ўзросту, першым з літоўцаў быў прызначаны епіскапам Кракава (Lietuvių enciklopedija T. 24: 382—383). Аднак у гэтым выпадку і кароль, і кіруючыя колы Польшчы мелі і другую, далёка сягаючую мэту — на вызваленае месца віленскага епіскапа пасадзіць паляка, епіскапа Берасцейскага і Луцкага Бернарда Мацяёўскага (Prochaska 1892: XX, 99. Dok. № 130), абыйшоўшы 12 артыкул (Lappo 1936: 129) толькі што прынятага Трэцяга Літоўскага Статута.

Літоўскі ўрад і перш за ўсё канцлер Леў Сапега запярэчылі такому аднабаковаму рашэнню. Пасля доўгіх перамоў у 1595 годзе канцлер Кароны Ян Замойскі, калі Леў Сапега быў у Варшаве, даслаў яму завераны сваёй пячаткай напісаны каралём рэкамендацыйны дакумент, у якім была просьба да папы Рымскага зацвердзіць Бернарда Мацяёўскага віленскім епіскапам (Prochaska 1892: 108—109. № 138).

Справа ў тым, што ўсе акты караля Польшчы і вялікага літоўскага князя набывалі моц закона толькі тады, калі іх завяраў сваёй пячаткай канцлер або падканцлер. І ў гэтым выпадку канцлер Леў Сапега адмовіўся паставіць пячатку на тым каралеўскім дакуменце. Не дапамаглі нават запэўніванні Яна Замойскага, быццам бы гэтаму не супярэчыць Крыштаф Радзівіл, віленскі ваявода, вышэйшы, як ужо было згадана, упаўнаважаны ВКЛ.

У такой складанай сітуацыі Леў Сапега дзейнічаў асцярожна і дыпламатычна, імкнучыся пазбегнуць сур'ёзных супярэчнасцей у адносінах з Жыгімонтам Вазай. Адразу ж пасля сустрэчы з Янам Замойскім 7 мая 1595 года ў лісце да Крыштафа Радзівіла ён прасіў яго выказаць сваю думку па гэтаму пытанню і даў вельмі дыпламатычную параду:

> [...] цяпер, калі наш літовец стаў кракаўскім епіскапам, трэба было б парадак адным разам навесці, і гэта толькі пры строгай умове ды праз пастанову сойма, каб у будучым не было ніякіх сумненняў наконт таго, што як і епіскапства, так і другія бенефіцыі заўсёды назначаліся па згодзе ў Літве літоўскага народа, а ў Польшчы — польскага (Prochaska 1892: 108—109. Dok. № 139)*.

Як бачна з другога ліста Льва Сапегі да Крыштафа Радзівіла, апошні пагадзіўся з яго думкай, толькі раіў вырашыць гэтае пытанне яшчэ болей рашуча: пад пагрозай пакарання забараніць літвінам займаць пасады ў Польшчы, зрабіўшы адзінае выключэнне для Юрыя Радзівіла (Prochaska 1892: 109—110. Dok. № 140), а палякаў не прызначаць ні на якія пасады ў ВКЛ. Адказваючы Крыштафу Радзівілу, Леў Сапега ў лісце пісаў, што такая прапанова яму вельмі падабаецца (Prochaska 1892: 110). І трэба сказаць, што ён, не звяртаючы ўвагі на націск караля і кіруючых вярхоў Польшчы, трымаўся цвёрда і не заверыў пячаткай памянёны каралеўскі дакумент.

Аднак гэты канфлікт з цягам часу абвастраўся. 25 студзеня 1596 года Леў Сапега пісаў Крыштафу Радзівілу:

> Так з гэтым віленскім епіскапствам мы не пагадзіліся [з палякамі. — *С. Л.*], лепей бы яно не было вакантным... (Prochaska 1892: 125. Dok. № 153).

Кароль і вышэйшыя польскія чыноўнікі ўсё націскалі на Льва Сапегу і нават пагражалі, патрабуючы паставіць пячатку на каралеўскім дакуменце, але ён не даваў сябе ўгаварыць. Тады палякі пайшлі на крайнюю меру — пратэкцыйны каралеўскі дакумент заверылі пячаткай Польшчы і адаслалі на зацвярджэнне папе, спадзеючыся, як лічыў Сапега, што Ватыкан не зразумее «субтыльнасцей» адносін Польшчы і Літвы ў адзінай федэратыўнай дзяржаве. Так і здарылася. Папа зацвердзіў намінацыю Бернарда Мацяёўскага на віленскае епіскапства без згоды ўрада Літвы, што выклікала бурны пратэст (Пташицкий 1893: 198).

* У арыгінале памылкова паўтораны № 138.

Між іншым, сам Бернард Мацяёўскі, вялікі дыпламат, разумеючы, што без згоды Літвы ён не зможа заняць віленскую кафедру, устрымаўся ад падарожжа ў Вільню, чакаючы адпаведнага рашэння павятовых сеймікаў. З такім яго рашэннем згадзіўся і папскі нунцый. Літоўскі ўрад, перш за ўсё дзякуючы цвёрдай пазіцыі і прадбачлівасці свайго канцлера, з гэтага супрацьстаяння выйшаў пераможцам. 26 красавіка 1600 года кароль віленскім епіскапам прызначыў віленчаніна Бенедзікта Войну. Гэту намінацыю ў той жа год 31 ліпеня зацвердзіў папа Клімент VIII (Lietuvių enciklopedija T. 34: 456). Так удалося пазбегнуць парушэння аднаго з важнейшых законаў ВКЛ, зафіксаванага ва ўсіх трох Літоўскіх Статутах (Lappo 1936: 129).

З другога боку, супраціўляцца рашэнням манарха і, больш таго, доўгі час перашкаджаць іх выкананню было небяспечна нават і для канцлера. І ўсё ж малады канцлер на гэта адважыўся, што сведчыла пра яго надзейнае становішча і вялікі вопыт дзяржаўнага дзеяча. Акрамя таго, для Льва Сапегі выкананне законаў (а яны ў гэтым выпадку былі на яго баку) было самым важным. Вядома, не трэба забывацца на тое, што ўлада караля і вялікага князя была слабай, яе абмяжоўваў той самы Трэці Літоўскі Статут. Леў Сапега разумна гэтым карыстаўся. У тым канфлікце, які працягваўся дзесяцігоддзе, ён змог дабіцца большага, чым адмены прызначэння віленскім епіскапам Бернарда Мацяёўскага. Жыгімонт Ваза пагадзіўся, што ў будучым кожны яго акт, які датычыць ВКЛ, яшчэ да свайго абвяшчэння павінен адсылацца для візіравання канцлеру ВКЛ.

Прынцыпова абараняючы інтарэсы ВКЛ, Леў Сапега разам з тым наладзіў дзелавыя і сяброўскія сувязі з каралеўскім палацам ды ўладнымі вярхамі Польшчы — пра гэта сведчыць багатая перапіска. Ужо ў першае дзесяцігоддзе свайго канцлерства ён толькі ад Жыгімонта Вазы атрымаў дзевяноста тры лісты і сам некалькі разоў пісаў каралю, таксама пятнаццаць лістоў адаслаў Яну Замойскаму, пісаў і другім польскім вяльможам (Prochaska 1892: XXIII—XXIV).

Асабліва сяброўскія адносіны, якія падтрымліваліся перапіскай, завязаліся з аўдавеўшай, але ўсё яшчэ вельмі ўплывовай каралевай Ганнай Жыгімонтаўнай, жонкай нябожчыка Стэфана Баторыя, якая вельмі часта падтрымлівала Льва Сапегу ў палітычнай барацьбе і заступалася за яго перад сваім пляменнікам Жыгімонтам Вазай.

Такая дзяржаўная і палітычная дзейнасць дзеля абароны інтарэсаў Літоўскага краю, дыпламатычная гнуткасць ды прадбач-

ліваe манеўраванне ў адносінах з каралеўскім палацам узвысілі аўтарытэт Льва Сапегі і сярод саноўнікаў ВКЛ.

У апошнім дзесяцігоддзі XVI стагоддзя надарылася новая магчымасць для такога манеўра. З прычыны намеру Жыгімонта Вазы завязаць сяброўскія адносіны з Германскай імперыяй і падмацаваць іх шлюбам з Ганнай Габсбургскай, пляменніцай эрцгерцага Карла, узнік сур'ёзны канфлікт паміж каралём і ўладнымі структурамі, якімі кіраваў канцлер Кароны і гетман Ян Замойскі. У сваім доўгім і добразычлівым лісце ад 30 ліпеня 1590 года да Льва Сапегі манарх прасіў яго парад і дапамогі ў асабістых справах, звязаных з будучай жаніцьбай на Ганне: аб тратах на вяселле, пра ўвесь цырыманіял і нават пра такія утылітарныя і зямныя рэчы, як выдзяленне будучай жонцы вена з часткі землеўладанняў вялікага князя ў ВКЛ. Па гэтаму пытанню ён пісаў:



*Касцёл Св. Казіміра ў Вільне да перабудовы 1864—1867 гг. пад праваслаўны сабор св. Мікалая. Заснаван у 1596 годзе пры фінансавай падтрымцы Жыгімонта II і Льва Сапегі*

> А маючы на ўвазе тое, што трэцяя частка вена павінна быць выдзелена з [уладанняў] Вялікага княства Літоўскага, у якіх стараствах або дзяржаннях на гэты час можна зрабіць тое... (Prochaska 1892: 60).

Леў Сапега даў каралю неабходныя парады і разам з панамі-радай памірыў яго ў канфлікце з большасцю польскіх сенатараў. Цяпер, падтрыманы вярхамі ВКЛ і не звяртаючы ўвагі на польскіх паноў, кароль уступіў у шлюб з Ганнай Габсбургскай. Натуральна, што за такую дапамогу канцлера ВКЛ чакалі каралеўскія міласці і новыя ўзнагароды.

Аднак падзеі, якія неўзабаве распачаліся, зноў размежавалі караля з дзяржаўнымі інтарэсамі ВКЛ.

У 1592 годзе памёр бацька Жыгімонта Вазы кароль Швецыі Ян. Жыгімонт Ваза, падтрыманы ўладнымі структурамі Польшчы, заявіў прэтэнзіі на шведскую карону, аднак шведскія феадалы падтрымалі кандыдатуру брата памёршага караля Карла. Узнікла рэальная пагроза вайны са Швецыяй. Леў Сапега рашуча засупярэчыў такой авантуры караля, вялікага князя і польскіх магнатаў.

Калі Жыгімонт Ваза з вялікай світай вышэйшых асоб у маі 1593 года паехаў у Швецыю дамагацца трона (Dundulis 1977: 14), Леў Сапега, прыкінуўшыўся хворым, пазбавіў сябе ад удзелу ў гэтай пройгрышнай для Літоўскай дзяржавы місіі. Ён добра разумеў, што намеры Жыгімонта Вазы заняць шведскі трон могуць выклікаць вайну Рэчы Паспалітай са Швецыяй, а тады панясуць страты перш за ўсё ўладанні ВКЛ.

Канцлер і ў гэтым выпадку не сядзеў, склаўшы рукі, а імкнуўся ўплываць на ход падзей праз свайго спецыяльнага пасыльнага і праз шведскую каралеўну Ганну, сястру караля, з якой ён завязаў сяброўскія адносіны і перапіску, уважліва сачыў за гэтымі падзеямі (Prochaska 1892: 117. № 148; 133—134. № 159).

Прадбачанні Льва Сапегі, на вялікі жаль, цалкам спраўдзіліся. Узыходжанне Жыгімонта Вазы на шведскі трон у 1594 годзе і такім чынам створаная персанальная унія Рэчы Паспалітай са Швецыяй у рэшце рэшт прынесла краіне, і перш за ўсё Літве, доўгую вайну і нягоды. У 1594 годзе Жыгімонт Ваза шведскім рыгстагам быў пазбаўлены шведскага трона і новы шведскі кароль Карл IX, дзядзька Жыгімонта Вазы, высадзіўся з войскам у Прыбалтыцы і заняў усю тэрыторыю сучаснай Эстоніі і частку Латвіі.

Льву Сапегу, як аднаму з кіраўнікоў ВКЛ, цяпер давялося актыўна ўдзельнічаць у ваенных дзеяннях супраць шведаў. І даючы парады вялікаму гетману ВКЛ Крыштафу Радзівілу Перуну ды нават гетману Кароны, і плацячы са сваіх сродкаў утрыманне наёмнаму войску, і непасрэдна ўдзельнічаючы ў ваенных дзеяннях, ён унёс значны уклад у разгром шведскага войска (Prochaska 1892: 299. № 359; 449. № 550; 468. № 567; 471. № 575; 471—472. № 576). Як бачна з яго лістоў да Крыштафа Радзівіла, вярнуўшыся з другой місіі ў Маскве (пра гэта будзе сказана пазней), Леў Сапега адразу ж, ужо восенню 1601 года, не шкадуючы сродкаў, якія атрымоўваў з вялізных уладанняў, сфарміраваў поўны вайсковы корпус, які са сцягам Сапегі змагаўся ў бітвах пры Валміеры, Пярну, Тарту і іншых гарадах Эстоніі (Prochaska 1892: 300—302. № 361, 362).

Намаганні Льва Сапегі і другіх кіраўнікоў ВКЛ далі станоўчыя вынікі. У 1605 годзе Літоўскае войска, лкое ўзначальваў новы вялікі гетман Ян Карл Хадкевіч (Prochaska 1892: 401. № 480)*, дамаглося значнай перамогі ў бітве са шведамі каля Кірхсгольма (Саласпілса). Гэтая перамога, праўда, не азначыла канец вайны, і шведы яшчэ канчаткова не пакінулі Прыбалтыку, але іх агрэсія на некаторы час была прыпынена.

Распачаўшы ў 1599 годзе вайну са Швецыяй, неабходна было палепшыць адносіны з Масквой. І зноў, як у 1584 годзе, гэта надзвычай важная дзяржаўная місія даручаецца Льву Сапегу, цяпер ужо ва ўсёй Рэспубліцы вядомаму дзяржаўнаму дзеячу і майстру дыпламатыі (VUMB RS. F. 59—13. L. 27v). У гэта цяжкае падарожжа ён як кіраўнік пасольства Літвы адбыў 27 верасня 1600 года.

У склад дэлегацыі ўвайшлі таксама варшаўскі кашталян Станіслаў Варшыцкі і пісар ВКЛ Эльяс Пілігрым, іх суправаджала світа паслоў, у якой у большасці былі сваякі Льва Сапегі: віцебскі ваяводзіч Ян Сапега, суддзя Аршанскай зямлі Андрэй Варапай, усвяцкі староста князь Яраслаў Друцкі-Сакалінскі і Мікалай Пранцкевіч-Радзімінскі (Sapiehowie 1890: 164—165).

Гэта місія падрабязна апісана адным з яе ўдзельнікаў, Эльясам Пілігрымам (Trebicki 1846; Brukner 1896: 78—96, 254—275, 412—442).

З аўтэнтычнай крыніцы, ліста самога Льва Сапегі ад 16 сакавіка 1601 года, што быў своеасаблівай справаздачай для канцлера Кароны і гетмана Яна Замойскага, вядома, што перамовы былі вельмі цяжкімі, асабліва напачатку. Новы маскоўскі цар Барыс Гадуноў быў не такім лёгкім на згоду, як яго папярэднік. Літоўская дэлегацыя прыехала ў Маскву 16 кастрычніка 1601 года, а цар прыняў яе толькі 26 лістапада. Акрамя таго, яе трымалі ў суровых умовах.

У тым лісце Леў Сапега пісаў:

> Прыехаўшы да Масквы 16 кастрычніка мінулага года, былі мы ў пасольскім палацы пад такой вялікай аховай, што ні за вароты нам выйсці, ні маскоўскай варце з пасламі размаўляць не дазвалялі, і толькі пасля настойлівых нашых зваротаў ледзьве праз шэсць тыдняў па нашым прыездзе да рукі вялікага князя [цара Барыса. — *С. Л.*] дапушчаны былі (Prochaska 1892: 258. № 315).

---

* Ян Карл Хадкевіч, які яшчэ ў 1602 годзе камандаваў Задзвінскім войскам, што змагалася са шведамі, стаў вялікім гетманам ВКЛ у пачатку 1605 года пасля смерці Крыштафа Радзівіла Перуна 20 лістапада 1603 года.

Аднак калі перамовы пачаліся, маскоўская дэлегацыя, у якую ўваходзілі Іван Тацішчаў, Сцяпан і Іван Гадуновы ды іншыя, усяляк іх зацягвала, імкнулася выйграць час. Леў Сапега адразу ж выказаў сваю вядомую праграму «вечнага міру», што магла б вырашыць і такія важнейшыя пытанні, актуальныя і для сучаснай дыпламатыі, як, напрыклад, свабоднае перамяшчэнне для грамадзян абодвух бакоў па іх тэрыторыі, свабода веравызнання і інш. Напачатку маскоўская дэлегацыя нават і не збіралася сур'ёзна абмяркоўваць гэтую праграму, а скіроўвала размову ў бок чыста працэдурных пытанняў і дыскусій наконт тытулаў уладароў.

Гэтую пазіцыю растлумачыў сам Леў Сапега ў згаданым лісце да Яна Замойскага:

> Масква марудзіць, чакаючы завяршэння вайны Рэспублікі з Балахіяй і Малдовай, а таксама прыбыцця шведскай дэлегацыі. Масква спадзяецца, што ёй пашчасціць утварыць нават саюз са Швецыяй супраць Рэспублікі (Prochaska 1892: 258—259).

Шведская дэлегацыя з'явілася толькі 16 лютага 1601 года. Урад Масквы свядома дэманстраваў сяброўскі і пампезны прыём шведаў. Пра гэта Леў Сапега пісаў:

> Правялі іх [шведскіх паслоў. — С. Л.] спецыяльна побач з домам нашага пасольства, і нашым людзям даручана было выйсці за вароты і глядзець на іх, і прытулак ім таксама недалёка ад нас далі, каб мы пра іх ведалі... (Prochaska 1892: 259).

Аднак час працаваў на карысць паслоў Рэспублікі, якімі кіраваў Сапега, і ён, цалкам у гэтым упэўнены, памяркоўна працягваў перамовы. Напрыканцы 1600 года войска гетмана Яна Замойскага разбіла валашскага ваяводу Мікалая, з якім звязваў свае надзеі ўрад Масквы. Праўда, гэта радасная вестка дайшла да Льва Сапегі і іншых літоўскіх паслоў толькі 11 лютага 1601 года. Маскве не ўдалося заключыць прымальны саюз са Швецыяй, якая аднолькава прэтэндавала на землі і маскоўскай дзяржавы, і Рэспублікі (Prochaska 1892:259).

Пасля доўгіх і цяжкіх перамоў Льву Сапегу ўдалося рэалізаваць, хоць і не цалкам, сваю праграму доўгатэрміновага міру з Масквой. Мір быў падпісаны яшчэ на дваццаць гадоў пасля заканчэння дзеяння ранейшай мірнай дамовы, на тых жа самых умовах: «а [...] дзеля вечнага міру будуць вясціся перамовы паміж абодвума бакамі праз паслоў» (Prochaska 1892: I: 259). Акрамя таго, у новую дамову

быў уключаны важны пункт пра свабоду гандлю. Гэты пункт Леў Сапега, як засведчана ў крыху пазнейшым яго лісце да Крыштафа Радзівіла, лічыў вельмі важным і пільна сачыў, каб абодва бакі яго прытрымліваліся (Пташицкий 1893: 220—221).

Увагі і энергічнай дзейнасці канцлера пастаянна патрабавалі не толькі знешняя палітыка, але і ўнутраныя справы дзяржавы. У гэты час у краіне, асабліва на тэрыторыі сучаснай Беларусі, пашыраўся антыфеадальны рух народных мас, часткова звязаны з рэлігійным супрацьстаяннем. У ім вельмі актыўна ўдзельнічалі ніжэйшыя слаі казацтва, якім кіраваў Севярын Налівайка. Паўстанцы ў 1595 годзе здолелі захапіць нават такія параўнальна вялікія гарады, як Бабруйск, Магілёў, Слуцк (История Польши 1956: 244—245).

Становішча для ўрада краю і феадалаў рабілася ўсё больш небяспечным. У гэтым выпадку Леў Сапега, як і належала вышэйшаму кіраўніку ўрада феадальнай дзяржавы, дзейнічаў рашуча і бязлітасна. 26 студзеня 1596 года ў лісце віленскаму ваяводзе Крыштафу Радзівілу, адасланым з Кракава, ён пісаў:

> Пра тую досыць сумную трагедыю з Налівайкам атрымаў поўнае ўяўленне з лістоў Вашай Княжацкай Светласці і ад тых, хто сюды прыязджае. [...] Як раней гэта разумеў, так і зараз лічу, не трэба было напачатку гэтага недаацэньваць, а лепей было б не шкадаваць усяго прызыву [у войска. — *В. Л.*], а сабраўшы дастаткова коннага і пешага войска даць адпор гэтаму нягодніцтву [...] і пакараць Налівайку з яго пасобнікамі... (Prochaska 1892: 125. № 153).

Паўстанне было жорстка падаўлена. Севярын Налівайка, якому напачатку пашчасціла адысці назад на Украіну, быў разбіты сіламі больш мабільнай рэгулярнай арміі Кароны пад камандаваннем гетмана Станіслава Жалкоўскага, узяты ў палон і пакараны смерцю ў Варшаве (История Польши 1956: 245). Таксама бязлітасна, але ўжо па загаду Льва Сапегі, было падаўлена паўстанне мяшчан Магілёва ў 1606 годзе.

Нямала намаганняў прыклаў Леў Сапега, каб дасягнуць згоды ўсіх трох канфесій у краі. Асабліва шмат ён зрабіў, ажыццяўляючы Берасцейскую царкоўную унію 1596 года, агітуючы на яе карысць на соймах, за што 9 чэрвеня 1606 года атрымаў асабістую падзяку ад папы Паўла V (Prochaska 1892: 498. № 609).

Другая вельмі складаная падзея ў гісторыі Рэчы Паспалітай, стаўшая сур'ёзнай праверкай кампетэнцыі Льва Сапегі як дзяржаўнага дзеяча, была ўзброеная апазіцыя шляхты каралю (ро-

каш), якую ўзначальваў кракаўскі ваявода Мікалай Зебжыдоўскі і сын Крыштафа Радзівіла Перуна Януш. Напачатку 1606 года пагроза грамадзянскай вайны была зусім рэальнай. Раздаваліся галасы, патрабаваўшыя скінуць Жыгімонта Вазу, які абвінавачваўся ў памкненнях да абсалютызму (История Польши 1956: 248—249). Леў Сапега ў адносінах да ракашоўцаў заняў асцярожную пазіцыю. Спачуваў ім і абараняў іх, у той жа час аднак ухвапяючы уладу манарха, але адкрыта ракашоўцаў не падтрымліваў, імкнуўся быць міратворцам паміж імі і каралём (Sapiehowie 1890: 168).

Напрыканцы 1604 года на палітычнай арэне ўзнік беглы манах Грышка Атрэп'еў, які ўвайшоў у гісторыю як уяўны царэвіч Дзмітрый. Леў Сапега з самага пачатку з асцярогай глядзеў на гэтага самазванца, хоць разумеў, што ўладныя структуры Рэспублікі і сам кароль могуць выкарыстаць гэтую палітычную фігуру і разбурыць так цяжка здабыты ім дваццацігадовы мір з Масквой. Ужо 10 лістапада 1604 года, паведамляючы новаму віленскаму ваяводзе Мікалаю Радзівілу Сіротцы пра з'яўленне так званага Дзмітрыя і пра магчымы вынік той дапамогі, якую яму аказалі асобныя польскія магнаты, Леў Сапега з горыччу пісаў:

> Ой, сутыкне нас пан ваявода Сандамірскі [Ежы Мнішак. — *С. Л.*] заўчасна з Масквой; ці пашчасціць нам тут, ці не, аднак жа бяду для айчыны і для нас накліча (Пташицкий 1893: 222, ADR 1885: 233. № XLV).

З гэтага ліста бачна, што Леў Сапега не падтрымаў самазванца, авантура якога быша варожай яго грандыёзнай праграме стварыць аб'яднаную дзяржаву ВКЛ — Польшчы — Масковіі з адзіным манархам.

Мала таго, калі пасля краху авантуры Ілжэдзмітрыя асобныя сенатары пачалі абвінавачваць каралеўскую ўладу, Леў Сапега на Варшаўскім сойме выступіў з доўгай і гарачай прамовай, у якой, абараняючы караля, усю віну звярнуў на Ежы Мнішака, Адама Вішнявецкага і іншых польскіх магнатаў (Любавский 1915: 3—7).

Хада гісторыі ўсё роўна зацягнула Рэч Паспалітую ў вайну з Масквой, што афіцыйна было абвешчана ў сакавіку 1609 года (История Польши 1956: 250). Леў Сапега са сваім уласным войскам вельмі актыўна ўдзельнічаў у ваенных дзеяннях, у тым ліку і ў асадзе Смаленска. Пішучы ў 1611 годзе каралеве Канстанцыі з-пад абложанага Смаленска, ён запэўніваў, што не адмовіцца ад «пачатай справы», даб'ецца захопу Смаленска (Kognowicki 1790:

380; Sapiehowie 1890: 169). І сапраўды Смаленск быў захоплены ў тым жа годзе.

Гэтая вайна, зацягнуўшаяся амаль на дзесяцігоддзе і добра вядомая ў гісторыі, захопам Смаленска і нават Масквы не закончылася для Рэспублікі. Народ і без маскоўскага цара змагаўся з інтэрвентамі. Варшаўскі сойм у 1616 годзе прыняў пастанову прадоўжыць вайну пад кіраўніцтвам каралевіча Уладзіслава Вазы, які яшчэ ў лютым 1610 года паводле змовы з баярскімі прадстаўнікамі так званага «Тушынскага лагера» быў прызнаны маскоўскім царом (История Польши 1956: 250). Здавалася, што ўжо набліжаўся час здзяйснення памянёнай грандыёзнай праграмы Льва Сапегі, што будзе створана аб'яднаная дзяржава Літвы — Польшчы — Масковіі.

Леў Сапега, надзвычай ужо асцярожны палітык, поўнасцю аддаўся ажыццяўленню ў сапраўднасці нерэальнай праграмы, непасрэдна ўдзельнічаў у адноўленай вайне, выдаткоўваў на яе вялікія асабістыя сродкі. У гэтым разе дзяржаўныя інтарэсы ВКЛ супалі з асабістымі маёмаснымі інтарэсамі самога Льва Сапегі, таму што значная частка яго буйных латыфундый была ў Смаленскай і Северскай землях (Sapiehowie 1890: 168). Ён быў не толькі важным удзельнікам гэтага ваеннага паходу на Маскву, але і фактычна яго ўзначальваў:

> [...] канцлер Сапега быў прызначаны камісарам [каралевіча Уладзіслава. — *С. Л.*] з той мэтай, каб каралевіч Уладзіслаў у асабліва важных справах не прыймаў ніякіх рашэнняў, не параіўшыся з ім (Sapiehowie 1890: 171).

Вынікі гэтай вайны вядомы. Рэч Паспалітая не змагла перамагчы і пасадзіць каралевіча Уладзіслава на маскоўскі прастол. Такім чынам, і на гэты раз праграма Льва Сапегі не бьша да канца рэалізаваная, аднак вынікі вайны для ВКЛ былі вельмі прымальнымі. 3 студзеня 1619 года было падпісана Дэўлінскае перамір'е, згодна якому Смаленская і Северская землі зноў адышлі да ВКЛ, а Рэч Паспалітая адмовілася ад прэтэнзій на маскоўскі трон (История Польши 1956: 251; Lietuvos TSR istorija 1985: 167). У такім спрыяльным для ВКЛ завяршэнні вайны была вялікая заслуга Льва Сапегі і як ваеннага дарадчыка каралевіча, і як дыпламата, і як аднаго з заможнейшых вяльмож ВКЛ, які «паўторна заплаціў затрыманае жалаванне войску [...] з асабістых сродкаў» (Sapiehowie 1890: 171). Калі пачаўся падзел адваяваных земляў, на іх заявілі прэтэнзіі і польскія магнаты. Аднак Леў Сапега на сойме

рашуча запратэставаў супраць таго, каб землі ВКЛ былі аддадзены палякам. Так перагарнулася гэтая вельмі важная ў гісторыі жыцця і дзяржаўнай дзейнасці Льва Сапегі старонка.

Набліжаліся іншыя, не меней важныя і небяспечныя для Рэчы Паспалітай, і асабліва для ВКЛ, падзеі, якія запатрабавалі ад яе дзяржаўных асоб вялікай мудрасці і цвёрдага самавызначэння. Распачалася новая вялікая вайна, вядомая ў гісторыі пад назвай Трыццацігадовай. Яе развязала не Рэспубліка, а дзяржавы Еўропы, якія размежаваліся на дзве групоўкі: першую, названую Каталіцкай лігай (Аўстра-Венгрыя, Іспанія і каталіцкія княствы Германіі), да якой далучылася і Рэспубліка, і другую — так званую унію Евангелістаў (Англія, Данія, Галандыя, Швецыя і пратэстанцкія княствы Германіі), з якой уступіла ў саюз каталіцкая Францыя. Да гэтай вайны імкнуліся перш за ўсё Габсбургі, якія ўладарылі ў Аўстра-Венгрыі і Іспаніі, а таксама Францыя, Англія і асабліва Швецыя, якая спадзявалася захапіць прыбалтыйскія землі, што ў той час належалі ВКЛ і Польшчы, пашырыць сваю тэрыторыю і пераўтварыць Балтыйскае мора ў «шведскае».

Леў Сапега прадбачыў менавіта такі ход падзей у гэтай вайне і пераконваў караля ўстрымацца ад ўдзелу ў ёй. На жаль, партыя прыхільнікаў караля была мацнейшай, і Рэспубліка ўвязалася ў гэтую згубную для яе вайну. Як і прадбачыў Леў Сапега, у асабліва цяжкі для Рэспублікі момант, калі Польшча ваявала з туркамі каля Хоціна, у 1621 годзе ваяўнічы шведскі кароль Густаў II Адольф распачаў імклівы наступ у Прыбалтыцы і заняў амаль усю Курляндыю, а ў верасні — і Рыгу. У гэтым паражэнні быў абвінавачаны брат жонкі Льва Сапегі Крыштаф Радзівіл Малодшы (Lietuvos TSR istorija 1985: 163).

Аднак на самой справе Рэспубліка проста не мела магчымасці ваяваць на два франты. Леў Сапега паводзіў сябе вельмі асцярожна і не спяшаўся непасрэдна ўблытвацца ў гэтую вайну. У тым самым 1621 годзе 28 верасня ў Хоціне памёр віленскі ваявода і вялікі гетман Ян Карл Хадкевіч (Sapiehowie 1890: 173)*. На вышэйшую ў Літоўскай краіне пасаду віленскага ваяводы ў тым жа годзе быў прызначаны 65-гадовы Леў Сапега (Sapiehowie 1890: 173)**.

Жыгімонт Ваза гэтым прызначэннем не толькі адзначыў вялікія заслугі Льва Сапегі перад дзяржавай, але і спадзяваўся на больш значную яго дапамогу ў вайне са шведамі ў Прыбалтыцы.

---

* Паводле іншых дадзеных, 24 верасня (Wolff 1885: 151).

** Памыляюцца тыя, хто называе 1623 год (напрыклад, Wolff 1885: 74).

Аднак падзеі заблыталіся так, што Леў Сапега і без гэтага быў вымушаны прыняць удзел у той вайне. Інтэрвенты займалі ўсё новыя тэрыторыі, захапілі ўсё Задзвінне і наблізіліся да самых межаў ВКЛ. Палявы гетман Крыштаф Радзівіл Малодшы увесь час адступаў, у войску зусім не стала дысцыпліны і парадку, ваярам не плацілі жалаванне, яны проста галадалі і ўцякалі з поля бою. У тыя дні Леў Сапега рабіў усё, каб усталяваць дысцыпліну і зноў, як у час вайны з Масквой, заплаціў войску жалаванне са сваіх сродкаў (Sapiehowie 1890: 175). Як чалавек у гадах, ён не мог ужо спраўляцца на дзвюх вышэйшых пасадах ВКЛ, таму 3 лютага 1623 года адмовіўся ад абавязкаў канцлера. Па яго рэкамендацыі канцлерам ВКЛ быў прызначаны Альберт Станіслаў Радзівіл, сын Алыкскага князя Станіслава Багамола, унук Мікалая Чорнага (Sapiehowie 1890: 173).

Тым часам вайна са Швецыяй усё ўскладнялася. Шведскае войска, заняўшы ўсю тэрыторыю сучаснай Латвіі, увайшло ў Літву і захапіла Біржай. Склалася крытычная сітуацыя. Вышэйшыя ўлады Кароны і сам Жыгімонт Ваза ўсе надзеі звязалі зноў са Львом Сапегай, яго скарбамі, дзяржаўнымі і дыпламатычнымі здольнасцямі. У гэтыя цяжкія для дзяржавы часы ён як віленскі ваявода ў 1625 годзе быў прызначаны і вышэйшым кіраўніком войска, г.зн. вялікім гетманам ВКЛ. На гэтую найвышэйшую вайсковую пасаду ён быў прызначаны

> [...] не так з-за таленту палкаводца, як па прычыне незлічоных скарбаў... (Sapiehowie 1890: 174).

Другім выпадкам, адчуваючы ношу гадоў, шасцідзесяцівасьмігадовы Леў Сапега ад гэтых вышэйшых вайсковых абавязкаў мог бы, вядома, адмовіцца, але, улічваючы трагічнае становішча дзяржавы, згадзіўся. Кіраўніцтва супраціўленнем шведскай інтэрвенцыі было, можна сказаць, апошнім подзвігам Льва Сапегі на карысць ВКЛ. Праўда, у нашай гістарычнай літаратуры сустракаюцца і негатыўныя ацэнкі гэтай яго дзейнасці. Сцвярджаецца, што прызначэнне Льва Сапегі вялікім гетманам ВКЛ

> [...] толькі пашкодзіла абароне Літвы, пагоршыла ўзаемаадносіны людзей, якія былі адказнымі за яе абарону (Tyla 1986: 178)*.

---

* Іншыя даследчыкі высока ацэньваюць асобу Льва Сапегі і яго заслугі перад Літоўскай дзяржавай (Kuolys 1992: 204, 209, 227—228).

Тут зноў паўстае вечнае пытанне гістарычнай навукі пра ролю асобы ў гісторыі. Ці асобы твораць гістарычны працэс і кіруюць ім, ці ён узвышае ў адпаведны момант тую ці іншую асобу? Ці мог бы хто-небудзь іншы, прызначаны вялікім гетманам ВКЛ, спыніць, а тым больш разбіць у некалькі разоў буйнейшае шведскае войска на чале з вопытным і смелым воінам Густавам II Адольфам, які ў тым жа самым 1625 годзе захапіў амаль усю Лівонію? Відавочна, не мог бы, таму што шведскае войска мела столькі сілы, што праз год, летам 1626 года, увайшло на узмор'е Польшчы і Прусіі, а ў хуткім часе ўсё яго захапіла (Tyla 1986: 189). Значыць, лепшым і разумнейшым выхадам для ВКЛ было любым коштам памірыцца са шведамі. І гэта было дасягнута пераважна дзякуючы аўтарытэту Льва Сапегі (згадаем, што ён ужо быў віленскім ваяводай) і яго дыпламатычным здольнасцям. 19 студзеня 1627 года ў Балдэнмуйжы быў заключаны мір са шведамі (Tyla 1986: 191).

Акрамя таго, добрыя адносіны Льва Сапегі з каралеўскім палацам і выдатныя дыпламатычныя здольнасці дапамаглі супакоіць палякаў, якія былі вельмі незадаволены гэтым сепаратным пагадненнем. У 1627 годзе на сойме Леў Сапега ў сваей прамове абгрунтаваў неабходнасць такога міру як адзінага выйсця з напаткаўшай ВКЛ небяспечнай сітуацыі (Kognowicki 1790: 92—97; Dundulis 1977: 30).

Сапраўднай памылкай (калі бачыць гісторыю ланцугом памылак, а не ходой сапраўдных падзей) трэба лічыць не прызначэнне Льва Сапегі вялікім гетманам ВКЛ, а саму Трыццацігадовую вайну, у якую кароль уцягнуў Польска-Літоўскую дзяржаву і ад якой, як ужо сказана, Леў Сапега ўпарта адгаворваў. Гэтую вайну распачалі вялікія еўрапейскія дзяржавы, для Польска-Літоўскай Рэспублікі яна была згубнай і закончылася з вялікімі стратамі 29 верасня 1629 года Альтмаркскім мірам (Lietuvos TSR istoria 1985: 164)*.

## Глава 4
## СКАРБЫ, СЯМ'Я І АСАБІСТАЕ ЖЫЦЦЁ

Размежаваць дзяржаўную дзейнасць з асабістым жыццём у дзеяча такога маштабу, як Леў Сапега, амаль немагчыма. Усё было звязана, усё падпарадкоўвалася кар'еры, палітыцы: і асабістае жыццё, і сямейныя справы, і маёмасць. А гэтыя рэчы, асабліва

* Падрабязна пра гэтую вайну гл. История Польши 1956: 251—256.

скарбы, у сваю чаргу залежалі ад кар'еры, ад таго, як паспяхова ішло ўзыходжанне па лесвіцы дзяржаўных пасад. Жыццё нашага гістарычнага персанажа было ў гэтым сэнсе асабліва характэрным. Погляд, што пераважае ў гістарыяграфіі і паводле якога Леў Сапега такіх вышынь дасягнуў нібыта выключна толькі дзякуючы свайму таленту, няправільны. Глебу для паспяховага ўзлёту падрыхтавалі яго продкі, якія дасягнулі вельмі высокіх пасад, набылі шмат скарбаў, парадніліся з княжацкімі кланамі і завязалі сяброўскія адносіны з аднымі з самых магутных асоб Літоўскай дзяржавы — Радзівіламі.

Такім чынам, заможнасць Льва Сапегі пачалася не з нуля. Ужо згадвалася, што пры яго актыўным удзеле як самага ўплывовага ў той час прыдворнага, бацька Льва Сапегі перамог у важным судовым працэсе. І ўвогуле сямейныя справы бацькі напрыканцы яго жыцця значна палепшыліся: былі звернуты асобныя ўладанні і тытулы дзеда Яна, згубленыя падчас няміласці ўладара. Ці меў Леў Сапега якія-небудзь уласныя землі яшчэ пры жыцці свайго бацькі, невядома. Мяркуючы па запісах з Літоўскай Метрыкі, бессямейныя дзеці і нават уступіўшыя ў шлюб да смерці бацькі звычайна пэўнай часткі яго ўладанняў не мелі, а валодалі толькі ўласнасцю, нажытай самімі. З другога боку, як ужо згадвалася, яшчэ ў 1579 годзе, г.зн. пры жывым бацьку, Леў Сапега на свае сродкі сфарміраваў немалое войска, якое пад сцягам роду Сапегаў удзельнічала ў вайне супраць маскоўскай дзяржавы. Зразумела, тое войска магло быць сабрана і на бацькавы сродкі, але, верагодней за ўсё, Леў Сапега ўжо меў нейкія ўласныя ўладанні і сродкі ад вялікага князя.

Бясспрэчна вядома, што некалькі гадоў пазней пры яго пасрэдніцтве ўладар падараваў надзелы нават яго малодшым, менеій здольным і вядомым братам (Sapiehowie 1890: 186—187).

Першыя звесткі пра падзел неабсяжных уладанняў маці ў Аршанскім павеце і Віцебскім ваяводстве паміж братамі Грыгалем, аршанскім падкаморыем, Андрэем, дваранінам уладара, Львом, які толькі што стаў падканцлерам, і сёстрамі Ганнай, Сафіяй і Фядорай датаваны 1585 годам, г.зн. ужо пасля смерці маці (Sapiehowie 1890: 145).

У Літоўскай Метрыцы за 1593 год падрабязна запратакаліраваны падзел бацькавай спадчыны, які канчаткова завяршыўся ў 1591 годзе. У час падзелу Леў Сапега атрымаў: у Аршанскім павеце Стары і Новы двары ў сямейнай вотчыне Чарэі, вёскі Болатаў, Горкі, Будзілавічы, Плескачы, Клубінічы, Канстанцінава, Ляхаў,

Стараяраславічы, Рыбель, Касінічы, Карэвічы і Пілкавічы, абодва двары ў Лемніцы і Скаруцінскі маёнтачак з угоддзямі; у Полацкім ваяводстве — вялікую вёску Белая каля Лепеля, Забор'е і іншыя надзелы; у Віленскім ваяводстве — Манастыры; у Лідскім павеце — маёнтачак Лыскава з усімі ўгоддзямі і сялянамі (VUMB RS. F. 59—13. L. 11 v. — 12). Прыкладна ў той жа час ён атрымаў і немалыя дары ад вялікага князя.

Напрыклад, па прывілею ад 20 ліпеня 1586 года яму было аддадзена ў трыманне Слонімскае старасства з усімі даходамі (VUMB RS. F. 59—13. L. 4).

Ажаніўся Леў Сапега вельмі позна. Ужо дваццацішасцігадовым у лісце да Крыштафа Радзівіла Перуна ён на паўсур'ёзе пісаў:

> Ваша Міласць, у юнацтве мог дазволіць сабе кахацца [...] такое ж і пра мяне Ваша Міласць можа падумаць, а я, небарак, усё яшчэ не ведаю, дзе сяджу і ўжо сабраўся ў манастыр, бо нішто мне не міла на свеце; яшчэ да гэтай пары не навучыўся кахаць, а вучыцца ўжо позна, акрамя ж таго пры двары няма і дасканалага на тое настаўніка... (Prochaska 1892: № 3. 4).



*Палац Сапегаў у Дзярэчыне.*
*У 1685 годзе мястэчка Дзярэчын перайшло ад Палубінскіх да Сапегаў і зрабілася адной з іх галоўных рэзыдэнцыяў. Здымак да 1938 г.*

Аднак у манастыр ён не пайшоў, а праз тры гады, 1 верасня 1586 года, дачакаўшыся 29 гадоў і займаючы пасаду падканцлера ВКЛ, ажаніўся на ўдаве Дароце Збаражскай, у тым жа самым годзе пахаваўшай свайго вядомага мужа — Трокскага ваяводу князя Сцяпана Збаражскага (Sapiehowie 1890: 145). Чаму менавіта ўдава,

ды яшчэ з малой дачкой? Можа таму, што так і «не навучыўся кахаць?» Хутчэй за ўсё, гаворачы шчыра, таму што быў добра знаёмы з жыццём тагачаснай уладнай арыстакратыі, і ўсё ім было належным чынам вылічана, прадугледжаны ўсе перспектывы ўдала распачатай дзяржаўнай кар'еры. Дарота была дачкой Фірлеяў з Дамбровіц: польскага саноўніка Андрэя, Люблінскага кашталяна, і Барбары, Плоцкай ваяводзіны (Sapiehowie 1890: 145). Яна не толькі ўзняла гонар Льва Сапегі (з паловы XVI стагоддзя для вяльмож ВКЛ жаніцца на знатных палячках лічылася своеасаблівым гонарам), але і прынесла немалы пасаг.

Акрамя таго, да пасагу прыдалося вялікае вена, прызначанае буйным саноўнікам Сцяпанам Збаражскім і, здаецца, усе яго маёнткі (у сувязі з тым, што ў Дароты была дачка, а апекуна ёй нябожчык бацька не прызначыў), а таксама тытул Трокскага ваяводы, бо Дарота была не толькі дачкой радавітых бацькоў, але і трокскай ваяводзінай. Такім чынам, Льву Сапегу было дзеля чаго і каго ўступаць у шлюб. Важную ролю тут мела і тое, што Дарота была кузінай трэцяй жонкі Крыштафа Радзівіла Перуна Катрыны Тэньчыньскай (Sapiehowie 1890: 381—391. Dok. № XXV).

Сяброўства Льва Сапегі з магутнейшым Крыштафам Радзівілам працягвалася ўжо многа год, а цяпер яны яшчэ і парадніліся (Prochaska 1892: 18. № 25)*. Акрамя таго, як сведчаць скупыя крыніцы, удава была не толькі даволі прыгожай і прывабнай, але і на колькі гадоў нават маладзейшай за Льва Сапегу (Encyklopedia 1868: T. 28: 391), які засядзеўся ў халасцяках. Відаць, і не спатрэбіўся «добры настаўнік», пра якога пісаў ён у лісце да Крыштафа Радзівіла; сама служба ў каралеўскім палацы была ў гэтым выпадку лепшым настаўнікам.

Скарбы падканцлера Льва Сапегі ў той час не былі асабліва вялікімі (Sapiehowie 1890: 145), таму жончын маёмасны ўнёсак у новую сям'ю (Sapiehowie 1890: 383—390. Dok. № XXV) быў асабліва значным: вялікі Межырэчанскі двор у Берасцейскім павеце, які ацэньваўся ў 30 000 польскіх злотых, і каштоўнасці, вартасць якіх, відавочна, была не меншай. Аднак і сам Леў Сапега меў ужо хоць і не «асабліва вялікі», але даволі значны скарб, калі змог запісаць жонцы 6000 злотых са сваёй маёмасці; акрамя таго, за перайшоўшыя да Дароты ў спадчыну мацярынскія ўладанні адпісаў 9000 злотых вена (Sapiehowie 1890: 388). Верагодней усяго, яшчэ да шлюбу ён

* Пасля шлюбу Леў Сапега называў у сваіх лістах Крыштафа Радзівіла шваграм.

атрымаў права на дзяржанне Маркаўскай і Мядзельскай валасцей (Sapiehowie 1890: 147).

Такім чынам, Льва Сапегу пасля шлюбу можна было ўжо аднесці калі не да самых значных, то ўжо да дастаткова важных вяльмож. Маёмасныя асновы кар'еры былі закладзены, і пачалося няспыннае пашырэнне ўладанняў.

У тым жа 1586 годзе Леў Сапега паспяхова завяршыў судовы працэс супраць трайдзенскага старасты Пятра Стабраўскага і яго жонкі — ковельскай князёўны Фядоры Сангушкі за перадзел вялікага Абалецкага двара, які знаходзіўся ў Абалецкай валасці Віцебскага ваяводства. Яго вышэй ахарактарызаваная мудрая пазіцыя падчас выбараў Жыгімонта Вазы каралём Польшчы і вялікім князем літоўскім і заслугі пры вырашэнні другіх дзяржаўных спраў, асабліва пасольская місія ў Маскве і выданне Трэцяга Літоўскага Статута ў 1588 годзе, былі адзначаны мноствам дароў манарха, якія падрабязна пералічаны ў капітальным выданні крыніц, прысвечаных генеалогіі і маёмаснаму становішчу рода Сапегаў (Sapiehowie 1890: 147—148). Пасля гэтых паднашэнняў Леў Сапега і яго жонка Дарота сталі валодаць, цяпер ужо пажыццёва,



*Дабосна (зараз Кіраўскі раён Магілёўскай вобл.).*
*З першай чвэрці XVII ст. гэтыя землі на два стагоддзі зрабіліся ўласнасцю роду Сапегаў*

буйнымі валасцямі вялікага княства — Мядзельскай і Маркаўскай (акрамя таго, да апошняй была далучана вёска Караневічы, якая належала Астрынецкаму старасту), а таксама часткай Куранецкага часовага ўладання.

У 1588 годзе дваюрадны дзядзька Льва Сапегі ваяводзіч Навагрaдскі Андрэй Паўлавіч Сапега па тэстаменту пакінуў яму буйную частку плошчаў у сваіх дварах Ікязна, Замошша, Лужкі, Вята, Арэчы і Густат, якія знаходзіліся ў Браслаўскім і другіх паветах Полацкага ваяводства. Праз два гады ад двух братоў Андрэя Паўлавіча, Багдана і Мікалая, ён прыдбаў і застаўшуюся долю пералічаных двароў. Менавіта цяпер у руках Льва Сапегі апынуліся ўсе гэтыя неабсяжныя ўладанні (Sapiehowie 1890: 147—148). Як заўважыў той жа самы біёграф роду Сапегаў, гэтыя двары

> [...] спачатку належалі Сапегам з Кодзенскай лініі, а пазней, вядомыя пад назвай «Друйшчыны» [ад мястэчка Друя. — *С. Л*], знаходзіліся ва ўласнасці Чарэйскай лініі Сапегаў да канца XVIII ст. і нямала садзейнічалі ўзмацненню ўплыву гэтай лініі знакамітага ў Літве рода (Sapiehowie 1890: 148).



*Касцёл Св. Міхаіла ў Вільні*

Перайшоўшы ў 1586 годзе ў каталіцтва і імкнучыся засведчыць сваю шчырасць у новай веры, Леў Сапега задумаў пабудаваць у Вільні касцёл з кляштарам. З гэтай мэтай ён у 1589 годзе купіў у віленскага капітула вялікі Лепельскі двор і дабіўся зацвярджэння гэтай пакупкі ў караля; пазней гэты двор перадаў пабудаванаму касцёлу Св. Мікалая і манашкам (бернандынкам) адкрытага пры ім кляштара Св. Клары. Гэтыя яго ўчынкі праз некалькі гадоў усхваліў папа Клімент VIII (LMAB rs. F. 4—14; Sapiehowie 1890: 149, 157). У тым жа 1589 годзе Леў Сапега спазнаў першае бацькоўскае шчасце. 25 кастрычніка ў яго нарадзіўся сын, якому было дадзена імя Яна Станіслава (Sapiehowie 1891: 1). Таму можна меркаваць, што будаўніцтва касцёла і жаночага кляштара ў Вільні былі яго падзякай Богу таксама і за гэта шчасце. Будаўніцтва касцёла супала і з іншымі вельмі значнымі падзеямі ў жыцці Льва Сапегі: набраў сілу ім выдадзены і ў значнай меры створаны Трэці Літоўскі Статут, а сам ён быў прызначаны канцлерам ВКЛ (Sapiehowie 1890: 150).

У 1590 годзе Леў Сапега атрымаў ад караля новыя землеўладанні. У абмен на пабудаваную ў час Лівонскай вайны на землях яго бацькі Суражскую крэпасць кароль дазволіў яму і яго братам далучыць да іх двароў Паланай, Брэшаў, Беражвечы, Цеплякі, Чарэя, Лемніцы, Алексінцы і Басея, частку земляў стрыечнай бабулі, нябожчыцы Ганны Сапегі-Скаруцінай (сястры дзеда Яна Багданавіча Сапегі, пра якога згадвалася раней) (Sapiehowie 1890: 151). У той жа час ён атрымаў дазвол уладара пераняць Здзітаўскае староства ад яго былога ўладальніка Смаленскага кашталяна Астафія Тышкевіча і, разам з жонкай Даротай, Ёсвайнскае староства, заплаціўшы яго былому гаспадару Яроніму Квілецкаму 2000 коп грошай закладу (Sapiehowie 1890: 151).

Таксама было пашырана і яго дзяржанне Маркава, калі зямянін Мінскага ваяводства Станіслаў Садоўскі перадаў яму правы на дзве суседнія вёскі. Аўдавеўшая каралева Ганна, якая, як ужо згадвалася, заўсёды спрыяла Льву Сапегу, таксама перадала яму Блудзенскую «дзяржаву» ў Берасцейскім павеце (Sapiehowie 1890: 151—152, 394).

У тым жа 1590 годзе ў Аршанскім, Берасцейскім і іншых паветах ад Берасцейскага ваяводзіча Яроніма Гарнастая ён атрымаў долю Друцкага замка і двары Талачын, Славены, Ябланкі, Кіевец, Стараселле, Коханаў, Басея, Шышаў, Везніца, землі двара Радча і такой жа назвы фальварка (LMAB RS. F. 1—208). Акрамя таго, дзейнічаючы энергічна, ён праз суд «вызваліў» ад даўгоў і адсудзіў

ад Мысліціцкага падараваны яму дзядзькам Андрэем Сапегам вялікі двор Замошша (VUMB RS. F. 59—13. L. 13).

Невычарпальная энергія Льва Сапегі, выдатнае веданне законаў, разуменне працэсуальнага права, здольнасць ужыцца са сваякамі, пасада падканцлера, а з 1589 года і канцлера, палітычная праніклівасць і тонкая дыпламатыя ва ўзаемаадносінах з каралеўскай уладай і панамі-радай, выгадны шлюб з багатай удавой далі яму магчымасць праз некалькі год стаць уладальнікам незлічоных скарбаў, неабсяжных землеўладанняў. Аднак ні высокія пасады, ні сабраныя скарбы, ні бязмежныя землеўладанні не маглі выратаваць яго, як і ўсякага іншага смертнага, ад бязлітасных udараў лёсу. 14 сакавіка 1591 года ў Міжрэчанскім двары памерла яго любая жонка Дарота, пакінуўшы Льву Сапегу іх двухгадовага сына Яна Станіслава і дзевяцігадовую падчарку Барбару. Тэстамент Дароты, напісаны за дзевяць дзён да смерці (Prochaska 1892: 65—66. Dok. № 86; Sapiehowie 1890: 381— 391. Dok. № XXV), вызначаецца глыбокім смуткам і болем. Яна асабліва перажывае за сваю дачушку Барбару (Басю), якая застаецца круглай сіратой і якую аддае пад апеку сваёй кузіне Катрыне Радзівіл, віленскай ваяводзіне:

> *Каб толькі пан Бог маю дачушку па маёй смерці да канца не асіраціў* [тут і далей курсіў у транскрыбіраваным тэксце тэстамента — *С. Л.*]. Таму я жадаю таго, каб ад дзяцінства свайго да пары сталасці, або да таго часу, пакуль пан Бог прызначыць выбраць сябра, яна атрымала добрае выхаванне і развіццё, *прашу віленскую ваяводзіну*, Міласцівую пані і сястру, ад якой заўсёды вялікую ласку да сябе адчувала, каб Яе Міласць той жа ласкай магла адарыць маіх дзетак, асабліва тую дачушку маю Басю, каб тую Яе Міласць *нашла магчымым* з ласкі сваёй *да сябе ўзяць і яе пры сабе гадаваць*, таму што той прыстойней і найлепей за ўсё было б пры Яе Міласці (Sapiehowie 1890: 382. Dok. № XXV).

Але і тут лес вырашыў інакш: праз год памерла і Катрына Радзівіл, а Барбара, дачакаўшыся паўналецця, з вялікім пасагам, які ёй у тэстаменце пакінула маці, выйшла замуж за польскага магната, сандамірскага ваяводу Габрэля Тэньчыньскага (Sapiehowie 1890: 382. Dok. № XXV). Астанкі Дароты пасля заканчэння Львом Сапегам будаўніцтва касцёла Св. Міхаіла былі ў ім перазахаваны (Sapiehowie 1890: 152—153).

Чалавек бяссільны перад смерцю, але і смерць слабая перад неадольным рухам жыцця. Леў Сапега не толькі старанна і мудра

служыў далей на сваіх высокіх дзяржаўных пасадах, але і энергічна ды паспяхова памнажаў свае ўладанні і скарбы. Па жончынаму тэстаменту да яго адышла значная доля яе земляў, каштаваўшых, як ужо было згадана, 30 тысяч злотых. Хутка па смерці жонкі ён прыдбаў новае, можна сказаць, вялізнае землеўладанне і звязаныя з ім даходы і правы. Яго дзядзька Мікалай Сапега ў дароўным акце адпісаў яму ўвесь свой набытак. У рукі Льва Сапегі перайшла значная доля ўладанняў яго дзеда Яна Багданавіча Сапегі і адпаведных важных правоў.

Напрыклад, гэтым дароўным актам яму было дадзена права курыраваць (зразумела, і атрымліваць даходы) Чарэйскі манастыр Св. Троіцы з прыналежнымі яму вёскамі і дзвюма царквамі (LMAB RS. F. 2—61, 71, 72; VUMB RS. F. 59—13. L. llv). Цікавыя матывы Міколы Сапегі ў гэтым дароўным акце:

> [...] я, Мікалай Янавіч Сапега, ні чым-небудзь не запалоханы, ні кім-небудзь з людзей не прыняволены, а па сваёй добрай волі, усё абдумаўшы і ведаючы Яго міласці пана Льва Сапегу, канцлера Вялікага княства Літоўскага, Слонімскага, Есвайнінскага, Маркаўскага і Мядзельскага старасту, майго любага пляменніка, прыхільнасць да мяне і дабрадзейнасць, бо мяне ва ўсіх цяжкіх выпадках заўсёды аберагаў і дапамагаў мне, за гэта...» запісаў пералічаныя двары, цэрквы і ўсе велізарныя даходы (LMAB RS. F. 2—72).

І гэта не апошняе сведчанне пра дапамогу і паслугі канцлера Льва Сапегі сваім шматлікім родзічам. У тым самым 1591 годзе ён здзейсніў некалькі неабходных абменаў і атрымаў дазвол выкупіць Капыскае староства, праўда, выкупіць яго яму не пашчасціла.

У вогуле 1591 год — гэта своеасаблівы размежавальны рубеж у пашырэнні Львом Сапегам сваіх магнацкіх абшараў. Асноўныя спосабы, дзякуючы якім Леў Сапега сабраў у сваіх руках неабсяжныя землеўладанні, — гэта падзелы вотчынных земляў, выгадныя шлюбы, звязаныя са службовай кар'ерай дараванні надзелаў вялікім князем і аўдавеўшай каралевай Ганнай у поўную ўласнасць або на пажыццёвае валоданне, а таксама дароўныя акты шматлікіх сваякоў.

У той час ён ужо быў старастам або пажыццёвым дзяржаўцам такіх вялікіх і багатых староств, як Слонімскае, Мядзельскае, Маркаўскае, Здзітаўскае, Блудзенскае і Есвайнінскае, спадчыннікам мноства вотчынных двароў у Полацкім і Віцебскім ваяводствах, Браслаўскім і Лідскім паветах, уласнікам дамоў і

ўчасткаў у Вільні, куратарам некалькіх касцёлаў ды цэркваў, а некаторых і фундатарам. Аднак сквапнасць і прага да багацця ў чалавека часцей за ўсё бывае неабмежаванай. Леў Сапега быў яскравым прадстаўніком буйнай знаці свайго часу: адукаваны гуманіст, эрудыт, выдатны дзяржаўны дзеяч, але разам з тым і заўзяты набытчык скарбаў, у іншых выпадках нават сквапнік, які злоўжываў, як цяпер скажам, сваім высокім службовым становішчам, веданнем законаў, шырокімі сувязямі ў вышэйшых колах Рэспублікі і нарэшце прыхільнасцю каралеўскага палаца.

Набыццё скарбаў працягвалася. Выдатна ведаючы права ВКЛ, Леў Сапега ў 1593 годзе ў Варшаве заключыў пагадненне з Гродненскай старасцінай Ганнай Валовіч, па якому амаль задарма завалодаў двума вялікімі дварамі ў Гродненскім павеце — Харошчай і Далідамі (Sapiehowie 1890: 155, 394). Актам ад 9 жніўня 1594 года жонка нябожчыка Стэфана Баторыя, аўдавелая каралева Польшчы Ганна Жыгімонтаўна яму як канцлеру ВКЛ падарыла двор у прадмесці Варшавы, які раней быў прыватнай маёмасцю Жыгімонта Аўгуста (LMAB RS. F. 1—215).

У тым жа 1594 годзе Леў Сапега атрымаў каралеўскі прывілей на куратарства манастыром Св. Анупрыя ў Мсціслаўлі (Sapiehowie 1890: 157). Магчыма, у той жа час ён стаў старастам Свіслацкага староства, а таксама дзяржаўцам Доўгелішскай воласці, якую пазней перадаў Яну Пацу і яго жонцы, вядома ж, не за дзякуй (Sapiehowie 1890: 157). У кастрычніку таго ж года ён за 8000 злотых перадаў іншым асобам свае закладныя правы на Гродэкскі (Гарадокскі) двор у Гродненскім павеце (Sapiehowie 1890: 158). Менавіта з таго часу Леў Сапега ўжо не толькі атрымліваў ва ўласнасць за пазычаныя грошы маёнткі вялікага князя, але і сам іх ізноў аддаваў у заклад, зарабляючы на такіх аперацыях вялікія грошы.

У 1596 годзе Леў Сапега пачаў тытулавацца і старастам Рэтаўскім, хоць само староства ён у сапраўднасці атрымаў годам раней (Sapiehowie 1890: 158—159). Ён прадаваў і абменьваў свае двары, імкнуўся набыць новыя, асабліва вотчынныя. Менавіта такім чынам, пасля мноства судовых працэсаў у 1596 годзе яму ўдалося далучыць да сваёй долі ў згаданым радавым уладанні Чарэі яшчэ і іншыя часткі, якімі валодалі яго сваякі (Sapiehowie 1890: 159). У першыя дні 1597 года Леў Сапега атрымаў каралеўскі прывілей на трыманне Астрынецкай воласці з умовай, што ён выплаціць былым дзяржаўцам належныя ім сумы (Sapiehowie 1890: 159—160).



*Замак Сапегаў у Ружанах. Сучасны выгляд*

Прыйшла пара, калі Леў Сапега не толькі прымаў дарэнні і міласці вялікага князя, але і сам мог адарыць другіх. Напрыклад, у тым жа 1597 годзе набыў большую частку Цітувенскага двара, які належаў Ганне Сапежанке-Сяняўскай, а застаўшуюся частку — ад Эльжбеты Нарушэвіч, а пасля ўвесь маёнтак «уступіў» Укмергскаму стольніку Даніле Левановічу (Sapiehowie 1890: 160).

Дарыў адным, але ў той жа час адбіраў ў другіх дадзеныя ім у трыманне двары, якія раней належалі Слонімскаму старству, таму што каралеўскі прывілей даваў яму як старасце на гэта поўнае права (Sapiehowie 1890: 160—161, VUMB RS. F. 59—13. L. 5).

Напачатку 1598 года Леў Сапега як дзяржаўца Есвайнінскага старства атрымаў права аддаць яго ў заклад. У красавіку таго ж года ён становіцца дзяржаўцам вялікага і прыбытковага Магілёўскага старства, а ў чэрвені згаданага года атрымлівае каралеўскі прывілей сабраць ў Парнаўскім старстве 15 тысяч злотых нават без прадстаўлення справаздачы, што было вельмі рэдкім выключэннем (Sapiehowie 1890: 161). У 1598 годзе Жыгімонт Ваза адабраў у дваранiна Браніцкага некалькі каралеўскіх двароў, якія належалі Слонімскаму старству, і перадаў іх у пажыццёвае ўладанне Льву Сапегу (VUMB RS. F. 59—13. L. 40v).

У тым жа 1598 годзе Леў Сапега набыў у зямяніна Наваградскага павета Берташа Бруханскага за нечуваную суму ў 30 тысяч злотых два вялікіх двары — Ласосну і Ружаны з фальваркамі Белавічы

і Сідараўшчызна ў Слонімскім павеце (LMAB RS. F. 2—73; VUMB RS. F. 59—13. L. 7—17v).

Такім чынам у Слонімскім павеце ўтварыўся вялікі масіў земляў Льва Сапегі. Яго цэнтрам паступова сталі двор і мястэчка Ружаны. З ведамасці даходаў за 1611 год бачна, што Ружаны — гэта вялікі двор, які меў каля 400 валокаў зямлі і немалое па тых часах мястэчка — 316 дамоў (VUMB RS. F. 59—2. L. 5v). Неўзабаве Леў Сапега пачаў будаваць тут раскошны і велічны палац, руіны якога зараз нагадваюць Калізей.

У 1599 годзе Леў Сапега набыў за 800 коп грошай у княгіні Багданы Карсакаўны Канстанцінавай-Лукомскай двор Карэвічы з вёскамі Таўціна і Старажэвічы ў Аршанскім павеце. Праўда, гэты двор быў не надта вялікі: пяць дваранскіх дамоў, пяць сялянскіх двароў і адзінаццаць пустак (LVIA. F. 1292. Ap. 1. S. v. 7. L. 1—2; S. v. 183. L. 11—12).

З усяго гэтага бачна, што Леў Сапега ў той час распараджаўся вельмі значнымі сумамі грошай, якія маглі мець толькі вяльможы. У 1599 годзе, заплаціўшы 2,5 тысячы злотых і перадаўшы трыманне Астрыні, ён атрымаў ад свайго стрыечнага брата Мікалая Мікалаевіча Сапегі апошнюю частку Чарэйскага двара і такім чынам злучыў велізарнае радавое землеўладанне ў Аршанскім павеце, стаўшы адзіным куратарам двух цэркваў і манастыра Св. Троіцы, пабудаваных яшчэ яго продкамі (VUMB RS. F. 59—13. L. 17—18).

Леў Сапега ў канцы XVI стагоддзя стаў своеасаблівым апекуном абедзвюх ліній роду Сапегаў — Чарэйскай і Кодзенскай. Ён, будучы душапрыказчыкам нябожчыка Мікалая Паўлавіча Сапегі, кодзенскага вотчынніка і наваградскага ваяводы, не толькі апякаў яго малалетніх дзяцей, а калі яны дасягнулі паўналецця, падзяліў іх спадчыну, але і, як сцвярджае А.Тламацкі, «лічачы сябе адказным за ўвесь род Сапегаў, імкнуўся таксама дабіцца для кодзенскіх Сапегаў даходных дзяржаўных пастоў» (Тюмаскі 1996: 41)*.

Такім чынам, напрыканцы XVI стагоддзя канцлер Леў Сапега стаў адным з самых багатых саноўнікаў дзяржавы. Па смерці жонкі мінула восем гадоў, Янка ўжо дачакаўся дзесяці, а падчарка Барбара Збаражская — сямнаццаці гадоў, і ёй, як ужо было сказана, вотчым з Крыштафам Радзівілам Перуном знайшлі хоць і не першай маладосці, але вельмі прыстойнага для той пары мужа — Сандамірскага ваяводу Габрэля Тэньчынскага.

* Пра гэтую ролю Льва Сапегі таксама гл. Тюмаскі 1996: 42—46.

Леў Сапега ўступіў у сорак трэці год свайго жыцця, маладосць прайшла, пачалася самая сталая для палітычнага і дзяржаўнага дзеяча пара. Многае бышо здзейснена на карысць айчыны, шмат сабрана скарбаў, ён наблізіўся да самых багатых вяльмож Літоўскай дзяржавы. Але асабістага жыцця, так званага чалавечага шчасця ўсё ж не было: з каханай жонкай пражыў каля пяці гадоў, а пасля гэтага восем год зноў быў адзін. А што, калі паспрабаваць ізноў? І не як-небудзь, а асмеліцца параднiцца з самымі магутнейшымі вяльможамі, узняцца яшчэ на адну прыступку вышэй.

Аказалася, што і гэта магчыма. Як ужо не раз было зазначана, даўнія сяброўскія сувязі і стрыечнае сваяцтва праз жонку звязвалі Льва Сапегу са славутым Крыштафам Радзівілам Перуном. Лісты сведчаць, што гэтыя адносіны былі вельмі блізкімі (Prochaska 1892: 166, 168—169, 204—205, 208—209. № 202, 204, 205, 246, 258 ir kt.). Леў Сапега заўсёды выказваў гатоўнасць паслужыць першаму саноўніку і дыгнітарыю ВКЛ, віленскаму ваяводзе і вялікаму гетману. 20 ліпеня 1599 года Леў Сапега пабраўся з шаснаццацігадовай Гальшкай (Эльжбетай) Радзівіл, якая нарадзілася ў 1583 годзе, дачкой Крыштафа Радзівіла і нябожчыцы Катрыны Тэньчынскай.



*Эльжбета Радзівіл-Сапега (1583—1611)*

Гістарычныя крыніцы не даюць пэўнага адказу на тое, калі і як выспела двухбаковая згода на гэты шлюб. Невядома, ці сапраўды была шчаслівай шаснаццацігадовая дзяўчына ад рашэння бацькі аддаць яе, адзіную дачку, за ўдаўца не першай маладосці, але другога дыгнітарыя ў дзяржаве, які ўжо быў сваім у эліце заможнейшых саноўнікаў. А можа было тут каханне пушкінскай Марыі Качубей да мужа, які сваім розумам і справамі значна перавышаў усіх вiруючых вакол яе юнакоў? Таксама невядома. Можна толькі меркаваць, што гэта была палітычная змова, патрэбная і для дзяржавы, і для абодвух сваякоў, якія ўсё яшчэ ўздымаліся ўверх. З лістоў Льва Сапегі бачна, што ён быў шчаслівым і шкадаваў толькі, што

з-за шматлікіх важных дзяржаўных спраў прыйдзецца адкласці вяселле:

> [Пра] адклад майго вяселля, шкада падумаць, яно ўжо зацягнулася, лепей ужо яго сыграць паводле змовы ў прызначаны час, а магчыма было б і раней, я б з радасцю пагадзіўся (Prochaska 1892: 216. Dok. № 258).

Нарэшце 20 ліпеня 1599 года вяселле адбылося. Дзіўнае супадзенне, што менавіта ў гэты ж дзень Леў Сапега піша Крыштафу Радзівілу дзелавы ліст, нічога не згадваючы ні пра вяселле, ні пра маладую, дзе ў першы раз называе сябе сынам Крыштафа (Prochaska 1892: 223. Dok. № 265).

Гэты шлюб для Льва Сапегі, вядома, быў значным поспехам. Толькі адзін, характэрны для тых часоў парадокс, які паўтарыўся двойчы: у 1586 годзе, быўшы рэфарматам-кальвіністам, ён ажаніўся на шчырай каталічцы, цяпер сам, стаўшы паслядоўным католікам, узяў шлюб з дачкой нязломнага кальвініста.

Праўда, пра канфесійную прыналежнасць і веравызнанне яе самой да шлюбу нічога невядома, аднак няма сумнення, што, уступаючы ў шлюб, яна павінна быга перайсці ў каталіцтва, а пазней, відаць, і поўнасцю прыняла мужавы погляды. Ці можа яшчэ ў дзяцінстве паддалася ўплыву сваёй маці, шчырай каталічкі, якая, аднак, не змагла прылучыць да сваёй веры ні мужа, ні сына.

Паказальна, што тэстамент Эльжбеты, напісаны праз дзесятак гадоў, перапоўнены бязмежнай адданасцю каталіцкаму веравызнанню. Яна пажадала, каб адзіная яе дачушка прысвяціла ўсё сваё жыццё Пану Богу, верна яму служыла, пайшла ў кляштар і зберагла цнатлівасць (Sapiehowie 1890: 393—394. Dok. XXVI).

Раней ужо гаварылася пра верагоднае каханне маладых перад вяселлем, аднак калі ў той час маладая яшчэ яго можа і не адчула, то пазней (як бачна з яе тэстамента) цалкам спазнала. У тэстаменце Леў Сапега не называецца інакш, як «мой каханы муж», а з усіх радкоў вее вялікай павагай да мудрага мужа і цёплай любоўю да яго.

Новы шлюб прынёс у дом Льва Сапегі не толькі каханне, утульнасць і жаночую цеплыню, але і вялікія скарбы. Не кажучы пра пасаг і асабістыя каштоўнасці маладой жонкі, за Эльжбетай яшчэ было дадзена 9 тысяч 918 коп літоўскіх грошай, або 24,8 тысячы польскіх злотых (Sapiehowie 1890: 394). І гэта быў толькі пачатак, бо яшчэ не былі падзелены мацярынскія ўладанні. Леў Сапега, добра дасведчаны ў літоўскім праве, нездарма «высакародна» адмовіўся ў

акце ад чвэрці вотчынных земляў, якая належала Эльжбеце Радзівіл як адзінай дачцэ (VUMB RS. F. 59—13. L. 9v—10, 18—24).

Гэты добра разлічаны «высакародны» жэст неўзабаве акупіўся з лішкам. Бацька маладой жонкі Крыштаф Радзівіл у сваім тэстаменце адпісаў Эльжбэце ўсе матчыны ўладанні — двары Семяцічы, Езерніцу і Бліжні. Іх кошт складаў каля 60 тысяч польскіх злотых.

У сваю чаргу Леў Сапега выдзяліў маладой жонцы трэцюю частку ўсіх сваіх маёнткаў: Ласосну, Радванае, Косаў, Белавіцу ў Слонімскім павеце, Талачын, Славені, Радчу і другія двары ў Аршанскім павеце — усяго на суму звыш 33 тысяч 760 злотых (VUMB RS. F. 59—13. L. 9v—10, 18—24. P. 161)*.

Такім чынам, гэты шлюб значна павялічыў уладанні і скарбы Льва Сапегі. Аднак ён і энергічна працягваў штогод павялічваць іх (Sapiehowie 1890: 163—169). Яшчэ да 1611 года ён атрымаў ад уладара ў пажыццёвае трыманне Слонімскае лясніцтва, адзін двор па смерці Эразма Баркоўскага (у 1599 годзе), а таксама прывілей вялікага князя, паводле якога яго жонцы давалася права на трыманне Рэтаўскага і Блудзенскага старостваў. Фінансавыя магчымасці Льва Сапегі сталі такімі вялікімі, што ён мог не толькі сам набыць мноства двароў, але і даваць у пазыку наяўныя грошы.

Напрыклад, Мінскі ваявода Ян Пац 27 чэрвеня 1600 года выдаў яму пазыковы акт на 625 коп грошай (VUMB RS. F. 59—13. L. 10). Зыходзячы з ускосных сведчанняў, Леў Сапега меў шмат даўжнікоў. Аднак асноўныя фінансавыя выдаткі ён выкарыстоўваў для набыцця ўсё новых і новых двароў. 1 чэрвеня 1600 года ён набыў у зямяніна Бальцэра за 80 коп грошай двор Залеева ў Друйскай воласці (VUMB RS. F. 59—13. L. 27—27v). Праз непрацяглы час набыў у жонкі ювеліра Ероніма Вісемірскага Барбары мураваны дом у Вільні (LMAB RS. F. 1—221). Жыгімонт Ваза ў 1600 годзе пацвердзіў права Льва Сапегі на пажыццёвае трыманне Слонімскага староства з усімі ўгоддзямі (VUMB RS. F. 59—13. L. 4v).

У гэтым старастве Леў Сапега вярнуў сабе раней трыманы фальварак Ількавічы. Уладар сваім прывілеем 1611 года пацвердзіў перадачу Льву Сапегу трох вёсак у Спонімскім старастве — Перавалкі, Востраў і Шапякі, якія трымаў Гродненскі падкаморы Павел Валовіч.

З 1599 па 1611 гады Леў Сапега рознымі спосабамі здабыў у сваю ўласнасць мноства земляў. Ён купіў у 1600 годзе ў Берасцейскага зямяніна Івана Багавіціна Казерацкага Вітаражскі двор,

* У тэстаменце Эльжбеты названа другая сума (29 тысяч) і іншыя двары.

а таксама вельмі вялікія Вортальскі і Дакудаўскі двары, закладзеныя розным асобам; у князя Масальскага за невысветленую цану купіў у Браслаўскім павеце ўладанні Друя, Чурылавічы, Дздзіна і Залессе, за 12 тысяч коп грошай набыў Асвейскі двор у Віцебскага ваяводзіча Станіслава Кішкі; у Слонімскім павеце ў баярына Пуцілы, які ўцёк з Масквы, купіў вёску Ладэніцу. Кароль Жыгімонт Ваза, калі Леў Сапега быў з пасольскай місіяй у Маскве, падараваў яму ў Браслаўскім і Полацкім паветах два двары вымерших дваран Пашкевічаў — Пнеўніцу і Росіцу.

Леў Сапега распачаў на сваіх землях шырокае будаўніцтва касцёлаў і кляштароў, а таксама мастоў, мытняў і іншых аб'ектаў. Гэта ў тыя часы патрабавала вялікіх затрат, але ў будучым магло даць велізарны прыбытак*.


*Мінскі дом Сапегаў*

Адным словам, Леў Сапега стаў сапраўдным магнатам, і пачаў ужо сам дарыць іншым свае ўладанні. Кузіне Раіне Сапежанцы і яе мужу Грыгалю Трызне ён падарыў фальварак Булы ў Слонімскім старастве. Падчас згаданай пасольскай місіі ў Маскве з дазволу караля ён перадаў вёску Бароўка, што знаходзілася ў Слонімскім старастве, Слонімскаму маршалку Аўрааму Мялешцы і яго жонцы Багдане (Sapiehowie 1890: 163).

Атрымаўшы права закладу на вотчынны двор Хадкевічаў Бабры ў Аршанскім павеце, ён у 1604 годзе перадаў гэтае права Станіславу Кгалінскаму (VUMB RS. F. 59—13. L. 6). За гэтыя дванаццаць год Леў Сапега шмат сваіх земляў таксама падарыў або здаў у трыманне новым касцёлам і кляштарам. Напрыклад, 2 ліпеня 1617 года ён запісаў трыманне Ружанскага касцёла яго настаяцелям (LMAB RS. F. 3—124).

* Пра ўсе пакупкі і данацыі ўладара з 1599 па 1611 гады гл. Sapiehowie 1890: 163—169.

Аднак, як і дваццаць гадоў таму, ні багацце, ні высокія пасады, ні міласці караля не здолелі засцерагчы Льва Сапегу ад удараў лёсу. 18 кастрычніка 1611 года ў Варшаве зусім яшчэ маладой памёрла яго другая жонка Эльжбета Радзівіл, пакінуўшы дачушку Ганну і двух сыноў — Крыштафа Мікалая і Казіміра Лявона.

Льву Сапегу ішоў пяцьдзесят пяты год, як мужчына ён яшчэ не быў старым, аднак у трэці раз ужо не ажаніўся. Мажа, таму, што вельмі кахаў другую жонку, быў моцна прывязаны да застаўшыхся сіратамі васьмігадовай дачушцы Ганнулькі і двух яшчэ меншых сыночкаў.

Здароўе Эльжбеты было благім, таму яшчэ за два гады да смерці, у 1609 годзе, яна падрыхтавала падрабязны тэстамент, адпісаўшы мужу асноўную частку свайго пасагу. Але асабліва яна непакоілася і перажывала за сваю дачушку, горача жадаючы, як ужо было сказана, каб тая пайшла ў кляштар і «служыла Езусу Хрысту». Як не маркоціцца, калі дачушцы толькі шэсць гадкоў, табе толькі дваццаць шэсць, а прывід смерці няўмольна і бязлітасна глядзіць у вочы. Такім чынам, смерць зноў скасавала намеры Льва Сапегі дасягнуць сямейнага шчасця.

Аднак ніякія бядоты не зламалі рашучасці Льва Сапегі служыць Айчыне і далей пашыраць свае землеўладанні і павялічваць скарбы. Запіс у Ваўкавыскай судовай зямельнай кнізе ад 24 лютага 1614 года сведчыць, што ён у зямяніна Берасцейскага ваяводства Мартына Нямеры купіў Вяліказельвенскі двор за велізарную суму ў 40 тысяч польскіх злотых (LMAB RS. F. 1—236). Можна толькі ўяўляць, якім вялізным быў той двор.

Як згадана, Леў Сапега адыграў адну з важнейшых роляў у вайне з Масквой у 1609—1619 гады і ў падрыхтоўцы так патрэбнага Рэчы Паспалітай Дэўлінскага мірнага пагаднення ад 3 студзеня 1619 года, згодна якому ВКЛ дасталіся вялікія тэрыторыі, а таксама горад Смаленск. Гэта вайна, якая спачатку запатрабавала ад яго нямала асабістых затрат, у рэшце рэшт прынесла і карысць, таму што былі звернуты ўладанні Сапегаў на Смаленскай зямлі.

Акрамя таго, Жыгімонт Ваза, адзначаючы яго заслугі і вялікія затраты ў вайне, яшчэ ў 1615 годзе даў Льву Сапегу ў пажыццёвае трыманне Шарашоўскую воласць, у 1616 годзе — горад Бярэсце, а ў 1618 годзе на шэсць гадоў — усю вялікую Берасцейскую эканомію з усімі прыналежнымі замку ўгоддзямі (Sapiehowie 1890: 172).

Праз нейкі час за немалую суму ў 19 тысяч коп грошай Леў Сапега набыў яшчэ некалькі ўладанняў: Круглянскі і Шапялевічскі двары і частку Капыскага княства з мястэчкамі Барань і Коханава. Гэтыя яго пакупкі апратэставаў як незаконныя брат яго нябожчыцы жонкі Крыштаф Радзівіл. Справа дайшла да суда. Суд прызнаў куплю, а дакладней кажучы, продаж капыскіх землеўладанняў незаконнымі, і Льву Сапегу прыйшлося ад іх адмовіцца (Sapiehowie 1890: 172—173). Выпіска ад 24 чэрвеня 1624 года з кнігі актаў віленскага магістрата сведчыць, што ў той час у Эльжбеты Прус, удавы Альберта Лампартавіча, ён купіў агарод з пабудовамі ў Вільні за гарадской сцяной, паміж Спаскімі і Субачскімі варотамі (LMAB RS. F. 4—16). У 1629 годзе ён дамогся ад караля прывілею на Вогінцкае войтаўства, якое знаходзілася па абодва бакі Буга.

Апошнімі значнымі пакупкамі Льва Сапегі былі вялікія Бешанковічскі і Сенненскі двары, за якія ён у 1630 годзе заплаціў 100 тысяч злотых (Sapiehowie 1890: 177).

У апошнія два дзесяцігоддзі жыцця Леў Сапега энергічна абменьваў, прадаваў і закладваў свае двары, будаваў касцёлы, масты і розныя іншыя даходныя аб'екты. Тут, вядома, няма магчымасці вычарпальна пералічыць усе тыя пакупкі і атрыманыя «дзяржавы», якімі ён у некалькі разоў павялічыў свае вотчынныя абшары і стаў буйнейшым землеўладальнікам ВКЛ*. Аднак, як ужо згадвалася, ні велізарнейшыя багацці, ні ўлада не ўратавалі яго ні ад асабістых трагедый, ні нават ад даўгоў, якія ён пакінуў па смерці (Sapiehowie 1890: 402. Dok. № XXVII)**.

Дажыўшы толькі да дваццаці чатырох гадоў, у 1527 годзе памёрла дачка Ганна, праз чатыры гады па смерці любай дачкі старога ваяводу і вялікага гетмана напаткала яшчэ адна бяда: 17 жніўня 1631 года памёр яго сын Крыштаф Мікалай (Sapiehowie 1891: 13).

Ненадоўга перажыў бацьку і другі сын Ян Станіслаў, — ён памёр 10 красавіка 1635 года (Sapiehowie 1891: 11). Таму міжволі прыгадваецца пытанне, на якое здаўна спрабавалі даць адказ шматлікія філасофскія вучэнні і рэлігійныя канфесіі: а ці варта смяротнаму так апантана, не грэбуючы ніякімі сродкамі, імкнуцца да такіх велізарных багаццяў і абсалютнай улады? Ці не часова ўсё гэта і адна толькі «суета сует»?

* Уладанні Льва Сапегі пералічаны ў дадатку, хоць не ўсе з іх, на жаль, удалося лакалізаваць.

** Вялікі Чарнобыльскі двор каля Кіева коштам у 150 тысяч злотых быў прызначаны ў тэстаменце Льва Сапегі для выплаты даўгоў.

## Глава 5
# ДЗЕЦІ

14 сакавіка 1591 года памерла першая жонка Льва Сапегі Дарота, пакінуўшы сваю дзевяцігадовую дачку Барбару і іх агульнага сына, двухгадовага Яна. Леў Сапега пражыў удаўцом восем гадоў. Увесь гэты час ён не толькі самааддана служыў на самых вышэйшых дзяржаўных пасадах, энергічна збіраў скарбы і пашыраў уладанні, але і па-бацькоўску клапаціўся аб застаўшыхся без маці дзяцей. Песціў падчарку Барбару, забяспечыў ёй, як пажадала перад смерцю маці, адпаведныя для тых часоў адукацыю і выхаванне і, як ужо было згадана, выгадна выдаў замуж за польскага саноўніка. З асаблівай любоўю і цеплынёй адносіўся да малога сыночка. Клапаціўся не толькі пра яго побыт, вучобу і выхаванне, але і пра скарбы, якія маглі гарантаваць таму высокае становішча ў тагачасным грамадстве.

Ужо ў 1593 годзе ён выклапатаў свайму чатырохгадоваму сыну прывілей вялікага князя на дзяржанне Маркаўскага і Мядзельскага старастваў, якія былі аддадзены яму ў заклад, а таксама адпісаў яму Куранецкую і Карэйкавіцкую валасці. Шасцігадоваму Яну ў 1595 годзе бацька адпісаў Ёсвайнінскі двор і валасць (VUMB RS. F. 59—13. L. 5). І ў пазнейшыя гады ён не толькі займаўся выхаваннем і адукацыяй сына, наймаючы славуцейшых гувернёраў і настаўнікаў, але і павялічваў яго багацці і ўладанні (Sapiehowie 1891: 1—2). У 1605 годзе ён запісаў за ім вялікі двор Ласосна. Такім чынам Ян Станіслаў яшчэ падлеткам стаў буйным землеўласнікам. Тытул стольніка ён атрымаў у 1611 годзе. Дзякуючы бацьку ў 1612 годзе ён удзельнічаў у каранацыі новага Германскага імператара Фердынанда і атрымаў аўдыенцыю ў самаго папы рымскага Паўла V. На парозе трыццацігодцзя Ян Станіслаў Сапега ўжо быў не толькі буйным землеўладальнікам, але і значным саноўнікам — у 1617 годзе атрымаў пасаду дворнага маршалка.

Аднак малады чалавек усё яшчэ быў нежанаты, таму стаў адным з лепшых жаніхоў ва ўсёй краіне. Бацька знайшоў для яго цудоўную шлюбную партыю. Трыццаціаднагадовы Ян Станіслаў у 1620 годзе ажаніўся на дачцэ першага саноўніка Літвы, віленскага ваяводы і вялікага гетмана ВКЛ Яна Карла Хадкевіча Ганне Схаластыцы, адзінай пераемніцы незлічоных скарбаў і ўладанняў свайго бацькі. З-за гэтых скарбаў па смерці Яна Карла Хадкевіча распачаліся судовыя працэсы, якія расцягнуліся на некалькі гадоў.

На вялікую частку вотчынных уладанняў прэтэндавалі браты Яна Карла Хадкевіча — трокскі ваявода Аляксандр і канюшы Літвы Крыштаф. Працэс цягнуўся да 1625 года і завяршыўся на карысць Ганны Схаластыкі Хадкевічанкі-Сапегі і яе мужа Яна Станіслава (VUMB RS. F. 59—13. L. 6v—7). Аднак радаваліся яны нядоўга. У той жа год Ганна Схаластыка памерла і завяшчала ў тэстаменце, як і было прадугледжана ў Літоўскім Статуце, свой пасаг мужу (Sapiehowie 1891: 4, 7).

Ян Станіслаў Сапега разам з бацькам, вялікім гетманам ВКЛ, актыўна ваяваў супраць шведаў у Курляндыі і быў адным з асноўных памагатых бацькі, які кіраваў войскам ВКЛ. У 1626 годзе, адбываючы на Варшаўскі сойм, Леў Сапега даручыў сыну кіраўніцтва войскам. Кароль Швецыі Густаў II Адольф, дзейсна выкарыстаўшы гэтыя абставіны, 6 студзеня 1626 года пад Муйжай напаў на войска ВКЛ і амаль ушчэнт яго разбіў.

Ян Станіслаў Сапега, вельмі замаркоціўся з прычыны сваёй ваеннай няўдачы, цяжка захварэў і па сутнасці адышоў ад дзяржаўных спраў (Sapiehowie 1891: 7—8). У 1631 годзе ён ажаніўся ў другі раз, але і на гэты раз яго не абмінуў жорсткі лёс: другая жонка, дачка падляшскага ваяводы Грызельда Вадзінская, памерла ў 1633 годзе. Цяжка хварэючы, разбіты жыццёвымі нягодамі, Ян Станіслаў Сапега ненадоўга пераджыў бацьку і памёр 10 красавіка 1635 года. Яго велізарнымі скарбамі завалодаў малодшы брат Казімір Лявон (Sapiehowie 1891: 10—11).

Леў Сапега ажаніўся ў другі раз 20 ліпеня 1599 года. Маладая жонка Эльжбета Радзівіл прынесла ў яго дом не толькі велізарныя скарбы, сямейную ўтульнасць, каханне і цеплыню, але і нарадзіла трох дзяцей. З Эльжбетай Радзівіл Леў Сапега, здаецца, быў шчаслівы, хоць жа ізноў нядоўга. Ад Эльжбеты ён прычакаў дачку і двух сыноў. Першая нарадзілася пасля чатырох гадоў сямейнага жыцця (у 1603 годзе). Доўгачаканую дачку ахрысцілі Ганнай (Sapiehowie 1891: 45).

Ганнульку Леў Сапега найбольш любіў, хоць не менш рупіўся і пра другіх дзяцей. 10 жніўня 1606 года нарадзіўся старшы сын Крыштаф Мікалай (Sapiehowie 1891: 11), а 5 ліпеня 1609 года — Казімір Лявон (Sapiehowie 1891: 13). Любую сваю дачушку ўжо пасля смерці маці Леў Сапега выдаў замуж за Войцэха Уладзіслава Радзівіла. Ганнулі толькі што споўнілася 15 гадоў, а Войцэх Радзівіл, які засядзеўся ў халасцяках, меў 29 гадоў. Хоць у той час жаніх не мог пахваліцца высокімі пасадамі і тытуламі (ужо пасля смерці

Ганнулі стаў трокскім, а пазней і віленскім кашталянам), аднак быў сынам першага саноўніка ВКЛ, знакамітага віленскага ваяводы, праўда, ужо памёршага (у 1616 годзе) князя Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі (Niesiecki 1841: 74, Sapiehowie 1891: 46).

Леў Сапега, як ужо гаварылася, радніўся толькі з першымі вяльможамі ВКЛ. Спачатку сам, быўшы саракатрохгадовым удаўцом, пабраўся з шаснаццацігадовай дачкой Крыштафа Радзівіла Перуна, цяпер сваю дачку выдаў за сына магутнага вяльможы, а праз два гады яшчэ лепшую партыю знайшоў для свайго сына Яна Станіслава. Аднак радавацца сямейнаму шчасцю прыйшлося нядоўга, толькі дзесяць гадоў, бо ў 1627 годзе Ганна Сапежанка Радзівіл памерла. Для Льва Сапегі гэта было страшэнным ударам, які ён вельмі цяжка перажываў. Тым болей, што быўшы ў той час на вайне са шведамі, ён не змог прыехаць на пахаванне дачкі (Sapiehowie 1891: 46).



*Сапега Грызэльда (Вадынская). Партрэт невядомага мастака, 1630-я гг.*

Сын Крыштаф Мікалай пайшоў па слядах бацькі: вучыўся за мяжой, разам з малодшым братам шмат падарожнічаў, асабліва па Нямеччыне. У час гэтых вандровак браты Сапегі былі прыняты князем Саксонскім Янам Казімірам. Аднак ужо з першага замежнага падарожжа Крыштаф Мікалай вярнуўся не толькі са шматлікімі ўражаннямі і ведамі, але і са страшнай для таго часу хваробай — туберкулёзам лёгкіх. Праўда, дома здароўе значна палепшылася.

Бацька рупіўся пра скарбы і дыгніторыі Крыштафа таксама, як і першага сына. У 1617 годзе адзінаццацігадовы хлапчук стаў дзяржаўцам трох буйнейшых уладанняў — Маркава, Губы ды Вілейкі і атрымаў пасаду стольніка. У 1625 годзе ён ужо дзяржаўца вялікай Здзітаўскай воласці. Дваццацігадовы юнак з малодшым братам Казімірам Лявонам у 1626 годзе зноў ад'язджаюць за мяжу паглыбляць свае веды, на гэты раз у Галандыю. З Галандыі браты пераехалі ў 1628 годзе ў Італію.

Аднак у 1629 годзе Крыштаф, пакінуўшы брата, адзін вярнуўся дамоў, відаць, па прычыне пагаршэння здароўя. На радзіме ён, ідучы бацькавым следам, у 1631 годзе атрымаў досыць высокую пасаду пісара ВКЛ.

Аднак ні велізарныя скарбы, атрыманыя яшчэ ў дзяцінстве і юнацтве намаганнямі бацькі, ні параўнальна высокія тытулы не дапамаглі асіліць хваробу. У тым жа 1631 годзе 7 жніўня Крыштаф Мікалай Сапега развітаўся з гэтым светам. Ён пахаваны ў сямейным склепе пры касцёле Св. Міхаіла ў Вільні. Ксёндз Альшоўскі, прамаўляючы ля яго магілы, адзначыў вялікія здольнасці нябожчыка, як у ваеннай, так і ў дзяржаўнай дзейнасці (Sapiehowie 1891: 1—13, VUMB RS. F. 59—17). Пасля смерці дачкі страта сына была для Льва Сапегі новым цяжкім ударам.



*Ганна Сапега-Радзівіл (1603—1627)*

Казімір Лявон, малодшы сын Льва Сапегі, вельмі абнадзейваў бацьку. Яшчэ зусім дзіцем ён разам са старэйшым братам Крыштафам Мікалаем пачаў падарожнічаць па замежжы і набірацца ведаў у славутых школах. Няспыннымі клопатамі бацькі ён, застаўшыся без маці ў двухгадовым узросце, ужо ў дзяцінстве стаў значным землеўласнікам, як і яго старэйшыя браты. У пятнаццаць гадоў стаў дзяржаўцам вялікіх Вольпінскай і Дубенскай валасцей. У 1625 годзе брат Ян Станіслаў перадаў Яну Любашанскую воласць, закладзеную раней за 8,0 тысяч коп грошай, а бацька здабыў яму прывілей на ўладанне Альшанскай воласцю ў Ашмянскім павеце.

У 1629 годзе дваццацігадовы Казімір Лявон Сапега вярнуўся на Радзіму пасля другога замежнага падарожжа і вучобы ва універсітэтах Бельгіі, Галандыі і Італіі, што доўжылася чатыры з паловай гады. Вярнуўся дасведчаным у праве і палітыцы, авалодаўшы васьмю мовамі, добрым знаўцам ваеннага майстэрства. У гэтым жа годзе ён быў абраны дэпутатам у Трыбунал ад горада Слоніма (Sapiehowie 1891: 14)*. Гэта была яго першая пасада.

* Тут і далей выкарыстана адна крыніца (гл. Sapiehowie 1891: 13—45).

У 1632 годзе Казімір Лявон Сапега быў ужо пісарам ВКЛ, а ў 1637 годзе — надворным маршалкам. Служачы на гэтых пасадах, ён выканаў шмат важных дзяржаўных спраў і каралеўскіх даручэнняў, сярод якіх асабліва значным было пасольства ў Маскву ў 1634 годзе. У час яго разам з іншымі членамі дэлегацыі ён заключыў з Масквой мірную дамову, у якой былі пацверджаны ўмовы Дэўлінскага пагаднення, дасягнутага яшчэ намаганнямі яго бацькі, калі ВКЛ былі вернуты Смаленск, Северск, Чарнігаў, Дарагабуж, Старадуб, Эстонія і Курляндыя. Па смерці бацькі, а пазней і брата Яна Станіслава Казімір Лявон Сапега завалодаў асноўнай часткай іх уладанняў і стаў адным з буйнейшых землеўласнікаў у ВКЛ. Яму дасталіся і Ружанскі двор з мястэчкам, дзе быў пабудаваны грандыёзны, ужо амаль закончаны палац. Па просьбе Казіміра Лявона Уладзіслаў Ваза 20 чэрвеня 1637 года прадаставіў Ружанам Магдэбургскае права (LMAB RS. F. 1—257).



*Крыштаф Мікалай Сапега (1607—1631)*

У 1639 годзе Казімір Лявон Сапега ажаніўся на Фядоры Крысціне, дачцэ вендэнскага ваяводы Якіма Тарноўскага і Радамскай кашталянічны Ганны Фірлей. Яго скарбы і далей памнажаліся, дзякуючы як яго здольнасцям, так і данацыям уладара. Каралеўская сям'я, якая не аднойчы гасцявала ў яго неабсяжных уладаннях, дзе ёй заўсёды наладжваліся пышныя сустрэчы, была вельмі ўдзячнай яму. «Міласці караля Уладзіслава IV і каралевы Цэцыліі Рэнаты для надворнага маршалка Казіміра Сапегі раслі з дня ў дзень» (Sapiehowie 1891: 24).

У 1645 годзе Казімір Лявон Сапега стаў падканцлерам. Карыстаючыся сваімі вялізнымі багаццямі і высокай пасадай, ён і далей актыўна дзейнічаў на карысць дзяржавы, напрыклад, бараніў яе ў 1648—1649 гадах ад нападу казакоў і татар. Многа паслужыў асвеце, навуцы і ўвогуле культуры, будаваў у сваіх уладаннях касцёлы, засноўваў школы. Адной з важнейшых яго заслуг у галіне асветы і навукі было фундаванне правазнаўчага факультэта Віленскага



*Ян Станіслаў Сапега*
*(1589—1635)*



*Казімір Лявон Сапега*
*(1609—1656)*

універсітэта (прызначыў выкладчыкам штогадовую суму ў 3,0 тысячы злотых).

Акрамя таго, Казімір Лявон Сапега падарыў універсітэту славутую бібліятэку Ружанскага двара. Яна налічвала тры тысячы тамоў каштоўнейшых кніг, якія сабралі яго бацька і ён сам. Асобныя з іх дажылі да нашых дзён і захоўваюцца ў бібліятэцы Вільнюскага універсітэта*.

23 кастрычніка 1652 года памёрла жонка Казіміра Лявона Сапегі Фядора Крысціна. Яна была пахавана ў склепе сям'і Сапегаў пры касцёле Св. Міхаіла. Праз тры гады ў Бярэсці памёр і сам Казімір Лявон Сапега. Дзяцей ён не меў. Велізарныя ўладанні былі падзелены паводле яго тэстамента, складзенага пасля 30 ліпеня 1655 года ў Варшаве. Так сумна закончыўся славуты род Льва Сапегі. Дзяржаўная і асветніцкая дзейнасць Казіміра Лявона Сапегі варта асобнага даследавання. Яго заслугі перад Айчынай, навукай, асветай высока ацаніў у «аўтарскай» прадмове да сваёй «Гісторыі Літвы» А. Віюкас-Каялавічус, які пісаў, што

> [...] гісторыю Літвы не мог інакш выдаць, як толькі пад апякунствам Тваёй Высокасці. Бо, безумоўна, апекуном Літоўскай гісторыі можа быць той самы чалавек, які з'яўляецца славутым абаронцам Літоўскай дзяржавы. Усе высокародныя, падчас публічных віншаванняў зазначылі, што Твая Высокасць, выяўляючы незвычайную адданасць Радзіме, аддаючы ёй

* Дакладны пералік гэтых кніг гл. BraziOnienes 1995.

неймаверныя памкненні ды ахвяруючы велізарныя сродкі, у гэтыя суровыя часы найлепшым чынам падтрымлівае Літоўскую дзяржаву... (Vijūkas-Kojelavičius 1988: 40).

## Глава 6
## ПАЛІТЫЧНЫЯ І ФІЛАСОФСКІЯ ПОГЛЯДЫ, ЗАКАНАДАЎЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Сучаснікі называлі яго вялікім Львом ды Салонам Літвы. Сам жа Леў Сапега быў заўсёды вельмі сціплым, часам да самапрыніжэння. Напрыклад, у лістах да віленскага ваяводы Крыштафа Радзівіла Перуна, ужо стаўшы канцлерам, а пазней і яго зяцем, заўсёды называў сябе «пакорлівым слугой» (Prochaska 1892: 130. Dok. № 155; 132. Dok. № 156 і інш.). Відаць, гэта была не толькі этыкетная формула тагачаснай перапіскі. Сціпласць, ветлівасць і мяккасць былі рысамі характару Льва Сапегі, хоць, як было ўжо неаднаразова зазначана, у маёмасных справах, а таксама калі закраналіся дзяржаўныя інтарэсы ВКЛ, ён умеў быць цвёрдым. У апошніх выпадках ён — грамадзянін сваёй Айчыны, непахісны патрыёт.

Такім ён быў у час незаконнага прызначэння віленскім епіскапам паляка Бернарда Мацяёўскага; такім быў і пры спробах палякаў несправядліва падзяліць пасады і ўладанні ў вернутых пасля Дэўлінскага перамір'я 1619 года Літоўскай дзяржаве Смаленскай і Северскай землях; такім быў, калі Жыгімонт Ваза імкнуўся ўцягнуць ВКЛ у проігрышную дынастычную вайну са Швецыяй; такім быў і ў шмат якіх іншых выпадках, калі закраналіся інтарэсы Айчыны.

Аднак Леў Сапега не быў супраць уніі Польшчы з Літвой, як гэта іншы раз любяць паказаць некаторыя беларускія публіцысты. Яго пазіцыю па гэтаму пытанню найбольш дакладна яшчэ сто гадоў таму вызначыў С. Пташыцкі, які пісаў:

> У сваіх лістах [якія у 1892 годзе выдаў А. Прахаска. — *С. Л.*] усюды і заўсёды Сапега стаіць на варце інтарэсаў Літвы, і калі не раз выказваецца за агульныя дзеянні Польшчы і Літвы, то яшчэ больш рупіцца аб захаванні рэгіянальных правоў Літвы (Пташицкий 1893: 196).

«На варце інтарэсаў Літвы» ён стаяў не толькі ў сваіх лістах, але і ў паўсядзённай дзяржаўнай дзейнасці як канцлер ВКЛ, а пазней і як віленскі ваявода і вялікі гетман.

Як чалавек Леў Сапега быў таварыскім, ветлівым і спагадлівым, жыў у згодзе са сваімі шматлікімі сваякамі, не адмаўляў ім у дапамозе, бо яшчэ ў маладосці выдатна спасціг законы і працяглы час займаў вышэйшае становішча ў дзяржаве. За дапамогу, праўда, атрымліваў ад сваякоў добрую адплату і адпісаныя ў тэстаментах немалыя ўладанні. У сваім тэстаменце сынам Яну Станіславу, вялікаму маршалку, і Казіміру Лявону, пісару ВКЛ, наказваў жыць у згодзе і дружбе як між сабой, так і з суседзямі. Старэйшаму, Яну Станіславу, раіў рупіцца пра маладзейшага за яго на дваццаць гадоў Казіміра Лявона (Sapiehowie 1890: 401. Dok. № XXVII).

Вядома, як і ўсе тагачасныя (на жаль, і ў наш час) саноўнікі, ён меў нямала ворагаў. Асабліва доўга змагаўся і судзіўся з Хадкевічамі, зайздрасць і ўзаемная антыпатыя на некаторы час вызначалі яго адносіны нават з Крыштафам Радзівілам Малодшым, братам другой жонкі, сынам Крыштафа Радзівіла Перуна, які на працягу ўсяго жыцця быў сапраўдным сябрам Льва Сапегі. Малады і амбіцыёзны палявы гетман Крыштаф не хацеў падпарадкоўвацца старэйшаму на трыццаць адзін год віленскаму ваяводзе і вялікаму гетману ВКЛ Льву Сапегу. Апошні надта перажываў з-за гэтага.

Праўда, у рэшце рэшт яны ўсё ж памірыліся, спачатку на полі бою, а пасля ля труны караля (Sapiehowie 1890: 178). Была дасягнута згода і з магутнейшым віленскім ваяводай і вялікім гетманам Янам Карлам Хадкевічам. У 1620 годзе яны пасрадніліся, калі Ян Станіслаў Сапега, як ужо было згадана, ажаніўся на яго дачцэ Ганне Схаластыцы.

У пытаннях веры Леў Сапега быў талерантным, хоць сам у свой час з палітычнай мэтай і дзеля асабістага дабрабыту і кар'еры перайшоў у каталіцтва і ўсюды імкнуўся падкрэсліць асаблівую сваю прыхільнасць да гэтай веры. Найбольш яскрава гэта было выказана ў яго тэстаменце, дзе Леў Сапега дзякуе Богу за тое, што *«у юнацтве збочыўшаму на ілжывую сцежку* [курсіў у транскрыбіраваным тэксце тэстамента наш. — *С. Л.*] ад сапраўднай веры і выратавальнага шляху, загінуць не дазволіў» (Sapiehowie 1890: 400. Dok. № XXVII).

Крыніцы сведчаць, што найвялікшай яго марай, якую ён імкнуўся ажыццявіць, было прымірыць розныя рэлігійныя канфесіі і ўвесці уніяцкую царкву. Леў Сапега горача падтрымліваў Берасцейскую царкоўную унію 1596 года і імкнуўся яе ажыццявіць. Ён заўсёды падтрымліваў уніяцкае духавенства, якое ўвесь час звярталася да яго па дапамогу. Асабліва многа і доўга ён перапісваўся з



*Быхаўскі замак на павялічаным фрагменце карты пачатку XIX стагоддзя. Пры Л. Сапегу, да якога ў 1621 перайшоў Быхаў, узведзена бастыённая фартыфікацыя*

Кіеўскім і Уладзімірскім Мітрапалітам Іпаціем Пацеем. А. Прахаска выдаў дзевяць лістоў Іпацiя Пацея, у якіх той звяртаецца да Льва Сапегі як да «магутнага дарадцы і вернага ды паслухмянага сына святога каталіцкага касцёла», якому «не трэба згадваць пра справы Боскага касцёла і святога паяднання [уніі. — *С. Л.*]» (Prochaska 1892: 362. Dok. № 433).

Леў Сапега, як ужо згадвалася, у сваіх неабсяжных уладаннях на працягу ўсяго жыцця будаваў касцёлы, цэрквы і кляштары, сярод якіх былі і касцёл Св. Мікалая з жаночым кляштарам Св. Клары ў Вільні. У гэтым касцёле ён пахаваў абедзвюх сваіх жонак, у ім загадаў у сваім тэстаменце пахаваць і сябе. Манастыры, касцёлы, цэрквы ў тыя часы былі не толькі малітвенымі дамамі, але і крыніцамі асветы. Пры многіх з іх дзейнічалі школы, у якіх атрымоўвалі пачатковую адукацыю і дзеці простых людзей, таму Льва Сапегу можна лічыць не толькі шчырым каталікам, але і сапраўдным асветнікам.

Будуючы касцёлы, пераўтвараючы ў іх цэрквы і пратэстанцкія малітвеныя дамы, ён адкрываў пры іх школы і прытулкі, ахвяруючы на іх утрыманне дастатковыя сумы грошай або зямельныя надзелы.

Так, у 1593 годзе ў вялікім Іказненскім двары на месцы былых цэркваў і малітвеных дамоў кальвіністаў ім быў пабудаваны каталіцкі касцёл. Такі ж самы касцёл пабудаваў ён і ў другім, Пагостаўскім двары. Пры тых касцёлах былі адкрыты школы і багадзельні, якім выдзелены неабходныя сродкі (LMAB RS. F. 6—256, 3—118).

Рэлігійная талерантнасць Льва Сапегі не была вынікам толькі аднаго рэфармацкага выхавання. Яе абумовіла пераважна канкрэтнае канфесійнае асяроддзе, якое гістарычна склалася ў ВКЛ, дзе да таго дзвесце гадоў існавалі поруч каталіцтва і праваслаўе, а ў другой палове XVI стагоддзя частка жыхароў, а сярод іх і буйныя феадалы, прыняла новую веру — рэфармаванае хрысціянства, асноўныя напрамкі якога названы паводле імёнаў іх важнейшых заснавальнікаў і прапаведнікаў Марціна Лютэра (лютэранства) і Ёгана Кальвіна (кальвінізм). Але ўсё ж і талерантнасць Льва Сапегі мела межы.

Адклікаючыся, напрыклад, на жорсткае супраціўленне уніі ўплывовага ахоўніка праваслаўя, такога буйнага саноўніка, як кіеўскі ваявода князь Канстанцін Канстанцінавіч Астрожскі, Леў Сапега рашуча абараняў каталіцтва. Ён папракаў князя Астрожскага за рэзкія выказванні супраць каталіцкага касцёла і самога папы рымскага, за намеры аб'яднаць праваслаўную царкву з рэфармацкай, даводзіў яму, што унія — гэта вялікая карысць перш за ўсё для ўсіх праваслаўных Літоўскай краіны:

> Як з паяднання з Вашай Міласці грэчаскай верай каталікі мала чаго будуць мець, — пісаў ён Канстанціну Астрожскаму, — так яны нічога не згубяць, калі Ваша Міласць па-старому ў адшчапенстве застанецца і, наадварот, калі б русіны змаглі аб сабе добра паклапаціцца, то самі жадалі б і самі імкнуліся б да адзінства касцёла Божага. Ім гэта больш патрэбна і важна, чым нам. Няхай тое на волі Яго Міласці застаецца, але лаяць папу, называць яго антыхрыстам, ворагам сына Божага, зневажаць каталікаў і святую саборную Рымскую веру, пагражаць каралю стратай здароўя і каралеўства, [...] сябраваць з ерытыкамі [рэфарматамі. — *С. Л.*] і ачарніцелямі Божай вялікасці, нацкоўваць іх на каталікаў?.. (Prochaska 1892: 114—115).

Як бачым, у адказ на катэгарычны і непрымальны для яго погляд іншаверца Леў Сапега выказаў сябе паслядоўным абаронцам

каталіцтва, а пратэстанты, да якіх ён калісьці належаў, сталі для яго «ерэтыкамі і богазневажальнікамі».

Аднак вельмі складаная сітуацыя ў тагачасным грамадстве ВКЛ вымушала Льва Сапегу і ў гэтым выпадку паводзіць сябе досыць супярэчліва, манеўраваць. У Трэцім Літоўскім Статуце, канчатковым рэдагаваннем якога ён кіраваў, выконваючы абавязкі канцлера ВКЛ, Леў Сапега пакінуў раней прапанаваны паслядоўнымі рэфарматамі канцлерам Мікалаем Радзівілам Рудым і Астафіем Валовічам. 3 артыкул III:

> Дзеля ўтрымання ў спакоі, згодзе ўсіх нашых падданых, жыхароў гэтай дзяржавы [ВКЛ. — *С. Л.*], па-рознаму разумеючых і спавядаючых хрысціянскую веру.

Тут маюцца на ўвазе зусім не праваслаўныя, а пераважна рэфарматы, якіх Леў Сапега называе ерэтыкамі (Lazutka 1994: 41). Праўда, пасля прыняцця Трэцяга Статута ўжо мінула сем гадоў, але вядома таксама, што і ў тую пару і пазней Леў Сапега абараняў прынятыя ў Статуце законы. Гэтыя неадназначныя дзеянні былі абумоўленыя перш за ўсё супярэчлівай рэчаіснасцю ВКЛ, рашучай контррэфармацыяй, якая разгарнулася ў той час.

Аднак можна канстатаваць, што перайшоўшы ў каталіцтва, Леў Сапега стаў паслядоўным католікам, заўсёды абараняў каталіцкія касцёл і веру, хоць не засцярогся ад ілюзіі (а што гэта была менавіта ілюзія, засведчыла гісторыя) аб'яднаць абедзве асноўныя рэлігіі ВКЛ. Увогуле, і ў гэтай сферы з погляду дзяржавы пазіцыю Льва Сапегі трэба ацаніць станоўча, а яго самога — як чалавека вялікай мудрасці, асветніка, прадбачлівага дзеяча вялікай, але ў нацыянальных і рэлігійных стасунках вельмі стракатай дзяржавы.

Аб'яднанне цэркваў, або, дакладней кажучы, далучэнне праваслаўнай царквы да каталіцкага касцёла, Леў Сапега меў намер здзяйсняць толькі мірным шляхам, без прымусу і патрабаваў таго ж ад іншых. Ён рэзка асуджаў тых вышэйшых іерархаў уніяцкай царквы, якія спрабавалі гвалтам загнаць праваслаўных у унію.

У гэтым сэнсе асабліва паказальны ліст архіепіскапу Полацкай мітраполіі Язафату Кунцэвічу ад 12 сакавіка 1622 года, у якім Леў Сапега, усебакова асуджаючы яго прымус супраць праваслаўных і іх гвалтаўнікоў, пісаў:

> Не супярэчу, што і сам стараўся на карысць Уніі, і скасаваць яе было справай неразумнай; аднак ніколі мне ў галаву не прыйш-

ло, каб Ваша Праасвяшчэнства маглі дадумацца прыводзіць людзей да яе такімі гвалтоўнымі спосабамі. *Найвышэйшы* [курсіў у арыгінале. — *С. Л.*] запрашае да сябе ўсіх лагодна: «Прыходзьце да мяне ўсе і г.д.», толькі нявольнікаў, сілай прыведзеных, мець не жадае і не прымае (Sapiehowie 1890: 374. № XXIV).

Яго асабліва пужала тое, што такія метады загоншчыкаў у унію пасеюць паміж католікамі і праваслаўнымі, якія стагоддзямі мірна суіснавалі, зерні вечнай варожасці і прынясуць непапраўную шкоду дзяржаве. У некалькіх месцах ліста ён нават рашуча адмяжоўваецца ад такога прымусу ў ажыццяўленні уніі. Адказваючы на параду Язафата Кунцэвіча выгнаць з краю тых праваслаўных, якія не прынялі уніі, Леў Сапега ўсклікнуў: «Барані Божа! Няхай не здарыцца ў нашай айчыне такое жудаснае бяспраўе» (Sapiehowie 1890: 378).

Яшчэ болей талерантнымі і супярэчлівымі былі погляды Льва Сапегі ў нацыянальным пытанні. Праўда, яго ўяўленні пра тагачаснае ВКЛ вельмі адрозніваліся ад сучасных. Патрыёт ВКЛ, хрышчоны ў праваслаўнай царкве, у юнацтве адмовіўшыся ад яе веры і прыняўшы кальвінізм, а трыццацігадовым перайшоўшы ў каталіцтва, ён нібыта і не задумваўся наконт сваёй нацыянальнай прыналежнасці. Важнейшай была вера. Ён узвышаў афіцыйную тагачасную дзяржаўную мову, называючы яе сваёй:


*Макет рэканструкцыі Быхаўскага замка*

> А калі якому народу сорам правоў сваіх не ведаць, то найперш нам, што не на *якой-небудзь чужой мове, а на сваёй напісаныя законы маем* [курсіў наш. — *С. Л.*] і кожны раз, чаго нам трэба для супрацьстаяння ўсякай крыўдзе, ведаць можам» (Lappo 1936: 17).

Гэтай мовай ён добра валодаў, патрабаваў, каб пісары пісалі толькі на гэтай мове, аднак сам часцей пісаў па-польску — большасць яго лістоў напісаны на польскай мове. Кім быў Леў Сапега — літоўцам, рускім, беларусам, палякам? Відавочна, такога пытання ні ён сам сабе, ні хто-небудзь іншы яму не задавалі. Гэта пытанне праз некалькі стагоддзяў навязалі гісторыкі-палітыканы. Можна сцвярджаць толькі тое, што ён быў вялікім грамадзянінам ВКЛ.

Светапогляд, палітычнае і ідэалагічнае крэда, выхаванне і ўсебаковая эрудыцыя Льва Сапегі адлюстраваны ў яго лістах да многіх карэспандэнтаў, тэстаменце і асабліва ў дзвюх яго «Прадмовах» да Трэцяга Літоўскага Статута. Практычнае прыкладанне ўсіх гэтых яго здольнасцей і дабрачыннасцей трэба шукаць у паўсядзённай дзяржаўнай дзейнасці, а таксама ў «Трыбунале» і Трэцім Літоўскім Статуце, бо ён быў адным з іх стваральнікаў.

Леў Сапега быў добра дасведчаны ў ідэях Рэнесансу, Рэфармацыі і гуманізму, увесь час імі кіраваўся ў сваёй палітычнай і дзяржаўнай дзейнасці. Яго любімымі настаўнікамі былі Цыцэрон і асабліва Арыстоцель. Менавіта ідэямі і філасофскімі высновамі апошняга ён кіраваўся ў сваім унікальным для таго часу творы — «Панегірыку» манарху. Гэта своеасаблівае ўступнае слова да першага выдання Трэцяга Літоўскага Статута, у якім Леў Сапега піша:

> А пра тое ён, вялікі і мудры філосаф Грэчаскі Арыстоцель, сказаў, што там дзікі звер пануе, дзе чалавек па разуменні сваім сваю ўладу ўсталёўвае, а дзе права або статут верх маюць, там сам Бог усім кіруе* [Пераклад наш. — *В. Л.*].

Ідэолаг і практык шляхецкай дэмакратыі, Леў Сапега ідэалізуе правы і законы, супрацьстаўляючы іх праўленню тыранаў, да якіх адносіць і рымскіх дыктатараў. Яшчэ лепей яго светапогляд гуманіста, ідэолага шляхецкай дэмакратыі і прыхільніка кіравання на аснове законаў адлюстравана ў другім артыкуле «Да ўсіх увогуле саслоўяў ВКЛ...» прадмовы да першага выдання Трэцяга Літоўскага Статута. Тут Леў Сапега праслаўляе Статут як аснову прававога, грамадскага і палітычнага суіснавання ўсіх саслоўяў:

---

* «А про то онъ, великий и зацный философъ Греческий Арыстотелесъ поведилъ, же тамъ бельлуа, а по нашому дикое звера,链 пануеть, где чоловекъ водлугъ уподобанья своего владность свою ростегаеть, а где опять право, або статутъ, гору маеть, тамъ самъ Богъ всимъ владнеть» (Lappo 1936: 9—10; таксама гл. Koženiauskienė 1990: 101).

> Так тыя муштук і цуглі [Статут. — *С. Л.*] для ўтрымання кожнага нахабніка знойдзены, каб баючыся закона, ад кожнага гвалту і здзеку ўстрымліваўся, а над слабейшым і горшым не ўзвышаўся і прыгнятаць яго не мог; бо для таго законы ўстаноўлены, каб багатаму ды магутнаму не ўсё было можна чыніці, як сказаў Цыцэрон, мы нявольнікі законаў для таго, каб маглі воляй карыстацца (Lappo 1936: 5)*.

Такім чынам, Леў Сапега дэкларуе роўнасць усіх грамадзян перад законам. Вольнымі ўсе грамадзяне могуць быць толькі прызнаючы сваю «няволю» перад законамі. Толькі маючы такі звод законаў, як Трэці Літоўскі Статут, сцвярджаў Леў Сапега, усе ў сваёй айчыне могуць адчуваць сябе свабоднымі, не баяцца непакаранага замаху на жыццё, здароўе, гонар і ўласнасць.

Высветліць сутнасць філасофіі права Льва Сапегі і яго заслугі ў канчатковым фарміраванні прававой феадальнай Літоўскай дзяржавы можна толькі рупліва прааналізаваўшы важнейшыя артыкулы Трэцяга Літоўскага Статута. Гэта было здзейснена І. Васілеўскене, якая слушна заўважыла, што

> [...] тэзіс Арыстоцеля пра супадзенне чалавечага шчасця з дабрабытам у дзяржаве Сапега замяніў хрысціянскай ідэяй усяленскай свабоды [...] Права, законнасць ствараюць гармонію і бяспеку ў дзяржаве, а беззаконнасць спараджае звярыныя схільнасці, прымус і прыгнёт (Vasilevskiene 1980: 30).

Усе даследчыкі Трэцяга Літоўскага Статута і біёграфы Льва Сапегі сутыкаліся з пытаннем пра яго ролю ў кадыфікацыі гэтага кодэкса. Некаторыя з іх, напрыклад С. Пташыцкі (Ptaszycki 1893: 5) і М. Шкялёнак, лічаць Льва Сапегу ствральнікам Статута. М. Шкялёнак пісаў:

> [...] і толькі тады, як справа гэта [г.зн. кадыфікацыя Трэцяга Статута — *С. Л.*] была даручана Льву Сапезе — праз два гады (у 1558 годзе) Статут быў гатовы. Леў Сапега вельмі добра справіўся са сваім заданнем» (Шкялёнак 1933: 9).

---

* «Тогды тотъ моньштукъ або удило на погамованье кождого зуфальцу есть вынайдено, абы, се боячы права, от кожьдого кгвалъту и збытку погамовалъ, а надъ слабшимъ и худъшимъ не паствилъ се и утискати его не могъ, бо для того права суть постановлены, абы можному и потужному не все было вольно чынити, яко Цыцеро поведилъ, ижъ естесмо невольниками правь для того, абысьмы вольности уживати могли» (таксама гл. Koženiauskienė 1990: 104—105).

І. Лапо, які грунтоўней за усіх даследаваў Трэці Літоўскі Статут і ролю Льва Сапегі ў яго кадыфікацыі, не пагадзіўся з такім меркаваннем. Ён трымаўся той думкі, што Трэці Літоўскі Статут збольшага быў падрыхтаваны ў канцылярыі вялікага князя пад кіраўніцтвам папярэднікаў Льва Сапегі Мікалая Радзівіла Рудога і Астафія Валовіча (Lappo 1934: 461—473).



*Трэці Літоўскі Статут (1588)*

Заслуга ж Льва Сапегі толькі ў завяршэнні рэдагавання і прыняцці Статута. На апошнім этапе кадыфікацыі, стаўшы старшынёй камісіі сойма па падрыхтоўцы Статута, ён аддаваў усе свае сілы і талент дзяржаўнага дзеяча, грунтоўную дасведчанасць у правазнаўстве таму, каб быў завершаны гэты унікальны па сваім аб'ёме звод законаў, якога не мела на той час ні адна феадальная дзяржава Еўропы. Леў Сапега выдатна справіўся з гэтай вельмі важнай і складанай дзяржаўнай і правазнаўчай задачай.

28 студзеня 1588 года кароль зацвердзіў Трэці Літоўскі Статут (Lazutka 1994: 34). Самае важнае, што ў ім удалося захаваць усе артыкулы, якія юрыдычна пацвярджалі поўную самастойнасць ВКЛ.

Юрыдычныя нормы Трэцяга Літоўскага Статута, як і ў Першым і ў Другім Статутах, захавалі самабытнасць Літоўскага права. Статут не быў уніфікаваны з польскім правам, як гэта было прадугледжана Люблінскай уніяй 1569 года, не зважаючы на ціск уладных колаў Польшчы. Важна і тое, што Трэці Статут, як і абодва ранейшыя, быў напісаны на старабеларускай мове — мове дзяржаўных дакументаў ВКЛ, што яшчэ больш яскрава акрэсліла яго самабытнасць.

Калі ў кадыфікацыі Трэцяга Літоўскага Статута Леў Сапега прымаў удзел толькі на апошнім этапе, то хуткае ўкараненне гэтага звода законаў — выключна толькі яго заслуга. У адрозненне ад абодвух ранейшых статутаў ужо летам таго ж 1588 года Трэці Літоўскі Статут быў выдадзены ў друкарні вядомых братоў Мамонічаў накладам у некалькі сот экземпляраў (Lazutka 1994: 45). Леў Сапега ў згаданай прадмове так тлумачыў значэнне выдання і распаўсюджання звода:

> Дагэтуль вялікай цяжкасцю было і тое, што не кожны мог мець Статут для цяжкага і доўгага перапісвання, таму гэту патрэбу кожнага грамадзяніна задавальняючы і служачы інтарэсам грамадскасці, вырашылі гэту працу зрабіць самі і, сродкаў і затрат сваіх не шкадуючы, выдаць, каб дарогу лягчэйшую і спрыяльную кожнаму да ведання права паказаць, бо цяпер кожны, калі захоча, можа мець гэты Статут у сваіх руках (Lappo 1936: 17)*.

Тут акрамя іншага выказаны і філасофскі погляд Льва Сапегі на феадальнае грамадства, якому ён так многа паслужыў, і члены якога, маючы Статут і на яго абапіраючыся, маглі актыўна ўдзельнічаць у жыцці краіны, і добра ведаючы законы, абараняць свае інтарэсы, праўду і свабоду.

Трэці Літоўскі Статут адзначаны прыкметамі сваёй эпохі, таму што быў прыняты ў складаны і супярэчлівы час, калі ў ВКЛ суіснавалі Рэфармацыя і контррэфармацыя, вялася барацьба за захаванне дзяржаўнасці гэтай вялікай краіны. Увесь немалы наклад Статута быў хутка распаўсюджаны, і выдаўцы неўзабаве паўтарылі выданне. З-за свайго надзвычай высокага прававога ўзроўню Трэці

---

* «А ижъ тая трудность передъ тымъ не помалу до того заважала, же не каждый Статуть могъ мети для трудного и долъгого переписованья, тогды, и въ томъ той потребе кождого обывателя фолькгуючы и пожитку речы посполитое служечы, важыломъ се того, тую працу на себе подъняти, а кошту и накладу своего не жалуючы, абыхъ то въ друкъ подалъ а дорогу лацнейшую и снаднейшую кождому ку ведомости права показалъ, кгды жъ то вжо въ рукахъ своихъ кождый, коли похочеть, мети можеть» (таксама гл. Koženiauskienė 1990: 105).

Літоўскі Статут дзейнічаў на тэрыторыі ВКЛ нават пасля падзелу Рэчы Паспалітай да 1840 года, г. зн. больш за 250 гадоў. Ён зрабіў вялікі ўплыў на права суседніх краін. Як дапаможнай юрыдычнай крыніцай ім карысталіся ў польскім судзе, шмат чаго з яго ўзялі стваральнікі старажытнарускага судзебніка «Соборное уложение» (1649).

Трэці Літоўскі Статут быў перакладзены на польскую мову і вытрымаў у Польшчы сем выданняў, тройчы быў перакладзены на рускую мову і выдадзены ў 1811 годзе, а таксама быў перакладзены і на нямецкую мову. У апошні раз яго пераклалі на рускую мову і выдалі ўжо ў наш час (Статут Вялткага княства літоўскага 1989).

Няшмат юрыдычных помнікаў зведалі такую вялікую ўвагу грамадскасці і шматлікіх даследчыкаў. Гэта заслуга і сведчанне незгасальнай славы кадыфікатараў і выдаўцоў Трэцяга Літоўскага Статута, сярод якіх першым заслужана згадваецца Леў Сапега.

Леў Сапега выдатна паслужыў культуры і гістарычнай навуцы ВКЛ яшчэ і тым, што па яго ўказанню было напісана і захавана сто дзевяноста кніг Літоўскай Метрыкі. Так ужо ў XVI стагоддзі называлі кнігі розных дакументаў канцылярыі ВКЛ. Гэта назва захавалася да нашых дзён.

Па прадбачліваму распараджэнню Льва Сапегі і пад яго наглядам прыблізна каля 1594 года было распачата напісанне кніг копій актаў і запісаў, якія назбіраліся больш чым за паўтары сотні гадоў. Праз дзесяць-дванаццаць гадоў іх было напісана каля двух сотняў (Banionis 1993: 28).

Менавіта гэтыя кнігі-копіі і дайшлі да нашага часу, бо арыгіналы (за выключэннем некалькіх кніг) не захаваліся. Клопаты, прадбачлівасць і мудрасць дзяржаўнага дзеяча Льва Сапегі вызначылі лёс гэтай каштоўнейшай культурнай скарбонкі, сведчання гісторыі некалькіх народаў. Шкада толькі, што цяпер гэтая скарбонка ведаў знаходзіцца не ў Вільні.

Шматлікія лісты Льва Сапегі, як ужо згадвалася, з'яўляюцца таксама важнай крыніцай для характарыстыкі гэтай незвычайнай асобы. Яны ўражваюць энцыклапедычнай эрудыцыяй іх аўтара, шырокімі юрыдычнымі, гістарычнымі і філасофскімі ведамі, здольнасцю аднолькава добра пісаць на некалькіх мовах — афіцыйнай мове ВКЛ, польскай, лацінскай, нямецкай і інш. Майстар эпісталярнага жанру, Леў Сапега ў сваіх лістах трапна выкарыстоўвае

лацінскія выразы, біблейскія сюжэты з асэнсаванымі выхадамі на свой час (Prochaska 1892: 70, 73. Dok. № 94, 97).

Так, у адным з лістоў, адрасаваным Крыштафу Радзівілу Перуну, Леў Сапега, сумняваючыся ў дзеяннях маладога караля Жыгімонта Вазы і заклапочаны тым, што ад іх могуць быць кепскія наступствы для саюзнай дзяржавы, піша:

> Бадай, не здарылыся б так з Яго Вялікасцю каралём, уладаром нашым, як з царом яўрэйскім Раваамам, сынам Саламона, які, не жадаючы слухаць парад старэйшых, зрабіў тое, што раілі маладыя. Што потым стала, я пісаць не жадаю, бо кожны можа прачытаць у святой Бібліі (Prochaska 1892: 70. Dok. № 94).

Тут Леў Сапега мае на ўвазе трагічны эпізод з гісторыі яўрэйскага народа, калі з-за маладога цара Раваама, які акружыў сябе маладымі дарадчыкамі і адштурхнуў старэйшых, магутнае Саламонава царства распалася на дзве асобныя дзяржавы, адна з якіх фактычна падпала пад пратэктарат Егіпта (Šventasis Raštas 1991: 65).

Прамовы Льва Сапегі ў сойме з'яўляюцца яркімі прыкладамі красамоўства. Такімі з'яўляюцца ўжо згаданыя тры яго прамовы 1611 года ў Варшаўскім сойме (апублікаваныя М. Любаўскім). У адной з іх, падтрымліваючы караля Жыгімонта Вазу, Леў Сапега сказаў:

> Коратка кажучы, з чыёй дапамогай той [самазванец Дзімітрый. — *С. Л.*] пайшоў паходам на Маскву, ведаюць людзі; Ваша Каралеўская Вялікасць забаранялі, загадаўшы ў пасланым універсале, каб людзі Вашай Каралеўскай Вялікасці з ім ішлі, не дапамагло гэта, пайшлі, пасадзілі яго на трон, і адсюль пачатак той вайны Маскоўскай. Нецяжка тое бачыць і вызначыць, хто яе распачаў. Вядома, не Ваша Каралеўская Вялікасць! (Любавский 1915: 3).

Нездарма Леў Сапега рыторыцы вучыўся ў Цыцэрона, бо гэтая прамова нагадвае стыль мовы гэтага знакамітага антычнага рытара. Кароткія ясныя пытанні і такія ж выразныя адказы на іх. «З чыёй дапамогай пайшоў паходам на Маскву?» — рытарычнае пытанне, і тут жа ясны адказ: «Ведаюць людзі». Або: «Нецяжка тое бачыць і вырашыць, хто яе распачаў». І далей рашучы вывад: «Вядома, не Ваша Каралеўская Вялікасць!»

Гэтыя прамовы з'яўляюцца, акрамя іншага, яшчэ і унікальнымі гістарычнымі дакументамі. Яны дапамагаюць разабрацца ў

такіх важных пытаннях гісторыі Масквы і ВКЛ, як высвятленне асобы самазванца, прычыны і абставіны, якія прывялі на рускі трон Барыса Гадунова (які, між іншым, у вачах сучаснікаў не быў законным уладаром) і прадвызначылі яго звяржэнне, і нарэшце, вытокі, прычыны і ініцыятараў той згубнай для абодвух бакоў вайны.

Безумоўна, гэтыя прамовы з'яўляюцца надзвычай каштоўнымі дакументамі, непасрэднымі сведчаннямі гістарычных падзей, тым больш, што сведка — асоба вышэйшага рангу і вельмі добра інфармаваная. Вядома, як слушна заўважыў яшчэ М. Любаўскі,

> [...] у іх палемічным спосабе можна знайсці як гарантыю асаблівай мэтазгоднасці і надзейнасці, так і наадварот — пазбегнуць магчымага аднабаковага погляду, зацікаўленага падбору чутак і звестак, якія ідуць з Масквы, тэндэнцыйнага скажэння фактаў і няправільнага іх асвятлення (Любавский 1915: IV).

Прамовы, лісты Льва Сапегі, якія захаваліся да нашых дзён, а асабліва дзве прадмовы да Трэцяга Літоўскага Статута (і сам Статут) характарызуюць яго як надзвычай таленавітага, усебакова адукаванага, надзвычай эрудыраванага дзеяча ВКЛ, які дзейнічаў на скрыжаванні двух значных гістарычных з'яў — Рэфармацыі і контррэфармацыі. Леў Сапега, будуючы палацы, касцёлы, кляштары і засноўваючы пры іх школы, таксама зрабіў вялікі ўклад у архітэктурнае мастацтва ВКЛ і выдатна паслужыў асвеце і адукацыі ў сваёй дзяржаве. Таксама высока цанілі заслугі Льва Сапегі яго сучаснікі.

Выдавец згаданай «Гісторыі Літвы» А. Віюкаса-Каяловічуса Ю. Ферстэр у панегірыку, прысвечаным сыну Льва Сапегі Казіміру Лявону, пісаў:

> Як мне не гаварыць пра Твайго Бацьку, які заслужыў надзвычайную славу? Рашэннем мудрага караля Стэфана, ён, вядома, быў выбраны з такога мноства і прызначаны на пастаянную каралеўскую службу, не параўноваючы з верным Ахатам. Па смерці караля ён памалу ўздымаўся да вышэйшых дзяржаўных пасад і напрыканцы воляй усей дзяржавы быў аб'яўлены гетманам ВКЛ пасля вялікага Сцыпіёна Літвы Хадкевіча. Ён, атрымаўшы гэтую спартанскую пасаду, так сябе паводзіў, што можна было паверыць, што ў ім уваскрос Хадкевіч (Vijūkas-Kojelavičius 1988: 37).

## Глава 7
## ГЕРБ РОДУ ЛЬВА САПЕГІ

Герб роду Сапегаў Ліс (Lis) большасць даследчыкаў геральдыкі памылкова выводзяць з герба прапраўнука Гедыміна Сунігайлы Нарымантавіча, які той атрымаў у 1413 годзе на Гарадзельскім з'ездзе (гл. мал.) (Labarre de Raillicourt 1970: 22)*.

Аднак, як ужо сказана, вылучэнне роду Сапегаў, а разам і герба, з Гедымінавічаў грунтуецца толькі на актах, фальсіфікаваных канцлерам Фрэдэрыкам Сапегам у XVIII стагоддзі. Заснавальнік роду Сапегаў Сіман, які з'явіўся ў асяроддзі вялікага князя ў пачатку 50-х гадоў XV стагоддзя, не меў нічога агульнага з Гедымінавічамі і, вядома, не мог наследаваць герб Сунігайлы Нарымантавіча. Таму паходжанне герба Сапегаў да нашага часу застаецца невядомым, а сам герб напачатку, відаць, быў намнога прасцейшым. Э. Лаўцэвічус сцвярджае, што

> [...] спачатку на шчыце герба была толькі выява прысеўшага ліса з паднятым хвастом, але потым на месцы яго [ліса. — *В. Л.*] з'явіўся двайны крыж з дахам, а самога ліса пачалі выяўляць на версе шчыта (Laucevičius 1967: 127).

Шкада, што Э. Лаўцэвічус не прадставіў у сваім атласе такога вадзянога знака, «на якім бы быў толькі прысеўшы ліс з паднятым хвастом» (Laucevičius 1967: 247—265. № 1855—2018). Затое гербаў — вадзяных знакаў, на шчыце якіх двайны крыж з дахам (або, як правільна называе яго А. Рымша ў сваёй «эпіграме», страла з двума крыжамі) і паверх яго прысеўшы ліс, у атласе ёсць нават некалькі (Laucevičius 1967: 251. № 1912; 253. № 1933).

Аднак ліс надоўга знік і зверху шчыта, а акцэнт герба змясціўся на стралу з двума крыжамі пасярод шчыта. Такія вадзяныя знакі ёсць нават з імем, прозвішчам і тытулам Льва Сапегі, па-лацінску напісанымі на авале шчыта: «Leo Sapega, MDL cancelar», а сам шчыт аплецены раслінным арнаментам (гл. мал.) (Laucevičius 1967: 247. № 1866, 1867).

Падобны герб выяўлены і ў вадзяных знаках з імем і прозвішчам аднаго са сваякоў Льва Сапегі — Паўла Сапегі (гл. мал.)

---

* Гэтую легенду яшчэ некалькі гадоў раней паўтарыў вядомы спецыяліст па геральдыцы Е. Лаўцэвічус, які пісаў: «Гэты герб [Ліс. — *С. Л.*] у Гародлі прыняў ковенскі намеснік, пазней трокскі кашталян Сунігайла, *заснавальнік сям'і Сапегаў*» [курсіў наш. — *С. Л.*] (Laucevičius 1967: 27).

(Laucevičius 1967: 248. № 1869, 1870), толькі вакол шчыта няма расліннага арнамента.

Вядома, у вадзяных знаках гербы былі намнога прасцейшымі, што праявілася і ў гэтых выпадках.



*Герб Сунігайлы*

На думку многіх даследчыкаў, падчас свайго з'яўлення гэты герб увогуле ўтвараўся толькі з адной стралы з двума ці нават адным крыжамі. Акрамя таго, на некаторых выявах герба вастрыё стралы накіравана ўніз. Такія варыянты герба, выкарыстаныя родамі польскіх дваран з канца XIII да пачатку XIV стагодцзя, адзначыў Ф. Пекасіньскі (Piekosiński 1905: 15—16), які заўважыў, што ў XV стагоддзі перамог варыянт герба Ліса з двума крыжамі і скіраваным уверх вастрыём стралы



*Вадзяныя знакі з гербамі Льва і Паўла Сапегаў*

(Piekosiński 1905: 16), г.зн. менавіта такі, які бачым у розных выявах герба Сапегаў.

У другой сваёй працы Ф. Пекасіньскі грунтоўна апісаў усе варыянты першапачатковых выяў тых гербаў (Piekosiński 1899: 20, 37, 80, 94—96, 121, 176, 331, 350, 351, 368, 371, 414). Аднак іх больш правільна называць толькі знакамі.

Сапраўдныя гербы Ліса, ужо нават у продкаў Льва Сапегі, былі намнога больш складанымі. Такім, напрыклад, з'яўляўся герб яго прадзеда Багдана (гл. мал.) (Labarre de Raillicourt 1970: 83), у якім ёсць амаль усе элементы пазнейшых гербаў: страна з двума крыжамі, тры лілеі, працяты стралой локаць рукі чалавека і ўнізе шчыта вершнік з мячом.



*Герб Багдана Сымонавіча Сапегі*

Герб самога Льва Сапегі даволі складаны і вельмі шыкоўны. Ён падрабязна ахарактарызаваны, можна сказаць, апеты ў надрукаванай ва ўступе да Трэцяга Літоўскага Статута эпіграме Андрэя Рымшы — своеасаблівай «одзе» роду Сапегаў і тут жа выяўленаму яго гербу (гл. мал.) (Lappo 1930: 13). У гэтым гербе важнейшае месца займае не страла з двума крыжамі, а тры ліліі на левай палове шчыта і адасоблены ад іх прамой лініяй вершнік з мячом на правай палове. З лілій і пачынае Андрэй Рымша свае радкі, ухваляючы герб Льва Сапегі:

*Хочешь же ся присмотреть гербомъ праве значнымъ,*
*Заразъ можешь познати, ижъ суть въ дому зацнымъ*
*Зъдавна славныхъ Сапеговъ. Тые з предковъ своихъ*
*Закитывали въ цнотахъ — знать во лилияхъ троихъ,*
*При которихъ зъ оружьем коньный воин стоить*
*Знакомь того, ижъ ся з нихъ ни одинъ не боить*
*Служить своимь сподаремь ку кождой потребе*
*Не литуючи скарбовъ, ни самого себе.*
*Кь тому видишь, якъ въ локоть пострелена рука,*
*Видишь, ижъ въскрозъ, изъ туга, з пострелного лука;*

*Такий пострелъ никого дома не потъкаеть,*
*Одно хто поганьские полъки розрываеть.*
*В тыхъ же геръбехъ есть стрела зъ крестами*
*Двема, а третий блиско, осажоному лунами, —*
*Тые знакомь, ижъ они болшъ для хрестиянства*
*Клали здоров[ъ]е свое, не смотречы паньства.*
*Смотри жъ вышей, узришь тамъ надъ гельмомъ коруну...**

Менавіта ў «одзе» Андрэя Рымшы цудоўна адлюстравана ўся атрыбутыка герба. І хоць напачатку акцэнтуюцца тры лілії, аднак усё ж у цэнтры шчыта — страла з двума крыжамі. Сам шчыт апаясаны раслінным арнаментам, у які часта ўплецены фрагменты лілій. У яго знешнім авале між дзвюма лініямі на старабеларускай мове, якой напісан Літоўскі Статут, запісаны імя, прозвішча і тытулы Льва Сапегі, якія ён меў у 1588 годзе:



*Герб Льва Сапегі*

> Леў Сапега, падканцлер ВКЛ, стараста Слонімскі, Маркаўскі і Мядзельскі і інш. (Lappo 1930: 13).

Пералічыўшы і коратка апісаўшы ўсе элементы герба Льва Сапегі, мы не заўважылі ліса, хоць назва герба «Ліс» засталася. Калі і чаму Ліс знікае з адных гербаў роду Сапегаў і з'яўляецца на іншых, знаўцы геральдыкі чамусьці не тлумачаць, хоць іх вельмі грунтоўныя даследаванні і з'явіліся яшчэ ў мінулым стагоддзі (Ostrowski 1898: 1—2, Piekosinski 1899).

У кнізе французскага даследчыка Лабарэ дэ Райлікорта змешчана нават адзінаццаць варыянтаў герба роду Льва Сапегі, і толькі ў пяці ёсць Ліс (гл. мал.) (Labarre de Raillicourt 1970: 11). Ліс з'яўляецца на гербе старэйшага сына Льва Сапегі Яна Станіслава. Гэты герб увогуле варты асаблівай увагі. У ім аб'яднаны гербы двух родаў: Сапегаў і Хадкевічаў, дакладней, адзінай дачкі Яна Карла Хадкевіча, першай жонкі Яна Станіслава Сапегі Ганны Схаластыкі, гербы Ліс і Косцеша (Kosciesza) (гл. мал.) (Labarre de Raillicourt 1970: 91).

* Гл. Lappo 1930: 14, таксама гл. Koženiauskienė 1990: 103—104.




*Выявы гербаў роду Сапегі*

Абодва гербы злучаны вяршыннымі канцамі шчытоў і выяўляюцца на фоне княжацкай мантыі, а апошняя ўверсе ўвенчана княжацкай каронай з крыжам. Уся атрыбутыка герба Яна Станіслава такая ж самая, як і герба яго прапрадзеда Багдана Сапегі (гл. мал.), аднак з'яўляецца яшчэ адзін вельмі істотны элемент — прысеўшы паверх шчыта Ліс, якога няма на гербе яго бацькі Льва Сапегі.

Такія былі розныя варыянты герба роду Сапегаў, яны з часам змяняліся, удасканальваліся і прыгажэлі.

Паходжанне герба роду Сапегаў да гэтай пары не ўстаноўлена, або памылкова высноўваецца з герба Сунігайлы Нарымантавіча.

## ЭПІЛОГ

30 красавіка 1632 года памёр кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт Ваза. 5 мая таго ж года Леў Сапега паехаў у Варшаву аддаць апошнюю пашану старому каралю, якому ён, нягледзячы на ўсе разыходжанні, верна служыў усе сорак пяць гадоў яго праўлення і сам не адзін раз карыстаўся яго міласцю, атрымаўшы вялікія землеўладанні і найвышэйшыя пасады у ВКЛ. Здаецца, што

там, каля труны нябожчыка караля, ён, як гэта часта здаралася, канчаткова прымірыўся са сваім шваграм Крыштафам Радзівілам Малодшым. Дзеля гэтага шмат парупіўся канцлер ВКЛ Альберт Станіслаў Радзівіл. Тамсама Леў Сапега прысягнуў верна служыць новаму каралю, сыну нябожчыка Уладзіславу IV, дарадчыкам і настаўнікам якога ён быў яшчэ ў часы паходу на Маскву.

Апошнія дні акружанага славай і прыгнутага ношай гадоў ваяводы і вялікага гетмана, якога асыпалі міласцямі два манархі, вобразна адлюстраваў сведка тых дзён, Альберт Станіслаў Радзівіл, які акрамя іншага меў і яркі талент літаратара (Radziwiłł 1839: 162—166).

Новы ўладар Уладзіслаў Ваза, толькі ўзышоўшы на трон, у чэрвені 1633 года вырашыў наведаць сваю другую сталіцу Вільню. 23 чэрвеня 1633 года ён прыбыў у Рудзінінкі (Rūdininkus), дзе яго разам з другімі шляхціцамі сустрэў віленскі ваявода, вялікі гетман ВКЛ, сямідзесяцішасцігадовы Леў Сапега, акружаны вялікай світай шляхты. Ён сказаў прыгожую прывітальную прамову, пажадаўшы Уладзіславу столькі год жыцця, колькі жыў легендарны траянскі цар Нестар.

Малады кароль, прамаўляючы ў адказ, жартам сказаў, што ён лепей пажадаў бы сабе «львіных гадоў», выкарыстоўваючы алюзію на імя Льва Сапегі (Radziwill 1839: 162—166).

Праз некалькі дзён, калі кароль прыехаў у Вільню, яго зноў вітаў Леў Сапега ў суправаджэнні вялікай групы шляхціцаў. Гэтае прывітанне ўражліва апісаў Альберт Станіслаў Радзівіл:

> Вартым здзіўлення было бачыць васьмідзесяцігадовага дзядка, які на кані гарцаваў з гетманскай булавой перад каралём; ужо спарахнелая старасць трымалася з апошніх сіл, бо ў той самы дзень, маладосцю ахоплены, ён ледзьве не развітаўся з гэтым светам (Radziwiłł 1839: 162).

І ўсё ж карціна была ўражлівай, здавалася, што і сам «дзядок», і яго слава і справы сапраўды неўміручыя. Вядома, ён сам, як і ўсе, што жывуць на гэтым свеце, быў смяротным, але яго справы і цяпер, праз чатыры стагоддзі ацэньваюцца з вялікай пашанай.

Праз два тыдні пасля апісаных падзей, 7 ліпеня Леў Сапега прымаў дэлегацыю з Італіі.

> «Пасля абеду, — пісаў Альберт Станіслаў Радзівіл, — калі іграла музыка, вясёлы дзядок пляскаў у далоні і кружыўся ў гур-

це; неўзабаве, пакінуўшы з гасцямі сына, пісара ВКЛ [Казіміра Лявона. — *С. Л.*], сам выйшаў [...] і ўжо жывым не вярнуўся, бо адным духам закончыў жыццё. Далі знаць сыну, той прыбег, але ўжо знайшоў мёртвым [...] дом напоўніўся смуткам, страх разагнаў гасцей; вакансіі, якія засталіся пасля яго, прымусілі многіх з-за іх спаборнічаць» (Radziwiłł 1839: 164—165).



*Надмагільны помнік Льва Сапегі і яго жонак*

Так ціха, спакойна, сам-насам памёр Леў Сапега. Пахаваны быў у Вільні ў сямейным склепе ў касцёле Св. Мікалая. Велізарныя яго скарбы і землеўладанні паводле тэстамента, складзенага ім у Варшаве яшчэ 14 ліпеня 1632 года, былі падзелены паміж яго сынамі, сваякамі і вернымі слугамі.

Леў Сапега пражыў доўгае і мэтанакіраванае жыццё. Ён аддаў усе свае сілы, цудоўнае выхаванне і адукацыю, вялікія здольнасці і розум на карысць ВКЛ, дасягнуў у ім вышэйшых пасад і тытулаў, сабраў вялізарныя скарбы і землеўладанні. Аднак як чалавек, якога ўвесь час суправаджалі асабістыя страты і трагедыі, ён наўрад ці быў шчаслівым.

# Уладанні Дзяржавы Льва Сапегі

Тут пералічаны ўладанні і дзяржавы, якія ў розныя часы належалі Льву Сапегу, асобныя з іх былі перададзены сынам ці іншым сваякам або зноў закладзены іншым асобам. Шкада, што некаторыя ўладанні не ўдалося лакалізаваць.

1. Астрынецкая воласць
2. Берасцейскае староства
3. Блудзенскае староства
4. Вогінцкае войтаўства
5. Даўгелішская воласць
6. Есвайнскае староства
7. Здзітаўскае староства
8. Куранецкая воласць
9. Магілёўскае староства
10. Маладзірвенскае цівунства
11. Маркаўскае староства
12. Мядзельскае староства
13. Рэтаўскае староства
14. Свіслачское староства
15. Слонімскае староства
16. Шарашоўская воласць

ДВАРЫ (МАЁНТКІ)

1. Абальцы — Віцебскае ваяв.
2. Авішчы (Вітараж)* — Слонімскі пав.
3. Акалоўск — Браслаўскі пав.
4. Алексінцы — Полацкае ваяв.
5. Альба (Косаў) — Слонімскі пав.
6. Андрыянопаль (Бешанковічы) — Полацкі пав.
7. Апакаў — Смаленская зямля
8. Арэчы — Браслаўскі пав.
9. Асвея — Полацкае ваяв.
10. Астрава (Востраў) — Слонімскі пав.
11. Барань — Аршанскі пав.
12. Бароўка — Слонімскі пав.
13. Басея — Аршанскі пав.
14. Бацікі — Слонімскі пав.
15. Белавіца — Слонімскі пав.
16. Белая — Полацкі пав.
17. Бернаў
18. Бярэжвічы — Аршанскі пав.

* У дужках пазначана другая назва.

19. Бліжня — Слонімскі пав.
20. Блудзень — Берасцейскі пав.
21. Бобр — Аршанскі пав.
22. Болатаў — Аршанскі пав.
23. Брэшаў — Аршанскі пав.
24. Будзілавічы — Аршанскі пав.
25. Була — Слонімскі пав.
26. Бусячы — Слонімскі (?) пав.
27. Бяроза — Берасцейскі пав.
28. Бялынічы — Аршанскі пав.
29. Вараўцы — Оўруцкі пав.
30. Везніца
31. Вортэль — Берасцейскі пав.
32. Востраў — Слонімскі пав.
33. Вязавец — Слонімскі пав.
34. Вята — Браслаўскі пав.
35. Глебаўшчына — Аршанскі пав.
36. Горы Вялікія — Мсціслаўскі пав.
37. Горы Малыя — Мсціслаўскі пав.
38. Горкі — Аршанскі пав.
39. Гродэк (Гарадок) — Гродненскі пав.
40. Густат — Браслаўскі пав.
41. Даліды — Гродненскі пав.
42. Дакудаў — Берасцейскі пав.
43. Давечаровічы — Кобрынскі пав.
44. Дрэча-Лука — Віцебскі пав.
45. Дзядзін — Браслаўскі пав.
46. Дзярэўна — Слонімскі пав.
47. Друцк — Аршанскі пав.
48. Друя — Браслаўскі пав.
49. Дрыбін
50. Езерніца — Слонімскі пав.
51. Ельня — Смаленская зямля
52. Забор'е — Полацкае ваяв.
53. Залеева — Браслаўскі пав.
54. Залессе — Браслаўскі пав.
55. Замошша — Браслаўскі пав.
56. Здзетэль — Слонімскі пав.
57. Здзітаў Стары — Слонімскі пав.
58. Зельва — Ваўкавыскі пав.
59. Жыровічы — Берасцейскі пав.
60. Івашковічы
61. Іказна — Браслаўскі пав.
62. Ількавічы — Слонімскі пав.
63. Канстанцінава — Аршанскі пав.
64. Караневічы — Гродненскі пав.
65. Карэвічы — Аршанскі пав.
66. Касінічы — Аршанскі пав.
67. Кена — Віленскі пав.
68. Кіевец — Берасцейскі пав.
69. Кішкулаўшчызна
70. Клубінічы — Аршанскі пав.
71. Когатаў — Аршанскі пав.
72. Коханаў — Аршанскі пав.
73. Кошуў — Мсціслаўскі пав.
74. Круглае — Аршанскі пав.
75. Ладэніца — Слонімскі пав.
76. Ласосна — Слонімскі пав.
77. Лемніца — Аршанскі пав.
78. Лепель — Полацкі пав.

79. Лыскаў — Лідскі пав.
80. Лучай — Браслаўскі пав.
81. Лужкі — Браслаўскі пав.
82. Лукомль — Полацкі пав.
83. Людагошча — Мсціслаўскі пав.
84. Ляпоны — Первалкскі пав.
85. Ляхаў — Аршанскі пав.
86. Манастыры — Віленскае ваяв.
87. Мезуляны — Віленскае ваяв.
88. Межырэчча — Берасцейскі пав.
89. Мелашкавічы — Аршанскі пав.
90. Мерачоўшчызна — Слонімскі пав.
91. Нацюны — Віленскае ваяв.
92. Пагост — Браслаўскі пав.
93. Паланая — Полацкае ваяв.
94. Палонск — Слонімскі пав.
95. Палубочкі
96. Паніквы — Бельскі пав.
97. Пацкаў — Мсціслаўскі пав.
98. Пачаевічы — Полацкае ваяв.
99. Пернарава — Ёсвайнскі пав.
100. Пілкавічы — Аршанскі пав.
101. Плескачы — Аршанскі пав.
102. Пнеўніца — Полацкі (?) пав.
103. Пярвалкі (Przewlokie) — Слонімскі пав.
104. Радча — Аршанскі пав.
105. Радванае — Слонімскі пав.
106. Рыбель — Аршанскі пав.
107. Росіца — Браслаўскі пав.
108. Ружаны — Слонімскі пав.
109. Сакалоічы — Аршанскі пав.
110. Старажэвічы — Аршанскі пав.
111. Стараяраславічы — Аршанскі пав.
112. Стараселле — Аршанскі пав.
113. Сідараўшчызна — Слонімскі пав.
114. Скаруцін — Аршанскі пав.
115. Славень — Аршанскі пав.
116. Стэцаў — Віцебскі пав.
117. Суша — Полацкі пав.
118. Сялец — Берасцейскі пав.
119. Сямяцічы
120. Сянно — Віцебскі пав.
121. Талачын — Аршанскі пав.
122. Тоўцін — Аршанскі пав.
123. Харошча — Гродненскі пав.
124. Цеплякі — Аршанскі пав.
125. Цітувены — Расейняйскі пав.
126. Шапякі — Слонімскі пав.
127. Шапялевічы — Аршанскі пав.
128. Шніпішкі — Віленскі пав.
129. Шылува (Шыдлува) — Расейняйскі пав.
130. Шышаў — Мсціслаўскі пав.
131. Чарнобыль — Кіеўскі пав.
132. Чартаеў
133. Чарэя — Аршанскі пав.
134. Чачэрын — Аршанскі пав.
135. Чэрнікаў
136. Чурылавічы — Браслаўскі пав.
137. Яблонка
138. Явар — Слонімскі пав.
139. Якаўлевічы — Аршанскі пав.

# Зварот Льва Сапегі да ўсіх станаў Вялікага Княства Літоўскага

*Пераклаў Іван Саверчанка*

Усім станам Вялікага Княства Літоўскага Леў Сапега, падканцлер Вялікага Княства Літоўскага, стараста слонімскі, маркоўскі і мядзельскі, пакорлівыя і зычлівыя службы свае ахвярую.

Заўважалі тое ўсіх вякоў мудрыя людзі, што ў кожнай рэчы паспалітай чалавеку прыстойнаму нічога не можа быць даражэй за вольнасць. А няволяй так мусіць гідзіцца, што не толькі скарбамі, але й смерцю самой яе ад сябе адганяць павінен. А таму ўсе людзі прыстойныя не толькі маёмасць, але і жыццяў сваіх супраць кожнага непрыяцеля выносіць не шкадуюць, каб пад іхжорсткае панаванне не трапіць. Каб вольнасці сваёй пазбаўленыя, паводле волі і разумення чужынцаў не мусілі жыць.

Але ўжо мала таго, каб чалавек не быў у няволі знешняга непрыяцеля, а дамашняга непрыяцеля над сабой трываць мусіў. Таму той мунштук або вудзіла дзеля стрымлівання кожнага нахабніка вынайдзеныя. Каб баяўся закону, усялякага гвалту і свавольства пазбягаў. І над больш слабым І горшым не здзекваўся, а таксама не мог прыгнятаць яго. Бо для таго законы ўстаноўленыя, каб багатаму І моцнаму не ўсё было вольна рабіць. Як гаварыў Цыцэрон: «Становімся нявольнікамі законаў для таго, каб свабоды ўжываць маглі».

Калі чалавеку прыстойнаму нічога няма даражэй за тое, каб у Айчыне сваёй бяспечна жыць, не баючыся, каб яго добрай славы не зганьбілі, целу ды здароўю не прычынілі шкоды, каб не маглі пакрыўдзіць яго на ўласнай маёмасці, тады толькі праву, а не чаму іншаму, павінен быць аддадзены. Дзякуючы законам, чалавек абаронены, аніякага прымусу, знявагі і крыўды не церпіць. Бо мэта і сэнс усіх законаў на свеце, каб кожны добрую славу сваю, здароўе і маёмасць захоўваў у цэласці, ва ўсім гэтым аніякіх страхаў не меў.

Нашая вольнасць, якую мы хвалім сярод іншых народаў хрысціянскіх, у тым, што маем гаспадара, які пануе не паводле волі сваёй, а паводле права нашага. І як славай добрапрыстойнай, гэтак жыццём і маёмасцю вольна карыстаемся. Бо калі б нехта ў тых трох рэчах нас пакрыўдзіць наважыўся і паводле свайго капрызу, а не паводле законаў нашых, звысіўся над намі, той быў бы не панам нашым, а скажальнікам правоў і вольнасцей нашых. Мы пры гэтым мусілі б быць яго нявольнікамі.

І слушна за праўду маем, за што дзякуй Пану Богу, што пры панаванні каралёў іх міласцей і вялікіх князёў, гаспадароў нашых, тую ўладу і вольнасць у руках сваіх маем. Творачы права самі сабе, найлепш можам вольнасці свае ва ўсім захаваць, бо не толькі сусед ці просты абывацель у Айчыне, але і сам гаспадар, пан наш, аніякай тыраніі над намі ўжываць не можа, адно толькі столькі, колькі яму права дазваляе.

Таму, маючы такі скарб у руках нашых, каторы нельга купіць ні за якую суму, належыць кожнаму прыстойнаму чалавеку ведаць пра яго. Каб быў добра абазнаны, сам сябе і жарсці свае стрымліваў, дзейнічаў паводле пісанага права і нікога не крыўдзіў. Калі б быў кімсьці пакрыўджаны, каб ведаў, дзе мусіць шукаць абароны і лекаў у крыўдзе сваёй.

Як адзін сенатар рымскі другога караў за тое, што права Айчыны сваёй не ведаў, гэтак І кожны наш абывацель заслугоўвае дакору за тое, што вольнасцю сваёй выхваляецца, а законаў сваіх умець і разумець не хоча, тых законаў, якія вольнасці яго дазваляюць захоўваць.

Сорамна народу не ведаць сваіх законаў, асабліва нам, бо не на чужой якой мове, а на сваёй уласнай маем пісанае права! І кожнага моманту, пры патрэбе даць адпор усялякай крыўдзе, мусім ведаць права.

А паколькі паўставалі немалыя цяжкасці ад таго, што не кожны мог мець Статут з-за доўгага перапісвання, тады, кіруючыся патрэбамі кожнага абывацеля і служачы на карысць Рэчы Паспалітай, наважыліся тую працу на сябе ўскласці. І, не шкадуючы кошту і накладу свайго, той Статут у друк падаў. Тым самым дарогу зручную і лёгкую да спасціжэння права кожнаму пратарыў. Кожны, хто захоча, зможа мець яго ў руках сваіх.

Прашу вашу міласць, дазвольце тую працу ад мяне ўдзячна прыняць.

Маючы вольнасці свае, добра замацаваныя правам, таго сцеражыцеся, каб да судоў і да трыбуналаў не толькі людзей добрых, але і ў праве нашым глыбока абазнаных выбіралі, якія баяцца Пана Бога, І цнатлівыя, якія б не для карысці сваёй, а на шкоду блізкаму дзеля прагнасці сваёй і дзеля падарункаў права не перакручвалі. Але простым парадкам ідучы, святую праўду і справядлівасць зберагалі. І тую вольнасць, якой гэтак цешымся, цалкам нам захавалі.

З тым братэрскай ласцы міласці вашых міласцей даручаюся.



*Помнік Льву Сапегу ў Лепелі.*
*Скульптар Леў Аганаў. 2010 г.*

# Прамова Льва Сапегі на Берасцейскім царкоўным саборы 1596 года

*Пераклаў Іван Саверчанка*

Паколькі Усемагутны Пан Бог з'яўляецца пачаткам і крыніцай усялякай згоды і міласці, таму богабаязныя і разумныя людзі шануюць адзін аднаго ў згодзе і лучнасці, якая ёсць маткай усялякага дабра.

Яго міласць кароль быў надта рады вашай дамове, пра якую вы паведамілі яму тры гады таму. Мітрапаліт і ўсе епіскапы на той момант дасягнулі згоды, у тым ліку і вашае міласці — епіскап львоўскі і епіскап перамышльскі. Аб гэтым красамоўна сведчаць подпісы вашых уласных рук пад супольнай пастановай.

Вы заяўлялі, што падданыя яго міласці караля — людзі грэчаскай веры — хочуць аб'яднацца з каталікамі, вярнуцца пад уладу адзінага пастыра, не жадаючы надалей дапамагаць новым грэкам — царградскім патрыярхам, адступнікам і адшчапенцам.

Кароль нікога аніякім чынам не схіляў да такога рашэння, не падгаворваў, а тым больш — нікога не прымушаў. Ён сапраўды быў вельмі ўсцешаны, бо праз лучнасць веры шмат людзей станавілася на шлях збавення, пашыралася хвала Богу, умацоўваліся згода і адзінства ў гаспадарстве яго каралеўскай міласці, на чым трымаюцца ўсе дзяржавы.

Яго міласць кароль ведаў, што пра лучнасць людзей хрысціянскай веры на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў надта стараўся кіеўскі ваявода (Канстанцін Астрожскі. — *І. С.*), які цяпер тут з намі сядзіць. Праз вялебнага айца Пасевіна ён звяртаўся да Папы Рымскага Грыгорыя XIII, просячы яго, каб згода шчаслівa здзейснілася.

Кароль памятаў на тое, што яго продкі — колішнія каралі — спрыялі адзінству, здзейсненаму на Фларэнцыйскім саборы, рашэнні якога распаўсюджваліся на іх гаспадарствы. Таму яго міласць

кароль лічыць за вялікую паслугу Пану Богу і ўсёй дзяржаве — ажывіць і абнавіць тую святую і выратавальную лучнасць.

Калі справы пайшлі далей, а паслы айцоў епіскапаў ужо вярнуліся з Рыма, пан кіеўскі ваявода на мінулым сойме вельмі прасіў караля спрыяць уніі, абяцаючы са свайго боку дапамогу хрысціянскай згодзе. Яго міласць кароль ласкава дазволіў здзейсніць унію паміж Касцёлам і Царквой.

Калі прайшоў пэўны час, а прыхільнікі лучнасці не змаглі ў вызначаны тэрмін і ў акрэсленым месцы завяршыць распачатую справу, кароль зноў пайшоў насустрач жаданню кіеўскага ваяводы і даў чарговы дазвол на скліканне сабора.

Больш за тое, калі набліжаўся час правядзення сабора, пан кіеўскі ваявода за некалькі тыдняў да пачатку накіраваў да караля паноў Мацея Малінскага і Лаўрына Дрывінскага, якія перадалі каралю яго сардэчную ўдзячнасць за дазвол на скліканне сабора. Праз тых сваіх паслоў кіеўскі ваявода прасіў аб чатырох рэчах.

Першае, каб ніхто не прыязджаў на той сабор узброеным і ў атачэнні жаўнераў. Каб падчас сабора ўсё адбывалася без прымусу і гвалту, у спакоі і бяспецы.

Другое, каб на сабор свабодна мог прыехаць кожны чалавек, незалежна ад веры.

Трэцяе, каб на тым саборы мог прысутнічаць Нікіфар Грэчын, якога злавілі з Розванам у Валахіі, а ён уцёк з палону з Хоцінскага замка.

Чацвёртае, калі на саборы не будзе дасягнута паразуменне па якім-небудзь з пытанняў, каб тыя пярэчанні можна было вынесці на абмеркаванне сойма.

Яго міласць кароль накіраваў кіеўскаму ваяводзе пісьмовы адказ, замацаваўшы свае рашэнне пячаткай.

На першую просьбу кароль не толькі даў поўную згоду, але і распарадзіўся, каб на саборы ўсё адбывалася ладам, спакойна, прыстойна, усе адчувалі сябе ў бяспецы. З гэтай мэтай ён і накіраваў уласных паслоў на сабор.

Другую просьбу яго міласць кароль не задаволіў. Ён патлумачыў, што паколькі сабор склікаецца дзеля паразумення праваслаўных з каталікамі, то людзям іншых веравызнанняў няма чаго рабіць на ім.

На трэцюю просьбу кароль таксама не даў згоды. Ён растлумачыў, што Нікіфар прывёў з Валахіі Розвана, падтрымліваў тайныя стасункі з туркамі, чым наносіў вялікую шкоду ўсяму каралеўству і ўсёй Рэчы Паспалітай. Таму засядаць разам з ім на саборы,

а тым болей вырашаць царкоўныя справы, анікому з падданых яго каралеўскай міласці не варта.

Чацвёртую просьбу кіеўскага ваяводы яго міласць кароль гэтаксама адкінуў. Ён давёў, што сабор і сойм — дзве розныя рэчы. На соймах не павінны разглядацца духоўныя пытанні, сойм не можа выносіць прысуды па духоўных справах.

І вось цяпер на гэтым саборы мы назіраем непарадак і супраціўленне волі і рашэнням яго міласці караля.

Тыя асобы, што настойліва прасілі аб скліканні сабора, адступілі ад яго раней, чым ён пачаўся.

Не ведаем, якім духам і з якімі думкамі вы прыехалі сюды, ваша міласць кіеўскі ваяводзе, — з гэтакім початам, з узброенымі пешымі жаўнерамі і коннікамі. Вы ж самі заракаліся чыніць падобнае! Вы давалі пісьмовае абавязацельства, за подпісам вашай уласнай рукі і некаторых валынскіх шляхціцаў, перадаўшы яго праз пана Малінскага яго міласці каралю! Каго тым войскам вы напалохаць хочаце? Гэта вы так трымаецеся вашага слова? Дзе ваша прыстойнасць? Дзеля братэрскай дамовы, а не на вайну сюды з'ехаліся! На сабор, а не на непрыяцельскія граніцы! На згоду, а не на зваду!

Калі вы хочаце застрашыць айцоў епіскапаў, біскупаў і іншых духоўных асобаў, перашкодзіць ім вольна абмяркоўваць духоўныя справы і выносіць царкоўныя пастановы, дык мы вам таго не дазволім! За нашых духоўных пастыраў мы гатовыя скласці ўласныя галовы!

Мы паверылі вашым словам і просьбам, прыехалі з пакорлівасцю, як належыць прыязджаць да Божай царквы. На саборы, дзе пануе Святы Дух, дзе святыя епіскапы, Божыя слугі, засядаюць І радзяцца, шукаюць ісціну, дбаюць пра спакой і карысць Божай царквы, — нельга дапускаць аніякага прыніжэння і знявагі!

Лепей бы вы не прасілі яго міласць караля ні аб чым! Не падманвалі яго і нас. Вы, просячы аб міры, прыехалі нібы на вайну!

Вы падбухторваеце вашых людзей да беспарадкаў!

Вы не размаўлялі, не дыскутавалі, урэшце, нікога не пыталіся, а адразу склікалі ўласную сходку, учынілі раскол і падзел!

Вы правялі недазволены і супрацьпраўны соймік, абралі на ім маршалка, чым зняважылі вярхоўную ўладу яго міласці караля! Менавіта кароль прыслаў нас сюды, каб мы забяспечвалі парадак і спакой, ажыццяўлялі маршальскія абавязкі!

Вы дапусцілі да сябе не толькі людзей рознай веры, але і ненадзейных і падазроных асоб. І што яшчэ горш — галавой вашай гра-

мады вылучылі Нікіфара Грэчына, якога пераследуе яго міласць кароль! Той Нікіфар нядаўна ўцёк з вязніцы, абвінавачваецца ў злачынных сувязях з туркамі і непрыяцелямі дзяржавы. Ён паклёпнічаў на караля, абражаў яго, чаго ніхто з вас, як падданых яго міласці караля, не павінен быў цярпець!

Вашая сходка не толькі не можа быць названа саборам, але нават і шляхецкім соймікам, бо і яны збіраюцца толькі з дазволу караля! Яна інакш і назвацца не можа, як толькі праявай непаслухмянасці, супраціўленнем ураду, пастаўленаму Богам! Святое Пісанне прыраўноўвае гэтакі грэх да пакланення ідалам.

Сапраўдны сабор склікаў мітрапаліт, а не Балабан і Капысцінскі!

Месца сабораў — у цэрквах і касцёлах, а не ў гасподах і шынках, памазаных ерэтызмам!

Узганарыліся вашымі духоўнымі айцамі, дадзенымі вам Богам, праз вашых паслоў выказваеце толькі ім паслушэнства! А гэтых наважваецеся пазбавіць сану, скінуць з мітраполіі і з епіскапстваў! Адкуль, з якой нагоды прысвойваеце царкоўную і каралеўскую ўладу? Вы такія ж свецкія людзі, як і мы! Аніякай духоўнай моцы і ўлады, без вышэйшага дазволу і адабрэння, вы не можаце прысвойваць сабе!

Сабор — тэта трыбунал для ўласна духоўных спраў, на якія не распаўсюджваюцца свецкія законы і каралеўская ўлада. Мы чулі, як ваш грэчаскі святы Афанасій назваў антыхрыстам імператара Канстанціна, які хацеў паўплываць на рашэнні епіскапскіх сабораў. Святы Афанасій граміў Канстанціна, указваў яму, каб ён займаўся ўпарадкаваннем дзяржавы, гарадоў і замкаў. Каб ён не прысвойваў сабе права выносіць прысуды па справах, якія знаходзяцца ў кампетэнцыі святароў, прызначаных Богам. Калі гэтакія словы гаварыліся манарху над усім светам, дык што б ён сказаў каму-небудзь з вашых міласцяў!

Яго каралеўская міласць дае згоду на прызначэнне царкоўных іерархаў як найвышэйшы ўладар і абаронца. Той, хто хоча іх турбаваць без ведама караля, замахваецца на ўладу большую, чым тая, якой валодае манарх.

Патрыярх Ерамія, калі быў тут і хацеў замяніць епіскапаў, прасіў дазволу яго міласці караля. Вы ж, з'яўляючыся падданымі яго каралеўскай міласці, здымаеце епіскапаў, чым ставіце сябе вышэй за караля. Але ж вы не маеце аніякай духоўнай улады на гэта. Памятайце, куды вядзеце сябе і іншых разам з сабой!

Ускладаеце вялікія грахі на сваіх старшых — мітрапалітаў і епіскапаў! Яны шукаюць згоды, хочуць хрысціянскай лучнасці, прагнуць паразумення з лацінянамі, вызваляюцца ад Царградскага патрыярха! І за гэта губляюць свой сан і пасады ад вас! Калі гэта грэх, нязгодных — злучаць, усталёўваць хрысціянскую міласэрнасць, мацаваць спакой Хрыстовай Царквы і Касцёла, весці душы да выратавання, дык узнагародай і дабрачыннасцю будзе — сеяць непаразуменне паміж братамі, раздзіраць рызу Хрыстову, разбураць адзінства яго вучняў і чыніць усё злое!

Але што на свеце можа быць больш прыемным Богу, карысным дзяржаве І людзям за адзінства, згоду і супольную міласэрнасць! Акурат згоду Хрыстос запаведваў нам сваім тэстаментам. Ён загадваў і папярэджваў, калі не будзем мець яе — не павінны называцца яго вучнямі! Хто ад згоды і лучнасці Хрыстовай Царквы ўцякае, пра яе паўсюль, дзе можна, не дбае, — той не можа называцца ані хрысціянінам, ані вучнем Хрыстовым.

Чым жа мы, католікі, гэтак брыдкія вам, што вы моцна гневаецеся на вашых старшых, якія хочуць саюзу з намі? Нібыта аб'ядноўваюцца з ерэтыкамі, да іх праклятых аблудаў прысталі! Відаць, ім бы вы дзякавалі.

Найперш, вы пыталіся, чаму адступаюць ад царградскіх патрыярхаў. Варта было б нам прывесці прыклады са Святога Пісання, з твораў святых айцоў — усходніх і заходніх, з канонаў і правілаў святых сабораў, з вашых рускіх (праваслаўных) пісанняў аб тым, што ніхто не можа быць выратаваны, хто не застаецца ў царкоўным адзінстве.

Як вядома, Пан Бог паставіў пастырам над усімі авечкамі святога Пятра і яго наступнікаў. Калі ж хто не слухае іх, той не з'яўляецца авечкай Хрыстовай. Ад пачатку святой Царквы, з часоў апосталаў, Рымскі біскуп як пераемнік святога Пятра меў і мае вярхоўную ўладу над цэрквамі ўсяго свету. Вы ж самі ў вашых літургіях і абеднях падчас Божай службы заўжды просіце пра аб'яднанне веры. А цяпер, калі Пан Бог, дзякуючы вашым малітвам, пасылае тое аб'яднанне, — вы пагарджаеце ім.

Мы маглі б прывесці са Святога Пісання неабходныя доказы, на якія б вы не змаглі нічым запярэчыць. Вам цяпер іх могуць прадставіць нашыя духоўныя айцы, калі вы пажадаеце весці з імі размовы і дыскусіі на гэты конт. Яны ўжо падрыхтаваліся і дзеля гэтага некаторыя з іх прыйшлі сюды разам з намі.

А тое, што епіскапы адступаюць ад царградскіх патрыярхаў — слушна гэта робяць! Бо царградскія патрыярхі адступілі ад Бога, ад праўды і ад адзінства Божай Царквы. Яны або не хочуць ісці да згоды, або з-за турэцкай няволі — не могуць. Для іх — загінуць, а згоды і хрысціянскага адзінства не жадаць — было б вялікай бязбожнасцю і глупствам.

Тыя царградскія патрыярхі і епіскапы — надта сапсаваныя, прыніжаныя і Панам Богам праклятыя. Аб гэтым вам не складана дазнацца. Як вы дакладна ведаеце, ніводзін з царградскіх духоўных айцоў не можа заняць пасады без святакупства. Кожны з іх мусіць купіць у турка тое месца. Каго турак вызначыць на пасаду, той яе і зойме. А ён не прызначае, пакуль яму добра не заплоцяць. Такім парадкам, аніводзін з царградскіх патрыярхаў не з'яўляецца сапраўдным і законным духоўным пастырам. Бо, паводле Божых і царкоўных законаў, кожны святакупца і сыманіяус губляе грошы і пазбаўляецца царкоўнай пасады, якую ён купіў.

Царградскія патрыярхі праклятыя Богам, бо яны адзін аднаго скідваюць з пасадаў, заплаціўшы туркам грошы. А часам здараецца, што там існуюць тры ці чатыры жывыя патрыярхі! Гэтак перапюбніца мае трох мужоў, чужаложніца жыве з чужаложнікамі! Духоўныя асобы — патрыярхі, манахі і ігумены там бесперастанку турчаць і басурманяць, валочацца па іншых краінах, знаходзяць там хрысціянаў і заражаюць іх. Яны даходзяць і да Рускіх краёў, падрабляючы пячаткі патрыярхаў. Бо жывыя яшчэ тыя залатары, якія дапамагалі ім падрабляць пячаткі.

Знойдзецца і яшчэ мноства грахоў, за якія іх праклялі папы рымскія, бо ім святы Пётр перадаў моц царкоўных ключоў. Вялікі грэх царградскіх патрыярхаў і епіскапаў — упартасць і адшчапенства. Ім карысней было б не ўцякаць ад рымскіх пастыраў, а ісці следам за імі. А яны, наадварот, выяўляюць падкрэсленую нядбайнасць пра ўласнае выратаванне.

Вашы старшыя дбаюць пра сябе і пра вас, не да злога паказваюць вам шлях, а да вечнага выратавання, якога не можа быць без згоды і царкоўнага адзінства. Гэтаму вашыя духоўныя айцы вас могуць навучыць шырэй. Мы ж на вас скардзімся Богу за тое, што вы прысвойваеце ўладу і суды, якія належаць вашым старшым. Іх, нікім не асуджаных, вы хочаце без суда і права праклінаць! Гэтыя дзве рэчы — беспадстаўныя і несправядлівыя. Яны называюцца тыранствам і бунтам.

Калі вас паслухаць, дык вы ўсе нібыта правыя, усе важныя, абараняеце людзей розных рэлігій. Але толькі не аберагаеце грэчаскага набажэнства. Разбураеце праваслаўныя храмы, пакідаеце іх пустымі! Не баіцеся ўцякаць да новахрышчэнства (арыянства) ды іншых ерасей. Чаму ж вы не дазваляеце вашым старшым пакараць вас за аблуднасць?

Вы бароніце канфедэрацыю, якая дэкларуе, каб ніхто не быў пакараны за веру, а самі прагнеце пакараць іншых. Хочаце скінуць з духоўных пасадаў тых, якія ідуць не да нейкай ерасі, а да грунтоўнай праўды і чыстай крыніцы Хрыстовай навукі. Ці ж не супраць сваёй уласнай канфедэрацыі чыніце?

Вас не трывожыць тое, што адступаеце ад Грэчаскай рэлігіі. А тыя духоўныя айцы ўмацоўваюць яе. Дасягаючы адзінства, яны нічога не адмяняюць — ані веры святых грэчаскіх старых айцоў, ані цырымоній і службаў царкоўных, ані звычаю набажэнства ва Усходняй Царкве.

Чаму ж вы іх за гэта пакараць хочаце, а самі за сваё адступніцтва аніякага пакарання не хочаце мець? Яны — вашы старшыя і якраз маглі б пакараць вас за вашу шкодную навуку і злыя ерасі. Бо ім дадзена такое права і ўлада. Яны — пастыры, а вы — авечкі! Яны — гаспадары, а вы — падданыя. Пан Бог загадаў вам браць навуку з іх вуснаў, ва ўсім слухацца іх.

Таму просім вас, вярніцеся да абачлівасці і розуму, не перашкаджайце правядзенню сабора, адмаўляйцеся ад антызаконных сходак і ідзіце ўсе да царквы, дзе сабраліся епіскапы і духоўныя айцы — сапраўдныя Божыя слугі! Слухайце, як нашыя старшыя будуць радзіцца пра нашае збавенне!

Яны маюць адказнасць перад Панам Богам, а мы не памылімся, калі паслухаем іх навукі, бо яны маюць пры сабе настаўніка, абяцанага Хрыстом, магістра праўды — Святога Духа!

Яны маюць святога айца, пастыра над усім светам, дабраславенне святога Пятра і яго ўладу!

Яны маюць святых і вучоных епіскапаў! Маюць старажытных настаўнікаў Грэчаскай веры і ўсе высновы праўды!

Не лічыце, што духоўныя айцы з'ехаліся сюды, каб усталяваць новую веру. Унія нічога новага не стварае. Аніякіх змен у Грэчаскую Царкву і Каталіцкі Касцёл не ўносім! Згоды хочам, міласэрнасці прагнем!

А вы, два мізэрныя ўладыкі і ўсе папы! Няўжо не бачыце, якое зло чыніце? Вы з'ядналіся з ерэтыкамі. Не толькі засядаеце на іхніх

нарадах, скіраваных супраць Святога Пісання і Божай волі! Слухаецеся іх парадаў, нябачна служыце ім. Не хочаце слухацца старых і прававерных хрысціянаў, а слухаецеся аблудных! Не прымаеце Божай праўды, давяраеце хлусні! Лічыце іх за надзейных прыяцеляў. А яны ж толькі ў адным Навагрудскім ваяводстве спустошылі 650 цэркваў і Божых службаў у іх! Там налічваласі больш за 600 шляхецкіх дамоў, дзе спавядалі Грэчаскую рэлігію, а засталося ледзьве 16, ці і таго меней. Астатнія адышлі да ерэтычнай новахрышчэнскай заразы!

Яны называюць сябе вашымі сынамі і паслушнікамі. Але калі вы спытаеце іх, як яны вераць, дзе спавядаюцца і прымаюць сакраменты, яны пакажуц вам воўчыя зубы, разарвуць вас і вашых авечак на кавалкі.

О, слепата ваша! Вы хіліцеся да тых, хто нішчыць вас, вашу веру і вашыя цэрквы! А бяжыце ад тых, якія хочуць захаваць вас у цэласці і абараніць!

На вас, дабраслаўных рыцараў, скардзімся. Бо чыніце вялікі грэх супраць Бога і яго памазанніка. Выяўляеце непаслухмянасць перад Панам Богам, сееце варажнечу паміж братамі, выступаеце як непрыяцелі згоды і міласэрнасці, не хочаце ведаць аб праўдзе і выратавальных шляхах, пагарджаеце вашымі духоўнымі айцамі, разрываеце саборы, не зважаеце на караля і яго мандаты.

Як гэта ўсё можа быць даравана вам? Напэўна, Пан Бог ускладзе на вас помсту. Хоць бы не такую, дзе і мы апынімся далучанымі да вашых грахоў.

Сведчым перад Богам нашым, што не жадае вашай крыві і згубы. Але мы, выконваючы даручэнне караля, братэрскімі ўгаворамі і разумнымі довадамі заклікаем вас да міласэрнасці і згоды дзе. Божай Царквы, у якой вы знойдзеце вечнае выратаванне. Вы зробіце дабро і захаваеце адзінства Рэчы Паспалітай (дзяржавы), якая найбольш трымаецца згодай і міласэрнасцю грамадзян. Вы акажаце ёй вялікую паслугу, а пры ёй — захаваеце сябе, вашы дамы і вашых дзетак праз Божае дабраславенне.

Глядзіце, каб вашыя разбуральныя дзеянні нашкодзілі соймікам, не прынеслі шкоды абароне ад турэцкай агрэсіі, якая над намі вісіць. Каб з-за вас усе мы не трапілі ў турэцкую няволю, разам з грэкамі-адшчапенцамі і іншымі ерэтыкамі.

# ЗМЕСТ

*Анатоль Тарас*

Леў САПЕГА . . . . . . . . . . 3

*Мікалай Шкялёнак*

ВЯЛІКІ КАНЦЛЕР ЛЕЎ САПЕГА . . . . . . . . . . 21

*Вітаўт Чаропка*

Леў САПЕГА . . . . . . . . . . 61

*Станіслаў Лазутка*

Леў САПЕГА . . . . . . . . . . 151

Уладанні Дзяржавы Льва Сапегі . . . . . . . . . . 241

Леў Сапега

Зварот да ўсіх станаў Вялікага Княства Літоўскага . . . . . . . . 244

Прамова на Берасцейскім царкоўным саборы 1596 года . . . . 247

12+

Навукова-папулярнае выданне

**ВЯЛІКІ БЕЛАРУС ЛЕЎ САПЕГА**

Зборнік артыкулаў

Укладальнік *А. Тарас*

Падпісана ў друк 04.09.2017.
Фармат 60×90 $^1/_{16}$. Папера газетная. Друк афсетны.
Умоўн. друк. арк. 16,0. Тыраж 2000 асобн. Заказ 2403.

ТАА «Харвест». Пасведчанне аб ДРВВРДВ № 1/17 ад 16.08.2013.
Вул. Скрыганава, д. 4А, адм. пам. 39, 220073, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.
E-mail рэдакцыі: harvest@anitex.by

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Пасведчанне аб ДРВВРДВ № 2/102 ад 01.04.2014.
Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск, Рэспубліка Беларусь.



Леў Сапега – выдатны дзяржаўны дзеяч ВКЛ XVI стагоддзя.

Ён адстойваў суверэнітэт ВКЛ у складзе федэратыўнай Рэчы Паспалітай, змагаўся супраць пашырэння польскага уплыва ў нашым крае, упарта бараніў нацыянальныя інтэрэсы «тутэйшых». Працы, сабраныя у зборніку, даюць добрае уяўленне аб жыццёвым шляху, заслугах і грамадзка-палітычных поглядах гэтага вялікага беларуса.



ISBN 978-985-18-4116-1

ВЯЛІКІ БЕЛАРУС ЛЕЎ САПЕГА